Беларуская мова 10

Беларуская мова

Вучэбны дапаможнік для **10** класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання
(з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню)

Дапушчана
Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Мінск

Нацыянальны інстытут адукацыі
2020

Правообладатель Национальный институт образования

УДК 811.161.3(075.3=161.3=161.1)
ББК 81.2Беи-922
Б43

А ў т а р ы:
Г. М. Валочка (§ 1—4, 23—25, 32), Л. С. Васюковіч (§ 5—7, 34), В. У. Зелянко (§ 8—22), С. С. Міхнёнак (§ 31, 33), С. М. Якуба (§ 26—30)

Р э ц э н з е н т ы:
кафедра агульнага і славянскага мовазнаўства ўстановы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова» (кандыдат філалагічных навук, дацэнт *В. М. Шаршнёва*); настаўнік беларускай мовы і літаратуры кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст», намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце ўстановы адукацыі «Полацкая дзяржаўная гімназія № 1 імя Ф. Скарыны» *А. У. Казлова*

Электронны дадатак для павышанага ўзроўню размешчаны на рэсурсе profil.adu.by

Умоўныя абазначэнні:

— правіла;

— рубрыка «Успамінаем вывучанае»;

— рубрыка «Скарбы мовы»;

— рубрыка «Дакладнасць маўлення»;

— рубрыка «Гавары і пішы правільна»;

— заданні, накіраваныя на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу вучняў;

• — дадатковыя пытанні і заданні, накіраваныя на замацаванне ведаў і ўменняў па раней вывучаных тэмах;

— заданні творчага характару, накіраваныя на развіццё звязнага маўлення вучняў;

— дадатковы матэрыял, размешчаны на электронным адукацыйным рэсурсе «Беларуская мова. 10 клас» (нацыянальны адукацыйны партал: http://e-vedy.adu.by);

— спасылкі на дадатковы матэрыял (QR-коды) для вывучэння і праверкі ведаў пры дапамозе смартфона ці планшэта;

— матэрыял электроннага дадатку, які вывучаецца на павышаным узроўні, размешчаны на рэсурсе http://profil.adu.by;

*дысплей** — лексічнае значэнне слова тлумачыцца ў слоўніку;

*з'ява*ф — зрабіць фанетычны разбор слова;

*помнік*л — зрабіць лексічны разбор слова;

*магчымасць*с — разабраць слова па саставе;

*названых*сл — зрабіць словаўтваральны разбор слова;

*сабака*м — зрабіць марфалагічны разбор слова;

*Свіtае.*сн — зрабіць сінтаксічны разбор сказа.

ISBN 978-985-594-585-8

© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2020

Правообладатель Национальный институт образования

Роля мовы ў жыцці чалавека і грамадства

§ 1. Мова як грамадская з’ява. Функцыі мовы

1. Прачытайце тэкст. Раскажыце пра ролю мовы ў жыцці чалавека, грамадства.

Людзі не могуць існаваць без мовы. З яе дапамогай пазнаю́ць навакольны свет, выказваюць свае думкі, пачуцці, перажыванні, дзеляцца вопытам працоўнай дзейнасці. Ні авалодваць ведамі, ні нават думаць нельга без мовы, якая дазваляе нам чытаць і разумець кнігі, слухаць і засвойваць тое, што гавораць іншыя, размаўляць і абменьвацца думкамі з сябрамі, бацькамі, настаўнікамі, знаёмымі і незнаёмымі. Усё гэта адбываецца ў людской супольнасці — грамадстве, у працэсе маўленчай дзейнасці чалавека, якая ўключае ў сябе гаварэнне, успрыманне і разуменне прачытанага (чытанне) ці пачутага (аўдзіраванне), а таксама пісьмо. Іншымі словамі, мова — гэта сістэма адзінак (словы, граматычныя формы і інш.), з дапамогай якіх людзі ўступаюць у суразмоўніцтва паміж сабой, г. зн. уключаюцца ў працэс маўленчай дзейнасці.

Агульнавядома, што мова з’яўляецца найважнейшым і асноўным сродкам зносін паміж людзьмі. З дапамогай мовы чалавецтвам фіксуюцца, назапашваюцца, класіфікуюцца, абагульняюцца веды. Іх засваенне, усе працэсы навучання людзей (у тым ліку ва ўстановах адукацыі) звязаны з шырокім выкарыстаннем мовы, якая служыць галоўным сродкам атрымання ведаў, перадачы духоўнай і матэрыяльнай культуры чалавецтва. Мова адыгрывае галоўную ролю і ў фарміраванні светапогляду і інтэлекту чалавека.

Дасягненні народа, нацыі ў развіцці навукі, мастацкай літаратуры і іншых галін духоўнай культуры ажыццяўляюцца пры дапамозе роднай мовы. Вось чаму кожны народ імкнецца, развіваючы сваю нацыянальную культуру, падтрымліваць і ўдасканальваць нацыянальную мову. Добра, калі чалавек ведае некалькі моў, але найперш трэба

Правообладатель Национальный институт образования

ведаць мову таго народа, на зямлі якога ты жывеш. Гэта дапаможа далучыцца да багатага жыццёвага вопыту беларусаў, да шматграннай духоўнай і матэрыяльнай культуры працавітага і мудрага народа.

Назавіце асноўныя функцыі, якія выконвае мова ў грамадстве. Якая роля роднай мовы ў жыцці чалавека?

2. Прачытайце пачатак і заканчэнне выказвання аб функцыях мовы. Вусна дапоўніце яго, выкарыстоўваючы прыведзеную схему.

Прызначэнне мовы вельмі шырокае. Яна абслугоўвае (непасрэдна або апасродкавана) усе сферы жыцця чалавека. Таму і функцый у яе некалькі. Асноўнымі з іх з'яўляюцца: камунікатыўная, … .

…

Кожная функцыя выконвае сваю ролю, але ўсе разам яны служаць таму, каб мова магла быць эфектыўным і аптымальным сродкам зносін паміж людзьмі.

зносіны	**камунікатыўная**	сродак маўленчых зносін, абмену інфармацыяй
абазначэнне	**намінатыўная**	сродак называння прадметаў, абазначэння паняццяў, з'яў навакольнай рэчаіснасці
выражэнне	**эмацыянальная**	сродак перадачы эмоцый, пачуццяў, перажыванняў
уздзеянне	**уздзеяння**	сродак пабуджэння да дзеяння

3. Прачытайце. Дакажыце, што нашы продкі разумелі значэнне слова (мовы) у жыцці грамадства. Якія функцыі мовы называюцца ў творах вуснай народнай творчасці?

Узнікшы разам з грамадствам, мова нястомна служыць чалавеку ў розных яго занятках і патрэбах. У штодзённай маўленчай практыцы людзі ўдасканальвалі гэты сродак зносін, імкнуліся спазнаць яго прыроду. І тое, што нашы продкі пакінулі нам узоры выкарыстання слова, сведчыць, што яны мелі добры моўны густ, разумелі значэнне мовы ў жыцці грамадства.

Правообладатель Национальный институт образования

Народ даўно заўважыў, што мова — найважнейшы[м] сродак зносін, і выказаў гэту думку вобразна і даступна: *Язык да Кіева давядзе. Н..в..домая дарога на канц.. языка.*

Разумелі людзі і такую функцыю мовы, як уздзеянне, здольнасць слова выклікáць у слухача пэўныя эмоцыі. Добрае, шчырае слова высока цэніцца ў народзе. Яно ўздымае[м] настрой, надае сілы, дапамагае жыць. Невыпадкова яго параўноўваюць з прадметамі і з'явамі, якія маюць вялікае значэнне ў жыцці чалавека: *Ласкава.. слоўка, як сонейка, грэ.. . Ласкава.. слова — што д..ень ясн.. . Скажа — як мёдам памажа.*

Але слова можа і балюча параніць. Такое слова асуджаецца ў народзе як найбольшае зло: *Рана* ***гоіцца****, злое слова — ніколі. Слова як соль. Сказа.. — як цвік у сэрца ўбі.. . Язык як перац.*

Слова збліжае, аб'ядноўвае людзей, яно і раз'ядноўвае іх. Таму народная мудрасць гаворыць: *Ліхое* слова* ***пракаўтні****. Як* ***брыдкае*** *слова сказаць, лепш язык выплюнуць. Перакусі, што маеш сказаць* (Паводле А. Каўруса).

Запішыце прыказкі, у якіх прапушчаны літары. Растлумачце правапіс. Падбярыце і запішыце сінонімы да выдзеленых слоў.

4. Прачытайце тэкст. Дакажыце, што мова — грамадская з'ява.

Роля мовы ў жыцці грамадства ўвесь час узрастае, становіцца ўсё больш прыкметнай. Мы ўжо ведаем, што мова ўзнікла з патрэбы людзей што-небудзь сказаць адно аднаму. Але з развіццём грамадства гэта «што-небудзь» увесь час узрастае, а мова і ёсць тая форма, у якой захоўваецца запас інфармацыі, атрымліваюцца і перадаюцца веды, назапашаны[сл] вопыт духоўнай і матэрыяльнай культуры.

З развіццём грамадства развіваецца і мова, яна прыстасоўваецца да патрэб грамадства. Напрыклад, з'яўляюцца новыя прадметы, з'явы, паняцці — і мова дае ім назвы. Гэты працэс мы назіраем амаль штодзень[ф]. Не так і даўно мы не ведалі ні камп'ютараў, ні прынтараў, ні сканераў, а цяпер словы — назвы гэтых прадметаў — актыўна ўжываюцца ў нашым маўленні. Нядаўна з'явіліся словы *дысплей*, брыфінг*, менеджар*, брокер*, дылер** і шмат іншых, якія перайшлі ў актыўны слоўнік многіх людзей. А яшчэ нядаўна новае слова *пэйджар** ужо стала гістарызмам.

Але справа не толькі ў тым, што ў сучаснай мове больш слоў, чым было раней. З часам змяняецца і сама мова.

Правообладатель Национальный институт образования

Адрозненні паміж мовай бацькоў і дзяцей, дзядоў і ўнукаў яшчэ не вельмі прыкметныя. Але за некалькі пакаленняў збіраецца столькі змен, што пісьмовыя помнікі[л] старажытнай мовы даводзіцца перакладаць на сучасную мову, як, напрыклад, «Слова пра паход Ігаравы»:

«Не лѣпо ли ны бяшеть, братие, начяти старыми словесы трудныхъ повѣстий о пълку Игоревѣ, Игоря Святъславлича? Начати же ся тъй пѣсни по былинамъ сего времени, а не по замышлению Бояню». —

А ці не лепей, братове,
пачаць у спрадвечным слове
мужны спеў пра паход Ігара,
Святаславава сына?
І пачаць спеў гэты
па былях дня нашага,
а не па надуме Баяна!

Пераклад Р. Барадуліна.

Як мова рэагуе на змены ў грамадскім жыцці? Пакажыце на двух-трох прыкладах.

Раскрыйце значэнне слоў, пазначаных зорачкай (*). Пры неабходнасці звяртайцеся да тлумачальнага слоўніка.

5. Прачытайце ўважліва ўрывак з першай публікацыі паэмы Я. Коласа «Новая зямля» ў «Нашай ніве» (1912 г.). Параўнайце правапіс, граматычныя формы і асаблівасці словаўжывання з тымі, што лічацца правільнымі ў сучаснай беларускай мове.

Каля пасады лясьніковай
Цягнуўся зграбнаю падковай
Стары высокі лес цяністы.
Тут верх асіны круглалісты
Сплетаўся з хвоямі, з дубамі,
А ёлкі хмурнымі крыжамі
Высока ў небі выдзяляліcь
І сумна з хвоямі шэпталіcь.

Заўсёды смутные, як удовы,
Яны найбольш адны стаялі,
І так маркотна пазіралі
Іх задуменныя галовы.
Лес наступаў і разступаўся,
Лужком зялёным разрываўся
А дзе прыгожые загібы
Так міла шлі каля сядзібы,
Што проста б імі любаваўся.

Назавіце словы, правапіс і граматычныя формы якіх не адпавядаюць сучасным нормам літаратурнай беларускай мовы. Растлумачце адрозненні (вусна) і запішыце па ўзоры.

У з о р: *лясьніковай — лесніковай*.

Тлумачэнне. *У сучаснай беларускай мове захоўваецца* **е** *ў другім перадназіскным складзе, не перадаецца на пісьме памякчэнне* **с** *перад мяккім* [н’].

Правообладатель Национальный институт образования

6. На старонках часопіса «Бярозка» ў рубрыцы «Дайджэст» (*digest* у перакладзе з англійскай азначае «пераказ, падборка») змешчаны звесткі пра самыя цікавыя і незвычайныя, на думку аўтара, гарадскія летнія мерапрыемствы ў Мінску. Пазнаёмцеся з некаторымі з іх.

Джазавыя вечары ля Ратушы

Мерапрыемства з гучнай назвай «Джазавыя вечары», на якім ужывую выступаюць музы́кі з замежжа і Беларусі. Тут можна пачуць джазавыя апрацоўкі беларускага фальклору; пабачыць дзіўны саюз музыкаў — трубача з Чылі і ўдарніка з Туркменістана; паслухаць вакальныя і інструментальныя выступленні ў розных стылях і напрамках: этна-джаз, класічны, ф'южан, джаз-фанк, свінг, мэйнстрым і інш. «Звыклыя» месцы для гэтага жанру — кафэ і клубы, а тут — сцэна на вуліцы ў гістарычным цэнтры горада — двойчы рамантыка.

Эка-фестываль «Пастарнак»

На працягу двух дзён у батанічным садзе можна пазнаёміцца з вытворцамі і пастаўшчыкамі экалагічнай прадукцыі, даведацца пра самыя сучасныя паслугі для здаровага ладу жыцця. Усе зоны падпарадкаваны тэматыцы фестывалю: фудкорт — здаровае харчаванне, *beauty*-зона — арганічная касметыка і прыемныя майстар-класы, спартыўная пляцоўка — розныя віды спорту і фітнес, музычная зона — акустычныя выступленні артыстаў у трох пунктах фестывалю.

FSP Freaky Summer Party

Двухдзённы арт-пікнік у цэнтры горада — унікальны па сваёй канцэпцыі. Фэст шматвектарны: велізарны фудкорт, адукацыйная пляцоўка *Edutainment*, жывая музыка на пяці сцэнах, маркет дызайнерскіх рэчаў, дзіцячая тэрыторыя *Kidsters*, пляцоўкі актыўнага і пасіўнага адпачынку, гульні і забавы ад партнёраў фестывалю. Усё адбываецца з паметай **dog-friendly*: уваход з жывёламі дазволены! *(Паводле М. Шантыр).*

Знайдзіце ў тэкстах словы, якія не з'яўляюцца агульнаўжывальнымі. Паспрабуйце раскрыць іх сэнс.

Ці з'яўляюцца гэтыя словы сведчаннем таго, што мова развіваецца разам з грамадствам?

Ці ўзніклі ў вас цяжкасці з разуменнем тэкстаў? Як вы думаеце, з чым гэта звязана?

Правообладатель Национальный институт образования

7. Прачытайце тэкст. Сфармулюйце яго тэму. Зачытайце сказ, у якім выказана асноўная думка.

На пачатку XXI стагоддзя беларуская мова выяўляе высокую ступень жыццяздольнасці і жыццёвасці. Яна вельмі вузка, а часам сімвалічна прысутнічае ў афіцыйных сферах ужытку, разам з тым яна сёння рэальна запатрабавана як сродак зносін у іншых сферах. Феноменам* яе сённяшняга існавання з'яўляецца тое, што яна паступова пранікае ў новыя, вельмі актуальныя для жыцця сучаснага грамадства сферы дзейнасці. Перш за ўсё, гэта сфера інтэрнэт-камунікацыі. Асабліва маладое пакаленне, якое мае справу з гэтай галіной, можа бачыць, наколькі шырока беларуская мова прадстаўлена ў гэтай прасторы. Па-другое, сучасная беларуская літаратурная мова дастаткова актыўна пранікае ў сферу, дзе яе абсалютна не было 20 гадоў таму назад, — у сферу набажэнства. Яна гучыць і ў каталіцкім касцёле, і ў праваслаўнай царкве. А гэта значыць, што яна запатрабаванас як элемент духоўнага жыцця беларускага грамадства. Нягледзячы на ўсе праблемы, беларуская мова пашырае сваю камунікатыўную прастору *(Паводле А. Лукашанца)*.

Як вы думаеце, чаму аўтар лічыць феноменам пранікненне беларускай мовы ў новыя, вельмі актуальныя для жыцця сучаснага грамадства сферы дзейнасці?

- Выпішыце з тэксту па два прыклады слоў, напісанне якіх адпавядае наступным правілам: «Правапіс ***о, э — а***», «Правапіс ***у — ў***», «Правапіс падоўжаных зычных», «Правапіс ***д — дз***».

8. Прачытайце фрагмент артыкула пра круглы стол, прысвечаны праблемам упарадкавання камп'ютарнай тэрміналогіі, які адбыўся напачатку 2020 г. у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з удзелам навукоўцаў і прадстаўнікоў IT-сферы.

У сваім выступленні першы намеснік дырэктара Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Аляксандр Лукашанец звярнуў увагу на тое, што прысутнасць беларускай мовы ў камп'ютарным асяроддзі — адна з умоў яе далейшага захавання і выкарыстання.

«У даследаванні венгерскага лінгвіста Андраша Карная "Лічбавая смерць моў", апублікаваным некалькі гадоў назад, сказана пра тое, што толькі чатыры працэнты з існуючых у свеце жывых моў прадстаўлены ў інтэрнэце», — падкрэсліў А. Лукашанец. «Ёсць вялікі віртуальны кнігазбор "Беларуская палічка" *(www.knihi.com)*, а гэта тысячы кніг. Беларуская мова прадстаўлена і ў сацыяльных сетках», — зазначыў дырэктар Інстытута мовазнаўства Ігар Капылоў.

Правообладатель Национальный институт образования

У месенджары *Viber* працягваюць з'яўляцца беларускамоўныя стыкеры, сёння ёсць магчымасць усталяваць *Windows 10* на беларускай мове. Будзе жаданне і запыт — будзе і далейшая праца ў гэтым кірунку. Усё залежыць ад карыстальнікаў — ад нас з вамі! *(Паводле С. Дубовіка).*

Раскажыце пра функцыянаванне беларускай мовы ў інтэрнэце, выкарыстоўваючы звесткі з тэксту і ўласны вопыт.

- Запішыце складаныя словы з тэксту, растлумачце спосаб іх утварэння.
- Назавіце дзеепрыметнікі, ужытыя ў тэксце. Вызначце іх форму і граматычнае значэнне (лік, род або склон), сінтаксічную ролю ў сказе.

9. Прачытайце выразна выказванні беларускіх паэтаў пра родную мову. Якое значэнне роднага слова, роднай мовы падкрэсліваецца ў іх?

Мова продкаў нашых і наш..адкаў —
Шэпт дубровы і пчаліны звон, —
Нам цябе ласкава і аш..адна*
Спазнаваць ажно да скону дзён,
Па чужых краях не пабіра..а,
*(Не)*а..даць цябе на забы..ё,
Наша *(не)*вычэрпнае бага..е,
Наша *(не)*смяротнае жыццё.

Г. Бураўкін.

Табе складаю шчыры свой санет,
Прапра..едаў маіх жывая мова, —
Ма..го народа першая аснова,
Душы яго шырокі, чысты свет!

Е. Лось.

О матчына мова!
Маленства вясна!
*(Ні)*хто і *(ні)*колі цябе *(не)*заменіць,
Бо ты, як і маці, на све..е адна.

А. Бачыла.

Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі.

10. Падрыхтуйце вуснае выказванне на тэму «Роля беларускай мовы ў жыцці чалавека і грамадства».

Правообладатель Национальный институт образования

Маўленне

§ 2–1

§ 2–2

§ 2–3

§ 2. Маўленне як працэс маўленчых зносін. Віды маўленчай дзейнасці. Формы маўленчай камунікацыі

11. Прачытайце тэкст. Раскажыце, чым адрозніваюцца мова і маўленне.

Мова — асноўны сродак перадачы інфармацыі паміж людзьмі. Не можа быць маўлення па-за мовай, без мовы. Мова — гэта сістэма сродкаў зносін, сістэма лексічных і граматычных форм, іх змяненняў і спалучэнняў, якая гістарычна склалася ў асобнага народа ці народнасці.

Маўленне — гэта працэс выкарыстання моўных сродкаў у камунікацыі. Яно існуе ў дзвюх формах: вуснай і пісьмовай. Калі чалавек гаворыць або слухае, ён карыстаецца вусным маўленнем, калі піша або чытае — пісьмовым. У залежнасці ад таго, распавядае чалавек сам або ўспрымае інфармацыю, маўленне таксама падзяляецца на прадуктыўнае (гаварэнне, пісьмо) і непрадуктыўнае (слуханне, чытанне).

Мова і маўленне адзіныя ў тым, што перадаюць два бакі адной і той самай з'явы — зносін людзей. Аднак, адчуваючы патрэбнасць у абмене думкамі з іншымі, чалавек выкарыстоўвае тую ці іншую мову, якая належыць яго народу. Мова — гэта заўсёды прадукт народа, яго гісторыі. Маўленне ўяўляе сабой практычнае выкарыстанне людзьмі мовы.

12. З апорай на схему падрыхтуйце вуснае паведамленне на тэму «Сітуацыя маўлення». Раскажыце, як мяняецца змест выказвання ў залежнасці ад абставін, у якіх яно ствараецца.



Правообладатель Национальный институт образования

13. Папрацуйце ў групах.

1-я група: вам даручылі выступіць на інфармацыйнай гадзі́не на тэму «Прафілактыка камп'ютарнай залежнасці». Раскажыце пра магчымыя спосабы прафілактыкі камп'ютарнай залежнасці ў навучэнцаў.

2-я група: уявіце, што ваш малодшы брат (сястра) ці сябар (сяброўка) шмат часу праводзіць за камп'ютарнымі гульнямі. Паспрабуйце пераканаць іх у тым, што ёсць заняткі больш цікавыя, чым гульні.

Абгрунтуйце думку, што змест, форма нашых паведамленняў і моўныя сродкі, якія ў іх выкарыстоўваюцца, залежаць ад сітуацыі маўлення (дзе, з кім і з якой мэтай мы гаворым).

Маўленне існуе ў дзвюх формах — вуснай і пісьмовай.

Вуснае маўленне — гэта зносіны, якія адбываюцца пры дапамозе вымаўленых услых слоў (гутарка, спрэчка і інш.). **Пісьмовае маўленне** ажыццяўляецца з апорай на запісаныя словы і фразы (чытанне тэксту, спісванне, выпраўленне памылак і інш.). Такім чынам, калі мы гаворым або слухаем, то карыстаемся вусным маўленнем, калі чытаем або пішам — пісьмовым. На працягу дня мы то гаворым, то слухаем, то чытаем, то пішам, гэта значыць мы ўвесь час уключаны ў працэс маўленчай дзейнасці. **Маўленчая дзейнасць** — гэта асобы від чалавечай дзейнасці (разам з працоўнай, пазнавальнай, гульнёвай і інш.), у час якой чалавек уступае ў маўленчыя зносіны з іншымі людзьмі.

Па меркаванні некаторых даследчыкаў, нашы зносіны з навакольным светам на 50 % адбываюцца праз слуханне, на 30 % — праз гаварэнне, на 20 % — праз чытанне і пісьмо.

14. Прачытайце прыказкі. Вызначце іх тэматыку. Раскрыйце сэнс кожнай прыказкі.

1. Са свайго языка спусці**ш**[ф] — на чужым не зловіш. 2. Што напісана пяром, не возьме і сякера. 3. Хто пыта**е**, той не блудзіць.[сн] 4. З разумным чалавекам добра і пагаварыць. 5. Слова — вецер, а пісьмо — грунт. 6. Слухай многа, а гавары мала. 7. Менш гавары — больш пачуеш. 8. Чыта**е** як рэпу грыз**е**.

- Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

Зачытайце прыказкі, у якіх гаворыцца пра вуснае маўленне і слуханне, пісьмовае маўленне і чытанне.

Успомніце і прывядзіце ўласныя прыклады прыказак і прымавак, якія маюць адносіны да відаў маўленчай дзейнасці.

Правообладатель Национальный институт образования

15. Разгледзьце схему. Падрыхтуйце на яе аснове вуснае паведамленне аб відах маўленчай дзейнасці.



З дапамогай тлумачальнага слоўніка высветліце значэнне слова *рэцэптыўны*. Абгрунтуйце падзел відаў маўленчай дзейнасці на прадуктыўныя і непрадуктыўныя (рэцэптыўныя).

16. Прачытайце тэкст. Складзіце яго план. Карыстаючыся планам, перакажыце тэкст.

У аснове сучаснага беларускага пісьма ляжыць кірыліца — старажытная славянская азбука. Яна была складзена ў IX ст. на аснове грэчаскага алфавіта і атрымала шырокае распаўсюджанне на Русі з канца X ст. у сувязі з прыняццем хрысціянства (988 г.). Паступова відазмяняючыся і прыстасоўваючыся да фанетычнай сістэмы старажытнарускай мовы, кірылічны алфавіт на працягу доўгага часу з поспехам абслугоўваў пісьмовыя зносіны ўсходніх славян, а пасля распаду іх адзінства — камунікацыю трох народаў (рускага, беларускага і ўкраінскага).

Побач з кірыліцай у XIX і пачатку XX ст. на Беларусі шырока выкарыстоўвалася лацінка — відазменены варыянт лацінскага алфавіта, які быў прыняты ў польскай мове. Лацінкай, напрыклад, былі надрукаваны творы В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, «Мужыцкая праўда» К. Каліноўскага, некаторыя зборнікі выбраных твораў Я. Купалы, Я. Коласа, Цёткі і іншыя публікацыі. У пачатку XX ст. газета «Наша ніва» і выданні суполкі «Загляне сонца і ў наша аконца» друкаваліся і кірыліцай, і прыстасаванай да гукавой сістэмы беларускай мовы лацінкай.

Правообладатель Национальный институт образования

Аднак выкарыстанне дзвюх графічных сістэм ускладняла выдавецкую дзейнасць, звязаную са значнымі матэрыяльнымі выдаткамі, стварала цяжкасці ў вывучэнні мовы, перашкаджала натуральнаму развіццю і стабілізацыі вымаўленчых правіл і норм, выпрацоўцы граматычных і арфаграфічных правіл. Узнікла неабходнасць прыняцця адзінага алфавіта. Праведзеная на старонках «Нашай нівы» публічная дыскусія паказала, што большасць чытачоў газеты выказалася на карысць кірыліцы. З 1912 г. «Наша ніва» і большасць беларускіх тэкстаў друкуюцца кірылаўскімі літарамі, больш звыклымі і знаёмымі для беларускага чытача, а лацінка паступова выйшла з актыўнага ўжытку.

Але неабходнасць у перадачы беларускіх слоў лацінскімі літарамі час ад часу ўзнікае і сёння. Напрыклад, калі трэба зрабіць паказальнікі з геаграфічнымі назвамі больш зразумелымі для турыстаў-замежнікаў. Запіс лацінкай у гэтым выпадку ажыццяўляецца ў адпаведнасці з «Інструкцыяй па транслітарацыі* геаграфічных назваў Рэспублікі Беларусь літарамі лацінскага алфавіта» (2007): *Homiel* (Гомель), *Minsk* (Мінск), *Žodzina* (Жодзіна), *Mahilioŭ* (Магілёў), *Dabrynaviči* (Дабры́навічы).

Разгледзьце паказальнік на фотаздымку. Якія з надпісаў зроблены ў адпаведнасці з інструкцыяй? Як вы думаеце, чаму толькі два з іх адпавядаюць інструкцыі?

Чым транслітарацыя адрозніваецца ад перакладу?

Запішыце кірыліцай назвы станцый мінскага метро, прыведзеныя лацінскімі літарамі.

Kupalaŭskaja, Niamiha, Spartyŭnaja, Uručča, Pieršamajskaja, Plošča Pieramohi, Piatroŭščyna, Uschod.

17. Разгледзьце схему. Падрыхтуйце на яе аснове вуснае паведамленне пра віды маўлення.



Правообладатель Национальный институт образования

Звярніце ўвагу!

Адрозніваюць знешняе і ўнутранае маўленне. **Знешнім** лічыцца вуснае (дыялагічнае і маналагічнае) і пісьмовае маўленне. **Унутранае** маўленне — гэта размова чалавека з самім сабой. Яно не накіравана на зносіны з іншымі людзьмі.

18. Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку. Як аўтар абгрунтоўвае яе?

Каб належным чынам весці гутарку, трэба перш за ўсё ўмець слухаць: *Меней гавары, болей ведац.. будз..ш. Слухай многа, а гавар.. мала.*

Народ перасцерагае: да мовы трэба ставіцца ўважліва. Перш чым сказаць, трэба добра падумаць, узважыць кожнае слова. Настойліва гучыць папярэджванне: *Выказанаг.. слова да губы не верн..ш. Слова (не)в..рабей: выпусц..ш — (не)злов..ш. Са свайго языка спусц..ш — на чужым (не)злов..ш.*

Запас бяды не чыніць. Гэтая «нямоўная» прыказка справядлівая. Добра, калі чалавек шмат ведае. Толькі ўмей выбраць, што падыходзіць для гутаркі, умей абмежаваць прадмет размовы, каб весці яе ў патрэбным кірунку.

Зважай на ўмовы гутаркі, ведай, што сказаць: *Усё знай, ды (не)ўсё бай. Многа ведай, ды мала гавары. Трэба знаць, што сказаць. У добрую часіну сказац.., а (у/ў)ліхую памаўчац..* (Паводле А. Каўруса).

Пра вуснае ці пісьмовае маўленне гаворыцца ў тэксце?

Запішыце прыказкі, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі. Абгрунтуйце, што кожная з іх мае самастойны змест і выражае закончаную думку.

19. Выкарыстоўваючы табліцу, параўнайце вуснае і пісьмовае маўленне, раскажыце пра асаблівасці кожнага з іх.

Вуснае маўленне	Пісьмовае маўленне
Перадаецца гукамі	Перадаецца графічнымі знакамі — літарамі
Узнікла гістарычна першым	Узнікла на аснове вуснага маўлення
Разлічана на слыхавое ўспрыманне	Разлічана на зрокавае ўспрыманне
Ствараецца ў працэсе гаварэння	Папярэдне абдумваецца, можа рэдагавацца

Правообладатель Национальный институт образования

Вуснае маўленне	Пісьмовае маўленне
Залежыць ад рэакцыі суразмоўцы і можа змяняцца ў залежнасці ад яе	Не залежыць ад рэакцыі суразмоўцы
Суправаджаецца інтанацыяй, мімікай, жэстамі	Мае графічнае афармленне
Існуе толькі ў момант гаварэння	Можа існаваць доўга (у залежнасці ад матэрыялу, на якім запісана)
Характарызуецца слоўнай імправізацыяй	Характарызуецца падрыхтаванасцю
Моўныя асаблівасці — свабода ў выбары лексікі, выкарыстанне простых сказаў, паўторы, незакончанасць думкі, перарывістасць	Моўныя асаблівасці — перавага кніжнай лексікі, выкарыстанне складаных сказаў, завершанасць думкі, строгае захаванне норм

20. Вызначце, якія з прыведзеных уласцівасцей характэрны для вуснага маўлення, а якія — для пісьмовага.

Інтанацыя, тэмп (хуткі, павольны, нармальны), знакі прыпынку, тон (спакойны, ціхі, вясёлы, ласкавы, бадзёры і г. д.), абзац, лагічны націск, чырвоны радок, паўза, міміка, жэсты.

Выпішыце сродкі выразнасці, характэрныя для вуснага маўлення.

21. Абгрунтуйце справядлівасць выказвання Бернарда Шоу: «Ёсць пяцьдзясят спосабаў сказаць “так” і пяцьсот спосабаў сказаць “не”, і толькі адзін спосаб іх напісаць». Якія з характарыстык вуснага і пісьмовага маўлення дазволілі Б. Шоу зрабіць такую выснову?

22. Прачытайце тэксты. Ахарактарызуйце сітуацыю маўлення. Вызначце асаблівасці маналагічнага і дыялагічнага маўлення.

І. Прыязджайце, прыходзьце, сябры, на вясёлае свята. Паверце паэту Міколу Маляўку, які аднойчы пабываў там:

Да Аўцюкоў, як цень,
Хадзіў я ў вечнай скрусе,
А там пацёрся дзень —
І цэлы год смяюся.

Правообладатель Национальный институт образования

Даўно і я паверыў, што смех — дар Божы. Смяюцца ўсе, але кожны па-свойму. Адзін смяецца, каб яго не чулі. Другі — на ўсю іванаўскую. Адзін — як парася свянцонае, другі — як з гары едучы. Смяецца рачная вада з балота, што яно зыбаецца. Смяецца кацёл з гаршка, бо ён чорны. Але ж смех не арэх — зуб не лупіць. Пасмяяцца — не пакалечыць. Ведаю адно: лепш жартаваць, чым гараваць. Дык давайце, сябры, весяліцца, як гэта ўмеюць рабіць мае землякі — аўцюкоўцы. Іх дасціпныя жарты, анекдоты, падколкі, прыпеўкі, вясёлыя байкі — увесь гэты фальклор вельмі кранае душу кожнага чалавека. Кранае, бо аўцюкоўскі гумар народны, а не прыдуманы, не высмактаны з пальца, таму і мудры, смешны, павучальны. Запрашаю ўсіх вясёлых людзей у госці да аўцюкоўцаў *(У. Ліпскі)*.

II. З парога папрасіў:

— Палячы!

— А што баліць?

— Жывот.

— Ад чаго баліць?

— Ад смеху!

От і кажуць у Аўцюках: «Не кожны хворы, хто стогне». А яшчэ кажуць, што лепш жартаваць, чым гараваць.

Што мы, беларусы, рабілі, робім і будзем рабіць! Свет захаваўся таму, што смяяўся *(У. Ліпскі)*.

- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай і прыдыялогу.

23. Складзіце дыялогі па адной з прапанаваных сітуацый (на выбар).

а) Вам трэба ўзяць у бібліятэцы неабходныя для напісання паведамлення (рэферата) кнігі;

б) вам трэба патэлефанаваць сябру / сяброўцы, каб даведацца, што новага адбылося ў класе, пакуль вы хварэлі / ездзілі на спаборніцтвы і г. д.;

в) вам трэба запрасіць знакамітага земляка (ветэрана вайны / працы, пісьменніка, касманаўта і г. д.) на сустрэчу, якую арганізуе ваш клас.

§ 2–4

Правообладатель Национальный институт образования

Тэкст

§ 3. Тэкст як адзінка мовы і маўлення. Прыметы тэксту

Тэкст (ад лац. *textus* — тканіна, сувязь, пабудова) — звязнае і адносна завершанае выказванне на пэўную тэму, якое складаецца з групы сказаў, аб'яднаных сэнсам і граматычна.

Тэкст належыць як да моўнай сістэмы, так і да камунікатыўнай. Таму, з аднаго боку, ён характарызуецца, як і кожная моўная адзінка, на граматыка-семантычным узроўні (спосабы і сродкі сувязі, структура), а з другога — залежыць ад канкрэтнай сітуацыі маўлення, накіраваны на вырашэнне пэўнай камунікатыўнай задачы (абмен думкамі, паведамленне, уздзеянне).

24. Устанавіце адпаведнасць паміж асноўнымі прыметамі тэксту і іх характарыстыкамі (запішыце лічбы і літары, напрыклад, 1Б). Раскажыце аб прыметах тэксту.

Асноўныя прыметы тэксту		Характарыстыка прымет тэксту	
1	Тэматычнае адзінства	А	Забяспечвае сувязь паміж сказамі тэксту з дапамогай паслядоўнага ці паралельнага спосабу сувязі
2	Звязнасць	Б	Наяўнасць тэмы (прадмет маўлення) і асноўнай думкі (тое, пра што хацеў сказаць, што хацеў растлумачыць аўтар, у чым хацеў пераканаць)
3	Сэнсавая цэласнасць	В	Тэма тэксту цалкам раскрыта, задача вырашана (з пазіцыі аўтара)
4	Паслядоўнасць	Г	Ствараецца з дапамогай падтэм (забяспечваюць шырыню ахопу тэмы) і мікратэм (забяспечваюць глыбіню раскрыцця тэмы)
5	Разгорнутасць	Д	Усе сказы ў тэксце звязаны паміж сабой па сэнсе
6	Завершанасць	Е	Праяўляецца ў тым, што элементы зместу размяшчаюцца ў тэксце ў пэўным парадку, пэўнай паслядоўнасці, па пэўнай схеме, што складае кампазіцыю тэксту

Правообладатель Национальный институт образования

25. Прачытайце. Дакажыце, што перад вамі тэкст, вызначыўшы яго асноўныя прыметы.

Маўчанне — золата

Пустаслоўе — гэта грэшная справа, якая вядзе да ліха.

Напэўна, вы заўважалі, што адны людзі гавораць больш, а другія менш. Між тым, аматар пагаварыць нярэдка аказваецца не надта разумным, і добра, калі здараецца, што гэта не так.

А людзі разумныя, як правіла, нешматслоўныя. Мудры чалавек заўжды застаецца гаспадаром свайго языка і «развязвае» яго толькі тады, калі сам гэтага захоча, калі яму сапраўды ёсць што сказаць іншым. А вось у чалавека балбатлівага, як народ заўважыў, язык спрытнейшы за розум. Балбатун шмат чаго можа наплесці на шкоду і сабе, і каму заўгодна. Ён калі не знаходзіць лепшага матэрыялу для свайго несупыннага балбатання, то вярзе абы-што на знаёмых і сяброў, выплёсквае свае і іх таямніцы, а разам з тым — і выдумкі, і розную хлусню...

Вось таму маўчанне — гэта золата. Прыродна гаваркі[с] чалавек павінен стараццa, каб хоць палову часу свайго маўлення выкарыстоўваць для роздуму. Тады ўсім будзе цікавей і лепш.

З іншага боку, не варта быць і залішне маўклівым. Тых, хто замала[сл] гаворыць, называюць скептычна маўчатолагамі. Гэта значыць, выказваюць падазрэнне, што яны такім чынам імкнуцца выглядаць надта разумнымі ды важнымі. Мы ад прыроды атрымалі дзівосны дар маўлення. Прычым толькі мы, людзі. Таму нядобра, калі сваім упартым маўчаннем набліжаемся да істот, якія гэтага дару не маюць. Хто без патрэбы маўчыць, той нібыта адмаўляецца ад сяброўства з навакольным светам. А гэта нядобра *(Паводле М. Булатавіч)*.

Як аўтар абгрунтоўвае думку, што «маўчанне — золата»?

Прывядзіце прыклады ўстойлівых выразаў (фразеалагізмаў) з тэксту. Растлумачце іх. Як вы разумееце сэнс прыказкі «Слова — серабро, а маўчанне — золата»?

- Прывядзіце з тэксту прыклады прыслоўяў у форме пэўнай ступені параўнання. Абгрунтуйце сваё меркаванне.

Уявіце, што вы сталі сведкам якой-небудзь непрыгляднай падзеі, парушэння правіл грамадскага парадку або правоў чалавека. Ці можна ў такіх выпадках прытрымлівацца народнай мудрасці «маўчанне — золата»? Калі, на вашу думку, маўчанне — золата, а калі гэта не так?

Правообладатель Национальный институт образования

26. Прачытайце верш. Сфармулюйце яго тэму і асноўную думку. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку?

Наконт серабра і золата

Б'е пад рабро
Прыказка молатам:
Слова — серабро,
Маўчанне — золата!

А ці не наадварот
У любую пару́:
Замкнёны рот —
Памінкі серабру!..

Ваюй за дабро,
І станеш волатам[л]:
Маўчанне — серабро,
Слова — золата!..

А. Лойка.

Як аўтар пераасэнсоўвае прыказку і чым абгрунтоўвае сваю думку? Ці згодны вы з ім?

27. Размясціце сказы так, каб атрымаўся тэкст. Запішыце яго.

Вярбовы парастак

(японская народная казка)

Паклікаў ён слугу і сказаў: «Даглядай добра парастак, сачы, каб суседскія[ф] дзеці яго не вырвалі». Але трэба было яму на тыдзень з'ехаць. Гаспадар пасадзіў вярбовы парастак, паліваў яго кожны дзень. «Добра», — адказаў слуга.

Праз тыдзень гаспадар вярнуўся. Парастак быў зусім вя́лы. «Я з парастка вачэй не зводзіў, — адказаў яму слуга. — З ранку да самага вечара глядзеў на яго. А калі цямнела, вырываў, заносіў у дом і зачыняў у шуфлядзе». «Ты не паліваў яго?» — раззлаваўся гаспадар.

Якая з прыведзеных прыказак, з вашага пункту гледжання, найбольш дакладна перадае асноўную думку тэксту? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

1. Што галава, то і розум.
2. З-за дурной галавы нагам няма спакою.
3. Людзей слухай, а свой розум май.
4. Усё знай, ды не ўсё бай.

Вызначце спосаб сувязі сказаў у тэксце казкі пра парастак. Ахарактарызуйце сродкі сувязі, якія дазволілі вам правільна размясціць сказы.

Раскажыце (пры неабходнасці карыстаючыся прыведзенай на с. 20 схемай) пра спосабы і сродкі сувязі сказаў у тэксце.

Правообладатель Национальный институт образования



28. Прачытайце. Ці можна назваць прыведзеныя сказы тэкстам? Сваю думку абгрунтуйце.

Наступіла зіма. Яна ў гэтым годзе прыйшла разам з яркім сонцам і цёплым ветрам. Вецер мацнеў, ён шкуматаў людзей за вопратку, зрываў з галоў шапкі і капелюшы. Капелюшы розных памераў і фасонаў можна набыць на другім паверсе самага вялікага ў горадзе магазіна галаўных убораў. Яны маюць розны колер, памер і выкарыстоўваюцца для прафілактыкі захворванняў вуха, горла, носа. Гэтыя органы пачуццяў перадаюць стаўленне людзей адзін да аднаго, а таксама да навакольнага свету. «Свет не без добрых людзей», — сцвярджае народная мудрасць.

29. Прачытайце назву пісьмовага выказвання. Як вы думаеце, пра што пойдзе ў ім размова? Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку?

Прачытайце само выказванне. Вызначце, якая з прымет тэксту ў ім адсутнічае. Абгрунтуйце сваю думку.

Вышыня

Мяркуючы па ўспамінах маці, мне ішоў ча*(ц/т)*вёрты год. Я цяжка перахварэў на адзёр*. Калі ачуняў, м..не выпусцілі з хаты ў двор.

Узлезці па баране можна вунь куды — па*(т/д)* самую страху хлява. Пале*(з/с)*. А барана, як жывая, адарвалася ад сцяны і кульнулася з верхалазам у снег. Не ўдарыўся. Але як выле*(з/с)*ці *(з)*пад бараны? Клікаць на дапамогу? Не. Ёсць жа і ў малога гонар! Ды і баяўся. Добра, калі выйдзе маці ці бабуля. А калі дзед Міначка?

Правообладатель Национальный институт образования

Каля хлява стаяла барана́ зубамі да сц..ны. Але якая ж добрая лесвіца! І якая вышыня! А ўсіх нас не толькі ў маленстве, але і ў сталым *(у/ў)*зросце цягне ў вышыню — *(у/ў)*неба. *(Не/ня)*дарэмна людзі пал..целі ў космас.

Доўга я грэбаўся ў снезе — выбіраўся *(з)*пад бараны. Выбраўся. Сам. І ад таго адчуў сябе пераможцам, героем, як бы за колькі хвілін падрос. І вынес перакананне: калі добра пастарацца, то можна і самому выбрацца з бяды.[сн] Невялікай. Але калі бяда вялікая, то кліч на падмогу людзей. Людзі памогуць.

Стаяла снежная зіма. Здаецца, што ў маленстве ўсе зімы былі снежныя. Дзень быў сонечны. Снег іскрыўся, сляпіў вочы. І ўвесь свет пасля хваробы ўяўляўся абноўленым, прыгажэйшым. Але чым заняцца малому? *(Паводле І. Шамякіна).*

Аднавіце вусна паслядоўнасць частак выказвання, каб атрымаўся тэкст. Запішыце тую частку, якая адпавядае малюнку. Раскрыйце дужкі, устаўце прапушчаныя літары. Абгрунтуйце іншыя напісанні слоў у тэксце.

30. Прачытайце. Дапоўніце выказванне, каб яно адпавядала ўсім прыметам тэксту.

Рэдкі чалавек цалкам задаволены сваёй знешнасцю. Камусьці не падабаецца колер валасоў ці скуры, а кагосьці раздражняюць вяснушкі ці кудзе́ркі*. Нехта лічыць, што яму ці ёй трэба неадкладна пахудзець...

§ 4. Апісанне, апавяданне, разважанне як функцыянальныя тыпы маўлення

31. Прачытайце тэксты. Абгрунтуйце іх прыналежнасць да аднаго з тыпаў маўлення (апавяданне, апісанне, разважанне).

І. Мы прызвычаіліся, што помнікі ставяцца з нагоды пэўных гістарычных падзей, у гонар знакамітых людзей і іх дасягненняў. Але ёсць выпадкі, калі помнік можа быць узведзены і нашаму сучаснiку. Прычым не толькі жывой асобе. Ёсць у Беларусі, у слаўным горадзе Полацку, калысцы беларускай дзяржаўнасці, незвычайны

Правообладатель Национальный институт образования

помнік літары беларускага алфавіта «Ў». Гэта даніна павагі нашай Бацькаўшчыне, яе гісторыі, культуры. Мова — той стрыжань, на якім трымаецца наша існасць, тое, што адрознівае нас ад іншых народаў. Літара «Ў» — адметны сімвал нашай мовы, які вызначае яе непаўторнасць. Гэта літара — таксама наша культурная спадчына. Прычым спадчына жывая *(Паводле А. Бяганскага)*.

II. Помнік літары «Ў» у Полацку ўстаноўлены ў 2003 годзе. Аўтар помніка — беларускі мастак з Полацка Ігар Куржалаў. На гранітнай аснове манумента знаходзіцца круглая пліта з выразаным сімвалам, пералікам алфавіта ў правай частцы і цытатай «Ад Еўфрасінні, ад Скарыны, ад Полацка пачаўся свет» з творчасці Рыгора Барадуліна ў левай частцы. Грані стэлы* ўяўляюць малюнак знешняга выгляду літары, паказваюць яе месца ў беларускім алфавіце, а таксама дэманструюць словы, якія найбольш часта выкарыстоўваюцца з гэтым графічным элементам.

Помнік выклікае цікавасць не толькі ў беларускіх, але і ў замежных турыстаў, якія пакідаюць пра яго шматлікія захопленыя водгукі на інтэрнэт-парталах *(Паводле матэрыялаў сайта www.vetliva.by)*.

III. У той дзень настаўніца сказала вучням выканаць заданне самастойна. Сама хадзіла па класе, заглядвала ў сшыткі і дапамагала кожнаму індывідуальна. Алене, якая нядаўна пераехала з Украіны да сваякоў у невялікі гарадок на Магілёўшчыне, яна прапанавала выправіць памылку. «У выразе “мы ўбачылі новыя будынкі” ў слове “ўбачылі” трэба пісаць “ў” (кароткае)», — падказала яна Алене. Узяла Алена гумку, падцерла хвосцік, укараціла яго і далей стала выконваць практыкаванне. Праз нейкі час настаўніца паўтарыла сваю заўвагу. Алена ўкараціла хвосцік у літары «ў» яшчэ больш. У канцы ўрока настаўніца не вытрымала: «Колькі можна казаць, што ў гэтым слове трэба пісаць “ў” (кароткае)». Алена заўсёды была паслухмянай, але зараз не стрымалася: «Я ўжо два разы ўкарочвала хвосцік у літары “ў”, яна ўжо стала падобнай да літары “ц”, больш не магу яе ўкараціць».

Вучні дружна засмяяліся, а Алена заплакала *(Паводле А. Плаўскай)*.

Пабудуйце тыповыя кампазіцыйныя схемы кожнага з тыпаў маўлення.

- Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай.
- Прывядзіце з тэксту III пяць прыкладаў слоў, у якіх напісанне і вымаўленне не супадаюць.

Правообладатель Национальный институт образования

32. Прачытайце тэкст. Вызначце тып маўлення, абгрунтуйце сваю думку.

У 2016 годзе помнік літары «Ў» у Полацку быў адноўлены. Многія знешнія асаблівасці захаваліся, аднак у цэлым ён сур'ёзна змяніўся. На адной з бакавых граняў стэлы цяпер змешчана цытата Р. Барадуліна «Ад Еўфрасінні, ад Скарыны, ад Полацка пачаўся свет» з указаннем імя яе аўтара. Унутры літары «С» можна адрозніць знак Ф. Скарыны. Сімвал складаецца з месяца і сонца, якія перакрываюць адно аднаго.

На другой грані стэлы знаходзіцца літара «Ў», напісаная[м] курсівам. Над ёй — беларускія словы, у якіх пішацца гэта літара, сярод якіх ёсць[ф] *настаўнік, Еўфрасіння, слоўнік, Браслаў, дзеяслоў* і некаторыя іншыя.

Паколькі *(?)*эта літара алфавіта з*(?)*яўляецца адметнас*(?)*цю беларускай мовы, з часам яна стала сімвалам ц..лай краіны. Як сцв..рджаюць некаторыя мастацтвазнаўцы, яна перадае спецыфіку нацы..нальнай трад..цыі непа..торнасць гістар..чнага і культурнага шлях.. народ.. *(Паводле матэрыялаў сайта www.vetliva.by).*

Знайдзіце ў тэкстах практыкаванняў 31 (II) і 32 сказы, якія адпавядаюць кожнаму з фотаздымкаў. Зачытайце іх.

Ці згодны вы з меркаваннем, што літара «ў» «стала сімвалам цэлай краіны»? Выкарыстоўваючы фотаздымкі і матэрыялы практыкаванняў 31 і 32, раскажыце, якім быў і як выглядае цяпер помнік літары «Ў» у Полацку.

Запішыце апошні абзац тэксту, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і ставячы неабходныя знакі прыпынку. Абгрунтуйце правапіс.

- Дапоўніце спіс слоў, у якіх пішацца літара «ў» і якія могуць быць змешчаны на другой грані стэлы. Знайдзіце ў інтэрнэце фотаздымак гэтай часткі помніка, зверце прыведзеныя на ім словы са складзеным вамі спісам, выявіце супадзенні. Як вы думаеце, чаму менавіта гэтыя словы напісаны на помніку?

33. Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму і асноўную думку.

Непрывычна высокі бераг.

На самым краёчку — невялікае агнішча*.

Хто і калі супыняўся тут? Чыю душу саграваля кволае цяпельца? Якія думы цешыў жывы агонь?

Правообладатель Национальный институт образования

Не ўведаю, відаць, ніколі.

За плячыма стогне пранізлівы вецер. Унізе раве і пеніцца растрывожаная Славечна. Па той бок ракі плача ваўчыца.

Робіцца вусцішна*. Іду да вербаў. Ля іхніх ног збіраю ламачынкі, леташняе лісце, зграбаю пажоўклую траву. І неўзабаве на старым агнішчы нараджаецца новае цяпельца.

Хутка мяне зноў пакліча дарога, і я пакіну гэты здзічэлы бераг. Засне цяпельца. Старое агнішча зраўняюць дажджы. Але мо нехта натрапіць на яго таксама. Супы́ніцца... Задумаецца: да Чарнобыля тое было ці пасля? І развядзе сваё цяпельца *(Я. Пархута)*.

Сімвалам чаго з'яўляецца ў тэксце вогнішча (знойдзенае на здзічэлым беразе старое агнішча — разведзенае новае цяпельца — вогнішча, якое можа развесці нехта ў будучыні)?

Што з'яўляецца асноўнай задачай тэксту:

а) апісанне прыроды;

б) апавяданне пра тое, як герой раскладваў вогнішча;

в) разважанне-боль пра пакінутыя людзьмі мясціны і адначасова надзея: як на месцы старога агнішча нараджаецца новае цяпельца, можа, некалі адродзіцца і само жыццё на гэтай зямлі?

Якія тыпы маўлення спалучаюцца ў тэксце? Як вы думаеце, які з іх з'яўляецца вядучым?

Назавіце моўныя сродкі з тэксту, характэрныя для апісання, апавядання, разважання.

Прааналізуйце схему. Падрыхтуйце паведамленне на яе аснове.

Сфармулюйце пасля аналізу схемы і запішыце вывад (у форме сцвярджэння-сказа) пра тое, наколькі Беларусь пацярпела ад чарнобыльскай катастрофы.

Раскажыце, што вы ведаеце пра чарнобыльскую трагедыю і як наша краіна перажыла яе наступствы.

Правообладатель Национальный институт образования

Звярніце ўвагу!

Асноўны тып маўлення вызначаецца ў адпаведнасці з камунікатыўнай задачай тэксту: паведаміць пра падзеі, з'явы, дзеянні (апавяданне), ахарактарызаваць прадмет ці з'яву (апісанне), выявіць пэўныя сувязі паміж прадметамі ці з'явамі (разважанне).

34. Складзіце тэкст-апавяданне, тэкст-апісанне і тэкст-разважанне, якія пачыналіся б з прапанаваных фраз.

1. Жылі-былі сябры, якія вельмі любілі падарожнічаць аўтастопам.
2. Прадаецца камп'ютар, які быў у карыстанні.
3. Народная мудрасць сцвярджае: «Чаго сабе не жадаеш, таго і іншым не зыч».

35. Разгледзьце малюнкі. Тэкст якога тыпу маўлення можна скласці на іх аснове? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

Складзіце выказванне адпаведнага тыпу маўлення на аснове малюнкаў.



36. Прачытайце. Тэксту якога тыпу маўлення адпавядаюць прыведзеныя пачатак і канцоўка? Пра што можа быць тэкст?

«Песня — душа народа», — сказаў збіральнік і прапагандыст беларускай народнай песні Рыгор Шырма.

…

Песня — гэта залатая скарбніца беларускай народнай культуры.

Складзіце тую частку тэксту, якой не хапае. Запішыце тэкст.

Правообладатель Национальный институт образования

37. Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Якія тыпы маўлення спалучаюцца ў ім? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

На працягу шматлікіх стагоддзяў беларусы трапятліва ставіліся да мудрасці і імкнуліся да пазнання. З ранніх часоў, калі многае вырашалася мячом і крывёй, людзі разумелі, што самая вялікая сіла — у ведах. Яркім прыкладам гэтаму стала Ефрасіння (Еўфрасіння) Полацкая, якая прысвяціла сваё жыццё служэнню Богу і асвеце людзей. Яе розум і пісьменнасць[с] былі ўнікальнымі для таго часу (у XII стагоддзі жанчыны былі пазбаўлены магчымасці атрымаць адукацыю).

Шляхетная князёўна была ўнучкай полацкага князя Усяслава Чарадзея[ф]. Магчымасць падарожнічаць дала яму веды і мудрасць, з якімі ён выхоўваў сваю ўнучку. У рукапісах ёсць сведчанні, што Ефрасіння, ці Прадслава, ужо ў юным узросце адрознівалася ад сваіх аднагодак жывым розумам і далікатным характарам. Калі бацькі вырашылі выдаць яе замуж, яна збегла ў манастыр, у Сафійскі сабор, што знаходзіцца ў Полацку. Прыняўшы пострыг і атрымаўшы імя Ефрасіння, яна цалкам прысвяціла сябе кнігам.

Заснаваны ёю жаночы манастыр стаў месцам, дзе манашкі займаліся іканапісам[сл], ткалі, навучаліся чытанню і пісьму, вялі летапісы. Паступова манастыр стаў цэнтрам адукацыі для ўсіх зямель Заходняй Русі. У сценах сабора захоўваліся зборы твораў славутых асветнікаў Кірыла і Мяфодзія, прапаведніка хрысціянства Іаана Залатавуста, «Аповесць мінулых гадоў».

Ефрасінняй уручную былі перапісаны не толькі царкоўныя кнігі, але і зборнікі афарызмаў, хронікі. Яна пісала і ўласныя працы — малітвы і павучанні, займалася перакладамі з лацінскай і грэчаскай моў.

У 1999 годзе ў Мінску каля Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта быў устаноўлены помнік Ефрасінні Полацкай, створаны таленавітым скульптарам Ігарам Голубевым *(Паводле матэрыялаў сайта www.vetliva.by)*.

У чым унікальнасць асобы Ефрасінні Полацкай?

Дакажыце, што заснаваны Ефрасінняй манастыр стаў цэнтрам адукацыі ў Заходняй Русі.

§ 4–1

Разгледзьце фотаздымак помніка на вокладцы вучэбнага дапаможніка. Раскажыце, якой паказаў скульптар беларускую асветніцу. Як вы думаеце, чаму яна трымае ў руках пяро і кнігу? Спалучыце ў сваім адказе элементы апісання і разважання.

Правообладатель Национальный институт образования

Культура маўлення

§ 5. Асноўныя якасці культуры маўлення. Правілы маўленчых паводзін. Маўленчы этыкет

Культура маўлення — гэта: 1) сістэма камунікатыўных якасцей маўлення; 2) уменне эфектыўна выкарыстоўваць моўныя сродкі ў канкрэтных маўленчых сітуацыях у адпаведнасці з літаратурнымі нормамі.

Асноўныя якасці культуры маўлення:

- **правільнасць** — адпаведнасць маўлення нормам літаратурнай мовы;
- **дакладнасць** — выкарыстанне слоў, фразеалагізмаў з уласцівым ім значэннем, адпаведнасць выказвання мэце і маўленчай сітуацыі;
- **лагічнасць** — паслядоўнасць выкладу думкі, сэнсавая несупярэчлівасць паміж ужытымі моўнымі адзінкамі і законамі логікі;
- **чысціня** — адсутнасць у маўленні нелітаратурных слоў і выразаў (жарганізмаў, слоў-паразітаў, беспадстаўна ўжытых дыялектных і запазычаных слоў);
- **дарэчнасць** — мэтазгоднасць выбару моўных сродкаў, іх адпаведнасць стылю, жанру, мэтам і ўмовам зносін;
- **багацце** — выкарыстанне разнастайных сінанімічных маўленчых сродкаў;
- **выразнасць** — эмацыянальнае ўздзеянне выказвання, выкарыстанне сродкаў, якія падтрымліваюць увагу і цікавасць чытачоў (слухачоў);
- **лаканічнасць** (сцісласць) маўлення — уменне адбіраць галоўнае, выключаць другаснае, пазбягаць непатрэбных падрабязнасцей.

Культура маўлення падразумявае веданне мовы, высокі ўзровень агульнай культуры чалавека, захаванне асноўных камунікатыўных якасцей маўлення, уменне выбраць найбольш дакладны, дарэчны, дасканалы варыянт.

Правообладатель Национальный институт образования

38. Прачытайце выказванні айчынных вучоных. Вусна раскажыце, чаму правільнасць выступае асновай культуры маўлення.

Маўленне правільнае, калі ў ім няма парушэння арфаэпічных, акцэнталагічных, словаўтваральных, марфалагічных, сінтаксічных, лексічных, фразеалагічных, прыказкавых норм. Асноўная ўмова правільнасці маўлення — добрае веданне названых[сл] норм літаратурнай мовы, а значыць, і ўмелае валоданне імі *(Паводле І. Лепешава)*.

Унармаванасць — сінонім правільнасці — найважнейшая[м] ўласцівасць літаратурнай мовы *(А. Міхневіч)*.

Менавіта правільнасць маўлення забяспечвае яго адзінства, агульназразумеласць інфармацыі, якая[ф] перадаецца і ўспрымаецца. Правільнасць заключаецца ў адпаведнасці маўлення тым законам і правілам, якія дзейнічаюць у мове *(Паводле Т. Тамашэвіча)*.

Правільнасць маўлення — аснова, якая дае магчымасць асобе пастаянна ўдасканальваць сваё маўленчае майстэрства.[сн] Правільнасць маўлення падразумявае строгае захаванне літаратурных норм, мэтазгоднасць[сл] выкарыстання тых або іншых моўных адзінак у працэсе зносін *(Паводле І. Навасельцавай)*.

Запішыце выказванне, якое, на вашу думку, найбольш дакладна, поўна акрэслівае правільнасць як асноўную якасць культуры маўлення. Падкрэсліце граматычныя асновы, дайце агульную характарыстыку сказам.

- Растлумачце пастаноўку працяжніка ў прыведзеных выказваннях.

39. Прачытайце. Растлумачце выдзеленыя тэрміны.

Арталогія — навука аб правільным маўленні — служыць адной мэце: дапамагчы асэнсаваць факты **мовы**, падкрэсліць ролю **моўцы**, навучыць свядома ставіцца да ўласнага **маўлення**. Тры гэтыя аспекты аналізу ўтвараюць паняцце **культура мовы**.

Пэўны час выраз «культура мовы» меў і значэнне ‘культура мовы як грамадская з’ява’, і значэнне ‘культура мовы асобнага чалавека — з’ява індывідуальная’. Аднак паняцці мова і маўленне размяжоўваюцца. Параўн.: ням. *Sprache* і *Rede*, англ. *language* і *speech*, франц. *langue* і *parole*, укр. *мова* і *мовлення*, руск. *язык* і *речь*, польск. *język* і *mova* і г. д.

Культура маўлення — гэта ўменне асобы выбіраць з сістэмы мовы тыя сродкі, якія робяць уласнае маўленне з’явай[ф] высокай культуры[сн] *(А. Міхневіч)*.

Правообладатель Национальный институт образования

Патлумачце розніцу паміж тэрмінамі *мова* і *маўленне*.

Растлумачце выраз з тэксту «свядома ставіцца да ўласнага маўлення». Ці ставіцеся вы свядома да свайго маўлення? Адказ аргументуйце.

- Растлумачце пастаноўку коскі або яе адсутнасць перад злучнікам ***і*** ў тэксце практыкавання.
- Запішыце прыклад да правіла «Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам».

40. Прачытайце. Запішыце азначэнні асноўных камунікатыўных якасцей маўлення па-беларуску.

Чистая речь — это речь, в которой отсутствует любая нелитературная лексика: слова-паразиты, грубые, жаргонные, нецензурные выражения и т. д. Эти слова засоряют речь, их чрезмерное употребление говорит о низкой речевой культуре.

Богатство речи связано с активным словарным запасом человека. Чем разнообразнее речь, тем она богаче. Богатая речь отличается многообразием на всех уровнях языка, она подразумевает и лексическое богатство, и синтаксическое, и интонационное.

Уместность речи — это соответствие высказывания конкретной ситуации. Уместная речь — это такая речь, в которой учитывается, что говорит автор, кому он это говорит, где, когда и как долго *(Н. Кузнецова)*.

Разгледзьце фотаздымак. Як вы лічыце, развіццю якой з названых камунікатыўных якасцей маўлення павінны паспрыяць беларускамоўныя білборды? Ці бачылі вы падобныя білборды на вуліцах свайго населенага пункта? Які з іх вам найбольш запомніўся? Чаму?

41. З дапамогай матэрыялу параграфа падрыхтуйце выказванне на тэму «Асноўныя якасці культуры маўлення». Карыстайцеся наступнай схемай.



Правообладатель Национальный институт образования

42. Перагледзьце (у бібліятэцы або ў электронным варыянце) часопісы «Беларуская мова і літаратура», «Роднае слова», «Маладосць», «Полымя» за апошнія гады. Раскажыце пра змест публікацый, прысвечаных культуры беларускага маўлення. Складзіце тэзісы па матэрыялах адной з публікацый (на выбар).

43. Прачытайце. Растлумачце значэнне прыведзеных паронімаў, запішыце словазлучэнні (сказы) з імі. Як звязана паранімія з дакладнасцю маўлення? Карыстайцеся тлумачальнымі слоўнікамі або «Слоўнікам паронімаў беларускай мовы» С. Грабчыкава.

Абагуліць — абагульніць, абанент — абанемент, адрасат — адрасант, бескарыслівы — бескарысны, выхаванец — выхавальнік, метэарыт — метэор, моўны — маўленчы, падаўжэнне — падваенне, публічны — публіцыстычны, цікавы — цікаўны, чалавечы — чалавечны, частотны — часты, эфектны — эфектыўны.

44. Дапоўніце сказы, карыстаючыся словазлучэннямі для даведкі.

1. ... вызначаюць аднастайнае вымаўленне гукаў і іх спалучэнняў у словах. 2. ... прадугледжваюць правільную пастаноўку націску. 3. ... акрэсліваюць правілы перадачы на пісьме вуснага маўлення (узаконьваюцца ўрадавымі пастановамі). 4. ... патрабуюць правільнага ўжывання слоў ва ўласцівых ім значэннях, засведчаных слоўнікамі, правільнага сэнсавага спалучэння слоў. 5. ... вызначаюць ужыванне форм слоў. 6. ... вызначаюць асаблівасці спалучэнняў слоў у словазлучэннях і сказах. 7. ... забяспечваюць правільнае выкарыстанне моўных сродкаў у адпаведнасці са стылем маўлення, зместам, формай і мэтай паведамлення, характарам зносін. 8. ... патрабуюць правільнай расстаноўкі знакаў прыпынку.

Для даведкі: *пунктуацыйныя нормы, марфалагічныя нормы, арфаэпічныя нормы, сінтаксічныя нормы, акцэнталагічныя нормы, арфаграфічныя нормы, стылістычныя нормы, лексічныя нормы.*

- Запішыце азначэнні, пабудаваныя як просты ўскладнены сказ. Зрабіце іх сінтаксічны разбор.

Раскажыце, у якіх слоўніках, даведніках зафіксаваны арфаэпічныя, акцэнталагічныя, арфаграфічныя, лексічныя і марфалагічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Правообладатель Национальный институт образования

45. Сцісла перакажыце тэкст па-беларуску. Дайце загаловак у адпаведнасці са стылем тэксту.

Языковые нормы не выдумываются учёными. Они отражают закономерные процессы и явления, которые происходят в **языке** и поддерживаются речевой практикой. К основным источникам языковой нормы относятся произведения писателей-классиков и современных писателей, средства массовой информации, общепринятое современное употребление, данные живого и анкетного опросов, научные исследования учёных-языковедов.

Литературная норма зависит от условий, в которых осуществляется **речь**. Языковые средства, уместные в одной ситуации (бытовое общение), могут оказаться нелепыми в другой (официально-деловое общение). Норма не делит средства языка на хорошие и плохие, а указывает их коммуникативную целесообразность *(Л. Введенская, П. Червинский)*.

Растлумачце значэнне выдзеленых тэрмінаў.

- Назавіце складаныя сказы ў рускамоўным тэксце.

§ 5–1

§ 5–2

§ 5–3

46. Прачытайце. Паразважайце над пытаннямі, сфармуляванымі аўтарам. Свае развагі запішыце на беларускай мове як звязнае выказванне.

Нужна ли вообще новым поколениям культура речи? Некоторые молодые люди утверждают, что классического русского языка для молодёжи не существует, что не нужно следовать литературным нормам. Ряд исследований, проведённых учёными-филологами, касающихся анализа текстов современной литературы и языка СМИ, позволяет сделать вывод о том, как сильно влияние на молодёжь жаргонной лексики. Нужно ли в этих условиях сохранять классический русский язык? Что это — игра или определённая тенденция, которую следует принимать серьёзно?

В своей среде вы, возможно, общаетесь на сленге, но когда приходите в класс, в театр, магазин, вы говорите на том самом русском литературном языке, которому вас учат в школе. И если вы пойдёте на работу или будете поступать в вуз, или поедете в другой город, захотите прочитать книгу, посмотреть фильм, — вам нужен будет именно тот нормативный язык, который представляется таким скучным и требующим изучения.

Согласны ли вы с тем, что воспитывать языковую культуру необходимо с детства? Можно ли в детских передачах, фильмах, мультфильмах допускать, чтобы их герои говорили неправильно? Взрослые-то

Правообладатель Национальный институт образования

понимают, что сленг в этих передачах употребляется для «смеха и прикола», но в состоянии ли ребенок определить, что правильно, а что «для смеха»? *(По Н. Кузнецовой).*

- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў створаным вамі тэксце.

Маўленчы этыкет — сістэма правіл маўленчых паводзін, якія выкарыстоўваюцца ў тыповых сітуацыях зносін (знаёмства, зварот, сустрэча, развітанне, падзяка і інш.). Маўленчыя этыкетныя формулы выступаюць як форма выражэння ветлівасці, паважлівых, добразычлівых адносін да субяседніка. Правілы маўленчага этыкету маюць нацыянальны, адметны характар, яны абавязковыя для членаў грамадства. Пры ўжыванні формул ветлівасці трэба ўлічваць іх гістарычную зменлівасць. Так, пры звароце да слухачоў у розныя перыяды развіцця грамадства ўжываліся наступныя маўленчыя формулы: *таварышы, грамадзяне, грамада, панове, спадарства.*

Веданне і дарэчнае выкарыстанне правіл маўленчага этыкету выяўляе ўзровень агульнай культуры асобы, яе інтэлігентнасць, выхаванасць.

47. Прачытайце тэкст. Пісьмова тэзісна перадайце яго змест, выкарыстоўваючы беларускія маўленчыя формулы этыкету.

Маўленчы этыкет — з'ява ўніверсальная, аднак у той жа час кожны народ склаў сваю, адмысловую сістэму правіл маўленчых паводзін.[сн] Так, калі ў Расіі пры сустрэчы абменьваюцца пажаданнем быць здаровым — *Здравствуйте!*, то ў Германіі, згодна з этыкетам, да 12 гадзін дня жадаюць *добрай раніцы*, з 12 да 17 — *добрага дня*, а далей — *добрага вечара*, але могуць абмежавацца і звычайным прывітаннем. У большасці еўрапейскіх краін і ў Амерыцы прывітанне ўтрымлівае пытанне: *Як справы?* У адказ атрымліваюць: *Добра* ці *Нармальна*, а затым задаецца аналагічнае сустрэчнае пытанне, пры гэтым не прынята адказваць, што справы дрэнныя. Беларусы ўжываюць наступныя прывітанні і развітанні: *Дзень добры!, Добры вечар!, Дабранач!* (апошняе выкарыстоўваецца і як развітанне на ноч, і як пажаданне, аналагічнае рускаму *Спокойной ночи!*), *Добрага ранку!, Да пабачэння!* (пры жаданні новай сустрэчы), *Бывай(це)!* (руск. *Прощай(те)!*), *Бывай здароў! (Здаровенька!), Будзь(ма)!* (у любой сітуацыі), *Жадаю (зычу) усяго найлепшага!*

Правообладатель Национальный институт образования

У нашай краіне, у сітуацыі руска-беларускага двухмоўя, трэба ў аднолькавай ступені валодаць як беларускімі, так і рускімі этыкетнымі маўленчымі нормамі. Пры гэтым неабходна ўлічваць, што аднолькавыя камунікатыўныя намеры ў рускай і беларускай мовах могуць выражацца па-рознаму. Напрыклад, беларуск. *Дазвольце пазнаёміць Вас з...* і руск. *Позвольте представить Вам...* (знаёмства); беларуск. *Зрабіце ласку* і руск. *Сделайте одолжение* (як спроба звярнуць увагу); беларуск. *Сардэчна запрашаем* і руск. *Добро пожаловать* (прывітанне-запрашэнне); беларуск. *Так, безумоўна* і руск. *Да, конечно* (згода); беларуск. *Вельмі ўдзячны, Шчыра дзякую Вам* і руск. *Большое спасибо, Искренне благодарю Вас* (падзяка); беларуск. *На жаль, Вы памыляецеся (Вы не маеце рацыі)* і руск. *К сожалению, вы ошибаетесь (Вы не правы)* (нязгода) *(І. Навасельцава)*.

Чаму, на вашу думку, на пытанне «Як справы?» звычайна адказваюць: «Добра», «Нармальна»?

● Выпішыце з тэксту прыклады, што ілюструюць арфаграму «Правапіс суфіксаў дзеясловаў».

Падбярыце і запішыце сінонімы да прыметнікаў з першага сказа. Растлумачце, чаму не варта шукаць сінонімы да слова *маўленчы*. Зрабіце марфалагічны разбор аднаго з прыметнікаў.

48. Прачытайце віншаванні з нагоды юбілею часопіса «Роднае слова». Прасачыце, як праз віншавальны тэкст выяўляецца моўная асоба, яе творчасць, далікатнасць, арыгінальнасць, духоўнасць.

Шчыра, па-сяброўску зычым Вам натхнення і радасці, светлай любові, плённай працы і вернай службы на карысць Беларусі, роднай зямлі. Няхай і наступныя гады́ прынясуць нам усім[м] жаданае ўзаемаразуменне і азораць ім далейшы шлях да міру і згоды.[сн]

***

Да такой прыгожай даты хочацца знайсці незвычайныя словы. Дзякуй за тое, што побач з Вамі зноў і зноў зачароўваешся[ф] родным словам. Спадзяёмся[с], што яшчэ доўгія гады мы будзем мець магчымасць вучыцца ў Вас любові да роднага слова.

***

Нам дарагі Ваш шчыры і добры талент служыць Слову, людзям.[сн] Не стамляйцеся быць чалавечнымі!

Падрыхтуйце тэкст віншавальнай паштоўкі ў дзень нараджэння для маці (бацькі, бабулі, дзядулі, сястрычкі, браціка). Знайдзіце дарагія, кранальныя словы, пастарайцеся выказаць сваю любоў і пяшчоту да родных людзей.

Правообладатель Национальный институт образования

49. Прачытайце. Раскажыце пра структуру віншавальнага тэксту. Ці варта, на вашу думку, адступаць ад прапанаванай структуры віншавання? Ці перашкаджае аўтару ўстойлівасць формул выявіць сваю арыгінальнасць, творчасць?

Віншаванне складаецца з некалькіх абавязковых частак: (1) прывітальная формула, (2) віншавальная частка, (3) пажадальная частка, (4) подпіс.

Віншавальная частка, як правіла, утрымлівае тры кампаненты: *адрасант — адрасат — падстава (матыў віншавання)*. Кожны з кампанентаў мадэлі можа апускацца ў канкрэтнай сітуацыі маўленчых зносін. Параўнаем: *Віншую Вас (цябе) з Новым годам (са святам(і), з блізкімі святамі)! Віншую Вас (цябе)! Віншую са святам! Віншую! Мае віншаванні!*

Пажадальная частка віншавання таксама складаецца з трох кампанентаў: *адрасант — адрасат — змест пажадання*. Найбольш прадуктыўныя ў сучаснай маўленчай практыцы наступныя формулы:

Найлепшыя святочныя пажаданні! Самыя добрыя пажаданні здароўя, настрою, плёну! Шчаслівага свята! Вясёлых, здаровых і шчаслівых свят і ўсяго новага года! Усяго самага добрага, радаснага і светлага! Добрага здароўя! Сямейнага дабрабыту! Здзяйснення ўсіх жаданняў, мар, спадзяванняў, планаў! Спакою! Дабра! Кветак! Кахання! Радасці! Усмешак! Хай Новы год будзе лепшы, прынясе шмат радасці! Хай Новы год прынясе Вам новыя надзеі і спаўненне ўсіх мар! Няхай Вас заўсёды акружаюць блізкія і любімыя людзі! (Паводле С. Важніка).

Запішыце маўленчыя формулы, якія вам хацелася б скарыстаць у віншавальнай і пажадальнай частках.

Складзіце тэкст віншавальнай паштоўкі родным (блізкім, знаёмым) да свята, якое найбольш шануецца ў вашай сям'і.

50. Прачытайце. Запішыце прыказкі, якіх вы раней не чулі. Раскажыце, якія правілы маўленчага этыкету адлюстраваны ў народных выслоўях. З дапамогай якіх моўных сродкаў ствараецца сітуацыя далікатнасці, ветлівасці, уважлівасці да суразмоўцы?

1. Без'языкага за адваката не бяруць. 2. Вы́казанага слова да губы не вернеш. 3. Добрая слава ў кошыку ляжыць, а благая па дарожцы бяжыць. 4. За доўгі язык не пахваляць. 5. Конь вырвецца — дагоніш і зловіш, а слова вырвецца — не зловіш. 6. Рана загоіцца, а злое слова — ніколі. 7. Слухай многа, а гавары мала. 8. Дрэннае слова і салодкім мёдам не заясі.

Правообладатель Национальный институт образования

Арфаэпічныя нормы

§ 0–6

§ 6. Вымаўленне галосных і зычных гукаў, некаторых спалучэнняў зычных

Арфаэпічныя нормы вызначаюць узорнае вымаўленне галосных і зычных гукаў і іх спалучэнняў у літаратурнай мове.

Асноўныя нормы вымаўлення галосных гукаў

1. Аканне — вымаўленне гука [а] замест [о], [э] пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных у ненаціскных складах: *шэпт — шаптаць, жэмчуг — жамчужына*. Аканне назіраецца ў тым ліку ў запазычаных назоўніках, што заканчваюцца на ***-аль, -ар*** *(шніцаль, камп'ютар)*, аднак ва ўласных назоўніках захоўваецца [э]: *Потэр, Юпітэр*. У даўно запазычаных словах на месцы [э] вымаўляецца і пішацца ***ы***: *цырымонія, інжынер, канцылярыя*.

Не падпарадкоўваюцца аканню словы са спалучэннямі ***ро***, ***ло***, якія чаргуюцца з ***ры***, ***лы***: *кроў — крывяносны, глотка — глыток*.

2. Яканне — вымаўленне [о], [э] пасля мяккіх зычных як [а] ў першым складзе перад націскам (на пісьме абазначаецца літарай ***я***): *цёмны — цямнець, сем — сямнаццаць*. У запазычаных словах і пасля ***г, к, х*** яканне адсутнічае: *метро, легенда, геральдыка, кефір*. Даўно запазычаныя словы падпарадкоўваюцца яканню: *каляндар, сяржант*.

Часціца ***не***, прыназоўнік ***без***, калі стаяць перад словам з націскам на першым складзе, падпарадкоўваюцца ў вымаўленні закону якання: *без кветак* [б'аскв'э́так], *не будзе* [н'абу́дз'э], *без хлеба* [б'асхл'э́ба].

3. Вымаўленне галосных [і], [ы], [у] залежыць ад становішча ў слове:

- пасля галоснага, а таксама пасля зычнага пры раздзельным вымаўленні да гука [і] далучаецца [й]: *ра́*[йі]*ца*, *вераб*[йі́];
- у пачатку слова, калі папярэдняе слова заканчвецца на галосны, замест [і] можа вымаўляцца [й] або [йі]: *падысці* [дайва́на], *сястра* [й] *брат, яркая* [йі́]*скра*;

Правообладатель Национальный институт образования

- пасля цвёрдых зычных (апрача [г], [к], [х]) на стыку прыстаўкі і кораня, частак складаных слоў або двух самастойных слоў пры іх злітным вымаўленні замест [і] гучыць [ы]: *пед*[ы]*нстытут*, *сын* [ы] *брат* (а л е: *Віцебск* [і] *Полацк*, *смех* [і] *грэх*);
- ненаціскны галосны [у] пасля галоснага перад зычным у вымаўленні заўсёды замяняецца на [ў]: *каля* [ў]*шач*, *да* [ў]*ладзіміра*;
- націскны [і] вымаўляецца як [йі] ў пачатку слова (*з ім* [з'йім]), пасля галоснага (*краіна* [крайі́на]), пасля апострафа (*аб'інелы* [абйі́н'элы]), мяккага знака (*Ільіч* [іл'йі́ч]), пасля *ў* (*салаўі* [салаўйі́]).

51. Прачытайце наступныя спалучэнні згодна з правіламі літаратурнага вымаўлення. Патлумачце гэтыя правілы.

З Італіі, Гродна і Віцебск, Віцебск і Мінск, прыгожае імя, пры іх, нехта іншы, кніга і аловак, ён ідзе, яна ідзе, у сям'і, ён і яна, мама ішла.

52. Запішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Прачытайце словы ўголас. Якія правілы вымаўлення ілюструюцца падабранымі прыкладамі?

Ап..рэдзіць, ап..льсін, ап..ляцыя*, ап..кун, в..чэраць, в..чарэ́ць, в..чарына, вет..ран, вес..лейшы, в..с..луха, в..сёлка, г..раізм, г..ограф, дз..лавы, дз..вятка, дз..вочы, д..манстрацыя, зб..нтэжыцца, зв..ртацца.

53. Прачытайце табліцу. З яе дапамогай раскажыце пра вымаўленне зычных, іх спалучэнняў у беларускай мове.

Гукі, спалучэнні гукаў і літар	Вымаўленне	Прыклады
[г], [г']	Вымаўляецца працяжна, фрыкатыўна	гай [гай], герой [г'эро́й], гербарый [г'эрба́рый], горад [го́рат]
[ґ], [ґ']	Вымаўляецца як выбухны (як у рускай мове) у некаторых запазычаных словах	швагер [шва́ґ'эр], мазгі [мазґ'і́], агрэст [аґрэ́ст], ганак [ґа́нак], нягеглы* [н'аґ'э́ґлы], гонта* [ґо́нта], гарсэт* [ґарсэ́т], розгі [ро́зґ'і], бразгаць* [бра́зґац'], слізгаць [с'лі́зґац']

Правообладатель Национальный институт образования

Гукі, спалучэнні гукаў і літар	Вымаўленне	Прыклады
	Як выбухны вымаўляецца таксама ў сярэдзіне іншамоўных слоў перад звонкім зычным	анекдот [ан’эґдо́т], вакзал [ваґза́л], экзамен [эґза́м’эн], экзатычны [эґзаты́чны], экзэмпляр [эґзэмпл’а́р]
з, с, дз, ц	Свісцячыя гукі перад наступным мяккім (акрамя [г’], [к’], [х’]) вымаўляюцца мякка: [з’], [с’], [д͡з’], [ц’]	звер [з’в’эр], снег [с’н’эх], цвёрды [ц’в’о́рды], з’ява [з’йа́ва], Дзвіна [д͡з’в’іна́], а л е: сківіца [ск’і́в’іца], схільнасць [сх’і́л’нас’ц’], згінуць [зг’і́нуц’], схема [сх’э́ма], з хітрынкаю [сх’ітры́нкайу]
зж	[ж̄]	зжаўцець [ж̄аўц’э́ц’], з жаданнем [ж̄ада́н’эм], з жартам [ж̄а́ртам]
зш, сш	[ш̄]	з шумам [ш̄у́мам], расшыфраваць [раш̄ыфрава́ц’], бясшумна [б’аш̄у́мна]
шс	[с̄’]	смяешся [с’м’айэ́с̄’а], рыхтуешся [рыхту́йэс̄’а], дзівішся [д͡з’і́в’іс̄’а], здзекуешся [з’д͡з’э́куйэс̄’а]
жс, шс	[с]	Белавежская (пушча) [б’элав’э́скайа], чэшскае (шкло) [чэ́скайэ], Нясвіжскі (замак) [н’ас’в’і́ск’і]
чц	[ц̄]	у бочцы [убо́ц̄ы], у хустачцы [уху́стац̄ы]
дч, тч	[ч̄]	дасведчанасць [дас’в’э́ч̄анас’ц’], дыспетчар [дыс’п’э́ч̄ар]
дц, тц	[ц̄]	на вокладцы [навóклац̄ы], на градцы [награ́ц̄ы], у вопратцы [увóпрац̄ы], на кветцы [нак’в’э́ц̄ы]
дс, тс	[ц]	справаводства [справаво́цтва], гарадскі [гарацк’і́]
чн	[чн]	яечня [йайэ́чн’а], ручнік [ручн’і́к]

Правообладатель Национальный институт образования

54. Прачытайце. Зрабіце фанетычны запіс прапанаваных слоў.

Аб'інець, адказаць, барацьба, вераб'іны, выязджаць, грузчык, дакладчык, джынсы, дзвесце, дождж, жаніцьба, загадчык, збожжа, змешаны, ідзе, іскра, іхні, Навагрудчына, надвор'е, паснедаць, поспехі, просьба, разнесці, світаць, смелы, снег, спартзал, сшытак, сям'я, хаваешся, хвалюешся, цвёрды, чацвер, экзаменатар.

Назавіце агульнае і адрознае ў значэнні і паходжанні слоў *арфаэпія* і *арфаграфія*. Выканайце інтэрактыўнае заданне па тэме «Асіміляцыя зычных гукаў».

55. Прачытайце прыказкі. Выпішыце словы (спалучэнні слоў), у якіх вымаўленне не супадае з напісаннем. Карыстайцеся арфаэпічным слоўнікам беларускай мовы. Зрабіце фанетычны запіс слоў.

У з о р: *не зловіш* — [н'азло́в'іш].

1. Трэба розумам надтачыць, дзе сіла не возьме. 2. Ідучы па кладачцы, на бакі не глядзі. 3. Ідзі з людзьмі, то не згубішся. 4. Не смейся з людзей — смейся з сябе ці са сваіх дзяцей. 5. Не бойся звяглівага, а бойся куслівага. 6. Санлівага не дабудзішся, лянівага не дашлешся і не дажджэшся. 7. Пусці свінню пагрэцца, то і самому не будзе дзе дзецца. 8. Без хлеба яда — да парога хада́.

Запішыце па памяці 4-5 прыказак, вусна растлумачце іх сэнс.

56. Прачытайце. Сфармулюйце і сцісла запішыце асноўную думку кожнай часткі тэксту, а потым перакажыце яго.

Правільнае вымаўленне — істотны кампанент паняцця «культура вуснага маўлення». Існуюць адзіныя, абавязковыя для ўсіх носьбітаў[ф] мовы нормы літаратурнага вымаўлення, якія, аднак, нярэдка парушаюцца па розных прычынах.

Першая з іх — захаванне ў вымаўленні дыялектных рыс роднай гаворкі. У мастацкіх творах пісьменнікі нярэдка абгрунтавана выкарыстоўваюць такія фанетычныя дыялектызмы для маўленчай характарыстыкі персанажаў. Напрыклад, у рамане І. Мележа «Людзі на балоце» чытаем: *Ціхо ты, ціхо, Ганначко! Корч ездзіў у мясцечко па дохтара.*

Другой прычынай парушэння арфаэпічных норм, на думку лінгвіста А. Падлужнага, «з'яўляецца двухмоўная[сл] сітуацыя, пры якой

Правообладатель Национальный институт образования

адзін і той жа чалавек карыстаецца то рускай, то беларускай мовай. Пры слаба выпрацаваных навыках вымаўлення звычайна парушаюцца арфаэпічныя правілы як той, так і другой мовы».

Так, пад уплывам рускай мовы магчыма не зусім цвёрдае вымаўленне [ч] ([ч'алав'э́к], [ч'і́сты]), вымаўленне гука [в] на месцы [ў] ([наста́вн'ік], [навра́], [пра́вда]), ***дж*** вымаўляецца як спалучэнне гукаў або як [ж] ([дажджы́], [джа́ла]), часам вымаўляецца паўмяккі [р'] ([р'аб'і́на], [ар'а́ц']).

Трэцяя прычына памылак у вымаўленні — уплыў арфаграфіі. Іншы раз вымаўляюць словы так, як прывыклі іх пісаць: [адкус'і́ц'], [ву́чышс'а] замест [аткус'і́ц'], [ву́чыс̄'а] *(Паводле І. Лепешава)*.

Растлумачце пастаноўку працяжніка ў сказах.

Падрыхтуйце вуснае выказванне на тэму «Чаму трэба захоўваць арфаэпічныя нормы?».

57. Прачытайце. Сфармулюйце і запішыце асноўную думку тэксту. Раскажыце, якія арфаэпічныя нормы адлюстроўваюць выдзеленыя словы.

Не так даўно **надта** вядомы сталічны хлебны магазін атрымаў новае найменне. Цяпер ён мае назву «Каравай». Але **не назва** мяне зацікавіла, а **падслуханы** ля ка́сы дыялог.

— Мне «Старажытны», — кажа адзін.

— А мне «Траецкі», — просіць другі.

— А мне «Чабаровы», — гаворыць трэці.

А **ёсць** яшчэ хлеб «Беларускі», «Нарачанскі», «Раўбіцкі»... І гэтакі водар ідзе **ад назваў!** Слухаючы, як вымаўляюцца ля ка́сы назвы розных гатункаў хлеба, падумаў: вось і нікога змушаць **не трэба**. У хлебнай краме ўсе гавораць па-беларуску. Само **жыццё** вымагае гэта рабіць.

Хай сабе хлебная крама «Каравай» яшчэ **не моўны** аазіс, але прыемна, што тут цэлы дзень, няспынна, ні на хвілінку **не заціхаючы**, гучаць родныя назвы. **Хлеб** і слова павінны быць побач. Абодва яны — вытокі нашага **жыцця** *(Паводле У. Содаля)*.

Выпішыце з тэксту сінонімы. Карыстаючыся слоўнікам, запішыце сінанімічныя рады да слоў *назва, гаварыць, родныя (словы)*, *вытокі*.

- Выпішыце складаны сказ, зрабіце яго сінтаксічны разбор.

Якія цікавыя беларускамоўныя назвы для новых гатункаў хлеба (цукерак, печыва) вы можаце прапанаваць?

Правообладатель Национальный институт образования

58. З дапамогай схем раскажыце правілы вымаўлення спалучэнняў зычных. Перадайце фанетычныя запісы слоў у адпаведнасці з арфаграфічнымі нормамі беларускай мовы.



1. А[ч͡]ай, пераклa[ч͡]ык, дакла[ч͡]ык, пераплё[ч͡]ык, лё[ч͡]ык, раке[ч͡]ык, дара[ч͡]ык.

2. У ло[ц͡]ы, на клада[ц͡]ы, на вопра[ц͡]ы, на пе[ц͡]ы, у бо[ц͡]ы, на ру[ц͡]ы, на квета[ц͡]ы.

3. Заво[цк’]і, гара[цк’]і, грама[цк’]і, сусе[цк’]і.

4. Таджы[цк’]і, узбе[цк’]і.

5. Францу[ск’]і, каўка[ск’]і, чэ[ск’]і.

59. Прачытайце верш А. Пісьмянкова, прысвечаны малой радзіме. Ці кранае* ён чытача? Чым? Чаму менавіта такую будову твора абраў паэт? Чаму тэкст заканчваецца шматкроп’ем?

Бялынкавічы

Малюю —
Мілую
Радзіму малю́ю:
Заку́тую* рэчку,
Лясное мястэчка.
Малюю старанна
Сярэбраны ранак,
Сасоннік, алешнік,
Рабіну, канешне ж,
З адвечнай самотай
На сінім сумёце*.
Вось дом
Пад бярозай,
Вось дым
На марозе,
Вось след
Каля бра́мы*:
МАМА…

Раскажыце аднакласнікам пра дарагія вашаму сэрцу мясціны.

Слухаючы і ацэньваючы расказы аднакласнікаў, звярніце ўвагу як на змест, будову выступленняў, так і на адпаведнасць маўлення акцэнталагічным, арфаэпічным нормам, магчымыя іх парушэнні (напрыклад, парушэнне закону якання пры вымаўленні часціцы *не* і прыназоўніка *без*, парушэнні ў вымаўленні галосных [у], [і], фрыкатыўнага [г] і выбухнога [ґ], свісцячых зычных перад мяккімі і інш.).

Правообладатель Национальный институт образования

60. Прачытайце. З дапамогай тэксту пісьмова адкажыце на пытанне, заключанае ў назве. Якімі электроннымі перакладчыкамі вы карыстаецеся?

Якія плюсы і мінусы маюць электронныя перакладчыкі?

«Вясёлага эфіру!» — нібыта пажадаў карыстальнікам са сферы СМІ стваральнік «Белазара», электроннага **перакладчыка** з рускай мовы на беларускую. Прадбачым каментарыі некаторых журналістаў: «Эканоміць час, якога заўсёды нестае, і, здаецца, па-беларуску разумее няблага». Спрачацца не станем. Плюсоў шмат.

Вядома, аднак, што нават самымі дасканалымі* **вынаходствамі** трэба карыстацца з розумам. Гэта можна сказаць і ў адносінах да электронных перакладчыкаў. Яны, дарэчы, ствараліся не для навучання мове з нуля, а для дапамогі ў працы тым, хто валодае ёю на дастаткова высокім узроўні. А што атрымліваецца ў жыцці? Часам з-за нежадання гартаць кнігі электронны перакладчык становіцца найлепшым «сябрам» дылетантаў*. І ў выніку *Папа Рымскі* аказваецца *Татам*, а *бялкі* становяцца *вавёркамі*... Сэнс выказвання скажаецца, з'яўляюцца недарэчныя канструкцыі.

Увогуле, пры карыстанні электроннымі памочнікамі чалавек, давяраючы ім, губляе **пільнасць** і ўласны стыль. Таму прафесіяналы звычайна перакладаюць самастойна, каб узбагачаць, **развіваць** сваё моўнае майстэрства.

Электронныя перакладчыкі не заўсёды і не для ўсіх добрыя **дарадцы.** Таму, хто ведае мову, яны сапраўды эканомяць час. Асабліва калі патрэбна **перакласці** афіцыйную інфармацыю. Але машына... можа **ўвесці** ў зман. Не падыходзіць яна і для перакладу мастацкай літаратуры, таму што можа **змяніцца** сэнс, страціцца каларыт *(В. Бандаровіч).*

Зрабіце арфаэпічны разбор выдзеленых слоў: назавіце асаблівасці літаратурнага вымаўлення гукаў і спалучэнняў гукаў, праверце правільнасць вымаўлення і пастаноўкі націску па слоўніку. Адлюструйце асаблівасці вымаўлення праз фанетычны запіс (напрыклад: *дождж — до*[шч]).

Растлумачце, у чым заключаецца розніца паміж фанетычным і арфаэпічным разборамі слова.

- Назавіце сказы з пабочнымі словамі. Зрабіце сінтаксічны разбор аднаго з такіх сказаў.

Правообладатель Национальный институт образования

61. Прачытайце верш. Які настрой трэба перадаць пры яго чытанні? Паразважайце, у чым заключаецца пранікнёнасць і сіла паэтычнага слова. Зрабіце вусны арфаэпічны разбор выдзеленых слоў.

Я не га́ню* землі чужыя, —
Хай **іх** сонца не абміне.
Толькі дзе б за морам ні жыў я,
Беларусь мая **снілася** мне.
Так карце́ла* — **сляза** закіпала,
Каб да сэрца **хаця б** здалёк
Прыплывалі жалейка Купалы,
Багдановічаў васілёк…
Гэта ўсё, безумоўна, **не нова.**
А ці трэба, каб новым было
Поле бацькава, **матчына** слова
І буслова **над** хатай жытло?
І **якія б** шляхі ні схадзіў я,
Кліча полацкая сенажаць…
А калі **не спяваць** аб Радзіме,
Дык навошта наогул **спяваць**?

Г. Бураўкін.

Растлумачце правапіс часціц *не* і *ні* ў тэксце. Узгадайце правілы напісання гэтых часціц з рознымі часцінамі мовы. Прывядзіце прыклады.

62. Вы цікавы чалавек? Тады раскажыце пра сябе. Падрыхтуйце невялікае вуснае выказванне на адну з прапанаваных тэм: «Свет маіх захапленняў», «Кнігі майго дзяцінства», «Хачу сказаць “дзякуй”...», «Чалавек, якому я дзякую».

Правообладатель Национальный институт образования

Акцэнталагічныя нормы

§ 7. Націск і яго функцыі

Акцэнталагічныя нормы прадугледжваюць правільную пастаноўку націску, рэгулююць месца размяшчэння націску ў слове. Асноўны націск — слоўны — абавязковая прымета самастойнага слова. Непаўназначныя (несамастойныя) словы прымыкаюць да папярэдняга *(схадзі́ў бы)* або да наступнага *(па ваду́, не была́)* самастойнага слова.

Націск у беларускай мове **сілавы** (вылучэнне сілай голасу аднаго са складоў у слове); **рознамясцо́вы** (нефіксава́ны, можа прыпада́ць на розныя склады: *жні́вень, кастры́чнік, сакаві́к*); **рухомы** (пры ўтварэнні форм слова застаецца на адным і тым жа складзе *(пала́ц, пала́ца, пала́цы)* або пераходзіць на іншы склад: *бу́сел — буслы́, нуль — нуля́, нулі́, нуля́мі*).

Асноўная функцыя націску — словаразмежавальная. Ад месца націску залежаць:

- адрозненне аднолькавых па гукавым саставе слоў: *а́тлас — атла́с*;
- правілы напісання галосных: *ляснік, леснічо́ўка, высакаякасны, шырокафарма́тны*;
- адрозненне граматычных форм слова: *ру́кі — рукі́*;
- адрозненне форм закончанага і незакончанага трывання дзеяслова: *насы́паць — насыпа́ць*.

Акцэнталагічныя (акцэнтныя) варыянты дапускаюць дваякі націск: *лі́тасцівы — літасці́вы, су́праць — супро́ць, хло́пец — хлапе́ц, навако́л — навако́л*.

Акцэнталагічныя нормы замацаваны ў «Слоўніку націску ў беларускай мове» Мікалая Бірылы, у арфаграфічных, тлумачальных слоўніках і даведніках.

Правообладатель Национальный институт образования

63. Прачытайце выказванні даследчыкаў. Запішыце тое з іх, якое, на вашу думку, найбольш дакладна характарызуе прадмет абмеркавання.

Падрыхтуйце адказ на пытанне «Чаму важна захоўваць акцэнталагічныя, арфаэпічныя (шырэй — літаратурныя) нормы?».

Уменне правільна ставіць націск у слове — істотны элемент культуры вуснага маўлення. Памылкі ў пастаноўцы націску ўскладняюць і абцяжарваюць успрыманне паведамлення, чытання *(Ф. Янкоўскі)*.

Адхіленні ад літаратурных норм не толькі зніжаюць інфармацыйнасць тэксту, але вядуць і да эстэтычных стратаў, бо ўспрымаюцца як парушэнне абавязковага і ўзорнага маўлення *(А. Каўрус)*.

Для авалодвання нормамі літаратурнага вымаўлення неабходна ўважліва ўслухоўвацца ў лепшыя ўзоры і засвойваць іх *(А. Каляда)*.

Дасканалае валоданне мовай прадугледжвае веданне правіл літаратурнага вымаўлення… Каб дакладна ставіць націскі, трэба запомніць шмат слоў і пастаянна іх паўтараць, трэніравацца *(М. Супрунчук)*.

64. Запішыце словы, абазначце ў іх націск.

Аер, выпадак, імя, статут, генезіс, гліняны, каменны, ільняны, звычай, Уладзімір, красавік, эксперт, падпарадкаванне, грамадзянін, аксюмаран*, анапест, факсіміле*, навіна, садавіна, спіна, паведаміць, журавель, вярба, каталог, дакумент, стары, кулінарыя, магазін.

Складзіце сказы з пяццю запазычанымі словамі.

65. Прачытайце. Знайдзіце ў тэксце дзевяць слоў з памылкамі, выкліканымі няведаннем акцэнталагічнай нормы. Запішыце гэтыя словы правільна, абазначце націск.

Серадзіна кастрычніка, пачатак лістапада — самога часу збору шыпшыны. Вось такою парою кожны год дабіраўся я на Лысую гару, бо шыпшыны тут — буйнай, спелай — было так многа, што аж гнуліся ад яе кусты. На гэты раз сонца яшчэ не паднялося і да палавіны неба, а мой ладны рукзак быў паўненькі ягад. Часу была шмат. Мне захацелася паблукаць па лесе, можа, удасца знайсці які-небудзь грыб.

Спусціўся з гары, якую з двух бокаў абступалі маладыя асілкі-дубы, і падаўся ў глыбіню лесу. Прайшоў вёрсты са тры, уважліва прыглядаючыся да землі, але, акрамя некалькіх мухамораў, не сустрэў ніякога грыба.

Запішыце два апошнія сказы правільна, зрабіце іх поўны сінтаксічны разбор. Вусна вызначце часціны мовы.

Правообладатель Национальный институт образования

66. **I.** Запішыце лічбы словамі і пастаўце націскі з дапамогай слоўнікаў.

11, 14, 50, 60, 70, 80, 200, 600, 800.

II. Запішыце лічэбнікі ў форме творнага склону.

2 (юнакі), 2 (кветкі), 3, 4, 5, 6, 7, 8, 11, 20, 30.

67. Запішыце назоўнікі мужчынскага роду 2-га скланення ў форме роднага склону адзіночнага ліку і ў форме назоўнага склону множнага ліку, абазначце націскі.

Бінт, бусел, вецер, воўк, волас, голуб, доўг, зубр, камень, мароз, плот, плуг, роў, рот, цесць, вус, рог.

68. Прачытайце табліцу, з яе дапамогай раскажыце пра асаблівасці націску ў беларускіх дзеяслоўных формах.

Форма слова	Месца націску	Прыклады
Формы 2-й асобы множнага ліку цяперашняга і будучага часу дзеясловаў I спражэння, якія ў форме 1-й асобы множнага ліку маюць канчатак *-ом (-ём)*	На апошнім складзе	*Беражо́м — бераж**а**це́, ідзём — ідз**я**це́, бяро́м — бера**ц**е́, нясём — нясе́це*
Большасць дзеясловаў у формах адзіночнага і множнага ліку прошлага часу	На аснове	*Прын**е**сла, прын**е**слі, бра́ла, бра́лі*
Выключэнне: *была́, было́, былі́; жыла́, жыло́, жылі́; магла́, магло́, маглі́*. Ва ўсіх формах маюць націск на канчатку дзеясловы *ліць, піць, пачаць, узняць, берагчы, пячы, сцерагчы, таўчы (лі**л**а́, лі**л**о́, лі**л**і́; пі**л**а́, пі**л**о́, пі**л**і́; пача**л**а́, пача**л**о́, пача**л**і́)*.		

Утварыце аналагічныя дзеяслоўныя формы ад наступных дзеясловаў: *прыняць, пячы, пастрыгчы, везці, мерзнуць, ажыць, званць*.

69. Растлумачце, якія формы слоў адрозніваюць націск у наступных выпадках.

Скл**і́**каць — скл**і**ка́ць, тра́вы — травы́, зак**і́**даць — зак**і**да́ць, ву́чыць — вучы́ць, гу́бы — губы́, заўважа́ць — заўва́жаць, лю́біць — люб**і́**ць, уру́чаць — уруча́ць, л**і́**чыць — л**і**чы́ць.

70. З дапамогай слоўнікаў пастаўце націск у наступных словах.

Аднаразовы, валасы, камбайнер, партэр, крапіва, жыхар, **эксперт**, нектар, **прынесла**, Уладзімір, дагавор, туманы, **мысленне**,

Правообладатель Национальный институт образования

таварышы, **графіці**, **статут**, **грамадзянін**, апостраф, дыспансер, (па) ваду, кіламетр, каталог, **вярба**, гліняны, **статус**, **алфавіт**, карабель, вусы, **выпадак**, крыху, была, несці, **садавіна**, дакумент, **жальба**, Украіна, слабы, нібы, **неруш**, дэфіс, індустрыя, інструмент, квартал, магазін, маленькі, навіна, цяжар.

Складзіце сказы з выдзеленымі словамі.

71. Выпішыце з практыкавання 70 словы, якім адпавядаюць наступныя лексічныя значэнні:
‘што-небудзь некранутае (няўраная зямля, дзікі лес, грыбное месца і да т. п.), некранутая паверхня чаго-небудзь’;
‘ніжні паверх глядзельнай залы з месцамі для публікі’;
‘надрадковы знак у выглядзе коскі’.

72. Прачытайце перад аднакласнікамі свой любімы верш — выра́зна, з захаваннем арфаэпічных і акцэнталагічных норм. Растлумачце выбар твора для чытання. Слухачы павінны ацаніць, наколькі ваша маўленне адпавядае літаратурным нормам сучаснай беларускай мовы, а таксама ўлічыць наступныя паказчыкі:

- тэхніка чытання: тэмбр (афарбоўка) голасу, тэмп (хуткасць вымаўлення слоў), сіла голасу (не варта атаясамліваць з крыкам);
- лагічная выразнасць чытання: разуменне тэмы, ідэі твора;
- эмацыянальна-вобразная выразнасць (інтанацыя, настрой, міміка).

Якое эмацыянальнае ўздзеянне аказала на вас мастацкае чытанне аднакласніка? Ці ўдалося чытальніку з дапамогай голасу перадаць найтанчэйшыя адценні паэтычнага слова? Раскажыце пра ролю культуры маўлення для разумення твора.

73. Прачытайце. Перакажыце тэкст па-беларуску, захоўваючы літаратурныя нормы. Ці згодны вы з аўтарам, што «брыдкаслоўе, як і хамства, — зброя няўпэўненых у сабе людзей»? Сфармулюйце ўласную пазіцыю адносна брыдкаслоўя.

Сквернословие (от слова *скверна* — ‘что-либо гнусное, мерзкое, порочное’) — это речь, наполненная неприличными выражениями, непристойными словами, бранью.

...Мало кто из ребят догадывается, что сквернословие, как и хамство, — оружие неуверенных в себе людей. Грубость позволяет им скрыть собственную уязвимость и защищает их. Обнаружить слабость и неуверенность в этом возрасте равносильно полному поражению. Иногда старшеклассники стараются задеть взрослых, шокировать их,

Правообладатель Национальный институт образования

вывести из себя, чтобы измерить свою власть над ними и подтвердить собственную эмоциональную независимость.

Словесная брань — это не только набор непристойностей. Употребление подобной лексики свидетельствует о духовной бедности человека. Ведь слово — не просто совокупность звуков, выражающих мысль. Оно способно очень многое рассказать о нашем душевном состоянии, о нашей жизни. Сократ говорил: «Каков человек, такова его и речь» *(По М. Яковлевой)*.

Чаму, на вашу думку, трэба змагацца з брыдкаслоўем? Якую шкоду яно наносіць грамадству?

74. Прачытайце верш у адпаведнасці з арфаэпічнымі і акцэнталагічнымі нормамі. Які настрой трэба перадаць пры чытанні твора?

Прынясіце кветкі салдатам

Адгулі, адгрымелі гарматы.
Хмары чорныя адплылі.
Прынясіце кветкі салдатам,
Што палеглі на нашай зямлі.
Пакланіцеся нізка-нізка
Тым, хто зведаў агонь і дым,
Строгім помнікам, абеліскам,
Слаўным зорачкам баявым.
Ля салдацкіх магіл памаўчыце...
Кожны з мужных салдат збярог
Цішыню, і сонца ў блакіце,
І сцяжынку на школьны парог.
Семдзесят пяць год пад сцягам крылатым
Крочыць мір па роднай зямлі.
Прынясіце кветкі салдатам,
Што свабоду для нас здабылі.

Л. Дайнека.

Выпішыце сказ, у якім выказана асноўная думка верша. Растлумачце свой выбар. Выпішыце ключавыя словы. Як яны адлюстроўваюць пачуцці і пазіцыю паэта?

Чаму, на вашу думку, у вершы пераважаюць формы дзеясловаў прошлага часу і формы загаднага ладу?

- Выпішыце просты ўскладнены сказ. Зрабіце яго сінтаксічны разбор.

Як ваша сям'я адзначае 9 Мая? Як у ёй захоўваюць памяць пра Вялікую Перамогу?

Правообладатель Национальный институт образования

75. Запішыце па-беларуску. У беларускіх адпаведніках пастаўце націскі.

Деятель, докрасна, долгожитель, долюшка, доченька, дровосек, единичность, журавлёнок, зашнурованный.

Снизу доверху, замкнутая на ключ дверь, красивая застёжка, гравийный участок, вымыть дочиста, береги честь смолоду, красивая набережная.

§ 7–1

§ 7–2

Тэставая работа па фанетыцы і арфаэпіі

1. Адзначце словы, вымаўленне якіх не супадае з напісаннем:

1) выцвілы;
2) без дапамогі;
3) скіба;
4) лічба;
5) стараешся.

2. Адзначце правільны фанетычны запіс слова *счысціць*:

1) [счы́сц'іц'];
2) [счы́с'ц'іц'];
3) [шчы́сціц'];
4) [шчы́сц'іц'];
5) [шчы́с'ц'іц'].

3. Адзначце правільныя фанетычныя запісы слоў:

1) смелы — [см'е́лы];
2) схема — [сх'э́ма];
3) касьба — [каз'ба́];
4) газетчык — [газ'э́тчык];
5) цётчын — [ц'о́тчын].

4. Адзначце словы з падоўжаным гукам [с̄']:

1) двукоссе;
2) калоссе;
3) ссыпаць;
4) брэсцкі;
5) ка́са.

5. Адзначце словы, у якіх падкрэсленая(ыя) літара(ы) абазначае(юць) гук [ш]:

1) дарожка;
2) сшытак;
3) падпісчык;
4) здзекуешся;
5) счытваць.

6. Адзначце словы, у якіх вымаўляецца падоўжаны гук [ц̄]:

1) смецце;
2) трыццаты;
3) адценне;
4) у лодцы;
5) смяяцца.

Правообладатель Национальный институт образования

7. Адзначце назоўнікі, у якіх правільна пастаўлены націск:

1) бу́слы;
2) (чырвоныя) гваздзікі́;
3) белару́сы;
4) алфа́віт;
5) кіло́метр.

8. Адзначце радкі, у якіх правільна пастаўлены націск у абодвух словах:

1) абе́руч, ву́сы;
2) бульбя́ны, грамадзя́нін;
3) стату́т, спі́на;
4) крыху́, да́лей;
5) сі́вы, сухе́нькі.

9. Адзначце выпадкі, дзе дапушчаны памылкі ў фанетычных запісах слоў:

1) скіраваць — [с’к’ірава́ц’];
2) радасць — [ра́дасц’];
3) без слёз — [б’эс̄’л’о́з];
4) з верай — [з’в’э́рай];
5) збіраць — [з’б’іра́ц’].

10. Абазначце радкі, у якіх усе выдзеленыя літары абазначаюць націскныя гукі:

1) адз**і**наццаты, м**а**ленькі;
2) **а**ркуш, кв**а**ртал;
3) вып**а**дак, грамадзян**і**н;
4) красав**і**к, м**ы**сленне;
5) глін**я**ны, ім**я**.

Правообладатель Национальный институт образования

Арфаграфічныя нормы

§ 8. Правапіс галосных *о, э, а*

§ 0–8

§ 1–8

76. У словах кожнага радка назавіце агульную для іх арфаграму.

а) Баксёр, жамчужына, дабрыня, прасіць, драўляны;

б) брыво, глыток, крывавы, грымоты, крышы́ць;

в) дэталь, чэмпіён, тэатр, жэле, рэльеф;

г) фламастар, кратар, шніцаль, лідар, прынтар.

1. Літары ***о, э*** звычайна пішуцца пад націскам. Не пад націскам на месцы ***о, э*** пішацца ***а***: *мо́ва — маўле́нне, шэ́лест — шалясце́ць*.

2. У некаторых словах са спалучэннямі ***ро, ло*** замест ***о*** не пад націскам пішацца ***ы***: *гло́тка — глыта́ць, дро́вы — дрыво́тня*, а таксама ў словах *я́блык, я́блыня, я́блычны*.

У адпаведнасці з літаратурным вымаўленнем літара ***ы*** пішацца ў некаторых запазычаных словах: *брызе́нт, дрызі́на, інжынер, канцыля́рыя, рысо́ра, цырымо́нія*, а таксама ў словах *по́чырк, трывога́*.

3. Літара ***э*** пішацца як пад націскам, так і не пад націскам:

а) пасля зацвярдзелых, а таксама [д] і [т]: *ч э́рствы, рэда́ктар, ка́тэт, дэта́ль, ацэ́нка, Жэне́ва*;

б) у пачатку некаторых запазычаных слоў: *э́ра, экзэмпля́р, Эсто́нія*;

в) на канцы запазычаных нязменных слоў, а таксама ўласных імён, геаграфічных назваў пасля зычных, акрамя ***л, к***: *купэ́, галіфэ́, кашнэ́, каратэ́, Душанбэ́* (а л е: *філе́, са́льта-марта́ле*, пікé, камунікé*).

4. Літара ***а*** пішацца не пад націскам незалежна ад паходжання слова: *хо́лад, рамо́нт, тры́а, сальфе́джыа, То́кіа*.

5. Канцавыя ненаціскныя ***-эль, -эр*** у запазычаных словах перадаюцца як ***-аль, -ар***: *шні́цаль, лі́дар, камп'ю́тар, ме́неджар*, але ва ўласных імёнах неславянскага паходжання захоўваюцца ***-эль, -эр***: *Ла́ндэр, Юпі́тэр, О́дэр*.

Правообладатель Национальный институт образования

77. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце іх правапіс.

Ац..ні́ць, с..кратар, ж..леза, ч..мпіянат, р..форма, майст..р, ш..снаццаць, р..корд, ш..дэўр, інж..нер, с..рдэчны, ш..рсць, ш..рсцяны, ч..рніцы, бр..зент, выстр..л, кар..спандэнт, р..дыска, мад..льер, ч..мадан, эпіт..т, ц..гляны.

ЦАГЕЛЬНЫ — ЦАГЛЯНЫ

Цаге́льны — які мае адносіны да вырабу цэглы: *цагельны завод*.

Цагля́ны — 1. Зроблены з цэглы, мураваны; які мае адносіны да цэглы: *цагляная царква*. 2. Які мае колер цэглы; карычнявата-чырвоны: *цагляны колер скуры*.

78. Прачытайце верш. Вызначце яго тэму і асноўную думку.

Пяшчотны, сіні, летні вечар
Струменіць водар навакол.
Драч хрыпату на лузе лечыць
Мядовым цёплым **малаком.**

Над **рэчкай** неба **маладое,**
На хвалі маладзік прылёг,
І рыба **скача** над **вадою,**
Прыняўшы зоркі за гарох.

Смяецца[ф] сцішанае рэха
Таемнай радасцю дзяўчат...
Здалёку я сюды прыехаў
Паслухаць **ноч** і **памаўчаць.**

М. Пазнякоў.

Якімі моўнымі сродкамі паэт стварыў малюнак летняга вечара?

Да выдзеленых слоў падбярыце і запішыце аднакаранёвыя словы так, каб адбывалася чаргаванне галосных гукаў [о] — [а], [э] — [а].

79. Запішыце словы па-беларуску. Растлумачце правапіс галосных.

Гардероб, рецепт, реклама, академический, черепаха, характеристика, лотерея, демографический, бровь, кратер, адрес, шёлковый, мастер, тревога, щедрый, купе, экономика, секрет, кондитер, портфолио, резюме, жетон, барельеф, Манчестер.

80. Прачытайце тэкст. Дакажыце тэзіс, сфармуляваны ў першым сказе.

Жменька зямлі можа стаць **рэліквіяй.** Роднай зямельцы, у якой былі пахаваны продкі, прыпісваліся ахоўныя функцыі.[сн] Выпраўляючыся ў чужую старану, чалавек браў з сабою жменю зямлі і, як

Правообладатель Национальный институт образования

пісаў А. Багдановіч, «зашыўшы яе ў шматок палатна, вешаў на грудзях: калі давядзецца памерці на чужыне, то яго прах усё ж будзе спачываць разам з роднай зямелькаю». Зямлю бралі ў падарожжа і для таго, каб вы́сыпаць на чужыне ў крыніцу, калі вада там нясмачная.

Зямля ў фальклорных творах **характарызуецца** як наймацнейшая, багатая, пладавітая, поўная, працавітая, шчодрая, чыстая. Адсюль пажаданне «Будзь весел, як сват на вяселлі, здароў, як вада, багат, як зямля!» *(Паводле І. Швед).*

Выпішыце з тэксту словы, у якіх націскны гук [о] можа чаргавацца з ненаціскным [а]. Запішыце словы парамі.

У з о р: *мо̲жа — ма̲гла*.

Растлумачце правапіс выдзеленых слоў.

Прывядзіце прыклады беларускіх прыказак, у якіх словы *зямля, вада* ўжываюцца ў памяншальна-ласкальнай форме.

81. Напішыце зрокавы слоўнікавы дыктант па тэме «Правапіс галосных ***о, э, а***».

82. Запішыце запазычаныя словы, якім адпавядаюць прыведзеныя лексічныя значэнні.

1. Розум, здольнасць чалавека мысліць і разважаць. 2. Музычны твор або частка яго ў павольным тэмпе. 3. Узнаўленне карцін, малюнкаў, чарцяжоў шляхам фатаграфіі, клішэ. 4. Аддзел установы, заняты справаводствам, а таксама памяшканне гэтага аддзела. 5. Пісьмовае распараджэнне; дакумент на атрыманне, выдачу чагонебудзь. 6. Вузкі шалік на шыю. 7. Той, хто пасылае паштовае адпраўленне; адпраўнік. 8. Спецыяліст па кіраўніцтве вытворчасцю, работай прадпрыемства. 9. Механічная чыгуначная машына, якая рухаецца па рэйках уручную або з дапамогай рухавіка. 10. Штаны, якія аблягаюць калені і расшыраюцца ўгару.

Д л я д а в е д к і: *канц..лярыя, галіф.., орд..р, адр..сант, др..зіна, р..прадукцыя, менедж..р, інт..лект, адажы.., кашн.. .*

83. Прачытайце тэкст. Пра якую ўнікальную традыцыю ў ім паведамляецца?

Унікальная традыцыя

Традыцыя вырабу птушкі-абярэга з расшчэпленай драўніны на тэрыторыі Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці існавала не адно стагоддзе. Адметныя рысы і форма надаюць птушкам-абярэгам лёгкасць

Правообладатель Национальный институт образования

і здольнасць рэагаваць на рух паветра.[сн] Абрысамі шчэпавая птушка нагадвае кола або сонечны дыск, які ахінае чалавека, аберагае ад злога.

Птушку выраблялі як цацку для дзіцяці, што мусіла ахоўваць яго ад «дрэннага вока» і іншых няшчасцяў. А на вялікія святы шчэпавымі птушкамі ўпрыгожвалі покуць.

Сёння шчэпавую птушку выкарыстоўваюць для аздаблення інтэр'еру, а таксама як сувенір, што перадае этнічную спецыфіку рэгіёна *(Паводле А. Сташкевіч, Т. Валодзінай, Л. Анцух, А. Мікульчык)*.

Знайдзіце ў тэксце сказы, змест якіх адпавядае малюнку.
З якой мэтай выраблялі шчэпавых птушак? Пісьмова адкажыце на пытанне, выкарыстоўваючы пабочныя словы *па-першае, па-другое* і да т. п.

Практ. 83–1

§ 9. Правапіс галосных *е, ё, я*

84. Сфармулюйце правілы правапісу галосных ***е, ё, я*** на аснове прыведзеных прыкладаў.

а) Цёплы — цяпле́йшы, цеплыня́;
б) геро́й, балеры́на, семе́стр;
в) ме́сяц, па́мяць, ты́сяча.

1. У беларускай мове літара ***ё*** пішацца толькі пад націскам: *лёгкі, цётка, вёска*.

Літара ***ё*** пішацца не пад націскам у словах з каранямі ***ёд-, ёт-***: *ёдафо́рм*, ётава́ны*, а таксама ў складаных словах з першай часткай ***радыё-***: *радыёгра́ма, радыёста́нцыя, радыёантэ́на*.

Калі першая частка складанага слова з'яўляецца асновай назвы хімічнага элемента *радый*, то пішацца літара ***е***: *радыеакты́ўнасць, радыеметры́чны* (у першым складзе перад націскам — літара ***я***: *радыяме́трыя, радыяхі́мія*).

2. У першым складзе перад націскам замест літар ***е, ё*** пішацца літара ***я***: *мёд — мядо́вы, се́м — сямна́ццаць*.

У іншых ненаціскных складах ***е*** захоўваецца: *во́сень, ча́рвень, медуні́ца, дзевятна́ццаты*.

3. У запазычаных словах у першым складзе перад націскам пішацца літара ***е***: *секу́нда, кефі́р, мело́дыя, Бетхо́вен*.

4. Літара ***е*** пішацца ў пачатку некаторых запазычаных слоў: *ерэты́к, Е́ўро́па, Е́ўпато́рыя*.

Правообладатель Национальный институт образования

5. Літара **я** захоўваецца на пісьме незалежна ад націску:

- у некаторых каранях слоў: *сі́вязь, за́вязь, ляманта́ваць, цяжкава́ты, мяккава́ты, свяцкава́ць, ты́сяча, по́яс, ме́сяц, па́мяць, дзе́вяць, Прыпяць*;
- у некаторых суфіксах назоўнікаў: *ро́ўнядзь, бо́язь, дро́бязь*;
- у суфіксах дзеясловаў: *ла́яць, ве́яць, се́яць, ка́шляць, ба́яць, мі́ляць*, а таксама ў аддзеяслоўных назоўніках: *ла́янка, ве́ялка, се́ялка*.

85. На якой падставе прыведзеныя словы падзелены на групы? Выправіце памылкі ў групоўцы слоў. Запішыце, устаўляючы прапушчаныя літары.

п..шчотны	кашл..ць	тэл..фон	в..снавы	се..ць
б..розавік	св..ткаваць	п..йзаж	ап..рацыя	дзев..ць
л..снічоўка	ве..ць	г..рань	н..паўторны	сув..зь
с..дзіба	мул..ць	шчаб..танне	в..рашчака	ц..жкаваты

СЯДЗІБА — СЯЛІБА

Сядзі́ба — жылыя і гаспадарчыя пабудовы разам з садам, агародам (звычайна ў сельскай мясцовасці): *сядзіба лесніка*.

Сяліба — невялікі населены пункт у сельскай мясцовасці: *сяліба Акопы*.

Няправільнае ўжыванне: *музей-сяліба Агінскага* (правільна: *музей-сядзіба Агінскага*).

86. Утварыце і запішыце складаныя словы з першымі часткамі *радыё-, радые-*. Растлумачце правапіс літар **е, ё, я**.

Практ. 86–1

Правообладатель Национальный институт образования

87. Запішыце словазлучэнні па-беларуску.

Серебряная медаль, пятеро котят, пятьдесят секунд, разъезжаться после ужина, заменить светофор, терпеливый верблюд, тяжеловатый мешок, небольшой зверинец, электрическое освещение, заледеневшая пещера, позеленевшие верхушки, отпраздновать именины, потеплеет послезавтра.

У першым пераднаціскным складзе гук [э] ў часціцы (прыстаўцы) *не* і прыназоўніку (прыстаўцы) *без* вымаўляецца як [а]: [н’**а**]*сма́чны*, [б’**а**з]*ры́б’е*, [н’**а**] *ве́даў*, [б’**а**з] *ры́бы* (пішацца *нясмачны, бязрыб’е, не ведаў, без рыбы*) (Паводле Ф. Янкоўскага).

88. Прачытайце тэкст. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку тэксту?

Школа мужнасці

Служыў Міхась у парашутна-д..сантных войсках. Н..далёка ад Каўнаса разм..шчаўся вучэбны баталь..н, дзе рыхтавалі с..ржантаў. В..йсковая служба — н..лёгкае выпр..баванне для к..жнага с..лдата, але яна гартуе мужчынскі характ..р. А паветраны д..сант — сапраўдная школа мужнасці. Гэта Міхась адчуў на с..бе з першых дз..н службы.

Был.. цяжка прывыкнуць пасля вольнага жыцця да армейскіх парадкаў. З досв..тку да позняга веч..ра, з н..в..лікімі перапынкамі на адпачынак, яны вучыліся в..йсковай справе. Нават такому дужаму хлопцу, як Міхась, был.. н..выносна цяжка перан..сіць шт..дзённыя нагрузкі воіна-д..сантніка. Але ён трымаўся, бо помніў, як перад войскам павучаў яго бацька: «Б..з цяжкасцей не бывае посп..ху[м]» *(Паводле М. Кукуця).*

Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары.

Ці згодны вы з тым, што без цяжкасцей не бывае поспеху? Складзіце вуснае выказванне (тып тэксту — апавяданне), якое б пацвердзіла або абвергла гэту думку.

89. Напішыце зрокавы слоўнікавы дыктант па тэме «Правапіс галосных ***е, ё, я***».

90. Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку.

І зноў успамінаецца май. Маладая зеляніна вакол. Усё такое жаўтавата-зялёнае. Баба Васілінка такою парою першы раз выпусціць

Правообладатель Национальный институт образования

з хлява кароў. Каровы разыдуцца па лужку, а баба Васілінка адхіліцца ад іх, пойдзе па выспе*, і зноў тады народзіцца песня. Светлая і трапяткая, як гэты высокі вясновы дзень, як гэта зялёная маладая трава.

Праз гады я чую яе, тую песню, і мне кожны раз здаецца, што гэта спявае сама зямля. Праз гады бачу, як нястомна[с] нагінаецца да гэтай зямлі мая старая суседка *(Паводле Х. Лялько)*.

Выпішыце з тэксту словы з арфаграмамі — галоснымі ***е, я***. Растлумачце іх правапіс.

91. Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып. Назавіце часткі, якія адпавядаюць кампазіцыйнай схеме гэтага тыпу.

Адна жанчына ў час вайны знайшла кволага шчанюка. Ён падрос і аказаўся прыгожым сенбернарам. Сабака[м] быў вельмі разумны. Аднойчы ён бег ля порта і ўбачыў, як матросы разгружаюць баржу, выносяць мяшкі, скруткі. Сабака пачаў дапамагаць ім. За гэта матросы далі яму кацялок з ежай. Сабака ўзяў яго за дужку і асцярожна панёс дадому. Галодная гаспадыня вельмі здзівілася. Раніцай сабака панёс пусты кацялок на прычал і зноў прыняўся за работу. Матросы прасачылі за сабакам. Яны былі вельмі ўражаны тым, як сенбернар клапаціўся пра сваю гаспадыню.

Вось так сабака аддзячыў жанчыне, якая ў час вайны, калі ўсе былі галодныя, пашкадавала і выкарміла яго, маленькага шчанюка *(Паводле Л. Адамовіч)*.

Практ. 91–1

Пісьмова перакажыце тэкст, дапоўніўшы яго апісаннем сенбернара.

§ 10. Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах

92. Прачытайце схему. Сфармулюйце правілы правапісу спалучэнняў ***іё (ыё), ія (ыя), іе (ые)*** у запазычаных словах. Прывядзіце ўласныя прыклады.

руск. ***ио*** — ***іё (ыё)*** пад націскам (био́лог — біёлаг); ***ія (ыя)*** не пад націскам (биоло́гия — біяло́гія)

руск. ***иа*** — ***ія (ыя)*** незалежна ад націску (пиани́ст — піяні́ст)

руск. ***ие*** — ***іе (ые)*** незалежна ад націску (дие́та — дые́та)

Правообладатель Национальный институт образования

1. У беларускай мове спалучэнні галосных літар ужываюцца звычайна ў словах іншамоўнага паходжання. Напісанне такіх слоў перадаецца ў адпаведнасці з беларускім літаратурным вымаўленнем: у большасці іншамоўных слоў развіўся ўстаўны гук [й], што перадаецца на пісьме спалучэннямі ***іе (ые), іё (ыё), ія (ыя)***:

- ***іе (ые)***: у пачатку слова і пасля мяккага зычнага пішацца ***іе***, а пасля цвёрдага ці зацвярдзелага зычнага — ***ые***: ***і**ерогліф*, *кл**і**ент*; *аб**і**тур**ы**ент*, *д**ы**ета*;
- ***іё (ыё), ія (ыя)***: у сярэдзіне слова пад націскам пішацца ***іё (ыё)***, не пад націскам — ***ія (ыя)***: *рэг**і**ён*, *патр**ы**ём* (а л е: *Эфіо́пія*, *мільён*, *трыльён*); *рэг**і**на́льны*, *патр**ы**ятычны* (а л е: *ра́д**ы**ё*);
- ***іо (іа)***: у пачатку слова пад націскам пішацца ***іо***, не пад націскам — ***іа***: *іо́н*, ***І**о́сіф*; *і**а**нізацыя*, ***І**а**н**і́чнае мора*;
- ***ео (еа), эо (эа)***: у сярэдзіне слова пад націскам пішацца ***ео***, ***эо***, не пад націскам — ***еа, эа***: *архео́лаг*, *харэо́граф*; *археало́гія*, *харэаграфія*, а таксама *Неа́паль*, *рэа́лія*, *тэа́тр* (а л е: *акіян*).

Спалучэнне ***иа*** (руск.) перадаецца на пісьме як ***ія (ыя)*** незалежна ад націску: *авія́цыя*, *піяні́ст*, *варыя́нт*, *дыяло́г*.

2. Спалучэнне зычнага гука [й] з галоснымі ў запазычаных словах перадаецца ётавымі галоснымі, як і ў словах уласнабеларускіх:

- у пачатку слова: *ёг*, *ёгурт*, *ёд*, *Нью-Ёрк*;
- пасля галоснага ў сярэдзіне слова: *маёр*, *маянэз*, *раён*;
- пасля галоснага на канцы слова: *фае*, *секвоя*, *Мая*.

93. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя спалучэнні літар. Растлумачце іх правапіс.

Алімп..да, ф..лка, д..гназ, акс..ма, патэнц..л, дывіз..н, абрэв..цыя, пр..рытэт, д..грама, мар..нетка, д..та, трыл..н, ав..тар, к..ск, г..лаг, т..рэма, від..тэхніка, ф..рверк, афіц..нт, ав..пошта, д..метр, баст..н, стац..нар, ген..льны.

- Зрабіце фанетычны разбор слоў, якія маюць наступныя значэнні: ‘пала-жэнне, якое не патрабуе доказу і прымаецца ў якасці зыходнага прынцыпу якой-небудзь тэорыі’; ‘спецыяльна ўстаноўлены рэжым харчавання’.

Правообладатель Национальный институт образования

94. Запішыце словы па-беларуску, растлумачце правапіс спалучэнняў галосных.

Клиент, бастион, патриот, реактив, библиотека, миллион, фразеология, идеология, регион, майонез, трио, биография, вариация, район, лауреат, биолог, рацион, ион, радио, официант, майор, археология, фиолетовый, спартакиада, периодика, проект, леопард, грандиозный, приоритет, йод.

БІЯГРАФІЯ — АЎТАБІЯГРАФІЯ

Біяграфія — апісанне жыцця і дзейнасці каго-небудзь: *біяграфія мастака*.

Аўтабіяграфія — апісанне свайго жыцця: *да заявы дадаецца аўтабіяграфія*.

Няправільнае ўжыванне: *напісаць сваю аўтабіяграфію* (правільна: *напісаць аўтабіяграфію*).

95. Спішыце сказы, раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах.

1. Трэба ж нагаварыцца пра дзяцей, пра сон, пра гарод, пра серы*(а/я)*лы *(Г. Марчук)*. 2. Канец прыгожай, пятлястай рачулцы прыйшоў неўзабаве пасля вайны, калі пачала разгортвацца мелі*(я/а)*рацыя *(А. Жук)*. 3. У дзяцей бясконцыя «чаму?», а ў старых — успаміны, асацы*(а/я)*цыі *(Я. Брыль)*. 4. Але хлопцы не праяўлялі ініцы*(а/я)*тывы *(І. Шамякін)*. 5. У невялікім агародчыку каля самай хаты раслі кветкі: ружы, флёксы, астры, глады*(о/ё)*лусы *(Т. Мушынская)*. 6. Пі*(я/а)*ністу быццам перадалася частка гэтай стыхійнай сілы *(Э. Луканскі)*.

Практ. 95–1

● Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказе з абагульняльным словам пры аднародных членах.

96. Прачытайце тэкст. Абгрунтуйце яго падзел на абзацы.

Спявала душа народа

Тытулаў і званняў, пасад і ўзнагарод у яго было нямала: народны артыст СССР і Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, старшыня праўлення Саюза кампазітараў Беларусі... А сам Рыгор Раманавіч Шырма вышэй за ўсё ставіў сваё звычайнае захапленне — збіральнік і прапагандыст беларускай народнай песні.

Кожную магчымасць сустрэцца з людзьмі, запісаць самабытную[л] песню, прымаўку, загадку ці прыказку Рыгор Раманавіч выка-

Правообладатель Национальный институт образования

рыстоўваў спаўна, разумеючы важнасць гэтай творчасці для народа.

У 1929 годзе ён выдаў у Вільні першы збор нацыянальнага меласу* — «Беларускія народныя песні». У 1938 годзе апублікаваў зборнік «Наша песня». Як засведчылі тагачасныя перыядычныя выданні, кнігі мелі ў асяроддзі яго землякоў незвычайны поспех.

Амаль што да васьмідзесяцігадовага ўзросту кіраваў Рыгор Раманавіч Дзяржаўнай харавой капэлай*. У знак прызнання яго асабістых заслуг перад беларускім нацыянальным мастацтвам Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэле было прысвоена імя яе заснавальніка — Рыгора Раманавіча Шырмы *(Паводле А. Мяснікова)*.

Выпішыце з тэксту словы, напісанне якіх адпавядае правілам: а) «Правапіс галосных ***о, э, а***»; б) «Правапіс галосных ***е, ё, я***»; в) «Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах».

Разгледзьце выяву паштовай маркі, прысвечанай Р. Р. Шырму. Якія рысы характару адлюстраваны на яго твары? Пра што паведамляе малюнак у правай частцы маркі? Як вы лічыце, з якой мэтай на паштовых марках змяшчаюць партрэты выдатных асоб?

97. Напішыце зрокавы слоўнікавы дыктант па тэме «Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах».

98. Прачытайце тэксты пра вядомых людзей Беларусі.

Запішыце тэкст (на выбар), устаўляючы прапушчаныя літары (спалучэнні літар). Растлумачце іх правапіс.

I. Ля Ціхага ак..на, там, дзе да яго падступаюць магутныя в..ршыні Андаў, у паўднёваамерыканскай[сл] краіне Чылі знаходзіцца горад Дамейка. А крыху паўночней — горны хр..бет, які носіць тое ж імя. Г..лагі могуць назваць мін..рал, батанікі — ф..лку, з..лагі — малюска, звязаных з імем Дамейкі. Сын беларускай з..млі, Ігнат Дамейка ўвайшоў у сусветную навуку, пакінуўшы прыкметны след у фізіцы, хіміі і м..талургіі, г..графіі і батаніцы, г..логіі і педагогіцы, этнаграфіі і з..логіі *(Паводле А. Мальдзіса)*.

II. Найбольшых дас..гненняў[сл] беларус па паходжанні Іван Дз..менцьевіч Чэрскі дабіўся ў галіне г..графіі і г..логіі. Але ён быў сапраўдны натураліст з надзвычай шырокім профілем: значны след

Правообладатель Национальный институт образования

ён пакінуў у з..логіі, анатоміі, арх..логіі, мет..ралогіі, цікавіўся батанікай, этнаграфіяй, фальклорам. Чэрскі адкрыў многа г..графічных аб'ектаў, у тым ліку новыя хр..бты, сабраў і апісаў шэраг сучасных і выкапнёвых жывёл. Іван Дз..менцьевіч вывучаў г..лагічную будову Саян, Прысаяння, Прыангар'я, басейнаў рэк Селенгі і Тунгускі *(Паводле Р. Гарэцкага)*.

Практ. 98–1

Раскажыце пра беларусаў, вядомых усяму свету, якімі вы захапляецеся.

§ 11. Правапіс прыстаўных галосных

99. Прачытайце пары словазлучэнняў. Чаму ў адных выпадках прыстаўныя галосныя пішуцца, у другіх — не?

а) На вялікай **і**льдзіне — вялікая льдзіна;
б) глядзеў з-пад **і**лба — зморшчына на лбе;
в) цвік **і**ржавы — на ржавым цвіку;
г) хлеб **а**ржаны — хлеба ржанога.

1. Прыстаўная галосная ***і*** пішацца:

- у пачатку слова перад спалучэннямі зычных з першай літарай ***м***: ***і**мчаць, **і**мгненне, **і**мклівы*;
- у пачатку некаторых слоў перад спалучэннямі зычных з першымі літарамі ***р***, ***л***, калі слова з такімі спалучэннямі пачынае новы сказ або стаіць пасля знака прыпынку ці слова, што заканчваецца на зычны: ***і**льняное палатно*; *пачарнелы, **і**ржавы серп*; *без **і**льгот*. Калі слова з такім пачатковым спалучэннем зычных стаіць пасля слова, якое заканчваецца на галосны, то прыстаўная літара не пішацца: *пакрыцца ржой, палатно льняное*.

2. У некаторых словах можа з'яўляцца прыстаўная галосная ***а***: ***і**мшара* і ***а**мшара*, ***і**ржаны* і ***а**ржаны*, ***і**ржышча* і ***а**ржанішча*.

3. Пасля прыставак і першай часткі складанага слова, якія заканчваюцца на галосны, прыстаўныя літары ***і***, ***а*** перад ***р***, ***л***, ***м*** не пішуцца: *заржавець, прымчацца, вокамгненна*.

Пасля прыставак на зычны замест ***і*** пішацца ***ы***: *абы**ы**лгаць, ады**ы**мжэць*.

Правообладатель Национальный институт образования

100. Прачытайце верш. З дапамогай якіх дзеясловаў паэт вобразна апісвае дождж?

Знайдзіце ў вершы словы, у якіх: а) прыстаўная галосная пішацца перад збегам зычных; б) прыстаўная галосная не пішацца перад збегам зычных. Растлумачце іх правапіс.

Кропля

Дождж прарваўся з ветрам
У спякоту,
Па пясках ударыў
Буйным шротам*.
За адно імгненне,
За хвіліну
Перамыў лістоту[м] на галінах,
Пачапіў на кожнае іглінцы
Па адной засмучанай слязінцы.
Прашумеў. Суняўся.
Ціха стала.
І слязінка кожная зайграла.
Колькі ў кроплю
Фарбаў назаткана,
Быццам свет увесь у ёй сабраны:
Поле, луг,
Сады ўсяго пасёлка,
І рака, і неба,
І вясёлка!

П. Броўка.

Напішыце міні-сачыненне (4-5 сказаў) на тэму «Колькі ў кроплю фарбаў назаткана!». Словы якіх часцін мовы будуць адыгрываць у гэтым тэксце галоўную тэкстаўтваральную ролю?

ІМЖЭЦЬ — ІМШЭЦЬ

Імжэ́ць — ісці, падаць, асядаць дробнымі кропелькамі (пра дождж): *на вуліцы імжэла*.

Імшэ́ць — зарастаць мохам: *балота імшэе*.

101. Спішыце сказы, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары. Растлумачце правапіс прыстаўных галосных.

1. Пасля дажджоў прырэчнае балота шырока разлілося, заліло ..мшарыну, якая, бы цеста на дражджах, пачала пухнуць мяккім вільготным мохам *(В. Быкаў)*. 2. Халодны пот выступіў на ..лбе *(Я. Колас)*. 3. І вось сёння за акном ..мжыў дождж[ф], які не радаваў гарадскую госцю, але вельмі цешыў вяскоўцаў, бо не трэба будзе паліваць агародніну *(М. Кукуць)*. 4. Пот ручаямі сцякаў з ..лба, шыі, і Іван разпораз выціраў яго прамоклай хусцінкай *(С. Сяргей)*. 5. Грудзі ..рваў сухі кашаль *(А. Мальдзіс)*. 6. Цяпер ніхто не забараняе касіць ..ржышча і ніхто і не косіць яго *(А. Жук)*. 7. Яму і сапраўды захацелася гэтай гарачай бульбы з ..льняною тоўчанкай, з кіслым малаком *(В. Казько)*.

- Складзіце схемы 1-га і 3-га сказаў.

Правообладатель Национальный институт образования

102. Знайдзіце ў сказах фразеалагізмы, растлумачце наяўнасць або адсутнасць прыстаўных галосных.

1. З раніцы да позняй ночы брыгада ..рве жылы, да знямогі высільваецца *(М. Капыловіч)*. 2. А я ж ..рвала глотку на ўвесь бор! Дзе ты прападаў? *(З. Бядуля)*. 3. Каб не ..рваць сабе душу, ён ледзь не бегма падаўся адсюль *(І. Кудраўцаў)*. 4. У млыне Крушынскі ніводнай хвіліны на месцы не можа ўстаяць. Яго ..рвуць на кавалкі — то туды, то сюды *(З. Бядуля)*. 5. Цяпер госці ўсе былі на зборнай і ..рвалі жываты ад смеху *(Я. Колас)*.

Запішыце фразеалагізмы ў адпаведнасці з прыведзенымі значэннямі: ‘бесперапынна турбаваць просьбамі, даручэннямі’; ‘вельмі моцна гаварыць, крычаць, спяваць’; ‘цяжка, з вялікім напружаннем працаваць, надрывацца на рабоце’; ‘вельмі моцна і доўга, да знямогі смяяцца’; ‘моцна трывожыцца, хвалявацца, мучыцца’.

Практ. 103–1, 103–2

103. Складзіце з прапанаванымі парамі слоў сказы так, каб у адным выпадку была прыстаўная галосная, у другім — не было. Запішыце.

Ілгаць — лгаць, ільняны — льняны, ірвануцца — рвануцца.

§ 13–17, 12, 18

§ 12. Правапіс звонкіх і глухіх, свісцячых і шыпячых зычных

104. Дапоўніце тэкст лінгвістычнага паведамлення. Праілюструйце яго прыкладамі.

Практ. 136–2, 136–3

Звонкія зычныя перад глухімі і на канцы слова вымаўляюцца … . Глухія зычныя перад звонкімі вымаўляюцца … . Каб праверыць правапіс літар, што абазначаюць звонкія і глухія зычныя гукі, трэба … .

Шыпячыя зычныя перад свісцячымі вымаўляюцца як … . Свісцячыя зычныя перад шыпячымі вымаўляюцца як … . Каб праверыць правапіс літар, што абазначаюць шыпячыя і свісцячыя зычныя гукі, трэба … .

Аглушэнне звонкіх зычных на канцы слова і перад глухімі, азванчэнне глухіх зычных перад звонкімі, прыпадабненне шыпячых да свісцячых і свісцячых да шыпячых на пісьме не перадаецца: *след* — *сле*[т], *лыжка* — *лы*[ш]*ка*, *малаццьба* — *мала*[дз’]*ба*, *на сцежцы* — *на сце*[с]*цы*, *пераносчык* — *перано*[ш]*чык*.

Правообладатель Национальный институт образования

Для праверкі правільнасці перадачы на пісьме звонкіх і глухіх, шыпячых і свісцячых зычных трэба змяніць слова ці падабраць аднакаранёвае слова, каб пасля зычнага быў галосны або санорны: *след — слядЫ, лыжка — лыжак, малацьба — малаціць, на сцежцы — сцежачка, пераносчык — пераносіць.*

У запазычаных словах напісанне зычных, якія нельга праверыць, вызначаецца па слоўніку: *баскетбол, вакзал, айсберг.*

105. Прачытайце тэкст. Абгрунтуйце яго падзел на абзацы.

Сялянская раскоша

На стале ў гліняных **місках** парыцца смажаная бульба з мясам. Каля яе — халаднік[с] са свежых агуркоў з цыбуляю і кропам. Каўбаса, паляндвіца, кумпяк, сала нарэзаны шчодрай рукой тоўстымі кавалкамі. У дадатак — толькі выняты з клінка* сыр, **галушка** масла, а каля іх — міска **пахкага** мёду з сотамі.

Зірнуўшы на ўсю гэту сялянскую раскошу, Кастусь напачатку падумаў, што яго сябар Лявон знарок рыхтаваўся да сустрэчы. Аднак, згадаўшы сваіх бацькоў і руплівых **аднавяскоўцаў**, успомніў, што на **касьбу**, жніво і іншыя **цяжкія** работы, як на свята, заўсёды пакідалі найлепшыя прысмакі *(Паводле І. Кананoвіча).*

Чаму на цяжкія работы людзі пакідалі найлепшыя прысмакі?
Пісьмова растлумачце правапіс звонкіх і глухіх зычных у выдзеленых словах.

У з о р: *міс̲ка — міса.*

НОСЧЫК — НОСЬБІТ

Но́счык — рабочы, які пераносіць ручны багаж на вакзале; насільшчык: *працаваць носчыкам.*

Но́сьбіт — той, хто валодае, надзелены чым-небудзь, можа быць выразнікам, прадстаўніком чаго-небудзь: *носьбіты мовы.*

106. Запішыце словы, выбіраючы з дужак патрэбную літару.

Дока*(з/с)*, ма*(г/х)*чымасць, абе*(т/д)*, на квета*(ч/ц)*цы, сто*(г/х)*, ду*(ж/ш)*кі, газе*(т/ч)*чык, з'ез*(д/т)*, у бо*(ч/ц)*цы, бара*(дз/ц)*ьба, перава*(з/ш)*чык, лі*(дж/ч)*ба, на паду*(с/ш)*цы, но*(з/с)*ьбіт, выгля*(д/т)*, у спрэ*(ч/ц)*цы, самалю*(б/п)*ства, рын*(х/г)*, праба*(ч/ц)*це, ця*(ж/ш)*касць, ка*(з/с)*ьба, возьме*(ш/с)*ся.

- Зрабіце фанетычны разбор двух слоў, у якіх не супадае колькасць гукаў і літар.

Правообладатель Национальный институт образования

Ёсць пэўная колькасць слоў, якія канчаюцца на два звонкія зычныя. Аглушаюцца ў такім выпадку абодва зычныя: *поезд* — *пое*[ст], *праезд* — *прае*[ст], *з'езд* — *з'е*[ст], *дождж* — *до*[шч] (Паводле Ф. Янкоўскага).

107. Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Абгрунтуйце сваю думку.

Беларусь — наш агульны дом

У Беларусі жывуць прадстаўнікі звыш 140 нацыянальнасцей. Гісторыя адных налічвае шмат стагоддзяў, іншыя прыехалі ў нашу краіну ў мінулым стагоддзі, нехта — у апошнія гады. Прычыны, па якіх усе яны апынуліся ў Беларусі, розныя. Але наша краіна для ўсіх зрабілася другой радзімай, дзе яны вучацца, працуюць, бяруць шлюб, дзе нараджаюцца іх дзеці, дзе знаходзяцца магілы іх продкаў.[сн]

Цяжка перадаць словамі пачуцці, якія ахопліваюць чалавека, калі ён далёка ад радзімы сустракае земляка. Спытайце, што яны адчуваюць у гэты момант, і вам адкажуць: адразу вее цяплом, перад вачыма ў адзін момант з'яўляюцца родны дом, бацькі, браты, сёстры. Усім хочацца чуць родную мову, успамінаць дарагія сэрцу мясціны. І гэта, мабыць, натхняе людзей на стварэнне свайго нацыянальнага асяродка. З другога боку, гэта дае магчымасць больш грунтоўна расказаць суайчыннікам пра свой народ, гісторыю і культуру сваёй краіны *(Паводле Л. Міхальчук)*.

Выпішыце з тэксту словы з арфаграмамі — звонкімі і глухімі зычнымі. Растлумачце іх напісанне.

Ці даводзілася вам далёка ад радзімы сустракаць земляка? Раскажыце пра свае пачуцці.

108. Запішыце словазлучэнні па-беларуску.

На тонкой ниточке, купаешься в речке, намажьте на хлеб, на деревянной полочке, вышивка на наволочке, пользуешься фломастерами, вести на верёвочке, держишься за перила, в новой юбочке, дежурить на вышке, благодарить дочку, умножьте на семь, пломбир на палочке, заботишься о кошке, писать при свечке, рисунок на брошке, торопишься на встречу.

Растлумачце правапіс свісцячых і шыпячых зычных.

- Зрабіце сінтаксічны разбор двух словазлучэнняў з рознымі відамі сінтаксічнай сувязі (дапасаванне і кіраванне).

Правообладатель Национальный институт образования

109. Прачытайце афарызмы, растлумачце іх сэнс. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс зычных.

1. Табе зрабіўся блі*(з/с)*кім цэлы свет! А ці бліжэйшым стаў табе сусе*(д/т)*? *(Н. Гілевіч)*. 2. Любоў і ла*(д/т)* узвышаюць, в..дуць за далягля*(д/т)*. Варожасць і злосць прыніжаюць, адкідваюць наза*(д/т)* *(А. Вярцінскі)*. 3. У нас добрая спа*(д/ч)*чына, паболей бы добрых спа*(д/ч)*ыннікаў[л] *(М. Стральцоў)*. 4. Толькі блі*(з/с)*кіх збліжае растань. Толькі з блі*(з/с)*кімі час у згодзе *(Н. Мацяш)*. 5. Б..ларусу і ў Парыжы сняцца б..лізна бяро*(з/с)* і сосен ме*(дз/ц)*ь *(П. Панчанка)*.

Напішыце сачыненне-мініяцюру на тэму аднаго з афарызмаў (тып тэксту — разважанне).

Практ. 109–1

§ 13. Правапіс прыстаўных і ўстаўных зычных

110. На аснове прыкладаў сфармулюйце правілы напісання прыстаўных зычных.

а) **В**о́сень, **в**о́бласць, **в**у́лей, **в**у́гал;
б) **в**о́сень — асенні, **в**о́бласць — абласны;
в) у**в**осень, за**в**облачны, за**в**уголле;
г) Орша, Омск, Ульяна.

1. Прыстаўная літара ***в*** пішацца:
- перад націскным ***о*** ў пачатку слоў: ***в**о́сень*, ***в**о́блака*; у вытворных ад іх словах пасля прыставак: *ув**о́сень*, *зав**о́блачны* (а л е: *о́каць* і вытворныя ад яго, *о́дум*). Пры змене месца націску ***о*** пераходзіць у ***а*** і прыстаўная ***в*** не пішацца: *в**о́сень* — *ас**е́нні*, *в**о́блака* — *аблач**ы́нка*;
- у запазычаных словах: *в**о́хра*, *в**о́цат* і вытворных ад іх: *в**о́х**рыць*, *в**о́цатны*;
- перад каранёвым ***у*** ў пачатку слоў: *в**у́галь*, *в**у́да*, *в**у́чань*, а таксама ў вытворных ад іх незалежна ад месца націску: *абв**у́глены*, *вудз**і́льна*, *навуч**э́нец*;
- перад націскнымі прыстаўкамі ***у-, уз- (ус-)***: *в**у́праж*, *в**у́зга**лаўе*, *в**у́сцішны**;
- у словах *в**о́ка*, *в**о́стры*, *вак**о́л* і вытворных ад іх незалежна ад націску: *вач**э́й*, *вастр**ы́ць*, *навак**о́лле*.

Правообладатель Национальный институт образования

2. Прыстаўная літара ***в*** не пішацца:

- перад пачатковым націскным ***о*** ў запазычаных словах і некаторых уласных імёнах і назвах: *о́пера*, *о́фіс*, *О́рша*, *О́ксфард*;
- перад пачатковым ***у*** ў запазычаных словах і некаторых уласных імёнах і назвах: *у́нікум*, *у́рна* (а л е: ***ву́стрыца***), *Уша́чы*, *Ура́л*;
- перад прыставачным ***у*** і перад ***у***, якое паходзіць з ***в***: *удву́х*, *угнае́нне*, *уну́к*, *учо́ра*.

3. Устаўная літара ***в*** пішацца:

- перад націскным ***о*** ў сярэдзіне некаторых слоў: *нівво́дзін*, *Лявво́н*;
- перад націскным ***у***: *павву́к*, *есавву́л*, а таксама ў вытворных ад іх незалежна ад месца націску: *павуці́нне*, *есавву́льскі* (а л е: *ау́л*, *бау́л*);
- перад ***у*** ва ўласных імёнах і геаграфічных назвах: *Навву́м*, *Тадэ́вуш* (а л е: *Барнау́л*).

4. Прыстаўная літара ***г*** пішацца ў займенніках *гэты*, *гэтакі*, *гэтулькі*; у прыслоўях *гэ́так*, *гэтакса́ма*, *дагэ́туль*; у выклічніках *гэй*, *го*, *га*, *гэ*.

111. Прачытайце верш. Растлумачце правапіс выдзеленых слоў.

На **возеры** — зялёны **астравок**,
Нібы застыў на хвалях паплавок.
На **астравок** зялёны не вяслуй[м],
Ты гэтых ціхіх хваль не расхвалюй.
К. Камейша.

- Ці з'яўляюцца аднакаранёвымі словы *хва́лі* і *расхваляваць*? Запішыце верш па памяці. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

ВУГЛАВЫ — ВУГЛАВАТЫ

Вуглавы́ — 1. Які мае форму вугла: *вуглавое злучэнне*. 2. Які стаіць на вуглу, на перакрыжаванні вуліц: *вуглавы дом*.

Вуглава́ты — з выступамі, няроўны: *вуглаваты почырк*.

112. Запішыце словы, устаўляючы, дзе трэба, літару ***в***.

На..учанне, ..огненны, ..углаваты, ..увага, ..упарты, ..узнагарода, ..орган, ..опера, ..ольха, ..угор, ..ордар, ..урад, ..угаль, ..образ,

Правообладатель Национальный институт образования

..опратка, ..астраслоўе, ..абласць, ..офіс, ..ураган, ..остраў, ..опытны, ..узрост, ..уж, ..астрэйшы.

● Знайдзіце слова, утворанае складана-суфіксальным спосабам. Назавіце арфаграмы ў гэтым слове.

113. Прачытайце верш. Якія словы і выразы дазваляюць уявіць восень як жывую істоту?

Па́даюць яблыкі —
Тупае восень па садзе.[сн]
Жоўтае лісце
Мяце на кляновай градзе.
А надвячоркам
На прызбе нячутна прысядзе
І залацісты праменьчык
Ля ног пакладзе.
Будзе пра лета мінулае
Думаць паціху.
Гляне спакойна
На познія кветкі ў акне.
Здыме нязлосна
Са смуглай шчакі павуцінку
І гаркаваты начлежны дымок
Пракаўтне...

Г. Бураўкін.

Знайдзіце ў вершы словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс прыстаўных і ўстаўных зычных». Выкарыстоўваючы іх, а таксама словы *навокал*, *воблачка*, *водбліск*, *вогнішча*, *вопратка*, *водсвет*, *вастралісты*, *вохра* і інш., складзіце тэкст (4-6 сказаў) на тэму «Тупае восень па садзе».

114. Запішыце словы па-беларуску.

Урожай, остроносый, паутина, осенний, осень, олово, угловой, озеро, урна, уголь, рабочий-угольщик, заострить, наушники, вьюн, ультразвук, облако, узел, обыск, Наум, Ольга, Обь, Ульяна, Узда, Огненная Земля.

115. Прачытайце тэкст. Вызначце яго тып. Абгрунтуйце сваю думку.

Запішыце тэкст, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі.

Школа дз..лілася ..узкім калідорчыкам на дз..ве пал..віны: у адной быў клас.., а ў другой жыла наста..ніца. Другая пал..віна была

Правообладатель Национальный институт образования

мен..шая за першую. Гэта быў *(не)*в..лікі пакой. Ля адной сц..ны ст..яў доўгі стол, увесь закладз..ны кні..камі, нотамі, рознымі паперамі. Паміж ст..лом і ..акном ст..яла крэсла *(з/с)* высокаю с..пінкаю. Ля другой сц..ны — шырокая мя..кая канапа, а *(з/с)* двух канцоў канапы — крэслы ў б..ларускім с*(ты/ці)*лі, *(з/с)* ра*(з/с)*ьбою, ц..вёрдыя і простыя. На сц..не вісела карта Б..ларусі, а над ёю — абвіты б..ларускім па..ском мален..кі п..ртрэт Янкі Купалы.

..окны гл..дзелі ў са*(д/т)*. Праз іх відаць былі клумбы *(з/с)* прыгожымі буйны́мі кветкамі, нек..лькі градак *(з/с)* аг..роднінаю. Па градах сц..ліўся ..усаты г..рох, з..вісаў *(з/с)* высокіх кійкоў св..імі кволымі[м] ..усікамі, пачынаў цв..сці бледна*(?)*фі..летавымі дробнымі кветачкамі *(Паводле М. Гарэцкага)*.

Практ. 115–1

- Растлумачце пастаноўку двукроп'я і працяжнікаў у сказах тэксту.

§ 14. Правапіс літар *у* і *ў*

116. Размяркуйце пункты правіла напісання літар ***у*** і ***ў*** на дзве групы: 1) пішацца літара ***у***; 2) пішацца літара ***ў***. Праілюструйце правілы прыкладамі.

на канцы іншамоўных слоў не пад націскам

пасля галосных у пачатку, сярэдзіне і канцы слоў

у пачатку ўласных назваў

пасля знакаў прыпынку

пад націскам

пасля злучка ці двукосся, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны

у іншамоўных словах, якія заканчваюцца на *-ум, -ус*

1. Літара ***у*** абазначае галосны гук [у] і пішацца:
- у пачатку сказа, пасля знакаў прыпынку і пасля зычных: ***У*** *слове «прыслоўе» 8 літар і 9 гу*каў;
- у пачатку ўласных назваў: *каля ракі* ***У****шачы, ва* ***У****збекістане*;
- у запазычаных словах, якія заканчваюцца на *-**ум**, -**ус***: *аква**рыум**, ра**дыус**, **страус*** і вытворных ад іх;
- у словах з націскным ***у***: *каля у́рны, пачулася у́ханне*;
- на канцы нескланяльных запазычаных слоў не пад націскам: *фра́**у**, ток-шо́**у**, ноу-ха́**у**, Бернард Шо́**у***.

Правообладатель Национальный институт образования

2. Літара ***ў*** абазначае зычны гук [ў] і пішацца:

- пасля галосных у пачатку слова: *на **ў**злеску*, *ва **ў**ніверсітэце*;
- у сярэдзіне слова пасля галосных перад зычнымі: *аў**ў**дыторыя*, *паў**ў**за*;
- пры чаргаванні [л] з [ў]: *спяваў*, *паўметра* (а л е: *палка*, *памылка*, *сеялка*, *Албанія*, *Алжыр*, *Балгарыя*);
- пры чаргаванні [в] з [ў]: *лаўка*, *Каўказ* (а л е: *ва **В**'етнаме*, *рака **В**лтава*);
- пасля злучка ці двукосся, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны: *мастакі-ўмельцы*, *у «Выбранае» ўвайшлі*.

117. Спішыце, устаўляючы ***у*** ці ***ў***.

Жо..ты, кантрольна-..ліковы, гучнае «..ра», со..с, каля ..зды, на ..краіне, Ніна ..ладзіміра..на, цётка ..ладзя, Брэсцкая ..нія, па-..чарашняму, па..за, бра..нінг, стра..с, па..днёва-..сходні, дыназа..р, ба..л, ла..рэат, ваку..м, а..тарытэтны, каля ..ваходу, гэта ..топія, часопіс «Маладосць» ..знагародзіў удзельніка.. конкурсу, моцны ..раган, Е..ропа, сімпозі..м.

АЎТАРЫТЭТНЫ — АЎТАРЫТАРНЫ

Аўтарыта́тны — які карыстаецца аўтарытэтам; які заслугоўвае аўтарытэт: *аўтарытэтная крыніца інфармацыі*.

Аўтарыта́рны — заснаваны на безагаворачным падпарадкаванні ўладзе, аўтарытэту: *аўтарытарны стыль кіраўніцтва*.

118. Устанавіце адпаведнасць паміж словамі і даведкамі пра іх паходжанне. Запішыце словы згодна з арфаграфічнымі нормамі.

1) фа..на	а) ад лац. *radius* — спіца, прамень
2) аквары..м	б) ад англ. *round* — кола, круг
3) джо..ль	в) ад лац. *auctoritas* — уплыў, значнасць
4) рады..с	г) ад лац. *fauna* — імя старажытнарымскай багіні палёў і лясоў
5) ра..нд	д) ад ням. *Frau* — пані
6) прэзіды..м	е) ад лац. *aquarium* — вадаём
7) а..тарытэт	ж) ад лац. *praesidium* — абарона, старшынства
8) фра..	з) ад *J. Joule* — прозвішча англійскага фізіка

Раскрыйце значэнні прыведзеных слоў.
З двума словамі (на выбар) складзіце сказы.

Практ. 118–1

Правообладатель Национальный институт образования

У словах, якія абазначаюць прозвішчы, імёны, геаграфічныя назвы, пачатковая літара ***У*** пішацца не ў адпаведнасці з вымаўленнем. На пісьме: *на **У**краіне*, *па **У**збекістане*, *ва **У**шачах*, *артыстка **У**ланава*; у вымаўленні: *на* [ў]*краіне*, *па* [ў]*збекістане*, *ва* [ў]*шачах*, *артыстка* [ў]*ланава* (Паводле Ф. Янкоўскага).

119. Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак. Спішыце тэкст, устаўляючы замест кропак ***у*** ці ***ў***.

Колькі памятаю сябе, слова Коласава было .. нашай хаце гэткае ж звычайнае, як акраец хлеба, што за..сёды ляжа.. на стале пад белым саматканым абрусам.

І сёння стаіць яшчэ .. нас дома старая, зрадзелая ..жо .. голлі груша-касцянка. Некалі вакол яе слалася ша..ковая, ..тульная мура..ка. І так прыемна было прылегчы ці пасядзець на ёй .. гарачыню[сл], .. спякотны дзень.

А ..летку тысяча дзевяцьсот дваццаць другога года прыязджа..[ф] .. нашу вёску і сядзе.. пад гэтай самай касцянкай Якуб Колас. Ён чыта.. з «Новай зямлі» «Раніцу .. нядзельку», «Дзядзьку .. Вільні».

А як скончы.., мужчыны падкідалі яго на «..ра» і гэтак на руках да самай школы неслі.

Не ведаю, з таго часу ці раней яшчэ, але .. нашай хаце «Раніцу .. нядзельку» ..се ведалі на памяць *(Паводле А. Васілевіч)*.

120. Пісьмова перакладзіце тэкст на беларускую мову.

Крытый футбольный манеж в Минске — это универсальный спортивно-оздоровительный комплекс, включающий футбольное поле, тренировочные залы и беговую дорожку. Варианты трансформации зала позволяют проводить соревнования по футболу, регби, гандболу, баскетболу, волейболу, теннису, а также выставки, концерты, дискотеки. При трансформации футбольного поля травяное покрытие защищается специальным настилом, на котором устанавливаются трибуны. Арена по периметру окружена пространством фойе с гардеробами. На четырёх этажах размещены четыре бассейна с разно-

Правообладатель Национальный институт образования

образными устройствами, каскадами, тренажёрные залы, косметические салоны, бани и сауны *(По энциклопедическому справочнику «Современная Беларусь»)*.

Слоўнік

защищаться — тут: *засцерагацца*
пространство — *прастора*
устройство — тут: *устройства, прылада, абсталяванне*

Карыстаючыся прыведзенай у тэксце інфармацыяй, дакажыце, што футбольны манеж у Мінску — універсальны спартыўна-аздараўленчы комплекс.

Практ. 120–1

§ 15. Правапіс *д* і *дз*, *т* і *ц*

121. Размяркуйце словы на чатыры групы ў адпаведнасці з правіламі правапісу ***д*** і ***дз***, ***т*** і ***ц***. Сфармулюйце правілы.

Цікавы, цвік, дыктант, сцяна, тэарэма, камандзір, абедзве, дзюба, жакецік, дыплом, подзвіг, мушкецёр, падзея, бамбардзір, чацвер, артылерыя.

У беларускай мове літары ***д***, ***т*** пішуцца для перадачы на пісьме цвёрдых зычных гукаў [д], [т], а ***дз***, ***ц*** — для перадачы мяккіх зычных гукаў [дз’], [ц’].

1. Чаргаванні [д] — [дз’] (дзеканне) і [т] — [ц’] (цеканне) адбываюцца:
   - перад галоснымі ***е, ё, ю, я, і***: *народ — у народзе*, *карта — на карце*;
   - перад мяккім [в’]: *два — дзве*, *чэрствы — счарсцвелы*;
   - перад суфіксамі і спалучэннямі суфіксальнага паходжання *-ін-, -ір-, -ік-, -ёр-, -еец-, -ейск-, -ірава-* ў іншамоўных словах, а таксама ў словах, вытворных ад іх: *каманда — камандзір*, *білет — білецёр* (а л е: *Індыя — індыец*, *індыйскі*).

2. ***Дз*** і ***ц*** пішуцца згодна з вымаўленнем перад [в’]: *дзверы*, *чацвер*, *подзвіг*, *мядзведзь*, *Дзвіна*, *Мацвей* (а л е: *твіст*, *Ядвіга*).

3. Прыставачны [д] і суфіксальны [т] перад [в’] перадаюцца адпаведна літарамі ***д*** і ***т***: *адвезці*, *падвязаць*; *у выдавецтве*, *аб прыродазнаўстве*.

Літары ***д*** і ***т*** перад мяккім [в’] пішуцца і ў некаторых іншых словах: *мардва* — мардвін*, *Літва — у Літве*.

Правообладатель Национальный институт образования

4. У пераважнай большасці слоў іншамоўнага паходжання ў адпаведнасці з літаратурным вымаўленнем пішуцца ***д*** і ***т***: *сту**д**энт*, *апла**д**ысменты*, *а**т**эстат*, *універсі**т**эт*.

У некаторых словах іншамоўнага паходжання ў адпаведнасці з традыцыяй і літаратурным вымаўленнем пішуцца ***дз, ц***: *мун**дз**ір*, ***дз**юшэс*, *бар**дз**юр*, ***ц**ір*, *э**ц**юд*, ***ц**юльпан*, *каран**ц**ін* і інш.

5. Ва ўласных назвах ***д, т*** і ***дз, ц*** пішуцца ў адпаведнасці з літаратурным вымаўленнем: *Лю**д**міла*, ***Д**эфо*, *Бал**т**ыка*, *Ва**т**ыкан*, *Антарк**т**ыда*, ***Т**эрэза*, ***Дз**ікенс*, *Хрыс**ц**іна*, *Арген**ц**іна*.

122. Запішыце словы ў два слупкі, выбіраючы з дужак патрэбныя літары: 1) словы з ***д, т***; 2) словы з ***дз, ц***.

*(Д/дз)*веры, бамбар*(ды/дзі)*раваць, *(дэ/дзе)*по, прак*(ты/ці)*кант, каман*(ды/дзі)*роўка, *(дэ/дзе)*путат, *(тэ/це)*левізійны, *(дэ/дзе)*кабрысты, ап*(тэ/це)*ка, *(Ты/Ці)*бет, апла*(ды/дзі)*сменты, *(ды/дзі)*ялект, тэф*(тэ/це)*лі, Лю*(д/дз)*міла, *(ты/ці)*раж, *(Тэ/Це)*ляханы, Палес*(ты/ці)*на.

ДЫЯЛЕКТ — ДЫЯЛЕКТЫЗМ

Дыяле́кт — гаворка, пашыраная на пэўнай тэрыторыі; мясцовая разнавіднасць мовы: *паўднёва-заходні дыялект*.

Дыялекты́зм — слова або моўны зварот якога-небудзь дыялекту ў літаратурным творы: *ужыванне дыялектызмаў*.

Няправільнае ўжыванне: *у рамане шмат дыялектаў* (правільна: *шмат дыялектызмаў*).

Практ. 122–1

123. Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс слоў з ***д, дз, т, ц***.

1. Д..ед вывеў мяне на *(це/тэ)*расу, якая спускалася ў парк *(З. Бядуля)*. 2. Выбіраем ад курса *(дзе/дэ)*легацыю і спачатку ід..ём да *(дзе/дэ)*кана факуль*(тэ/це)*та *(А. Васілевіч)*. 3. Я*(д/дз)*віся слухае, як шумяць за акном дрэвы *(М. Лынькоў)*. 4. Данік Васіль пабыў брыга*(ды/дзі)*рам два гады, а пасля стаў радавым калгаснікам[сн] *(А. Алешка)*. 5. Мікіта ўсё час*(т/ц)*ей прападаў у экспе*(дзі/ды)*цыях і розных каман*(дзі/ды)*роўках *(А. Ветах)*. 6. Квітнею*(т/ц)*ь на двары *(ту/цю)*льпаны *(А. Зэкаў)*. 7. Рэгіна моўчкі па..шла да *(д/дз)*вярэй *(В. Кадзетава)*.

Правообладатель Национальный институт образования

124. Пісьмова перакладзіце тэкст на беларускую мову.

Кинотеатр-мультипле́кс «Беларусь»

Первый в Минске кинотеатр-мультиплекс «Беларусь» с пятью зрительными залами и общим количеством мест более тысячи открылся 13 сентября 2008 года на месте бывшего здания одноимённого кинотеатра.

Кинозалы мультиплекса оборудованы специальной системой демонстрации фильмов. Она позволяет транслировать один фильм одновременно во всех кинозалах со смещением времени показа от 15 до 30 секунд либо организовать в каждом зале индивидуальный просмотр. Для достижения идеального звукового комфорта и в залах, и в аппаратной мультиплекса предусмотрены акустические подвесные потолки. Залы, как лепестки цветка, расположены вокруг ядра — кинопроекционной, а сам мультиплекс выполнен в форме эллипса. На первом уровне двухэтажного кинотеатра находятся кинозалы, кассы, буфет, торговые павильоны, игровой центр, на втором — служебные и технические помещения. Все интерьеры выполнены в стиле минимализма. Здание удачно вписывается в окружающую застройку и природный ландшафт *(По фотоальбому «Беларусь созидающая»)*.

Слоўнік

кинопроекционная — *кінапраекцыйная*
мультиплекс — *мультыплекс**
подвесной — *падве́сны*
смещение — *зрушэнне*

125. Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Назавіце моўныя сродкі, характэрныя для гэтага стылю.

Поўня

В..чарэе. Пры*(т/ц)*емкавая шэрань перахо*(д/дз)*іць у густаватую і *(т/ц)*ёплую, як *(з/с)*гатаваны ра*(сс/с)*ол, ноч. Лё..кая, ле*(д/дз)*ь улоўная стылас*(т/ц)*ь а..чуваецца ў пах..ладалым паветры. Аз..рцо выдыхнула з с..бе празрыстую тканіну туману. Павісла яна, зачапіўшыся[с] за в..ршалі́нкі аеру, над самай вадою, а пас*(?)*ля, бы*(цц/ц)*ам апам..таўшыся, папаўзла на бліжэйшыя кусты вербало*(зз/з)*я ў нізінках, абла*(с/ш)*чыла шурпатую паверхню валуноў і датыкнулася да разбура*(нн/н)*ых рэшткаў замка. З*(?)*за далёкага грэбня лесу, які, бы*(цц/ц)*ам затупле*(нн/н)*ыя пікі, па*(д/т)*піраў неба, паказаўся

Правообладатель Национальный институт образования

ярка*(?)*пурпурны краёчак начнога св..ціла. Палахлівай, ле*(д/дз)*ь заўважнай паз..лотаю асвя*(т/ц)*іліся[с] ні*(з/с)*кія, з фі..летавым адлівам хмары, падобныя да падрыхтава*(нн/н)*ай для пра*(д/дз)*іва ку*(д/дз)*елі. На *(не)*далёкай лугавіне, у тумановым малацэ, раптам у*(з/с)*крыкнуў драч.

Поўня дастойна, з гонарам выплывала, узбіралася на неба. Вось яна вялізным дыскам павісла над лесам. І ўжо праз імгненне ўспаўзла на сярэдзіну неба, адразу заліла наваколле казачным святлом, якое адначасова зачароўвала і наводзіла страх *(Паводле А. Казлова)*.

Спішыце першы абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс ***д*** і ***дз, т*** і ***ц***.

Якія вы ведаеце назвы фаз Месяца ў беларускай мове?

Практ. 125–1

§ 16. Правапіс падоўжаных зычных

126. Вусна адкажыце на пытанні, прывядзіце прыклады.

У якім становішчы зычныя гукі могуць вымаўляцца падоўжана?

Як на пісьме перадаецца падоўжанае вымаўленне зычных гукаў?

Якое спалучэнне літар выкарыстоўваецца для перадачы на пісьме падоўжанага гука [дз’]?

У якіх словах зычныя гукі звычайна не падаўжаюцца?

1. У беларускай мове ў становішчы паміж галоснымі зычныя гукі [з’], [л’], [н’], [с’], [дз’], [ц’], [ж], [ш], [ч] могуць вымаўляцца падоўжана. Такое іх вымаўленне на пісьме перадаецца падвоеным напісаннем адпаведных літар: *палоззе*, *соллю*, *насенне*, *калоссе*, *пяццю*, *збожжа*, *узвышша*, *ноччу*. Падоўжаны гук [дз’] перадаецца на пісьме спалучэннем літар ***ддз***: *суддзя*, *стагоддзе*.

2. Падаўжэнне зычных не адбываецца ў словах *Ілья*, *Ульяна*, *Касьян*, *Емяльян*, *Юльян*, *Юльяна* і вытворных ад іх: *Ілыч*, *Ульянаў*, *Касьянавіч*, *Емяльянавіч* і інш., а таксама ў словах, утвораных ад дзеяслова *ліць*: *лье*, *вылью*, *налью*.

3. У запазычаных словах і вытворных ад іх, у тым ліку ва ўласных імёнах і назвах, падвоеныя літары звычайна не пішуцца: *калектыў*, *сума*, *група*, *калона*, *Ала*, *Іна*, *Кірыл*, *Генадзь*, *Адэса*, *Марока*, *Ніца*.

Выключэнне: ***ванна***, ***манна***, ***панна***, ***бонна****, ***мадонна***, ***мецца-сапрана****, ***саванна***, ***Ганна***, ***Жанна***, ***Сюзанна***, ***Мекка*** і інш.

Правообладатель Национальный институт образования

127. Запішыце словы, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары.

Кал..екцыя, палоз..е, дванац..аць, гнездаван..е, узбярэж..а, бар..ыкада, тон..а, рал..я, Іл..іч, пер..он, сён..я, мас..аж, ван..а, пас..ажыр, пісьмен..ік, нал..ю, навакол..е, раўнадуш..а, прамен..е, адзен..е, пытан..е, Ул..янавіч, развод..е, тэр..ыторыя, грам..атыка, Палес..е, абліч..а, світан..е, эф..ектыўны, раздол..е.

ЭФЕКТНЫ — ЭФЕКТЫЎНЫ

Эфе́ктны — які робіць моцнае ўражанне: *эфектны выгляд*.

Эфекты́ўны — які прыводзіць да пажаданых вынікаў; дзейсны: *эфектыўныя лекі*.

128. Устаўце ў фразеалагізмы прапушчаныя кампаненты — словы з падоўжанымі зычнымі. Запішыце. Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннямі.

1) ні днём ні …
2) не … дык заўтра
3) як на гарачым …
4) пуцёўка ў …
5) пускаць …
6) пад стол … ходзіць

а) ‘у стане крайняга хвалявання, неспакою, трывогі’
б) ‘трывала асталёўвацца дзе-небудзь, уладкоўвацца на доўгі тэрмін’
в) ‘зусім малы, малалетні’
г) ‘падтрымка на пачатку якой-небудзь дзейнасці’
д) ‘ніколі, увесь час’
е) ‘вельмі хутка, у бліжэйшы час (будзе што-небудзь)’

Для даведкі: *жыццё, пешшу, ноччу, вуголле, карэнне, сёння.*

З двума фразеалагізмамі (на выбар) складзіце і запішыце сказы. Разбярыце іх па членах сказа.

129. Прачытайце верш. Якім настроем ён прасякнуты?

І калі разальецца ранне
Чысцінёй некранутай над светам,
Паспяшаю зноў на спатканне
Я са шчодрым сунічным летам.

Спеў птушыны чуецца звонкі,
І нібыта рассыпаў хтосьці[м]
На паляне ягады-зоркі
Невымоўнае прыгажосці.

Правообладатель Национальный институт образования

Як прыемна з кошыкам поўным
Нетаропка дамоў вяртацца.
Водар лесу такі чароўны
Будзе доўга мне ўспамінацца.

Н. Цвірко.

Успомніце, чым адрозніваецца падаўжэнне зычных ад падваення. Выпішыце з верша спачатку словы з падаўжэннем зычных, а затым — з падваеннем. Дапоўніце кожны радок слоў уласнымі прыкладамі.

Падбярыце эпітэты да слова *лета (шчодрае, сунічнае...)*.

130. Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак у адпаведнасці з тэмай.

У пачатку восені балота, нібы праменнем[м], падсвечана ягаднай чырванню. Пацеркамі рассыпаны ў імху журавіны. Бруснічнік далікатна трымае ў лакіраваных далоньках свае нясмела-ружовыя гроначкі.

— Сюды! — кліча ягадніка купінка, аплеценая нітачкамі журавінніку.

— Не, сюды! — зваблівае* яе шыкоўная суседка, якая ў зарасніку багуну беражэ саспелыя буйны́я ягады.

Ажно вочы разбягаюцца, сэрца вырываецца з грудзей, а рукі шчыруюць у сівым імху ў знаёмай толькі сапраўдным ягаднікам спешцы *(Паводле А. Масла)*.

Выпішыце з тэксту словы з падаўжэннем і падваеннем зычных. Карыстаючыся гэтымі словамі як апорнымі, пісьмова перакажыце тэкст.

- Знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы.

Раскрыйце значэнні ўжытых у тэксце фразеалагізмаў.

131. Прачытайце тэкст. Назавіце сказ, у якім сфармулявана яго асноўная думка. Спішыце, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце іх правапіс.

Як быў я малы, разро*(с/сс)*я пад Сумлічамі куст шыпшыны. А калі я ішоў на в..йну, куст быў ужо ц..лым зара*(с/сс)*нікам. Пакутуючы душой у той праклятай Няме..чыне, я толькі і думаў пра Волечку і пра тую шыпшыну. Без Волечкі і без шыпшыны няма для мяне і роднай Бацькаўшчыны[л]. Для мяне будзе радасць, калі я прайду паўз той зара*(с/сс)*нік, уваходз..чы ў Сумлічы. На мой розум, толькі той ч..лавек, хто, калі яго вырвуць з роднага месца, будзе рва*(ц/цц)*а

Правообладатель Национальный институт образования

туды, пакуль жывы. Няма мне жы*(ц/цц)*я там, дзе не расце тая шыпшына, што ў маім мален..тве цешыла мне вочы. Лепш гры*(с/з)*ці з..млю ў родным кутку, чым каб цябе ліхім ветрам кідала па чужым свеце *(Паводле К. Чорнага)*.

Што сімвалізуе шыпшына ў тэксце?

Прывядзіце прыклады беларускіх прыказак, сэнс якіх перадае думку, выказаную ў апошнім сказе тэксту.

Запішыце 5-7 назваў населеных пунктаў Беларусі з падоўжанымі зычнымі.

- Як вымаўляецца прыназоўнік *без* у спалучэннях з назоўнікамі (*без Волечкі, без шыпшыны* і да т. п.)?

Практ. 131–1

§ 17. Правапіс некаторых спалучэнняў зычных

132. Разгледзьце схемы. Сфармулюйце правілы правапісу спалучэнняў зычных. Прывядзіце ўласныя прыклады.



1. У беларускай мове ў асобных словах адбылося спрашчэнне груп зычных: гістарычныя спалучэнні ***здн, згн, стн, скн, стл, рдн, рдц*** вымаўляюцца як ***зн, сн, сл, рн,*** што перадаецца на пісьме:

- ***здн — зн***: *выязны* (параўн.: *выезд*), *позна*, *спазніцца*;
- ***згн — зн***: *бразнуць* (параўн.: *бразгаць*);
- ***стн — сн***: *посны* (параўн.: *пост*), *кантрасны* (параўн.: *кантраст*);
- ***скн — сн***: *бліснуць* (параўн.: *бліскаць*), *пырснуць* (параўн.: *пырскаць*); а л е: *віскнуць*, *націскны*;
- ***стл — сл***: *шчаслівы* (параўн.: *шчасце*), *помслівы* (параўн.: *помста*);
- ***рдн — рн, рдц — рц***: *міласэрны*, *сэрца* (параўн.: *сардэчны*).

2. Спалучэнні зычных ***ск, ст, сц*** [с’ц’] на канцы кораня слова могуць чаргавацца з ***шч***, што і перадаецца на пісьме: *воск — вашчыць*, *густы — гушчар*, *хрысціць — хрышчоны* (а л е: *пясчаны, пясчынка*, *пясчанік* [шч]).

3. Спалучэнне зычных ***дт*** на канцы слоў іншамоўнага паходжання перадаецца праз ***т***: *Кранштат*, *Шміт*.

Правообладатель Национальный институт образования

133. Запішыце словы, устаўляючы, дзе трэба, літару ***д*** або ***т***.

Праяз..ны, быць праез..ам, вус..ны, неміласэр..ны, пахіс..нуцца, хіс..ацца, свіс..нуць, разас..ланы, колькас..ны, бязлітас..ны, фарпос..ны, Рэмбран..т, пачэс..ны, няўрымс..лівы, сэр..ца.

134. Запішыце словы, якія адпавядаюць прыведзеным значэнням.

1. Вечарынка ў акцёраў, студэнтаў і іншых з самадзейнымі нумарамі жартаўліва-парадыйнага зместу. 2. Схільнасць да спагады іншым, да літасці над кім-небудзь. 3. Цэнтральнае нябеснае цела Сонечнай сістэмы, якое з'яўляецца гіганцкім вогненным шарам, што вылучае святло і цяпло. 4. Які мае адносіны да вобласці, належыць ёй. 5. Той, якому дадзена шчасце, які мае, адчувае шчасце, радасць, захапленне ад чаго-небудзь. 6. Ежа без мяса і малака, не скаромная; якую ўжываюць у час паста. 7. Заснаваны на кантрасце. 8. Які дае права на праезд якім-небудзь відам транспарту.

135. Запішыце словазлучэнні па-беларуску.

Присвистнуть от удивления, постное блюдо, застлать пол, крёстная мать, безжалостный поступок, крепостной вал, ненавистное место, полезные продукты, качественные прилагательные, количественные числительные, предложный падеж.

136. Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып. Якую ролю адыгрываюць у тэксце прыметнікі — назвы колераў?

*(Дз/д)*ень у В..нецыі

С..рабрысты туман прыглушыў а пас..ля і *(з/с)*хаваў *(не)*звычайную кар*(т/ц)*іну якую можна ўбачыць назіраючы за небам В..нецыі і в..дой яе каналаў. С..рабрысты туман пагл..нуў п..рламутравыя адценні[ф] ружовай ласкавасці і блакітнай пя..чоты.

С..рабрыста*(?)*ж..мчужны кол..р. Роўн..дзь заліва *(зз/з)*яе бы*(цц/ц)*ам луска в..лізарнай рыбіны. Толькі на хвіліну бліс..нула *(з)*за аблокаў капрызнае со..нца і вокамгне*(нн/н)*а зм..ніўся гора*(д/т)*.[сн]

У*(з/с)*пыхнулі зіхо*(д/т)*кія фарбы неба палацаў с..бораў. Ра*(з/с)*хінуўся ўвесь неб..схіл. Міл..ёны брыл..янтаў радас..на бліскаюць на

Правообладатель Национальный институт образования

вёслах гандол як бы*(цц/ц)*ам кара́лі або пац..ркі *(не)*в..домай русалкі *(Паводле Т. Мушынскай)*.

Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары, раскрываючы дужкі і расстаўляючы знакі прыпынку. Растлумачце правапіс спалучэнняў зычных.

Практ. 136–1

§ 18. Правапіс мяккага знака і апострафа

Змякчальны мяккі знак

137. Размяркуйце пункты правіла правапісу змякчальнага мяккага знака на дзве групы: 1) мяккі знак пішацца; 2) мяккі знак не пішацца. Праілюструйце правілы прыкладамі.

пасля літар, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя	перад мяккім зычным, які пры змене слова або падборы аднакаранёвага слова чаргуецца з цвёрдым	пасля мяккага зычнага перад цвёрдым
пасля мяккага [л’] перад цвёрдым або мяккім зычным	пасля ***з, с, дз, ц*** перад мяккімі зычнымі, калі пры змене слова або падборы аднакаранёвага слова абодва зычныя застаюцца мяккімі або становяцца цвёрдымі	пасля літар ***б, м, п, в, ф, д, т***
		паміж падоўжанымі зычнымі

1. Мяккі знак пішацца пасля літар ***з, л, н, с, ц*** (парны да [т]), ***дз*** (парны да [д]):

- для абазначэння на пісьме мяккасці зычнага на канцы слова: *мазь*, *вучань*, *дзевяць*, *мядзведзь*;
- для абазначэння на пісьме мяккасці зычнага перад цвёрдым, а таксама перад мяккім зычным, які пры змене слова можа чаргавацца з цвёрдым: *рэдзька*, *барацьба*, *пісьменнік — пісьмо*, *дзьме — дзьмуць*;
- пасля мяккага [л’] перад цвёрдым або мяккім зычным, за выключэннем падоўжанага [л’]: *бульба*, *вельмі*, *пальцы* (а л е: *голле*, *вяселле*).

2. Мяккі знак пішацца ў некаторых граматычных формах:

- у дзеясловах загаднага ладу перад канчаткам 1-й асобы множнага ліку ***-ма***, перад постфіксам 2-й асобы множнага ліку ***-це***,

Правообладатель Национальный институт образования

перад постфіксам ***-ся***, калі дзеясловы без гэтых марфем заканчваюцца на мяккі знак: *станьма*, *станьце*, *застаньcя*;

- у назоўніках у форме творнага склону множнага ліку перад канчаткам ***-мі***: *людзьмі*, *слязьмі*, *коньмі*;
- перад суфіксам ***-чык-***, калі слова без гэтага суфікса заканчваецца на мяккі знак: *камень — каменьчык*, *рэмень — раменьчык*, *агонь — агеньчык*;
- перад суфіксам ***-к-*** пасля мяккага [н’]: *вішанька*, *банька*;
- у складаных лічэбніках *пяцьдзясят*, *шэсцьдзясят*, *пяцьсот*, *шэсцьсот*;
- у слове *ледзьве* (як і ў слове *ледзь*);
- у постфіксе ***-сьці***: *хтосьці*, *штосьці*, *дзесьці*, *чамусьці*;
- перад суфіксам ***-ск-*** у прыметніках, утвораных ад назваў месяцаў на ***-нь*** і ад слова *восень*: *жнівень — жніверьскі*, *восень — восеньскі*;
- у суфіксах прыметнікаў ***-аньк-***, ***-еньк-***, ***-эньк-***: *малюсенькі*, *добранькі*, *старэнькі*.

3. Мяккі знак не пішацца:

- пасля зацвярдзелых зычных, а таксама пасля ***б, в, м, п, ф***: *мыш*, *печ*, *голуб*, *верф*, *насып*, *сем*, *стэп*;
- пасля зычных [з’], [с’], [ц’], [дз͡’] перад мяккімі, калі пры змене слова або падборы аднакаранёвага слова абодва зычныя застаюцца мяккімі або становяцца цвёрдымі: *звер — звяры*, *песня — песню*, *дзве — два*, *збіраць — зборы*;
- паміж падоўжанымі зычнымі: *калоссе*, *стагоддзе*, *сумленне*;
- перад суфіксам ***-ск-*** у прыметніках, утвораных ад назоўнікаў на ***-нь***, калі гэтыя назоўнікі не з’яўляюцца назвамі месяцаў: *конь — конскі*, *Любань — любанскі* (а л е: *Чэрвеньскі раён*), *Цянь-Шань — цянь-шанскі*.

138. Прачытайце верш. Вызначце яго асноўную думку. У якіх радках яна сфармулявана?

Дабро ўмее даць штуршок
для мноства самых слаўных дзеяў,
Як лёгка шчодраю душой
камусьці падарыць надзею;
у дзень пахмурны ці ў мароз,
у смуты час і горкай[л] слоты*
святла дадаць у чыйсьці лёс,
кагосьці збавіць ад самоты!

В. Жуковіч.

Правообладатель Национальный институт образования

Выпішыце з верша словы з мяккім знакам, пракаменціруйце іх правапіс. Растлумачце адсутнасць мяккага знака ў выдзеленым слове.

● Займеннікі якога разраду пераважаюць у тэксце? Чым гэта можна растлумачыць?

Складзіце вуснае выказванне на тэму «Дабро ўмее даць штуршок для мноства самых слаўных дзеяў» (тып маўлення — апавяданне).

139. Выпішыце словы, у якіх прапушчаны мяккі знак.

Дз..ве, дз..ме, шыр.., распус..ціцца, піс..мо, ус..мешлівы, Смаргон..скі, ледз..ве, чамус..ці, любан..скі, нас..цеж, Капыл..скі (раён), барац..біт, чэрвен..скі (нумар), пытан..не, сляз..мі, забудз..це, дз..веры, дзядз..ка, старэн..кі, карэн..чык, прыгожан..кі, свежас..ць, завез..ці, людз..мі, застан..ся, сем.., мен..шы.

140. Утварыце ад прыведзеных дзеясловаў формы 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку загаднага ладу, запішыце іх.

Кінуць, звесіць, злезці, сустрэць, застацца, прыгледзецца, намыліцца.

Губныя зычныя ([б], [м], [п], [в], [ф]) на канцы слова ў беларускім вымаўленні толькі цвёрдыя: *накіп*, *сем*, *верф*. Перад наступным [й] яны таксама цвёрдыя: [пйу] *(п'ю)*, [в'эрабйі́] *(вераб'і)*, [с'амйа́] *(сям'я)* (Паводле Ф. Янкоўскага).

141. Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль, абгрунтуйце сваю думку.

Спішыце тэкст, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі.

Раптам тонен..ка загучала[с] адна струна скрыпкі, другая, трэцяя, і С..цепаніда пазнала П..тракову руку́. На што іншае ён быў не надта каб здатны, але іграць умеў, як рэ*(д/т)*ка хто іншы. З хаты п..вуча пац..кла музыка любімай ёю «Купалінкі». С..цепаніда *(не)*стрымалася, з ..ачэй выплыла адна за адной некал..кі с..лязін, яна хуцен..ка с..церла іх з твар.. ра*(ж/ш)*ком хусткі і зноў стаілася. П..трок іграў слаўна, чыста і нават старан..а, як некалі іграў м..лады на в..чарынках *(Паводле В. Быкава)*.

● Зрабіце фанетычны запіс спалучэння слоў *не надта*.

Правообладатель Национальный институт образования

Раздзяляльны мяккі знак і апостраф

142. Устанавіце адпаведнасць паміж пунктамі правіла і прыкладамі напісання раздзяляльнага мяккага знака і апострафа.

1) Раздзяляльны мяккі знак пішацца пасля мяккіх зычных перад літарамі ***е, ё, ю, я, і***, калі яны абазначаюць два гукі.
2) Апостраф пішацца перад літарамі ***е, ё, ю, я, і*** пасля прыставак, якія заканчваюцца на зычны.
3) Апостраф пішацца ў сярэдзіне слова пасля зычных, акрамя ***з, л, н, с, ц, дз***.
4) Пасля літары ***ў*** апостраф не пішацца.

а) бар’ер, інтэрв’ю
б) прыслоўе, здароўе
в) мільярд, шампіньён
г) пад’ехаць, аб’яднанне

1. **Раздзяляльны мяккі знак пішацца** пасля зычных ***л, с, ц*** (парны да [т]), ***дз*** (парны да [д]) і непрыставачных ***н*** і ***з*** перад галоснымі ***е, ё, ю, я, і***:

- у словах іншамоўнага паходжання: *кальe*, *канферансье*, *каньён* (а л е: *булён*);
- ва ўласных імёнах і назвах, утвораных ад імёнаў на ***-ій (-ый)***, перад суфіксальным ***-еў- (-ев-)***: *Васільеў*, *Арсеньевіч*, *Анатольеўна*;
  Заўвага. Пасля ***г, к, х*** і збегу зычных, акрамя ***нц***, перад суфіксальным ***-еў- (-ев-)*** пішацца ***і (ы)***: *Георгіеў*, *Ануфрыевіч*, *Дзмітрыеўна* (а л е: *Вікенцьевіч*, *Лаўрэнцьеўна*, *Кліменцьевіч*).
- у словах *Ілья*, *Ульяна*, *Касьян*, *Емяльян*, *Юльян*, *Юльяна* і вытворных ад іх: *Ільін*, *Ульянаўск*, *Касьянавіч*, *Емяльянавіч*;
- у словах, утвораных ад дзеяслова *ліць*: *льецца*, *разалье*, *падальюць*.

2. **Апостраф пішацца:**

- пасля прыставак, якія заканчваюцца на зычны, перад ***е, ё, ю, я*** і націскным ***і***: *аб’езд*, *з’едлівы*, *раз’юшаны*, *між’ярусны*, *аб’і́нець*;
- у сярэдзіне слова пасля губных ***б, м, п, в, ф*** і іншых зычных, акрамя ***з, л, н, с, ц*** (парны да [т]), ***дз*** (парны да [д]): *аб’ём*, *куп’істы*, *п’еса*, *надвор’е*, *Дзям’ян*, *Лук’янаў*, *Пракоф’еў*, *В’етнам*;
- у складаных словах пасля частак ***двух-, трох-, чатырох-, шмат-***: *двух’ярусны*, *шмат’ёмісты*.

Правообладатель Национальный институт образования

3. **Апостраф не пішацца:**

- пасля ***ў*** перад літарамі ***е, ё, ю, я, і***: *салаўі*, *разнатраўе*, *любоўю*;
- у складаных і складанаскарочаных словах на мяжы састаўных частак, у тым ліку калі яны пішуцца праз злучок: *дзяржюрвыдавецтва*, *трэд-юніён**.

143. Размяркуйце словы на групы ў адпаведнасці з правіламі правапісу мяккага знака і апострафа. Запішыце, устаўляючы мяккі знак або апостраф.

Брыл..янт, ліпен..скі, трох..ярусны, пер..е, дз..муць, аб..інець, парц..ера, раз..юшаны, п..еса, прэм..ер, бракан..ер, выл..юць, п..едэстал, хадз..ба, кал..цый, ад..ютант, надвор..е, кан..ён, кар..ера, італ..янец, Емял..ян, Соф..я.

144. Падбярыце да слоў беларускія адпаведнікі, запішыце, растлумачце іх правапіс.

Объект, полынь, серьёзный, семья, пятьюдесятью семью, июньский, Григорьева, Арсеньев, Кордильеры, Мольер, соловьи, пьеса, восемьсот, объезд, барьер, почтальон, Нарочь, надпись, рельеф, сольфеджио, Сибирью, созвездие, Двина, Загорье, миллиард, Вьетнам, бильярд, верфь, восемь.

145. Спішыце прыказкі, устаўляючы, дзе трэба, мяккі знак ці апостраф.

1. У вераб..я багатая сям..я: у кожнага верабейкі па тры капейкі. 2. Пан з панам б..ецца, а ў мужыка чуб трашчыц.. . 3. І печанае рэдз..кі з..ясі, калі выгаладаешся. 4. Свае б..юцца, а чужы не ўмешвайся. 5. Розум не куле́ш*, у галаву не ўвал..еш. 6. Бачылі вочы, што бралі, а цяпер плач..це, хоць павылаз..це. 7. Мёд на стале — здароў..е ў доме. 8. На малацэ апарыўся, то і на халодную ваду дз..мухае. 9. У роднай староначцы птушкі пяюц.., а ў чужой староначцы часта слёзы л..юць.

Растлумачце сэнс прыказак.

146. Прачытайце тэкст. Абгрунтуйце яго падзел на абзацы. Дайце тэксту загаловак.

Спішыце, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі.

Летам я зноў прыехала ў родную вёску.

Ст..яла сп..кота. *(Н..)*гледзячы на чэрв..нь, у сівіз..не ліс..ця вербаў, што тужліва выц..гнуліся ў*(з/с)*доўж в..сковай вуліцы, праглядвала

Правообладатель Национальный институт образования

ж..ўцізна. Тол..кі аднойчы пра..шоў *(н..)*вялікі дож.., які скупа апырскнуў высуша*(н/нн)*ы *(да)*бяла п..сок.

Ап..каючы ступні, я х..дзіла басано*(ж/ш)*. *(Што)*год, ад пачатку лета да вос..ні, у любое надвор..е, як у г..рачыню, так і ў дні, калі л..е дож.., я ігнаравала абутак. А..чувала, што такім чынам, праз дакрана*(н/нн)*е, пранікае[м] ў м..не не..кая ас..блівая пя..чота роднай з..млі. Цэлы го*(д/т)* я сумавала па ёй. Калі прыя..джала ў вёску, дык разувалася проста на станцыі, каб вось так, басано*(ж/ш)*, х..дзіць да ад..езду[сл] *(Паводле Н. Касцючэнка)*.

Растлумачце правапіс слоў з мяккім знакам і апострафам.
Ці падабаецца вам хадзіць басанож? Раскажыце пра свае адчуванні.

Практ. 146–1

§ 19. Правапіс вялікай і малой літар

147. Размяркуйце словы (спалучэнні слоў) на групы ў адпаведнасці з правіламі правапісу вялікай і малой літар, запішыце. Сфармулюйце правілы правапісу слоў кожнай групы.

Возера Дрывяты, балет «Стварэнне свету», Даўгінаўскі тракт, Вілейскае вадасховішча, Брэсцкі чыгуначны вакзал, Юбілейная плошча, Заходняя Дзвіна, Цэнтральны дом афіцэраў, опера «Сівая легенда», вуліца Зарэчная, фестываль «Чароўны свет мастацтва», Беларуская дзяржаўная філармонія.

З вялікай літары пішуцца:

- прозвішчы, імёны, імёны па бацьку, псеўданімы, мянушкі, клічкі жывёл і інш.: ***Іван Дамінікавіч Луцэвіч (Янка Купала)***, ***Дунін-Марцінкевіч***, *мядзведзь* ***Бурык***, а таксама прозвішчы, імёны ў множным ліку, калі яны выступаюць як назвы роду, групы асоб ці ўжываюцца ў значэнні агульнай назвы: *браты* ***Гарэцкія***, *род* ***Радзівілаў***, *бязродныя* ***Іваны*** (а л е: *гарлахвацкія*, *кручковы*, калі перадаюць пагардлівыя, зневажальныя адносіны);
  Заўвага. Назвы нацыянальнасцей, плямён, а таксама словы, якія паказваюць на месца пражывання, пішуцца з малой літары: *беларус*, *дрыгавічы*, *мінчанін*.
- геаграфічныя, дзяржаўныя, адміністрацыйна-тэрытарыяльныя і астранамічныя назвы (акрамя слоў з родавым значэннем: *рака*, *возера*, *горад*, *вастраў*, *вуліца*, *плошча*, *вобласць*, *раён*,

Правообладатель Национальный институт образования

зорка і г. д.): ***Рэспубліка Беларусь***, ***Балканскі паўвостраў***, *возера* ***Нарач***, ***Гомельская вобласць***, ***Прывакзальная плошча***;

- назвы дзяржаўных органаў і арганізацый:
  а) усе словы ў найменнях вышэйшых органаў заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады: ***Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь***, ***Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь***;
  б) першае слова ў найменнях рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых арганізацый: ***Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь***, ***Міжнародны алімпійскі камітэт***, ***Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі***;
  в) простыя і састаўныя ўласныя назвы ў складзе ўласных найменняў дзяржаўных органаў і іншых арганізацый: ***Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь***, ***Таварыства Чырвонага Крыжа***;
  г) слова *Савет* у значэнні органа ўлады: *Мінскі абласны* ***Савет дэпутатаў***, *сельскі* ***Савет дэпутатаў*** (а л е: *сельсавет*);
  д) словы *Дом*, *Палац* у пачатку наймення ўстановы: ***Дом культуры***, ***Дом народнай творчасці***, ***Палац спорту*** (а л е: *Лядовы* ***палац***, ***дом адпачынку***).

148. Спішыце выразы, раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс вялікай і малой літар.

Марыя Складоўская-*(К/к)*юры, *(Б/б)*ярэзінскі *(Б/б)*іясферны *(З/з)*апаведнік, маёнтак *(Т/т)*ышкевічаў, *(Н/н)*алібоцкая *(П/п)*ушча, *(М/м)*лечны *(Ш/ш)*лях, народы *(П/п)*оўначы, *(П/п)*алац *(М/м)*астацтваў, Давыд-*(Г/г)*арадок, *(А/а)*рганізацыя *(А/а)*б'яднаных *(Н/н)*ацый, *(К/к)*рывічы, вёска *(К/к)*рывічы, *(М/м)*інска-*(М/м)*аладзечанскае *(У/ў)*звышша, *(Б/б)*рэсцкі *(Д/д)*зяржаўны *(У/ў)*ніверсітэт *(І/і)*мя А. С. Пушкіна, *(Т/т)*улягі, *(Д/д)*ом *(Л/л)*ітаратара.

149. Складзіце слоўнікавы дыктант (35—40 слоў), уключыўшы ў яго словы (спалучэнні слоў), якія пішуцца з вялікай або малой літары. Прадыктуйце іх вашаму аднакласніку. Запішыце слоўнікавы дыктант, складзены ім. Выканайце ўзаемаправерку.

Практ. 149–1

З вялікай літары пішуцца:

- аднаслоўныя ўласныя назвы і першае слова ў састаўных назвах кніг, газет, часопісаў, устаноў, арганізацый, заводаў, караблёў, марак машын (бяруцца ў двукоссе): *часопіс «****Бярозка****»*, *аўтамабіль «****Джылі****»*, *хлеб «****Водар****»*;

Правообладатель Национальный институт образования

Заўвага. Назвы саміх вырабаў, акрамя назваў, што супадаюць з асабовымі і геаграфічнымі назвамі, пішуцца ў двукоссі з малой літары: *«**а**тлант»* (халадзільнік), *«**г**арызонт»* (тэлевізар), а л е: *«**С**партак»* (шакалад), *«**П**алессе»* (трыкатаж);

- аднаслоўныя ўласныя назвы і першае слова ў састаўных назвах знамянальных падзей і дат, перыядаў і эпох, свят: ***Адраджэнне***, ***Першая (Другая) сусветная вайна***; ***Каляды***, ***Новы год***, ***Дзень ведаў***, ***Вялікая субота*** (а л е: *імперыялістычная вайна*, *лютаўская рэвалюцыя*, *кайназойская эра*, *эпоха феадалізму*, *залаты век*, *санітарны дзень*);
- словы або спалучэнні слоў, якія з'яўляюцца афіцыйнымі назвамі асобы па вышэйшых дзяржаўных і рэлігійных пасадах: ***Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь***, ***Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі***, ***Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі***, ***Папа Рымскі***; ***Заўвага.*** У неафіцыйным ужыванні словы *прэзідэнт*, *кароль*, *імператар* пішуцца з малой літары: *сын каралевы*.
- найменні найвышэйшых бостваў у рэлігійных культах, асабовыя імёны заснавальнікаў рэлігійных вучэнняў, біблейскіх асоб, імёны легендарных і міфічных асоб, уласныя назвы казачных істот і герояў літаратурных твораў, назвы культавых кніг: ***Бог***, ***Алах***, ***Святая Троіца***; ***Ісус Хрыстос***, ***Буда***, ***Святы Павел***; ***Геркулес***, ***Зеўс***; ***Калабок***, ***Каза-дзераза***; ***Біблія***, ***Каран***. ***Заўвага.*** З малой літары пішуцца словы *бог*, *гасподзь*, *алах* ва ўстойлівых выразах тыпу *бог яго ведае*, *дай божа*, *дзякаваць богу*, *алах з ім*, а таксама агульныя назвы ўяўных істот: *анёл*, *муза*, *лясун*, *гном*, *троль* і інш.

150. Якія тавары беларускай вытворчасці, на вашу думку, ствараюць пазітыўны імідж нашай краіны? Запішыце 6-8 назваў гэтых тавараў.

З вялікай літары пішуцца:

- усе словы ў назвах дзяржаўных і нацыянальных, ваенных і культурных рэліквій: ***Крыж Ефрасінні Полацкай***, ***Помнік Перамогі***, ***Курган Славы***;
- усе словы ў поўных назвах ордэнаў, медалёў (акрамя слоў *ордэн*, *медаль*, *ступень*): *ордэн* ***Славы*** *I ступені*, ***Георгіеўскі Крыж*** (а л е: *ордэн Дружбы народаў*);
- першае слова ў назвах дзяржаўных сімвалаў, дзяржаўных і міжнародных прэмій, грамат, прызоў і інш.: ***Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь***, ***Нобелеўская прэмія***, ***Кубак свету***.

Правообладатель Национальный институт образования

151. Разгледзьце выявы беларускіх ордэнаў. Суаднясіце іх з інфармацыяй пра тое, за што ўручаюць гэтыя дзяржаўныя ўзнагароды.

ордэн *(В/в)*оінскай славы

ордэн *(П/п)*ашаны

ордэн *(М/м)*аці

ордэн *(А/а)*йчыны

ордэн *(Ф/ф)*ранцыска *(С/с)*карыны

- За выключныя заслугі ў кіраванні войскамі, умацаванні баявой садружнасці з замежнымі дзяржавамі, адвагу і самаадданасць, праяўленыя пры абароне Айчыны;
- за нараджэнне і выхаванне пяцярых і больш дзяцей;
- за вялікія дасягненні ў розных сферах дзейнасці, высокія вытворчыя паказчыкі, плённую дзяржаўную і грамадскую дзейнасць;
- за значныя поспехі ў галіне нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння, асаблівыя заслугі ў гуманітарнай, дабрачыннай дзейнасці, у справе абароны чалавечай годнасці і правоў грамадзян, міласэрнасць і высакародныя ўчынкі;
- за выдатныя дасягненні ў розных сферах дзейнасці, мужнасць і адвагу, праяўленыя пры абароне Айчыны, вялікія заслугі ў развіцці сувязей паміж Беларуссю і іншымі краінамі.

Карыстаючыся прыведзенай інфармацыяй, складзіце і запішыце тэкст на тэму «Ганаровыя дзяржаўныя ўзнагароды».

Практ. 151–1

З вялікай літары пішуцца прыметнікі ва ўласных назвах, калі яны паказваюць прыналежнасць (утвораны пры дапамозе суфіксаў ***-ев- (-ёв-, -ёў-), -ов- (-ав-, -оў-), -ін- (-ын-)*** ад уласных імён, мянушак, клічак жывёл) або ўваходзяць у склад сінанімічных назваў са словамі *імя*, *памяці*: *Купалава паэма*, *Барсікава міска*; *Коласаўская прэмія (прэмія імя Якуба Коласа)*, *Танкаўскія чытанні (чытанні, прысвечаныя памяці Максіма Танка)* (а л е: *коласаўскія мясціны*, *нёманскія краявіды*, *сочынскія курорты*).

Правообладатель Национальный институт образования

З малой літары пішуцца прыметнікі, утвораныя ад асабовых назваў, якія ўжываюцца ў складзе ўстойлівых спалучэнняў або ў складзе састаўных агульных назваў: *геркулесавы слупы*, *танталавы пакуты*, *рэнтгенаўскі здымак*.

152. Складзіце і запішыце сказы з прапанаванымі прыметнікамі. Абгрунтуйце іх напісанне.

Гомельскі і гомельскі, Скарынаўскі і скарынаўскі, Дзяржаўны і дзяржаўны, Куляшоўскія і куляшоўскія, Вялікая і вялікая.

153. Устаўце ў фразеалагізмы прапушчаныя кампаненты-прыметнікі, утвораныя ад асабовых назваў, прыведзеных у дужках. Запішыце. Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннямі.

1) *(Дамокл)* меч
2) *(Ахілес)* пята
3) *(Гордзій)* вузел
4) *(Аўгій)* стайні
5) *(Праметэй)* агонь

а) ‘заблытаная справа, складаныя абставіны’
б) ‘незгасальнае імкненне да высакароднай мэты’
в) ‘пастаянная небяспека, неадступная пагроза’
г) ‘найбольш паражальнае месца, слабы бок у каго-небудзь’
д) ‘вельмі забруджанае месца, запушчанае памяшканне’

Раскажыце пра паходжанне аднаго з фразеалагізмаў (на выбар). Пры неабходнасці выкарыстайце «Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў» І. Я. Лепешава.

154. Прачытайце тэкст. Чаму аўтар сцвярджае, што Беларусь «багата ў чым “першая” і “самая”»?

Мая *(Б/б)*еларусь! Ты багата ў чым «першая» і «самая».

Твая дачка Ефрасіння *(П/п)*олацкая — першая святая жанчына ў *(С/с)*лавянскім свеце.

Першую друкаваную кнігу ва *(У/ў)*сходняй *(Е/е)*ўропе выдаў у 1517 годзе *(Б/б)*еларус Францыск Скарына.

Першую *(Е/е)*ўрапейскую *(К/к)*анстытуцыю напісаў па-беларуску Леў Сапега.

Сучасны друкарскі *(К/к)*ірылічны шрыфт прыдумаў у 1700 годзе *(Б/б)*еларус Ілья Капіевіч.

Анастасія *(С/с)*луцкая — першая *(Б/б)*еларуска-ваяр, абараніла сваё княства ад *(Т/т)*атар у XVI стагоддзі.

Правообладатель Национальный институт образования

Першую ў свеце касмічную ракету вынайшаў у 1650 годзе *(Б/б)*еларус Казімір Семяновіч.

Першая ў свеце жанчына-касманаўт Валянціна Церашкова нарадзілася ў *(Б/б)*еларусі.

На нашым *(П/п)*алессі захаваліся самыя вялікія балоты ў *(Е/е)*ўропе.

Белавежская *(П/п)*ушча — самы буйны́[м] старажытны лес *(Е/е)*ўропы.

Нясвіж належаў роду *(Р/р)*адзівілаў — аднаму з самых багатых у *(Е/е)*ўропе *(Паводле У. Ліпскага)*.

Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс вялікай і малой літар. Пісьмова дапоўніце тэкст інфармацыяй, якая пацвярджае думку аб тым, што наша краіна «багата ў чым “першая” і “самая”» *(У. Ліпскі)*.

Практ. 154–1

§ 20. Правапіс слоў разам, праз злучок і асобна

155. Утварыце і запішыце складаныя словы паводле прапанаваных схем. Вусна растлумачце іх правапіс.

а) Кніга + сховішча = назоўнік;
б) газавая + прамысловасць = назоўнік;
в) высокая + якасць = прыметнік;
г) шмат + галасы = прыметнік;
д) генерал + маёр = назоўнік;
е) кілават + гадзіна = назоўнік;
ж) паўночны + заходні = прыметнік;
з) доўга + доўга = прыслоўе.

Пішуцца разам:

- складаныя назоўнікі, утвораныя пры дапамозе злучальных галосных або без іх: *льнозавод*, *даляглад*, *хлебапякарня*, *філфак*, *медсястра*;
- складаныя словы з першай іншамоўнай часткай ***аэра-, аўта-, авія-, фота-, мота-, вела-, агра-, метэа-, гідра-, сацыя-, спарт-, стэрэа-, неа-*** і інш.: *аэраклуб*, *аўтасалон*, *авіябілет*, *велагонка*, *метэаслужба*, *гідрастанцыя*; а таксама з прыстаўкамі і падобнымі да іх пачатковымі часткамі ***а-, анты-, архі-, гіпер-, дэз-, дыс-, інфра-, звыш-, інтэр-, контр-, супер-, між-, паст-, псеўда-, ультра-*** і інш.: *алагізм*, *антыгуманны*,

Правообладатель Национальный институт образования

архіважны, *дэзактывацыя*, *контрагент* (а л е: *контр-адмірал*), *псеўдакультура*, *супермаркет*, *міжшкольны*;

- назоўнікі з дзеяслоўнай часткай на ***-і (-ы)***: *сарвігалава*, *вярнідуб*, *пакацігарошак* (а л е: *перакаці-поле*, *узвей-вецер*);
- словы са скарочанай пачатковай часткай ***поў- (паў-)***: *поўнач*, *паўгоддзе*, *паўяблыка* (а л е з уласнымі назвамі: *паў-Мінска*, *паў-Камароўкі*);
- складаныя прыметнікі, якія суадносяцца:
  а) са складанымі назоўнікамі, што пішуцца разам: *водаправодны (водаправод)*, *іншаземны (іншаземец)*;
  б) са словазлучэннямі: *агульнаадукацыйны (агульная адукацыя)*, *дрэваапрацоўчы (апрацоўваць дрэва)*;
  в) са спалучэннямі прыслоўя і прыметніка, прыслоўя і дзеепрыметніка, калі яны абазначаюць адно паняцце: *вечназялёны*, *густанаселены*;
  Заўвага. Захоўваюць сваю лексічную самастойнасць перад прыметнікамі і дзеепрыметнікамі прыслоўі, якія ўтварыліся ад адносных прыметнікаў: *асабліва адказны*, *своечасова прыняты*, *адносна спакойны*.
- складаныя лічэбнікі з літарным напісаннем кожнай часткі: *шэсцьдзясят*, *трохсоты*, *двухсотпяцідзесяцімільённы*; але састаўныя лічэбнікі пішуцца асобна: *сто трыццаць сем*, *дваццаць пяты*, *тры шостыя*;
- прыслоўі, утвораныя шляхам спалучэння прыназоўнікаў з іншымі часцінамі мовы: *удвая*, *дабяла*, *здалёку*, *надоўга*, *урассыпную*, *бесперастанку*, *наўздагон*, *паблізу*, *дадому*, *уверсе*, *спачатку*, *звечара*;
  Заўвага. Асобна пішуцца спалучэнні назоўніка з прыназоўнікамі ***без, з, да, па, на, у***, калі пры назоўніку ёсць паясняльнае слова: *з самага ранку*, *з верху дрэва*, *на векі вечныя*.
- прыназоўнікі, якія паходзяць ад прыслоўяў: *насустрач*, *упарадзе*, *услед (услед за бацькам)*;
- злучнікі, якія з'яўляюцца вынікам зліцця прыназоўніка з займеннікам ці словамі *колькі*, *столькі*: *затое*, *прычым*, *паколькі*, але словазлучэнні прыназоўнікаў з адпаведнымі займеннікамі ці неазначальна-колькаснымі словамі пішуцца асобна: *паволі рабіў*, ***затое*** *грунтоўна — за што ўзяў*, ***за тое*** *і аддаў*;
- займеннікі і прыслоўі з постфіксамі ***-сь***, ***-сьці***: *дзесь*, *хтосьці*, *калісьці*.

Правообладатель Национальный институт образования

156. Прачытайце табліцу. Утварыце і запішыце складаныя словы з прыведзенымі ў табліцы часткамі.

Першая частка складаных слоў	Значэнне	Другая частка складаных слоў
метэа-	1) які мае адносіны да метэаралогіі*; 2) які мае адносіны да даследаванняў зямной атмасферы, да метэаралагічных з'яў	*цэнтр, станцыя, назіранні*
агра-	агранамічны	*тэхніка, сядзіба, турызм*
сацыя-	які мае адносіны да грамадства, да навук пра грамадства	*лінгвістыка, псіхалогія*
гідра-	які мае адносіны да вады, воднай энергіі	*касцюм, вузел, пушка*
неа-	новы	*капіталізм, класіцызм, калонія*

Пішуцца праз злучок:

- словы, утвораныя спалучэннем двух аднолькавых, блізкіх або супрацьлеглых па значэнні слоў: *сіні-сіні*, *мама-мамуся*, *дзе-нідзе*, *раз-пораз*, *сям-там*, *больш-менш* (а л е: *з вока на вока*, *дзень у дзень*, *раз за разам* і інш.);
- складаныя словы, першай або апошняй часткай якіх з'яўляюцца лічбы, літары ці літарныя абрэвіятуры любога алфавіта: *70-годдзе*, *9-павярховы*, *α-часціца* (альфа-часціца), *МАЗ-60*;
- складаныя назоўнікі:

  а) утвораныя з дзвюх і больш асноў, якія спалучаюцца без злучальных галосных, а таксама назоўнікі з прыдаткам: *лён-даўгунец*, *жар-птушка*, *сон-трава*, *прэм'ер-міністр*, *норд-ост*;

  б) са значэннем цэласнай адзінкі вымярэння: *тона-кіламетр*, *самалёта-вылет*, *чалавека-дзень* (а л е: *працадзень**);

  в) з пачатковай часткай ***віцэ-, лейб-, максі-, міні-, обер-, унтэр-, штаб- (штабс-), экс-***: *віцэ-прэм'ер*, *міні-матч*, *обер-майстар*, *экс-чэмпіён*;

  г) якія абазначаюць састаўныя імёны, прозвішчы, уласныя геаграфічныя назвы: *Бялыніцкі-Біруля*, *Давыд-Гарадок*, *Растоў-на-Доне*;

Правообладатель Национальный институт образования

- складаныя прыметнікі:
  а) утвораныя ад складаных назоўнікаў, якія пішуцца праз злучок: *генерал-губернатарскі (генерал-губернатар), санкт-пецярбургскі*;
  б) утвораныя з дзвюх і больш асноў, якія абазначаюць раўнапраўныя паняцці: *электронна-вылічальны, мяса-малочны, беларуска-руска-ўкраінскі*;
  в) якія абазначаюць асаблівасці ці адценні разнароднай якасці: *кісла-салодкі, жоўта-зялёны*;
  г) з першай часткай ***усходне-, заходне-, паўднёва-, паўночна-, цэнтральна-***, якая абазначае напрамкі свету ў іх спалучэнні: *паўднёва-ўсходні, паўночна-заходні*;
- лічэбнікі, якія абазначаюць прыблізны лік або ў якіх першая частка напісана лічбамі, а другая — літарамі: *восем-дзесяць гадоў, 2-3 гады́, 25-ы*, на *10-м кіламетры, 10-мільённы*;
- прыслоўі, якія складаюцца з пачатковай часткі ***па-*** і наступнай часткі на канцавыя ***-ку, -і (-ы), -аму (-яму), -ому (-ему), -йму***: *па-беларуску, па-латыні, па-чалавечы, па-мойму*, а таксама словы *па-першае, па-другое* і інш.;
- складаныя прыназоўнікі ***з-за, з-пад, з-над, з-паміж, па-за, па-над***;
- складаныя выклічнікі і гукапераймальныя словы: ***о-го-го, вой-вой, о-ё-ёй, ха-ха-ха, ку-ку***;
- словы з прыстаўкай ***абы-***, постфіксамі ***-небудзь, -колечы (-кольвечы, -кольвек)***, часціцай ***-то***: *абы-хто, як-небудзь, як-колечы, сказаць-то сказаў*;
  Заўвага. Займеннікі *абы-хто, абы-што, абы-які* пры спалучэнні з прыназоўнікамі пішуцца ў тры словы: *абы ў каго, абы з чым, абы з якімі* (а л е: *у абы-каго, з абы-якім*).
  Словы, утвораныя ад прыслоўя *абы-як*, з прыстаўкай *абы-* пішуцца разам: *абыякавы, абыякавасць*.
- часціца ***-такі***, калі яна стаіць пасля дзеяслова: *прыйшоў-такі*, а таксама ў словах *усё-такі, так-такі, зноў-такі, даволі-такі*.

АБЫ-ЯКІ — АБЫЯКАВЫ

Абы-які́ — які-небудзь, усякі; хоць які: *абы-якая вопратка*.
Абыя́кавы — які не выяўляе ніякай цікавасці, увагі да каго-, чаго-небудзь, раўнадушны: *абыякавыя адносіны да працы*.

Правообладатель Национальный институт образования

157. Прачытайце тэкст. Вызначце яго тып.

Бачыў я сон. Іду я нібыта полем. Раса пад нагамі, як срэбра, блішчыць, пераліваецца. А жыта **высокае-высокае** — увесь у ім хаваешся. Каласы **поўныя-поўныя**, аж хіляцца да зямлі і шасцяць, шасцяць[Ф]. А неба **сіняе-сіняе**, ні воблачка на ім. А за возерам сонца ўзыходзіць. Я іду, дыхаю. А паветра **чыстае-чыстае**. І так лёгка мне, так радасна, што заспяваў бы *(Паводле І. Навуменкі)*.

Сфармулюйце правіла, якому адпавядае правапіс выдзеленых слоў.
Якую сэнсава-стылістычную ролю выконваюць у тэксце гэтыя словы?

158. Запішыце словы, якім адпавядаюць прыведзеныя лексічныя значэнні.

1. Папяровая вокладка, што агортвае пераплёт кнігі. 2. У царскай Расіі і некаторых іншых краінах: начальнік края з вышэйшай ваенна-адміністрацыйнай уладай. 3. Былы міністр. 4. Месца размяшчэння вайсковага штаба. 5. Адважны чалавек, а таксама гарэза, свавольнік. 6. Службовае званне намесніка консула. 7. Тое, што не з'яўляецца сапраўдным мастацтвам, а толькі выдаецца за яго. 8. Адзінка вымярэння энергіі і работы, роўная рабоце, што выконваецца за 1 гадзіну пры магутнасці току ў 1 кілават. 9. Удар, які наносяць войскі па арміі праціўніка з мэтай яго разгрому і пераходу ў наступленне. 10. Вакзал аэрапорта.

Для даведкі: *штаб(?)кватэра, контр(?)удар, супер(?)вокладка, псеўда(?)мастацтва, аэра(?)вакзал, кілават(?)гадзіна, віцэ(?)консул, сарві(?)галава, генерал(?)губернатар, экс(?)міністр.*

159. Прачытайце тэкст. Чаму Мінск лічыцца галоўным прамысловым цэнтрам нашай краіны?

Прамысловасць Мінска

Сучасны Мінск галоўны прамысловы цэнтр нашай краіны. Ён размешчаны на перакрыжаван..і гандлёвых шляхоў што звяз..ваюць Балтыку і **Чорнае мора** а таксама Заходнюю і **Усходнюю Еўропу**.

В..лізарны навукова*(?)*тэхнічны і прамысловы патэнцы..л беларускай сталіцы складаецца з **два..цаці пяці тыс..ч** малых і буйных пр..дпрыемстваў. Гэта машына*(?)*будаўнічыя і метала*(?)*апрацоўчыя заводы а так*(?)*сама пр..дпрыемствы электра*(?)*энергетыкі л..сной дрэва*(?)*апрацоўчай хімічнай нафта*(?)*хімічнай галін. Прадукцыя аўтамабільнага падшыпнікавага авія*(?)*рамонтнага трактарнага

Правообладатель Национальный институт образования

маторнага оптыка*(?)*механічнага заводаў в..домая ў многіх краінах свету *(Паводле Н. Гальпяровіча, Н. Ванінай, В. Чаропкі, Т. Сівец)*.

Спішыце тэкст, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары, раскрываючы дужкі і расстаўляючы знакі прыпынку.

Ад выдзеленых слоў і словазлучэнняў утварыце складаныя словы (прыметнікі, лічэбнікі). Запішыце іх.

- Запішыце 3-5 назваў мінскіх заводаў і прадпрыемстваў, пра якія ідзе гаворка ў тэксце.

Пішуцца асобна:

- словы ў састаўных злучніках *таму што*, *так што*, *хіба што*, *як толькі*, *як быццам*, *перш чым*, *гэта значыць*, а таксама ў словазлучэннях, якія ўжываюцца ў ролі пабочных слоў: *можа быць*, *так кажучы*, *такім чынам*;
- часціцы *бы (б)*, *жа (ж)*: *прыйшоў бы*, *прыйшла б*, *казаў жа*, *чаму ж*, а таксама *што* ў спалучэннях *пакуль што*, *амаль што*, *толькі што*, *сама што*, *хіба што*;
- спалучэнні *без дай прычыны*, *усё адно*, *усё роўна*, *як след* (а л е: *якраз*);
- спалучэнні назоўнікаў з прыназоўнікамі: *з размаху*, *без памяці*, *без аглядкі*, *да адвалу*, *на хаду*, *на ляту*, *на памяць*, *на вока*, *пад паху*;
- спалучэнні адмоўяў ***не, ні*** з прыназоўнікамі і назоўнікамі: *не ў пару*, *не ў час*, *не для смеху*, *ні на хвіліну*;
- спалучэнні прыназоўніка ***у*** з назоўнікам, які пачынаецца з галоснага: *у абрэз*, *у адзіночку*, *у абдымку*, *у абхват*.

160. Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі. Растлумачце напісанне слоў разам, праз злучок ці асобна.

1. *(Дзе)*нідзе толькі віднеліся на гэтай н..абсяжнай з..лёнай роўн..дзі асобныя купкі *(бела)*ногіх б..розак, якія стаялі м..сцінамі, як тыя дз..ўчаты ў карагодзе *(П. Броўка)*. 2. Напалеон Орда стаў *(мастаком)*вандроўнікам, аб*(?)*ездзіў амаль *(паў)*Еўропы, кожны раз прывозячы з падарож..аў сотні малюнкаў, акварэляў *(Л. Пракопчык)*. 3. Дзень стаяў ціхі, *(па)*асенняму цёплы і *(па)*летняму празрысты[м] — такія дні ў верасні бываюць даволі часта *(В. Хомчанка)*. 4. Але *(ўсё)* роўна сонца *(з)*за лесу ўзыходзіла і *(за)*лес заходзіла *(І. Навуменка)*. 5. Дзік то ў адным, то ў другім месцы выбіраў *(як)*раз тыя куточкі, дзе лепей за ўсё раслі баравікі і падасінавікі *(З. Бяспалы)*.

Правообладатель Национальный институт образования

161. Спішыце афарызмы, раскрываючы дужкі. Вусна растлумачце іх сэнс.

1. Ды калі ты не бязродны сын — гавары са мной *(па)*беларуску *(Я. Янішчыц)*. 2. Жыві, шукай, усё рабі *(як)*след, каб на Радзіме твой святліўся след *(С. Грахоўскі)*. 3. Усе шляхі вядуць *(да)*хаты, выток шануючы *(с)*прад*(?)*век[сн] *(У. Мазго)*. 4. Жыццё заўжды — іспыт на мужнасць. Яе*(ж)* не возьмеш *(на)*пракат *(Н. Мацяш)*. 5. Быць беларусам — гэта значыць за родны край згараць *(на)*дым, *(па)*беларуску чуць і бачыць *(на)*гэтым свеце і *(на)*тым *(Р. Барадулін)*.

162. Вусна перакладзіце тэкст на беларускую мову.

Вскоре долгожданная Масленица подкатила, настоящая, сибирская: с блинами, пельменями, жаренной в сметане рыбой, вся в бубенцах, в гривастых тройках, с кострами, песнями.

Дня за три-четыре целая орава ребятишек на широкой площади ладила «город» — очень высокий вал из снега, по гребню там-сям ёлочки утыканы. В «прощёное» воскресенье удальцы на конях «город» будут брать.

«Прощёное» воскресенье началось честь честью: православные к обедне повалили. Даже трезвон колоколов точно весёлый пляс. «Четверть блина, четверть блина!» — задорно подбоченивались, выплясывали маленькие колокола. «Полблина, полблина!» — приставали медногорлые середняки. И основательно, не торопясь, бу́хал трёхсотпудовый дядя: «Блин!» *(По В. Шишкову)*.

Слоўнік

бубенец — *бразготка*
выплясывать — *вытанцоўваць, скакаць*
задорно — *з запалам, заўзята*
орава ребятишек — *чарада дзяцей*
основательно — *моцна*
пляс — *скокі*
подбочениваться — *брацца ў бокі*
«прощёное» воскресенье — *«дараваная» нядзеля*
трезвон (колоколов) — *перазвон*
честь честью — *як мае быць*

Практ. 162–1

Запішыце па-беларуску словы з тэксту, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс слоў разам, праз злучок і асобна».

Чаму перазвон параўноўваецца ў тэксце з гучаннем слова *блін*?

Правообладатель Национальный институт образования

§ 20–1

§ 21. Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны

163. На аснове схемы сфармулюйце правілы правапісу прыставак, якія заканчваюцца на зычны. Прывядзіце ўласныя прыклады.

Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны

- ***-з*** — перад звонкімі і санорнымі зычнымі (бе́збароды, ра́змеркаваць)
- ***-с*** — перад глухімі зычнымі (бе́схмарны, ра́спілаваць)
- ***-б, -д*** — пішуцца нязменна (аб'клеіць, пад'бадзёрыць)

Прыстаўкі ***ад-, над-, пад-, перад-, аб-*** пішуцца нязменна (перад глухімі, звонкімі і санорнымі зычнымі): ***адкрыць***, ***адбіць***, ***падняць***, ***падказаць***, ***абрынуцца***, ***абсыпаць***.

Прыстаўкі ***з-, уз-, раз-, без- (бяз-)*** пішуцца перад галоснымі, звонкімі і санорнымі зычнымі: ***здзівіцца***, ***узгадаць***, ***безабаронны***; прыстаўкі ***с-, ус-, рас-, бес- (бяс-)*** — перад глухімі зычнымі: ***спісаць***, ***успомніць***, ***бясшумна***.

Калі корань слова пачынаецца з галосных ***а, у, э*** або ненаціскнога ***і***, якое пераходзіць у ***ы***, замест прыстаўкі ***з-*** пішацца ***с-***: ***арганізаваць***, ***эканоміць***, ***сыграць*** (а л е: ***зымправізаваць***, ***зыначыць***).

На стыку прыстаўкі і кораня можа адбывацца падваенне зычных: ***бессаромны***, ***раззлаваць***, ***аддаць***.

У словах ***расада***, ***расаднік*** (месца, скрынка для вырошчвання расады), ***расадны***, ***расольнік***, ***расол***, ***ростань*** пішацца адна літара ***с***.

Калі корань слова пачынаецца збегам зычных, пасля прыстаўкі ўзнікае беглы гук [а]: ***сабраць***, ***сарваць***, ***разагнуць***.

Прыстаўка ***дэз-*** пішацца нязменна: ***дэзактывацыя***, ***дэзынфекцыя***. У прыстаўцы ***дыз-*** перад галоснымі пішацца ***з***, перад зычнымі — ***с***: ***дызасацыяцыя***, ***дысгармонія***.

РАСАДНІК — РАССАДНІК

Раса́днік — месца, дзе вырошчваюць маладыя расліны (расаду) для высадкі ў грунт: *расаднік для агуркоў*.

Рассáднік — крыніца з'яўлення, размнажэння, распаўсюджання чаго-небудзь: *рассаднік хваробы*.

Правообладатель Национальный институт образования

164. Спішыце сказы, раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс прыставак.

1. Мы выходзім з лодкі на бераг і ра*(з/с)*кладаем вогнішча *(В. Вольскі)*. 2. Аксана сёрбала духмяную юшку, забываючы нават а*(д/т)*кусваць хлеб *(А. Федарэнка)*. 3. Халадзец ажно ра*(з/с)*тае ў роце *(В. Гардзей)*. 4. Я люблю тваю чуйную зімнюю ціш, мой а*(б/п)*сыпаны зоркамі горад *(Г. Бураўкін)*. 5. А*(д/т)*чувалася ўрачыстасць моманту, нават нейкая прыўзнятасць *(У. Гніламёдаў)*. 6. Малако а*(д/т)*праўлялі малакавозамі на завод *(Н. Маеўская)*. 7. Павольна ра*(з/с)*сейвалася цемра, святлела неба *(В. Гурскі)*.

- Зрабіце сінтаксічны разбор сказа са звароткам.

Спалучэнне прыставачнага [д] з наступным мяккім [ц’] вымаўляецца як [д͡ц’]: *а*[д͡ц’]*існуць (адцісnуць), па*[д͡ц’]*ягнуць (падцягнуць)*.

Спалучэнне прыставачнага [д] з наступным мяккім [д͡з’] вымаўляецца як [д͡з’]: *па*[д͡з’]*ець (паддзець), а*[д͡з’]*ячыць (аддзячыць)* (Паводле Ф. Янкоўскага).

165. Прачытайце верш. Прывядзіце прыклады перанясення ўласцівасцей жывых істот на з’явы прыроды. Як называецца гэты мастацкі прыём?

Дзень дажджу

Аб’явілі дзень дажджу,
і як быццам дождж падслухаў,
і як быццам дождж пачуў —
цэлы дзень пяе над вухам.
Ад налётаў дажджавых
сакавіцкі снег разлезся,
ад прыкметаў веснавых
захацеў схавацца ў лесе.
Пад сасной старой залёг
і чакае плямай цёмнай,
калі першы ж ручаёк
панясе яго да Нёмна.

Цьмяна-шэрым дываном
зацягнулі неба хмары.
Дождж спявае за акном
звонкім голасам гітары.
Пад нябесны гэты душ
Падстаўляе горад плечы.
Дождж — вясне ўрачысты туш*,
Прывітання сімвал вечны.
І як тое немаўля,
пасля воднага хрышчэння
прачынаецца зямля
да вясны, да адраджэння.

Л. Кебіч.

Выпішыце з верша словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны».

Запішыце па памяці адну з выдзеленых строф (на выбар). Падкрэсліце ў словах арфаграмы. Растлумачце іх правапіс.

У якім значэнні ўжыта ў вершы слова *туш*?

Правообладатель Национальный институт образования

166. Запішыце словы, устаўляючы прапушчаныя прыстаўкі ***дэз-*** (‘выдаленне, знішчэнне, спыненне або адсутнасць чаго-небудзь’) або ***дыз- / дыс-*** (‘парушэнне, разлад, страта чаго-небудзь’).

..камфорт, ..інфекцыя, ..прапорцыя, ..актывацыя, ..функцыя, ..урбанізацыя, ..гармонія, ..інтэграцыя, ..кваліфікацыя, ..арыентацыя.

167. Ад прыведзеных назоўнікаў утварыце прыметнікі з дапамогай прыставак ***без- (бяз-), бес- (бяс-)*** і суфіксаў. Растлумачце правапіс прыставак.

У з о р: *крыўда — **бяс**крыўдны*.

Вынік, чалавек, людзі, журбота, густ, колер, цана, закон, мова, тэрмін, шум, зброя, памылка, перспектыва, мяжа, сіла.

168. Спішыце прыказкі, устаўляючы прапушчаныя дзеясловы з прыстаўкамі, якія заканчваюцца на ***з, с***.

1. Дзетак ... — не грыбоў назбіраць. 2. Чалавек не арэх, адразу не ... . 3. Чужую бяду рукамі ... . 4. За вялікім пагонішся — і малое ... . 5. Хто старое ... , таму вока вон. 6. Што было, тое ... . 7. Слова не верабей, выпусціў — не ... . 8. Сам заварыў кашу, няхай сам і ... . 9. Шыла ў мяшку не ... . 10. Не ... , чаго няма, то няхай.

Д л я д а в е д к і: *ра(з/с)хлёбваць, (з/с)хаваць, у(з/с)гадаваць, (з/с)губіць, у(з/с)помніць, (з/с)плыць, ра(з/с)кусіць, у(з/с)дыхаць, ра(з/с)весці, (з/с)лавіць*.

169. Пісьмова перакладзіце рэцэпт на беларускую мову, замяняючы інфінітывы дзеясловамі ў форме 2-й асобы множнага ліку загаднага ладу.

Котлета «Беловежская»

500 г свиной корейки (с костью) нарезать кусками так, чтобы каждый был с косточкой. Мясо отбить, косточку зачистить.

Приготовить фарш: обжарить одну измельчённую луковицу и нарезанную кубиками ветчину (60 г), добавить 80 г зелёного горошка, одну столовую ложку муки, соль, перемешать и слегка потушить. Чтобы масса не была слишком густой, развести её бульоном или кипячёной водой.

На подготовленные куски корейки положить фарш, скатать в виде колбаски, обмакнуть в яйце, обвалять в сухарях, затем снова обмак-

Правообладатель Национальный институт образования

нуть в яйце и снова обвалять в сухарях. Обжарить в топлёном масле и поставить на 10-15 минут в нагретую духовку *(По энциклопедии белорусской кухни «Смачна есці»)*.

Слоўнік

ветчина — *вяндліна*
измельчённый — *здробнены, скрышаны*
кипячёная вода — *гатаваная вада*
корейка — *карэйка**
обвалять в сухарях — *укачаць у сухары, абсыпаць сухарамі*
скатать — *скруціць*
топлёное масло — *топленае масла*

Звярніце ўвагу!

Стандартныя скарочаныя абазначэнні метрычных мер пішуцца без кропак: *г* (грам), *кг* (кілаграм), *см* (сантыметр), *га* (гектар).

§ 22. Правапіс *і*, *ы*, *й* пасля прыставак

170. На аснове прыкладаў сфармулюйце правілы напісання літар ***і***, ***ы***, ***й*** пасля прыставак.

а) Над**ы**шоў, аб**ы**граць, дэз**ы**нфармацыя;
б) вы**й**шаў, за**й**граць, пера**й**менаваць;
в) звыш**і**мклівы, суп**е**рінтэлект, контр**і**дэя.

1. Гук [і] пасля прыставак на галосны чаргуецца з [й], што перадаецца на пісьме літарай ***й***:

- у словах з каранямі ***іс***-*ці*, ***ігр***-*аць*, ***ім***-*я*, ***інач***-*ай* на месцы ненаціскнога пачатковага каранёвага [і]: *вы**й**сці*, *за**й**граць*, *па**й**менны*, *пера**й**начыць*;
- у словах *за**й**маць*, *на**й**маць*, *пера**й**маць*, *пера**й**манне*, *пра**й**маць*.

У астатніх выпадках пачатковы каранёвы гук [і] пасля прыставак на галосны перадаецца нязменна: *заіскрыцца*, *заікацца*, *заінець*, *заінтрыгаваць*, *праілюстраваць*, *праіснаваць*, *неістотны*, *Прыіртышша*, *Заілійскі*.

2. Пачатковае ***і*** захоўваецца пасля прыставак ***звыш***-, ***між***-, ***пан***-, ***супер***-, ***транс***-, ***контр***-: *звышімклівы*, *міжінстытуцкі*, *панісламізм*, *суперінтэлект*, *трансіндыйскі*, *контрідэя*, а таксама ў складаных словах: *бортінжынер*, *спортінвентар*, *спецінструктаж*, *педінстытут*.

Правообладатель Национальный институт образования

3. Пры спалучэнні прыставак, якія заканчваюцца на зычны ***(аб-, ад-, пад-, над-, спад-, перад-, суб-, раз-, з-, уз-, дэз-)***, са словамі, што пачынаюцца з ***і***, вымаўляецца і пішацца ***ы***: *абысці*, *падыграць*, *спадылба*, *субынспектар*, *узысці*, *дэзынфармацыя*.

171. Размяркуйцеце словы па групах у залежнасці ад таго, якая літара пішацца пасля прыстаўкі. Запішыце.

Вы..сці, за..нтрыгаваць, пад..сці, між..нстытуцкі, ад..грываць, уз..ход, пера..менаваць, контр..гра, пад..граць, пра..сціся, з..начыць, супер..нтэлект, ад..сці, над..шоў, за..скрыцца, пера..сці, уз..сці, пера..начыць, дэз..нфіцыраваць, за..нелы, за..сці, пра..нфармаваць, раз..шліся, спад..лба, па..шоў, звыш..мклівы, раз..грываць, на..менне, пра..снаваць, дэз..нфармацыя, вы..грыш, пры..шлі, контр..дэя, за..кацца, без..ніцыятыўны.

Сярод прапанаваных слоў знайдзіце тыя, што маюць наступныя лексічныя значэнні:
‘з-пад нахмураных броваў’;
‘увядзенне ў зман фальшывай інфармацыяй’;
‘змяніўшы, зрабіць іншым’.

172. Запішыце фразеалагізмы, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары.

Вы..сці сухім з вады, дух за..маць, ады..сці ў нябыт, абы..сці бокам, пры..сці ў галаву, ад..грываць ролю, раз..грываць камедыю, пера..сці дарогу.

Растлумачце сэнс фразеалагізмаў. Складзіце сказы з трыма фразеалагізмамі (на выбар).

173. Спішыце сказы, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары.

1. Ртутны слупок папоў*(з/с)* *(у)*верх і да..шоў да пятай ры*(з/с)*кі над нулём *(В. Гурскі)*. 2. Найперш ёй х..целася наведаць свой пед..нстытут, даўно там *(не)*была *(З. Дудзюк)*. 3. Ад..шла зіма, саступіла месца з..лёнаму ц..плу, разво*(дз/ддз)*ю, б..розавым пупышкам, спевам с..лаўёў *(Ю. Зарэцкая)*. 4. Яны пацiснулі адзін аднаму рукі і вы..шлі з вагона *(Д. Пятровіч)*. 5. Я*(д/дз)*віся пад..шла да *(д/дз)*вярэй

Правообладатель Национальный институт образования

пакойчыка Лабановіча, а..чыніла і ўва..шла *(Я. Колас)*. 6. На небе толькі што ўз..шла паўночная зорка *(З. Бядуля)*. 7. Д..рогі с..шліся, а вось самі яны, людзі, так да к..нца жы*(ц/цц)*я с..сціся *(не)*зм..глі *(В. Казько)*. 8. Добра, што за..грала музыка і нек..торыя па..шлі танцаваць *(М. Кукуць)*.

- Растлумачце адсутнасць коскі перад злучнікам *і* ў апошнім сказе.

174. Прачытайце тэкст. Калі адбываюцца падзеі, пра якія паведамляецца ў ім?

Весела гамонячы, валачобнікі **пад..шлі** да суседняй хаты. Стукалі, стукалі — не дастукаліся. Тут жыў Гугнівы Рысь, як яго дражнілі на сяле. Ён, мабыць, наўмысля не адклікаўся, бо чалавек быў скупы і непрыветны.

— Скупяндзя! — гукнуў хтось з валачобнікаў. А Плён стаў спяваць **пера..начанае** віншаванне[сл], **пад..грываючы** сабе на гармоніку:

Не далі яечка, каб здохла авечка!
Каб на вашай хаце лебяда расла,
Каб ваша гаспадыня ўпроч **па..шла!**

— Годзе табе! — закрычалі валачобнікі на Плёна. — А то яшчэ **вы..дзе** з хаты ды лаяцца стане.

Пад вясёлы **на..грыш** валачобнікі **ад..шлі** *(Паводле Я. Лёсіка)*.

Выпішыце з тэксту выдзеленыя словы, устаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце іх правапіс.

175. Запішыце прыказкі, утвараючы ад дзеясловаў, што ў дужках, новыя словы з дапамогай прапанаваных прыстаўак.

1. Жыццё пражыць — не поле *(пера- + ісці)*. 2. Калі *(па- + ішоў)* у бойку, дык чуба не шкадуй. 3. Каб свінні рогі, не *(с- + ішла)* б з дарогі. 4. Пакуль сонца *(уз- + ідзе)*, раса вочы выесць. 5. Маной свет *(про- + ідзеш)*, а назад не вернешся. 6. Няма таго злога, каб не *(вы- + ішло)* на добрае.

Якія з прыведзеных прыказак маюць наступны сэнс:

‘пакуль дачакаешся чаго-небудзь жаданага, то будзе позна і прыйдзецца перанесці шмат гора, нядолі’;

‘калі б была ў каго-небудзь улада, сіла, магчымасць, то ён крыўдзіў бы іншых, злоўжываў бы сваім становішчам’?

Правообладатель Национальный институт образования

КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Як перадаюцца на пісьме канцавыя ненаціскныя ***-эль, -эр*** у запазычаных словах?
2. У якіх марфемах літара ***я*** захоўваецца на пісьме незалежна ад націску?
3. У якім становішчы ў запазычаных словах пішуцца спалучэнні галосных ***іо, іа***?
4. У якіх выпадках перад спалучэннямі зычных з першымі літарамі ***р, л*** пішацца прыстаўная галосная?
5. Як праверыць правільнасць напісання звонкіх і глухіх, шыпячых і свісцячых зычных?
6. У якіх словах пішацца ўстаўная літара ***в***?
7. У якіх выпадках у запазычаных словах пішацца літара ***у***?
8. Перад якімі суфіксамі і спалучэннямі суфіксальнага паходжання адбываюцца дзеканне і цеканне?
9. У якіх запазычаных словах адбываецца падаўжэнне зычных?
10. Як перадаецца спалучэнне зычных ***дт*** на канцы слоў іншамоўнага паходжання?
11. Калі ў прыметніках перад суфіксам ***-ск-*** пішацца мяккі знак?
12. У якіх выпадках словы *Дом*, *Палац* пішуцца з вялікай літары?
13. Як пішуцца словы са скарочанай пачатковай часткай ***поў- (паў-)***?

176. Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак у адпаведнасці з тэмай.

Сібірскі кот Васька, які жыў у бабкі Агаты, стаў маім кумірам з-за свайго пушыстага чорнага футра. Калі яго ў цемры пагладзіш супроць шэрсткі, то з яе з сухім трэскам вылятаюць бліскучыя іскрынкі — электрычныя зарады.

Наша сяброўства мацавалася на цвёрдай эканамічнай аснове. Васька вельмі любіў сырое мяса. Ідучы да бабкі Агаты, я кожны раз запасаўся кавалачкам, і кот сустракаў мяне радасным мяўканнем.

Перш чым аддаць Ваську кавалачак мяса, я прымушаў яго паказваць розныя цыркавыя нумары. Ён мог дзве хвіліны стаяць на задніх лапках, умеў лічыць, лёгка рашаў арыфметычную задачу 2 + 2. Праўда, і пры лічэнні, і пры складанні ён беспамылкова мяўкаў толькі чатыры разы. На элементарную задачу 1 + 1 Васька адказваў пагардлівым маўчаннем, нібы сямікласнік[с], у якога раптам пацікавіліся веданнем табліцы множання.

Што ні кажыце, а бабчын кот быў вялікім разумнікам! *(Паводле М. Зарэмбы).*

Правообладатель Национальный институт образования

Выпішыце з тэксту па два словы, у якіх:
1) літара **э** пішацца не пад націскам у пачатку запазычаных слоў;
2) у першым складзе перад націскам пішацца літара **е**;
3) адбываецца аглушэнне звонкіх зычных;
4) перад [в'] адбываюцца дзеканне, цеканне;
5) адбываецца падаўжэнне зычных гукаў.

Раскажыце пра свойскіх жывёл, якіх можна назваць вялікімі разумнікамі.

177. Прачытайце тэкст. Абгрунтуйце яго падзел на абзацы.

Калі гарм..ніст за..граў полечку Максім хуцен..ка па*(д/т)*бег да Алёнкі. Др..жачым гол..сам запр..сіў дз..ўчыну на танец. Хвал..ваўся раптам а*(д/т)*мовіць? Але ў адка*(з/с)* на запрашэн..е атрымаў у падарунак шчас..лівую ўсмешку і ..дзячны позірк.

Як яны тады добра танчылі гэтую в..сёлую і ..мклівую полечку! Максім б..ражліва па*(д/т)*трымліваў Алёну за тонкую талію а іхнія рукі перапл..ліся ў в..ночак. І выказ..валі толькі адну пя..чоту. Замілавана гледзячы *(з/с)*верху на кірпаты носік на чорныя броўкі юнак падумаў Нікому ц..бе не а*(д/т)*дам! *(Паводле Г. Атрошчанка).*

Спішыце тэкст, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары, раскрываючы дужкі і расстаўляючы знакі прыпынку.

178. Вусна перакладзіце тэкст на беларускую мову.

«Гонка легенд»

В 2015 году в Раубичах впервые прошёл уникальный фестиваль «Гонка легенд — звёзды биатлона за мир».

Идейный вдохновитель проекта — Дарья Домрачева, четырёхкратная чемпионка мира, заслуженный мастер спорта Республики Беларусь, Герой Беларуси. Она пригласила посетить нашу страну знаменитых биатлонистов, завершивших карьеру. Олимпийские чемпионы, обладатели Больших хрустальных глобусов, многократные чемпионы мира порадовали собравшихся своей хорошей физической формой и отличным настроением. Примечательно и то, что на трассах отдельно соревновались не только легенды биатлона, но и перспективные белорусские спортсмены, представители средств массовой информации.

Прославленные биатлонисты приняли участие в автограф- и фотосессиях: болельщики могли получить автограф кумира, а также сделать фото на память со звёздными гостями.

Правообладатель Национальный институт образования

Фестиваль уже стал традиционным, вышел далеко за пределы биатлонной трассы и вовлёк любителей отдыха на открытом воздухе в другие интересные спортивные занятия *(По Л. Анцух, В. Семченко)*.

Слоўнік

вдохновитель — *натхняльнік*
вовлечь — *уцягнуць*
обладатель — *уладальнік*
примечательно — *знамянальна, характэрна, паказальна, цікава*
четырёхкратный — *чатырохразовы, чатырохкратны*

Знайдзіце ў тэксце словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах».

Растлумачце напісанне вялікай і малой літар у назвах званняў, прызоў.

Вусна апішыце лагатып фестывалю «Гонка легенд».

179. У 2019 годзе ў рамках Года адукацыі Беларусі ў Кітаі адбыўся Міжнародны конкурс праектаў «Беларусь і Кітай: мост у будучыню» (арганізатар мерапрыемства — Нацыянальны інстытут адукацыі). У конкурсе прынялі ўдзел больш за 300 навучэнцаў Беларусі і Кітая ва ўзросце ад 15 да 18 гадоў. Дыпломам I ступені быў узнагароджаны Антоній Пацэль, навучэнец 10-га класа Бараўлянскай гімназіі (Мінскі раён), які стварыў відэаролік «Мая будучая прафесія».

Паглядзіце відэаролік, пісьмова адкажыце на пытанні, выканайце заданні.

Верш якога беларускага паэта аўтар відэароліка выкарыстаў у якасці эпіграфа?

Прадстаўнікі якой прафесіі, на думку Антонія, кожны дзень здзяйсняюць гераічныя ўчынкі? Ці згодны вы з прыведзенымі аргументамі?

Што заахвоціла аўтара відэароліка да вывучэння кітайскай мовы?

Дайце ацэнку беларускаму маўленню студэнтаў Сіянскага ўніверсітэта замежных моў.

Чаму ў Беларусі становіцца папулярным вывучэнне кітайскай мовы? Дапоўніце аргументы Антонія ўласнымі разважаннямі.

Якую карысць прыносіць чалавеку вывучэнне моў?

180. Выканайце тэставую работу «Арфаграфічныя нормы».

Тэставая работа па арфаграфіі

1. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара ***э***:

1) р..монт;
2) канц..лярыя;
3) пр..тэнзія;
4) рэзюм..;
5) прынт..р.

Правообладатель Национальный институт образования

2. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара ***я***:

1) с..рада;
2) кал..ндар;
3) п..цярня;
4) дроб..зь;
5) ап..тыт.

3. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца спалучэнне літар ***ыя***:

1) д..лог;
2) мед..цэнтр;
3) т..рэма;
4) кабр..лет;
5) р..лізм.

4. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара ***ё***:

1) ..гурт;
2) і..н;
3) рады..біялогія;
4) рады..тэхніка;
5) міль..н.

5. Адзначце прыклады, у якіх на месцы пропуску пішацца літара ***і***:

1) думкі ..мклівыя;
2) пры..мчацца;
3) чулася ..ржанне;
4) пад ..льдзінай;
5) за..ржавець.

6. Адзначце правільна напісаныя словы:

1) мягкі;
2) дакладчык;
3) спаччына;
4) малацьба;
5) эгзамен.

7. Адзначце словы, у якіх парушаны арфаграфічныя нормы:

1) расшпіліць;
2) на досцы;
3) раскашчык;
4) змагаешся;
5) зжаўцець.

8. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара ***в***:

1) на..одшыбе;
2) ..обласць;
3) ..опера;
4) ..абласны;
5) ..угаль.

9. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара ***ў***:

1) ва ..нівермагу;
2) ліноле..м;
3) прыслоўе «..нізе»;
4) Вера ..льянаўна;
5) фа..на.

10. Адзначце словы, у якіх пішацца спалучэнне літар ***дз***:

1) *(ды/дзі)*візія;
2) каман*(ды/дзі)*роўка;
3) ме*(ды/дзі)*цына;
4) абе*(д/дз)*ве;
5) Ін*(ды/дзі)*я.

Правообладатель Национальный институт образования

11. Адзначце словы, у якіх прапушчана літара:

1) суд..зя;
2) (з) руплівасц..ю;
3) бас..ейн;
4) узвыш..а;
5) саван..а.

12. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца мяккі знак:

1) чац..вер;
2) астрахан..скі;
3) жнівен..скі;
4) піс..меннік;
5) сем..дзесят.

13. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца апостраф:

1) вераб..і;
2) парц..ера;
3) двух..ярусны;
4) аб..інець;
5) праваслаў..е.

14. Адзначце прыклады, у якіх пішацца вялікая літара:

1) *(В/в)*іцебшчына;
2) *(Д/д)*зень пагранічніка;
3) *(Д/д)*амоклаў меч;
4) Лядовы *(П/п)*алац;
5) *(О/о)*рдэн Працоўнай Славы.

15. Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок:

1) гідра*(?)*тэхніка;
2) абы*(?)*якавы;
3) паў*(?)*вядра;
4) паў*(?)*Еўропы;
5) экс*(?)*міністр.

16. Адзначце словы, якія пішуцца разам:

1) сіва*(?)*грывы;
2) пад*(?)*вечар;
3) у*(?)*зімку;
4) водна*(?)*салявы;
5) доўга*(?)*жыхар.

17. Запішыце назоўнік *Нарач* у форме творнага склону.

18. Да назоўніка *гвардыя* падбярыце аднакаранёвы прыметнік, запішыце.

19. Запішыце слова, у якім дапушчана памылка, згодна з арфаграфічнай нормай:

1) капусны;
2) помслівы;
3) бліснуць;
4) кантрастны;
5) Рэмбрант.

20. Запішыце па-беларуску словазлучэнне *литературное объединение*.

Правообладатель Национальный институт образования

Лексічныя нормы

§ 0–23

§ 1–23

§ 2–23

§ 3–23

§ 4–23

§ 23. Ужыванне слова ў адпаведнасці з яго лексічным значэннем, адрозненне мнагазначных слоў і амонімаў

181. Прачытайце тэкст.

Слова з'яўляецца асноўнай адзінкай мовы. З дапамогай слоў называюцца ўсе шматлікія з'явы і прадметы навакольнага асяроддзя, іх прыметы, дзеянні, стан. Ад дакладнасці ўжывання слоў у маўленні залежаць правільнасць перадачы інфармацыі і ўзаемаразуменне паміж слухачамі (чытачамі).

Лексічныя нормы характарызуюцца тым, што яны адносна свабодныя. Так, у мастацкім стылі могуць ужывацца, калі гэтага вымагае сітуацыя маўлення, дыялектныя, прастамоўныя, нават жаргонныя словы, якія недапушчальныя ў навуковым і афіцыйным стылях. Не з'яўляецца парушэннем нормы выкарыстанне прастамоўнай лексікі ў гутарковым стылі, бо яна не супярэчыць нязмушаным абставінам маўлення. Выбар слова нярэдка абумоўлены не нормай, а мэтазгоднасцю. Можна сказаць, што **лексічная норма** — гэта правільна выбранае і да месца выкарыстанае слова ў яго агульнавядомым значэнні. Няправільны выбар слова і яго ўжыванне з неўласцівым значэннем прыводзіць да ўзнікнення **маўленчых (лексічных) памылак.**

Задайце ўдакладняльныя пытанні па змесце тэксту і адкажыце на іх.

182. Вызначце, якія са слоў не адпавядаюць прыведзеным лексічным значэнням.

1. Трыбуна — узвышэнне для выступлення прамоўцы. 2. Крыжачок — беларускі народны танец. 3. Салярый — месца, дзе здабываюць соль. 4. Канфлікт — сутыкненне розных бакоў, поглядаў, сіл. 5. Спрынт — бег, плаванне і інш. на кароткія дыстанцыі. 6. Трылогія — пяць літаратурных або музычных твораў аднаго аўтара, аб'яднаных агульнай ідэяй. 7. Тэлемост[сл] — тэлевізійная сустрэча

Правообладатель Национальный институт образования

на далёкія адлегласці пры дапамозе касмічных установак, прыбораў. 8. Кашалот — буйное млекакормячае атрада кітоў. 9. Кастрычнік — дзявяты месяц каляндарнага года.

183. Прачытайце схему. З апорай на яе вызначце, якія памылкі дапушчаны ў сказах. Выпраўце іх і запішыце правільныя сказы.



1. Недзе высока ў небе звінеў тоненькі галасок, як быццам нехта нябачны гуляў на флейце. 2. Добра падумаўшы, Зося зрабіла правільны вынік: грошы трэба здаць у міліцыю. 3. Дзеці пазіраюць на свет шырока расчыненымі вачыма. 4. Васіль з Ганнай стаялі моўчкі без слоў. 5. Шмат твораў стварыў Якуб Колас для дзяцей. 6. Потым быў шпіталь, амуніцыя адной нагі і хвіліны душэўнай слабасці. 7. На першым пасяджэнні быў прыняты і статус таварыства аматараў музыкі.

184. Словы могуць мець адно або некалькі лексічных значэнняў. Адпаведна выдзяляюцца адназначныя і мнагазначныя словы.

Запішыце мнагазначныя словы паводле прыведзеных значэнняў.

1. Падземная[с] частка расліны, пры дапамозе якой яна замацоўваецца ў зямлі і атрымлівае пажыўныя рэчывы; частка воласа, зуба, пазногця, якая знаходзіцца ў целе; асноўная частка слова (без суфіксаў і прыставак).

2. Зямля з усім, што на ёй існуе; усё жывое, усё навакольнае; сусвет; чалавечая супольнасць, аб'яднаная пэўным грамадскім ладам, культурнымі і грамадска-гістарычнымі адзнакамі.

3. Упрыгожанне з кветак або галінак, сплеценых у кружок; нанізаныя на нітку грыбы, пацеркі і пад.; рад бярвёнаў зруба.

Правообладатель Национальный институт образования

4. Памяншальна-ласкальнае ад слова «конь»; востры верхні край, грэбень страхі; любімая тэма размовы, любімы занятак каго-небудзь.

5. Частка нагі, дзе злучаюцца бядровая і галёначная косці; частка чаго-небудзь сагнутага, непрамога ад аднаго згібу або павароту да другога; асобная частка, закончаны матыў у музычным творы; пакаленне ў радаслоўнай.

Мнагазначныя словы патрэбна адрозніваць ад амонімаў. **Амонімы** — словы з розным лексічным значэннем, яны не маюць паміж сабой сэнсавай сувязі (як мнагазначныя словы), таму і ў слоўніках падаюцца ў розных артыкулах.

Пры адрозненні амонімаў ад мнагазначных слоў трэба вызначыць, ці ёсць паміж значэннямі сэнсавая сувязь. Калі яна назіраецца, перад намі мнагазначнае слова, калі не — амонімы.

185. Знайдзіце ў тлумачальным слоўніку прыклады амонімаў і мнагазначных слоў. Раскажыце, як яны падаюцца ў слоўнікавых артыкулах.

186. Вызначце, якія з выдзеленых слоў у прыведзеных па́рах з'яўляюцца амонімамі, а якія — мнагазначнымі.

1) **Правіць** краінай — **правіць** коньмі;
2) абрад памінання продкаў **Дзяды** — расліна **дзяды**;
3) **вастрыё** штыка — **вастрыё** сатыры;
4) прыгожы **від** на мора — рэдкі **від** птушак;
5) рэчка **высахла**— дзяўчына **высахла** ад перажыванняў;
6) гераічная **быліна** — адна **быліна** пры дарозе хісталася ад ветру;
7) музычная **нота** «до» — **нота** пратэсту.

187. Прачытайце верш. На якой моўнай з'яве заснаваны жарт?

Прыйшоў рагач.
— Завуць вас як?
Адказвае спакойна:
— Як.

Р. Барадулін.

У якім значэнні (прыслоўя, злучніка ці часціцы) ужываецца слова *як* у пытальным сказе?

Раскрыце значэнне слова *рагач*. Якім спосабам яно ўтворана?

Складзіце і запішыце слоўнікавыя артыкулы слова *як*.

Правообладатель Национальный институт образования

188. Раскрыйце значэнні міжмоўных амонімаў.

Гонар (беларуск.) — гонор (руск.), гасцінная (беларуск.) — гостиная (руск.), гусеніца (беларуск.) — гусеница (руск.), дараваць (беларуск.) — даровать (руск.), дзіўны (беларуск.) — дивный (руск.), месяц (беларуск.) — месяц (руск.), нагадаць (беларуск.) — нагадать (руск.), наказаць (беларуск.) — наказать (руск.), мір (беларуск.) — мир (руск.), згубіць (беларуск.) — сгубить (руск.), трус (беларуск.) — трус (руск.).

Разгледзьце фотаздымкі. Якія міжмоўныя амонімы яны ілюструюць? Складзіце сказы з беларускімі словамі. Сказы запішыце. Якія словы адпавядаюць ім у рускай мове?

189. Прачытайце тэкст. Спішыце абзац, у якім падаецца рэцэпт гатавання мараканскага чаю. Раскрыйце дужкі, устаўце прапушчаныя літары, пастаўце неабходныя знакі прыпынку.

Мараканскі чай

У мараканскім кафэ гучаць мяккія, пяшчотныя мелодыі. Музыканты ў круглых шапачках — фесках — сядзяць пасярод невялікага памяшкання. Вакол нізенькія столікі і канапкі на трох-чатырох чалавек.

На сценах вісяць старажытныя арабскія стрэльбы з даўжэзнымі ствалами і перламутравымі інкрустацыямі на прыкла́дах, крывыя шаблі, кінжалы, гліняныя і драўляныя блюды.

Афіцыянт у белым адзенні і чырвонай фесцы прыносіць невялікія вузкія шклянкі з зялёным чаем. У кожнай з іх — лісточкі мяты. Вельмі салодкі[ф] і духмяны, мараканскі чай прыемна ахалоджвае рот і горла.

Нам тлумачаць як трэба гатаваць чай па*(?)*мараканску. У медны чайнік засыпаецца зялёны чай і кладзецца столькі цукр.. колькі можа зм..сціцца ў чайнік.. . Усё гэта завар*(?)*ваецца і насто*(?)*ваецца. Потым у густы гарачы сіроп кладуць свежыя лісты мяты. Перад тым як наліць у шклянку ча.. туды так*(сама)* кладуць мяту. Пасля таго як выпіты першыя шклянкі у чайнік кладзецца новая порцыя цукр.. і новыя лісткі мяты наліваецца свежы вар. Чай больш не па*(д/т)*сыпаецца. У Марока зялёны чай прыгатава*(н/нн)*ы такім спосабам з*(?)*яўляецца любімым нацы..нальным напоем.

Правообладатель Национальный институт образования

Мараканцы ў кафэ гучна сёрбаюць мятны чай і прыцмокваюць з вялікім задавальненнем. Мы п'ём з не меншай асалодай. Нам маракенскі чай спадабаўся *(Паводле В. Вольскага)*.

У якіх значэннях ужыты ў тэксце назоўнік *чай*?

Для даведкі: *чай — 1) высушаныя і асобым спосабам апрацаваныя лісты вечназялёнага чайнага дрэва, на якіх настойваюць духмяны напітак; 2) гарачы напітак, настоены на лісці гэтай расліны; 3) працэс піцця такога напітку.*

Як адным словам беларусы называюць працэс піцця чаю?

Да якіх слоў — адназначных ці мнагазначных — адносіцца назоўнік *блюда* ў беларускай мове, слова *блюдо* ў рускай?

Як называюцца пары слоў тыпу *прыклад — прыкла́д*, *стрэльба — стральба́*?

На аснове якога спосабу пераносу — метафары, метаніміі ці сінекдахі — узнікла новае значэнне ў назоўніка *шклянка* ў словазлучэнні *выпіць першыя шклянкі*?

- Выпішыце з тэксту назоўнікі і прыметнікі з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі. Абазначце суфіксы. Якія дадатковыя сэнсавыя адценні яны надаюць словам?

Этымалагічна слова *гарбата* паходзіць ад польскага *herbata*, а тое ў сваю чаргу — ад лацінскага *herba* 'зелле' і новалацінскага *thea* (ад кітайскага *tē* 'высушаныя лісты раслін сямейства чайных'). З улікам этымалагічнай даведкі вызначце, якое з прыведзеных тлумачэнняў лексічнага значэння слова *гарбата* з'яўляецца, на вашу думку, найбольш правільным. Абгрунтуйце сваё меркаванне.

1) Гарбата — тое, што і чай *(А. М. Булыка)*.

2) Гарбата — чай, завараны на травах *(І. Р. Шкраба)*.

Раскажыце пра вядомыя вам спосабы гатавання чаю.

190. Падрыхтуйце на аснове табліцы вуснае паведамленне пра лексіка-семантычныя катэгорыі слоў.

Лексіка-семантычныя катэгорыі слоў		
Амонімы (рознае значэнне, аднолькавае напісанне і вымаўленне)	**лексічныя** (належаць да адной часціны мовы)	*каса* 'прылада працы' — *каса* 'від прычоскі'
	амафоны (супадаюць у гучанні)	*код* ([кот]) — *кот*; *казка* ([ка́ска]) — *каска*
	амографы (супадаюць у напісанні)	*мука́* — *му́ка*; *пара́* — *па́ра*
	амаформы (супадаюць у пэўных граматычных формах)	*піла́* (назоўнік і дзеяслоў у форме прошлага часу)

Правообладатель Национальный институт образования

Лексіка-семантычныя катэгорыі слоў		
Сінонімы (розныя адценні значэння)	**сэнсавыя (семантычныя)** (адрозніваюцца адценнямі значэння)	*злосць, гнеў, абурэнне; рашуча, катэгарычна*
	стылістычныя (адрозніваюцца стылістычнай афарбоўкай)	*лёс, доля, наканаванасць, планіда*
	сэнсава-стылістычныя (адрозніваюцца адценнямі значэння і стылістычнай афарбоўкай)	*скардзіцца, ныць, хныкаць*
	кантэкстуальныя (выступаюць у якасці сінонімаў толькі ў пэўным кантэксце)	*(рашучасць) слабела, мякчэла, сціхала, нікла*
Антонімы (супрацьлеглае значэнне)	*дзень — ноч;* *высока — нізка;* *любіць — ненавідзець*	
Паронімы (рознае значэнне, падобнае вымаўленне і напісанне)	*пісьмовы — пісьменны;* *адрасат — адрасант;* *быць — біць*	

191. Прачытайце тэкст.

Вогнікі зніклі

Якуб Колас любіў маляўнічыя краявіды Пухаўшчыны. У 1935 годзе ён з сям'ёй летаваў у хаце лесніка Волеся Бранавіцкага.

У нядзельку завітала да Бранавіцкіх пляменніца Алена. Паклала на стол кавалачак сыру.

— Вось гасцінец вашаму Міколку прынесла.

Але Міколка да пачастунку нават не дакрануўся.

— Нядобрыцца яшчэ яму, — растлумачыла маці Вольга Сцяпанаўна. — Праўда, пачуваецца лепш, чым учора. То ж, было, плямы ружовыя на целе выступілі. Вусны вогнікам абсыпала. Да доктара трэба. А дзе ўзяць доктара ў нашай Загібельцы?

І расказала, як дапамог сыну Колас. Ён агледзеў Міколку, пра сёе-тое распытаў, а потым і кажа:

— Дайце мне рыдлёўку і палатняную торбачку. Пайду лекаў пашукаю.

Пайшоў Колас на балота, накапаў там сушаніцы. Прамыў, апусціў у гладыш, заліў кіпенем. Праз гадзіны тры змазаў Міколкавы вусны змочанай у адвары ваткай. Пад вечар паўтарыў лячэнне. Вогнікі пад раніцу і зніклі. Як і не было іх.

Правообладатель Национальный институт образования

Вольга Сцяпанаўна падзякавала Коласу і пацікавілася:

— Адкуль вы, Канстанцін Міхайлавіч, ведаеце, як немач выганяць з чалавека?

— У нашай сям'і дзеці часта хварэлі, — адказаў Колас. — Маці лячыла нас адварам траў. От і засталося тое з дзяцінства. Мята добра хворыя бронхі лечыць, крапіўка апетыт прыбаўляе. А калі сэрца баліць, трэба пустырнік заварыць. У вашым гародчыку, бачыў, шмат яго расце.

Праз тыдзень усе жыхары Загібелькі ведалі пра ўмельствы народнага доктара, які летаваў у Бранавіцкіх.[сн] Калі хто ў вёсцы захварэе, то ішлі да Якуба Коласа.

У верасні пісьменнік пакідаў вёску — ад'язджаў у Мінск. Правесці яго прыйшлі ўсе жыхары Загібелькі *(С. Зубкоўскі)*.

Раскрыйце сэнс слоў *летаваць, немач, нядобрыцца, пачувацца*.

Суаднясіце словы ў левым слупку з іх значэннямі ў правым.

1) вогнік *(разм.)*	а) 'балотная лекавая расліна'
2) сушаніцы	б) 'збан без ручкі'
3) гладыш	в) 'хвароба, якая суправаджаецца высыпкай на твары, вуснах'

- Выпішыце з тэксту прыклады дзеясловаў у форме цяперашняга, прошлага і будучага часу.
- Знайдзіце ў апошнім абзацы назоўнік, які адпавядае наступным лексіка-граматычным характарыстыкам: агульны, адушаўлёны, асабовы, канкрэтны; мужчынскага роду, 2-га скланення; ужыты ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку; у форме роднага склону адзіночнага ліку мае канчатак ***-а***.

Раскажыце пра афармленне на пісьме дыялогу.

Раскажыце, як Якуб Колас лячыў Міколку. Назавіце травы, з дапамогай якіх у народзе лечаць хваробы бронхаў, сэрца, павышаюць апетыт.

Як называецца лячэнне травамі? Якія вы ведаеце спосабы такога лячэння? Раскажыце пра адзін з іх.

§ 24. Правілы выкарыстання сінонімаў, антонімаў, паронімаў

192. Прачытайце выказванні. Знайдзіце і выпішыце сінонімы, вызначце іх сэнсава-стылістычную ролю, ахарактарызуйце сферу ўжывання (пры неабходнасці карыстайцеся табліцай «Лексіка-семантычныя катэгорыі слоў» да практыкавання 190).

1. Вось людзі гавораць, што вясну да нас прыносяць ластаўкі. Пэўна, так яно і ёсць[ф] у мясцінах, дзе не ведаюць антонаў. На Палессе ж, у палескую вёску, нясе вясну на сваіх магутных крылах бусел *(В. Казько)*.

Правообладатель Национальный институт образования

2. Ну, кажуць тыя кумы, як гэта ў нас бывае зімою, калі добра падзьме? Замець? Кудаса? Завіруха? Мяцеліца? Усё не так. А потым і схамянуліся: зі-ма-ве-я *(Я. Брыль)*.

3. Прабегшы[с] некалькі хат, Арцём завярнуў на агароды, шуснуў у жыта, адтуль разораю заламаў у вулачку і пасучыў проста да калодзежа... *(Я. Колас)*

4. **Дождж**

Быў жа ён зусім малы,
А як стаў на ножкі,
Абабег усе вуглы,
Абскакаў дарожкі[ф].
Што гарэзніку гара,
Дрэвы, агароджа!
Выбег з нашага двара
І ўстаяць не можа.
Дыб, дыб, дыб —
І на сцяну,
Шлях далейшы сочыць,
У завулак сігануў,
На трамвай ускочыў.
На прыпынку святлафор
Лыпнуў грозна вокам.
Ён — з падножкі і папёр
Вуліцай шырокай.
Не зважае на агні,
Смаліць на чырвоны.
Калі хочаш — дагані,
Дзе там — не дагоніш!

В. Вітка.

193. Вызначце ў сінанімічных радах стылістычныя сінонімы. У якіх стылях маўлення яны могуць выкарыстоўвацца?

1. Ісці, ступаць, крочыць, маршыраваць, пхнуцца, дыбаць, сунуцца, валачыся, джгаць. 2. Бясплатна, дарэмна, дарма, дарам, на дармаўшчыну, за так. 3. Палёгка, уступка, паблажка, ільгота, прывілея. 4. Лёс, доля, наканаванасць, планіда.

194. Падбярыце да прыметнікаў сінонімы. Абгрунтуйце сваё меркаванне.

Лёгкая сумка, лёгкая задача, лёгкі мароз, залаты характар, жалезная воля, свінцовы погляд, свінцовыя хмары, воўчы апетыт.

Звярніце ўвагу!

У мнагазначнага слова могуць быць розныя сінонімы, якія адносяцца да розных яго значэнняў: *жалезны характар — цвёрды, стойкі характар; жалезныя рукі — моцныя, дужыя рукі; жалезная логіка — строгая, правільная логіка*.

Правообладатель Национальный институт образования

195. Дапішыце прыказкі, устаўляючы патрэбныя антонімы.

1. Любіш узяць — любі і … . 2. Добрае чуваць далёка, а … яшчэ далей. 3. Ластаўка дзень пачынае, а салавей … . 4. Рыхтуй летам сані, а … калёсы. 5. Згода збірае, а … растрасае. 6. Блізка відаць, ды … дыба́ць. 7. Новых сяброў набывай, ды … не забывай. 8. Лепш трошкі зрабіць, чым … нагаварыць. 9. Лёгка пасварыцца, … памірыцца.

Звярніце ўвагу!

Антонімы адносяцца да адной часціны мовы: гэта могуць быць назоўнікі *(ноч — дзень)*; дзеясловы *(пачынаць — заканчваць)*; прыметнікі *(высокі — нізкі)*; прыслоўі *(далёка — блізка)*. Кожнае значэнне мнагазначнага слова мае свае антонімы: *свежы хлеб — чэрствы хлеб; свежы след — даўні, учарашні след*.

196. Вызначце, якія пары слоў не з'яўляюцца антонімамі.

1. Вясёлы — сумны. 2. Наш — ваш. 3. Ты — вы. 4. Кароткі — доўгі. 5. Высокі — нізкі. 6. Ранак — вечар.

197. Падбярыце антонімы да прыметнікаў. Запішыце словазлучэнні парамі.

1. Злы сабака, злы час, злы мароз. 2. Пустое вядро, пустая размова. 3. Цесны абутак, цесныя адносіны.

198. Прачытайце тэкст. Раскажыце на яго аснове пра паронімы.

З дакладнасцю ўжывання слоў цесна звязана ўжыванне **паронімаў**, слоў адной часціны мовы з гукавым і структурным падабенствам, але з розным лексічным значэннем:

каменны — выраблены, пабудаваны з каменю *(каменны будынак)* і *камяністы* — пакрыты, усыпаны каменнем, з вялікай колькасцю камення *(камяністая дарога)*;

эфектны — які стварае ўражанне, эфект, прыцягвае ўвагу *(эфектны ўчынак)* і *эфектыўны* — які прыводзіць да патрэбных вынікаў, дзейсны *(эфектыўны спосаб)*.

Паколькі паронімы маюць гукавое і структурнае падабенства, то часта ў маўленні адно слова ўжываецца замест другога, што з'яўляецца прычынай маўленчых памылак. Каб іх пазбегнуць, трэба выкарыстоўваць словы з вядомым лексічным значэннем, а пры ўзнікненні цяжкасцей звяртацца да тлумачальнага слоўніка або слоўніка паронімаў.

Правообладатель Национальный институт образования

199. Прачытайце прыклады з рубрыкі «Дакладнасць маўлення». Абгрунтуйце наяўнасць узаемасувязі паміж культурай маўлення і правільным выкарыстаннем паронімаў.

АБАГУЛЬНІЦЬ — АБАГУЛІЦЬ

Абагу́льніць — выразіць у агульным палажэнні вынікі назіранняў над асобнымі фактамі, з'явамі: *абагульніць факты*.

Абагу́ліць — зрабіць асабістае, уласнае калектыўным, грамадскім: *абагуліць маёмасць*.

ДЗЕЙНЫ — ДЗЕЙСНЫ

Дзе́йны — надзвычай энергічны, актыўны: *дзейны чалавек*.

Дзе́йсны — здольны актыўна ўздзейнічаць на што-небудзь: *дзейсныя меры*.

● Якія арфаграфічныя правілы ілюструюць прыведзеныя прыклады? Раскажыце гэтыя правілы, прывядзіце іншыя прыклады.

200. Растлумачце розніцу паміж словамі. Пры неабходнасці карыстайцеся тлумачальным слоўнікам або слоўнікам паронімаў.

Грамадскі — грамадзянскі, фантазія — фантастыка, чалавечы — чалавечны, ганаровы — ганарысты, рэальны — рэалістычны, пісьменны — пісьмовы, суседні — суседскі.

201. Знайдзіце памылкі ва ўжыванні паронімаў. Выправіце іх і запішыце правільныя сказы.

1. А зараз даводзяць, што яны [кратары] ад падзення метэораў!.. *(А. Карпюк)*. 2. Па эфектыўнасці дзеянняў нашай авіяцыі гэты выпадак не мае прэтэндэнта ў ходзе Вялікай Айчыннай вайны *(«Звязда»)*. 3. Культывацыя толькі адной культуры, як вядома, прыводзіць да масавага размнажэння шкоднікаў *(«Звязда»)*. 4. Колькасная перавага коласаўскага слоўніка тлумачыцца тым, што ў ім шмат слоў дыялектычных, мясцовых, абласных *(ЛіМ)*.

202. Выканайце заданні. Пры ўзнікненні цяжкасцей можаце звярнуцца да рубрыкі «Дакладнасць маўлення», змешчанай ніжэй.

1. Вызначце, якія літары прапушчаны ў словах, і знайдзіце «лішняе».

Г..наровы, г..нарысты, г..нар, г..нарлівы, г..нарыцца.

Правообладатель Национальный институт образования

2. Укажыце, як называюцца словы тыпу *ганарысты*, *ганаровы*, *ганарлівы*.

а) Сінонімы;

б) антонімы;

в) паронімы;

г) амонімы.

3. Укажыце, якое з прыведзеных слоў прапушчана ў сказе «Наша настаўніца ўзнагароджана ... граматай Міністэрства адукацыі». Растлумачце правапіс вялікай і малой літары ў словах.

а) *(Г/г)*анарыстай;

б) *(Г/г)*анаровай;

в) *(Г/г)*анарлівай.

4. Як называецца байка Кандрата Крапівы, што пачынаецца наступнымі словамі: «Бывае, праўда вочы коле...»?

а) «Ганаровы Парсюк»;

б) «Ганарлівы Парсюк»;

в) «Ганарысты Парсюк».

ГАНАРЛІВЫ — ГАНАРОВЫ — ГАНАРЫСТЫ

Ганарлі́вы — поўны гордасці, усведамлення сваёй важнасці, перавагі: *ганарлівая дзяўчына*.

Ганаро́вы — 1) які карыстаецца пашанай; пачэсны: *ганаровы госць*; 2) які даецца, прысвойваецца за вялікія заслугі: *ганаровае званне*; 3) выбраны ў знак высокай павагі, пашаны: *ганаровы прэзідыум*; 4) які з'яўляецца выражэннем гонару, праводзіцца ў знак павагі: *ганаровая вахта*.

Ганары́сты — пагардлівы, пыхлівы; фанабэрысты: *ганарысты чалавек*.

203. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і выбіраючы з дужак неабходныя словы. Абгрунтуйце свой выбар.

Чаму чай *(называюць/клічуць)* байхавым

Мы п'..м чай, які *(называюць/клічуць)* байхавым. Назва гэта паходзіць ад кітайскага слова *бай-хоа* — 'бела.. *(вейка/вечка)*'. Так па-кітайску *(называюць/клічуць)* *(срэбныя/серабрыстыя)* варсінкі, якія пакрываюць *(адзін/адну)* *(бок/старану)* чайных *(лісцяў/лістоў)*. Як гэта часта бывае, слова «байхавы» даўно *(згубіла/страціла)* свой першапачатковы сэнс, і цяпер так *(называюць/клічуць)* толькі *(сыпучыя/сыпкія)* гатункі ча..сн *(Паводле «Кнігі пра смачную і здаровую ежу»)*.

204. Выканайце тэставую работу «Лексічнае значэнне слова».

§ 24–1

§ 24–2

§ 24–3

§ 24–4

Правообладатель Национальный институт образования

Фразеалагічныя нормы

§ 0–25

§ 25. Правілы ўжывання фразеалагізмаў у маўленні

Фразеалагічная норма — такое ўжыванне фразеалагізмаў, якое прынята ў маўленчай практыцы і замацавана ў адпаведных слоўніках.

205. Прачытайце выразна верш. Як у ім характарызуецца роля слова?

Словы

Над намі словы ўладараць.
Мы чуем і гаворым іх.
Яны то здружаць, то пасвараць
Сяброў і ворагаў маіх.
Бо словы розныя бываюць.
Адны — агню стрымаюць шквал,
Другія словы забіваюць
Усё жывое напавал.
Ад слова сэрца халадзее,
Праходзіць сон і забыццё,
Ад слова рушацца надзеі,
Ад слова свеціцца жыццё.
Ад слова вырастаюць крылы,
А ў сэрцы стукае любоў,
Ад слова прыбываюць сілы,
Дык не шкадуйце шчырых слоў!
А здатным толькі на дакоры
І гучна словамі грымець,
Каб не прыносіць людзям гора,
Было б найлепей[с] анямець.

С. Грахоўскі.

Назавіце ўстойлівыя выразы і фразеалагізмы, ужытыя аўтарам. Раскрыйце іх сэнс, ахарактарызуйце сэнсава-стылістычную ролю ў вершы.

Звярніце ўвагу!

Маўленчая практыка замацавала за кожным фразеалагізмам пэўнае значэнне ці значэнні, кампанентны склад, структурную арганізацыю, спалучальнасць са словамі кантэксту… Складанасць фразеалагізмаў як моўных адзінак, супярэчнасць паміж іх сучасным і першапачатковым значэннем, паміж іх цэласным зместам і расчлянёнай формай ствараюць пэўныя цяжкасці пры іх ужыванні і патрабуюць добрага валодання нормамі *(І. Лепешаў)*.

Правообладатель Национальный институт образования

206. Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і словамі-суправаджальнікамі, з якімі гэтыя фразеалагізмы ўжываюцца ў маўленні. Запішыце іх разам са словамі-суправаджальнікамі. Раскрыйце значэнне фразеалагізмаў.

Словы-суправаджальнікі	Фразеалагізмы
блытаць	на горкі яблык
збіць	як мыш пад венікам
прыходзіць	да грэчаскіх каляд
крывіцца	боб з гарохам
адкладваць	у свіныя галасы
сядзець	як серада на пятніцу

207. Устаўце ў сказы прапушчаныя фразеалагізмы з кампанентамі-лічэбнікамі ў адпаведнасці з прыведзенымі лексічнымі значэннямі.

Запішыце сказы, замяніўшы лічбы словамі.

Сказ	Значэнне фразеалагізма
1. Дзянёк быў сонечны, і апранутая ў цёплы кажух Маечка была … ад радасці *(У. Краўчанка)*.	‘быць бязмерна шчаслівым, вельмі задаволеным’
2. — А я дзень пры дні сяджу … і свету белага не бачу, — звычайна скардзіўся Пцічкін *(І. Новікаў)*.	‘не выходзячы з дому, з памяшкання’
3. Аксён Каль верыць у праўду, у тую адвечную праўду, якой так прагна чакае народ і якая … хаваецца ад яго *(Я. Колас)*.	‘недзе далёка і надзейна (таіць, хаваць)’
4. Месца пад падлогай, кожную дошку самой падлогі Міколка ведаў … , бо не раз рабіў ён налёты сюды са сваімі таварышамі *(М. Лынькоў)*.	‘(ведаць) вельмі добра, грунтоўна, да дробязей’
5. Марчук вам … : ён пляменнік вашай стрыечнай цёткі *(Я. Радкевіч)*.	‘вельмі далёкі сваяк’

Д л я д а в е д к і: *у 4 сценах; 10 (7) вада на кісялі; на 7 небе; за (пад) 7 замкамі (за 7 пячаткамі); як свае 5 пальцаў.*

208. Вызначце, да якіх фразеалагізмаў няправільна падабраны словы-сінонімы. Запішыце правільныя варыянты.

1. Павесіць галаву — засумаваць. 2. Біць лынды — гультаяваць. 3. Кроў з малаком — хітры. 4 Пад бокам — блізка[Ф]. 5. Хоць гаць гаці — далёка. 6. У свіныя галасы — рана. 7. Лахі пад пахі — хутка.

Правообладатель Национальный институт образования

209. Выпішыце з тлумачальнага слоўніка фразеалагізмы з кампанентам *сцяна*, якім адпавядаюць наступныя лексічныя значэнні:

а) ‘пад надзейнай аховай каго-небудзь, спакойна’;

б) ‘нічога не дзейнічае на каго-небудзь’;

в) ‘неадольная перашкода; поўная ізаляванасць ад каго-небудзь, чаго-небудзь’;

г) ‘рабіць гранічныя намаганні для дасягнення чаго-небудзь’;

д) ‘не ўдзельнічаючы ў танцах, стаяць у памяшканні (часцей пра таго, хто не ўмее танцаваць)’.

Пры неабходнасці выкарыстайце артыкулы з «Тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы» (2016).

Складзіце і запішыце сказы з двума фразеалагізмамі (на выбар).

210. З апорай на схему вызначце, якія памылкі дапушчаны пры ўжыванні фразеалагізмаў.



1. Перад сустрэчай з Зояй Сцяпанаўнай Віталь адчуваў сябе не на сваёй талерцы. 2. Міхасю мазолілі рукі раскіданыя па ўсім пакоі цацкі малодшай сястры. 3. Пасля доўгай прагулкі па лесе дзеці вярталіся без задніх ног. 4. Пасля той размовы з дзядзькам Алесь баяўся яго ценю. 5. Марына Сяргееўна некалькі разоў прасіла сына памыць падлогу, а ямý як віламі па вадзе. 6. Васіль нічога не адказваў[с], маўчаў як рыба аб лёд. 7. У Сяргея з учарашняга дня макавай крошкі ў роце не было.

Выправіце памылкі і запішыце правільныя сказы.

Раскажыце, пацвярджаючы свой адказ прыкладамі, аб прычынах узнікнення фразеалагічных памылак.

Правообладатель Национальный институт образования

211. Падбярыце да рускіх прыказак беларускія адпаведнікі, растлумачце іх сэнс.

1) Моя хата с краю — ничего не знаю.
2) Утопающий и за соломинку хватается.
3) Солдат спит — служба идёт.
4) Цыплят по осени считают.
5) Утро вечера мудренее.
6) Соловья баснями не кормят.
7) Шила в мешке не утаишь.
8) Не всё коту масленица.

а) Кухар спіць, а суп кіпіць.[сн]
б) З гутаркі хлеба не наясі.
в) Не заўсяды як на Дзяды.
г) Не маё гарыць — не мне тушыць.
д) Як топішся[ф], той за лязо ўхопішся.
е) Пераначуем, то болей пачуем.
ж) Лес чуе, а поле бачыць.
з) Не хваліся травою, а хваліся сенам.

Якія з прыведзеных прыказак змяшчаюць у сабе культуразнаўчую інфармацыю пра нацыянальныя характары рускіх і беларусаў?

Якія рысы нацыянальнага характару беларусаў знайшлі адбітак у наступных прыказках?

1. Госць у хаце — Бог у хаце. Госць на парог — гаспадыня за пірог.
2. Шчырая праца — мазалёвая. Гаспадарку весці — не лапці плесці.
3. Родная зямелька — як зморанаму пасцелька. Усякая птушка сваё гняздо бароніць.

Дапоўніце пералік беларускіх прыказак, якія ілюструюць указаныя рысы нацыянальнага характару (пры неабходнасці можаце звярнуцца да «Слоўніка беларускіх прыказак» І. Лепешава (2006)).

- Растлумачце пастаноўку працяжнікаў у прыказках.

212. Запішыце сказы, падабраўшы да выдзеленых слоў фразеалагізмы.

1. Міхась пады*(?)*шоў да самага *(?)*акна, прытаіўся і **прыслухаўся**.
2. Усю ноч маці **н*(е/я)*спала**, думала, як дапама*(г/х)*чы сыну справіцца з гэтай б*(я/е)*дой.
3. П*(я/е)*тро **вельмі ўважліва** слухаў усё, што ра*(з/с)*казвала *(я/е)*му Саша.
4. Падарожны *(з/с)*пачатку застыў **нерухома**, а потым кінуўся *(у/ў)*цякаць *(у/ў)*лес.
5. Відаць, **наканавана** было Марыл*(і/е)* жыць адной, бе*(з/с)* мужа, бе*(з/с)* дз*(я/е)*цей.

як укопаны
вачэй не зводзіць
на лёсе напісана
затаіўшы дыханне
навастрыць вушы

Звярніце ўвагу на тое, ці трэба выдзяляць фразеалагізмы знакамі прыпынку.

Правообладатель Национальный институт образования

213. Выканайце інтэрактыўнае заданне па тэме «Значэнне фразеалагізмаў».

КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Якія нормы называюцца лексічнымі?
2. Прывядзіце прыклады маўленчых (лексічных) памылак. Як такіх памылак пазбегнуць?
3. Як адрозніць мнагазначныя словы ад амонімаў? Прывядзіце прыклады.
4. Якія словы называюцца паронімамі?
5. Як дакладнасць маўлення звязана з выкарыстаннем паронімаў? Прывядзіце прыклады.
6. Якія нормы называюцца фразеалагічнымі?
7. Назавіце тыпы фразеалагічных памылак. Прывядзіце прыклады.

Тэставая работа па лексіцы і фразеалогіі

1. Лексічнае значэнне вызначана няправільна ў словах:

1) летась — ‘у мінулым годзе, год таму назад’;
2) сукупны — ‘аб’яднаны, сумесны, агульны’;
3) ліпень — ‘шосты месяц каляндарнага года’;
4) тара — ‘тое, у чым захоўваецца або перавозіцца тавар’;
5) салярый — ‘месца, дзе здабываюць соль’.

2. Укажыце адназначныя словы:

1) аснова;
2) прыстаўка;
3) корань;
4) суфікс;
5) канчатак.

3. Адзначце нумары сказаў, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні:

1) Яго **знешні** выгляд быў бездакорны.
2) Святлана Сяргееўна ўсё жыццё працавала на **ніве** навукі.
3) Людзі пачалі **будаваць** новае жыццё.
4) Вокны хаты выходзяць на **поўдзень**.
5) На паліцы стаяла **нізкапробная** літаратура.

Правообладатель Национальный институт образования

4. Адзначце прыклады, у якіх словы з'яўляюцца амонімамі:

1) бокс (стрыжка) — бокс (від спорту);
2) алмаз (камень незвычайнай цвёрдасці) — алмаз (прылада, каб рэзаць шкло);
3) вянок (з кветак) — вянок (рад бярвення ў зрубе);
4) лёс (доля) — лёс (горная парода);
5) стол (драўляны) — стол (дыетычны).

5. Укажыце рады, у якіх усе словы з'яўляюцца сінонімамі:

1) настойлівы, напорысты, упарты, валявы;
2) прамоўца, аратар, красамоўца, пустаслоў;
3) даверлівы, прастадушны, кемлівы, наіўны;
4) упасці, паваліцца, рухнуць, шлёпнуцца;
5) раздарожжа, скрыжаванне, развілка, ростань.

6. Беларускія сінонімы да іншамоўных слоў падабраны няправільна ў парах:

1) індустрыяльны — прамысловы;
2) папулярны — вядомы;
3) арыгінальны — самабытны;
4) гарманічны — правільны;
5) камунікабельны — размоўны.

7. Адзначце пары слоў, якія не з'яўляюцца антонімамі:

1) прыліпнуць — адарвацца;
2) родны — суседскі;
3) спагада — жорсткасць;
4) здабытак — страта;
5) гаварыць — балбатаць.

8. Укажыце пары спалучэнняў слоў, у якіх ужыты амонімы:

1) кіравацца асабістым матывам — песня з вясёлым матывам;
2) пуховая падушка — падушка механізма;
3) сухі клімат — сухі пералік фактаў;
4) ліпавы мёд — ліпавы дакумент;
5) загадаў выканаць заданне — загадаў загадку.

9. З'яўляюцца міжмоўнымі амонімамі (у беларускай і рускай мовах маюць рознае лексічнае значэнне) словы:

1) пуд;
2) плот;
3) краска;
4) склон;
5) поле.

Правообладатель Национальный институт образования

10. Адзначце словазлучэнні з няправільным спалучэннем слоў:

1) адукацыйная ўстанова;
2) адукаваная праграма;
3) ледзяны каток;
4) ледніковы перыяд;
5) ледзяная вада.

11. Маўленчыя памылкі дапушчаны ў сказах:

1) Перад слухачамі выступіў дыпламант Міжнароднага конкурсу піяністаў.
2) Качка выбралася на пясочную выспу.
3) Грыбы ў сасновым маладзіку яшчэ не раслі.
4) Мужчына скардзіўся на моцны боль у каленчатым суставе.
5) Гаспадыня пераліла квас у ёмісты гладыш.

12. Значэнне ‘вельмі многа’ маюць фразеалагізмы:

1) у кожнай кішэні па жмені;
2) як старой бабе сесці;
3) з жабіны прыгаршчы;
4) як на Дзяды;
5) хоць гаць гаці.

13. Значэнне фразеалагізма прыведзена няправільна:

1) як карова языком злізала — ‘раптам знікнуць’;
2) жаваць жвачку — ‘гаварыць вельмі хутка, пераскокваючы з аднаго на другое’;
3) заткнуць рот — ‘прымусіць каго-небудзь замоўкнуць’;
4) хоць касой касі — ‘вельмі вялікі’;
5) галава і два вухі — ‘нездагадлівы, праставаты чалавек’.

14. Адзначце сінанімічныя пары фразеалагізмаў:

1) вомегам вылазіць — у момант вока;
2) як горкая рэдзька — як агнём апякло;
3) за адзін прысест — адным махам;
4) як апошняе ў печ усыпаўшы — як мыла з’еўшы;
5) лахі пад пахі — шапку ў ахапку.

15. У якасці свабодных спалучэнняў могуць ужывацца фразеалагізмы:

1) даць лейцы ў рукі;
2) мала кашы з’еў;
3) выходзіць з сябе;
4) есці вачыма;
5) скінуць з плячэй.

16. Перакладзіце з рускай мовы на беларускую словазлучэнне *резьба по дереву* адным словам.

Правообладатель Национальный институт образования

17. Якімі словамі-амонімамі называюць: 1) месяц каляндарнага года; 2) загусцелую ежу з мяснога або рыбнага навару з кавалачкамі мяса, рыбы?

18. Знайдзіце ў сказе маўленчую памылку і запішыце слова, неабходнае па сэнсе (у пачатковай форме):

Віктар з маленства займаўся спартыўнай грэбляй.

19. Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннямі (напрыклад, 1 — а):

1) ні семя ні емя	а) ‘у стане вялікага страху’
2) ні ў кола ні ў мяла	б) ‘зусім няма нічога есці’
3) ні жывы ні мёртвы	в) ‘якраз столькі, колькі трэба’
4) ні села ні пала	г) ‘пра няўмелага, няздатнага чалавека’
5) ні многа ні мала	д) ‘неспадзявана, нечакана і без якіх-небудзь падстаў’

20. Выпішыце з тэксту:

а) слова, што мае значэнне ‘прыстасаванне, на якое падвешваецца кудзеля пры прадзенні’;

б) фразеалагізм;

в) сінонім да слова *спадцішка*.

Управіўшыся дома, перад полуднем збіраліся дзяўчаты: прыносілі абвязаныя хусткамі пра́сніцы з тоўстаю кудзеляю — іхнія калаўроткі стаялі ў Корсакавай хаце яшчэ з учарашняе раніцы... Але пра́дзіва не было — дзень перад Калядамі малы, як у зайца хвост, а на ша́рай* гадзіне прыходзілі хлопцы, падсаджваліся да кудзельніц, неўпрыкметку скідалі з калаўроткаў шнуры́, адбіралі лёгкія і голыя яшчэ верацёны *(В. Адамчык)*.

Правообладатель Национальный институт образования

Словаўтваральныя нормы

§ 0–26

§ 1–26

§ 2–26

§ 21, 22

§ 3–26

§ 26. Утварэнне слоў і іх ужыванне ў адпаведнасці з правіламі словаўтварэння

214. Прачытайце верш. Растлумачце, чаму ён так называецца.

Чайка над жытам

Збіраюся ў госці
да мора цяпер я.[сн]
Замошша, Замосце,
Зарэчча, Зазер'е —
у хмурным прыволлі
прасёлак закружыць.
За полем — Заполле,
За лугам — Залужжа,
А потым — Залессе,
А побач — Загор'е.
Калышуцца воддаль[м]
Ля спелага бору
Туманныя воды
Крынічнага мора.

А. Вялюгін.

На аснове якіх прымет узніклі назвы паселішчаў, згаданыя ў вершы? Вызначце ўтваральныя асновы для геаграфічных назваў і выдзеленых слоў.

- Растлумачце напісанне слоў з падоўжанымі зычнымі.

Як вы разумееце выраз *спелы бор*? Прывядзіце прыклады іншых народных эпітэтаў і параўнанняў.

Раскажыце пра ўтварэнне назвы свайго населенага пункта.

Словы беларускай мовы падзяляюцца на **невытворныя** (яны не ўтварыліся ад іншых слоў: *мама, ліст, сонца*) і **вытворныя** (утвораныя ад іншых слоў: *мамін, ліставанне, сонечны*). Словаўтварэнне мае справу толькі з вытворнымі словамі.

Вытворныя словы маюць ***утваральную аснову***. Слова «аснова» ў гэтым тэрміне ўжываецца ўмоўна: утваральнай асновай могуць з'яўляцца *слова (шумець → зашумець), аснова (чорн(ы) → → чарніцы), некалькі слоў (вечна + зялёны → вечназялёны),*

Правообладатель Национальный институт образования

некалькі асноў (сховішч(а) для зерн(я) → зернясховішча), частка слова і цэлае слова (медыцынская сястра → медсястра), часткі слоў (юны натураліст → юннат), літары (Мінскі трактарны завод → МТЗ [*эмтэзэ*], *гукі (Арганізацыя Аб'яднаных Нацый → → ААН* [*аан*]), што паслужылі для ўтварэння новага слова.

Новыя словы ўтвараюцца па пэўных правілах і мадэлях. Напрыклад, па мадэлі *«назоўнік + -ніц- → назоўнік са значэннем 'асоба жаночага полу паводле роду дзейнасці'»* ўтварыліся словы *настаўніца* і *чараўніца: настаўнік(□) + -ніц- → настаўніца, чараўнік(□) + -ніц- → чараўніца*; па мадэлі *«ад- + дзеяслоў → дзеяслоў са значэннем 'завяршыць дзеянне'»* ўтварыліся словы *адпрацаваць* і *адламаць: ад- + працаваць → адпрацаваць, ад- + ламаць → → адламаць.*

Пры ўтварэнні слоў выкарыстоўваюцца марфемы, якія называюцца **словаўтваральнымі.** Такія марфемы (прыстаўкі, суфіксы, постфіксы) далучаюцца да ўтваральнай асновы і ўтвараюць слова з новым значэннем: *су- + аўтар → суаўтар, добр(ы) + -аньк- → добранькі, пры- + зямл(я) + -і- → прызямліць, чый + -сьці → чыйсьці, за- + думаць + -ца → задумацца.*

215. Запішыце назвы асоб жаночага полу, утвораныя з дапамогай суфіксаў ***-к-, -льшчыц-, -янк-, -іх-, -лл-, -іц-, -ніц-, -оўн-***. Ад якіх слоў яны ўтварыліся?

У з о р: *'бялявая, светлавалосая жанчына, дзяўчына' — бялянка (бялянка ← ← бел(ы)).*

'Жанчына, якая танцуе', 'смуглая жанчына, дзяўчына', 'дачка лесніка', 'тая, хто займаецца прадзеннем','спецыяліст па шліфаванні', 'жонка Лявона', 'маладая замужняя жанчына', 'тая, што прымае ўдзел у чым-небудзь'.

Графічна пакажыце ўтваральныя асновы і словаўтваральныя сродкі. Якія змены адбыліся ва ўтваральных асновах?

З дзвюма назвамі асоб паводле роду дзейнасці складзіце сказы.

Які твор Я. Купалы суадносіцца з назвай, што мае значэнне 'дачка бондара'?

Правообладатель Национальный институт образования

216. Разгледзьце схему «Способы словаўтварэння». Запоўніце яе словамі для даведкі.



Для даведкі: *добраўпарадкаваны, бледна-ружовы, засмяяцца, прадзед, шырокафарматны, сасоннік, смела, глыбокапаважаны, прыдарожны, газападобны, браняносец, заснежыць*[ф].

Прывядзіце ўласныя прыклады да кожнага спосабу словаўтварэння.

Якія злучальныя галосныя могуць удзельнічаць ва ўтварэнні складаных слоў?

217. Прачытайце табліцу. Што новага вы даведаліся пра спосабы словаўтварэння?

Марфалагічныя (марфемныя) спосабы	словы ўтвараюцца пры дапамозе марфем ці шляхам складання: *прыскакаць, звышімклівы, чараўніца, узгорак, зверху, байкапісец, добразычлівы*
Прыставачны (прэфіксальны) спосаб	утварэнне слоў шляхам далучэння да ўтваральнай асновы прыстаўкі: *прачытаць* ← *чытаць*, *праўнук* ← ← *унук*, *небяспека* ← *бяспека*
Суфіксальны спосаб	утварэнне слоў шляхам далучэння да ўтваральнай асновы суфікса: *лясны* ← *лес*(□), *весялосць* ← *вясёл*(ы)
Бяссуфіксны (нульсуфіксальны) спосаб	утварэнне слоў шляхам далучэння да ўтваральнай асновы нулявога суфікса: *крык* Ø ← *крыча*(ць), *сінь* Ø ← ← *сін*(і), *бег* Ø ← *бег*(чы), *вылет* Ø ← *вылята*(ць)

Правообладатель Национальный институт образования

Прыставачна-суфіксальны (прэфіксальна-суфіксальны) спосаб	утварэнне слоў шляхам далучэння да ўтваральнай асновы прыстаўкі і суфікса адначасова: *беспаспяховы* ← ← *поспех*(□), *зарэчны* ← *рака*(*а*), *падкісліць* ← *кісл*(*ы*), *надвячорак* ← *вечар*(□)
Асноваскладанне	утварэнне слоў шляхам аб'яднання дзвюх ці больш асноў з дапамогай злучальнай галоснай або без яе: *новабудоўля* ← *нов*(*ы*) + *будоўл*(*я*), *караняплоды* ← ← *корань*(□) + *плод*(□)
Асноваскладанне з суфіксацыяй (складана-суфіксальны спосаб)	утварэнне слоў ад дзвюх асноў з далучэннем да іх суфікса (у тым ліку і нулявога): *першакурснік* ← *перш*(*ы*) + + *курс*(□), *шаснаццацігадовы* ← *шаснаццаць*(□) + + *год*(□), *белакорØы* ← *бел*(*ы*) + *кар*(*а*), *густалістØы* ← *густ*(*ы*) + *ліст*(□)
Словаскладанне	утварэнне слоў шляхам зліцця двух самастойных слоў у адно: *вечназялёны* ← *вечна* + *зялёны*, *шораз* ← *што* + + *раз*, *супрацьстаяць* ← *супраць* + *стаяць*, *высокаразвіты* ← *высока* + *развіты*
Абрэвіяцыя	утварэнне складанаскарочаных слоў (абрэвіятур): *педуніверсітэт* ← *педагагічны ўніверсітэт*, *БРСМ* ← ← *Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі*
Немарфалагічныя (немарфемныя) спосабы	марфемы не ўдзельнічаюць ва ўтварэнні слоў: *камандзіраваны* ← *камандзіраваны спецыяліст*, *хуткая* ← ← *хуткая дапамога*, *кулак* (‘заможны селянін’) ← *кулак* (‘частка цела чалавека’)
Марфалагічна-сінтаксічны спосаб	пераход слоў з адной часціны мовы ў іншую: *прыехалі* ***родныя*** (назоўнік) ← ***родныя*** (прыметнік) *краявіды*, *выехалі* ***насустрач*** (прыназоўнік) *нам* ← *пайшлі* ***насустрач*** (прыслоўе) *у вырашэнні пытання*
Лексіка-семантычны спосаб	слова набывае новае значэнне (так узнікае аманімія): *журавель* (‘птушка’) і *журавель* (‘страла калодзежа’), *гасцінец* (‘дарога’) і *гасцінец* (‘падарунак’)

Карыстаючыся інфармацыяй з табліцы, складзіце схему «Спосабы словаўтварэння ў сучаснай беларускай мове». Падрыхтуйце паведамленне пра спосабы ўтварэння слоў.

Разбярыце па саставе словы *чарнавокі*, *мімаволі*, *першакурснік*.

Правообладатель Национальный институт образования

218. Прачытайце тэкст, утвараючы ад дзеясловаў, запісаных у дужках, дзеепрыметнікі. Дайце тэксту загаловак.

Першае, з чым дарослыя знаёмілі дзяцей, былі цацкі. Для маленькіх каліс*(?)*ці майстравалі кружолку — драўляны кружок, у цэнтры якога прадз..валі стрыжань з *(завастрыць)* канцом. З лазовых і в..рбовых пруткоў хлапчукі майстравалі свісткі.

Прасцей за ўсё было зрабіць звычайную пі*(с/ш)*чалку: прыклаў лісцінку пырнік.. да губ і пі*(с/ш)*чы.

А як абы*(?)*сціся *(у/ў)*летку жэўжыку без гушкалак? На сукі дрэў, што стаялі побач, клалі тоўстую палку, да якой прывяз*(?)*валі канцы вяроўкі. Дастаткова *(на)*сярэдзіну вяроўкі пакласці *(не/ня)*вялікую дошчачку, каб можна было гушкацца.

Вельмі простым быў драўляны канёк, у якім *(нагрэць)* жалезным прутком былі *(прапаліць)* дз*(?)*ве дзіркі для працягвання вяровачкі. На ніжняй час*(?)*цы канька замацоўвалі[м] тоўсты дрот. Дзеці каталіся па лёдзе на адным каньку, а..штурхоўваючыся другой нагой.

На плоце агарода вешалі вятрак.[сн] Ён уяўляў дз*(?)*ве шырокія лучыны, *(звязаць)* крыж*(?)*на*(?)*крыж і *(накалоць)* на цвік, які быў *(убіць)* у палку. Паз*(?)*ней сталі рабіць драўляны самалёт, што быў *(замацаваць)* на кіі і *(у/ў)*перадзе меў прапелер з *(выразаць)* лучынкі *(Паводле А. Лакоткі, С. Барыса)*.

Растлумачце напісанне арфаграм у словах. Спішыце два апошнія абзацы тэксту, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары.

Шляхам падбору роднасных слоў растлумачце значэнні слоў *кружолка, пішчалка, свісток*. Ад якіх слоў яны ўтварыліся? Назавіце ўтваральныя асновы і словаўтваральныя сродкі.

Знайдзіце ў тэксце па пяць-шэсць слоў, што адпавядаюць кожнаму з прыведзеных у табліцы спосабаў марфалагічнага (марфемнага) словаўтварэння. Запішыце словы ў пачатковай форме ў адпаведныя графы табліцы.

Спосабы марфалагічнага (марфемнага) словаўтварэння		
прыставачны	суфіксальны	прыставачна-суфіксальны

Разгледзьце фотаздымак. Якія цацкі на ім адлюстраваны і з чаго яны зроблены? Карыстаючыся рознымі крыніцамі інфармацыі, раскажыце пра беларускія прадпрыемствы, на якіх вырабляюць дзіцячыя цацкі.

Правообладатель Национальный институт образования

219. Разгледзьце схему. Вызначце, ад якіх часцін мовы назоўнікі ўтвараюцца бяссуфіксным (нульсуфіксальным) спосабам. Растлумачце, якія змены адбываюцца ва ўтваральных асновах пры словаўтварэнні.



220. Прачытайце прыказкі і прымаўкі. Як вы разумееце іх сэнс?

1. Помста ..часця не прыносіць. 2. Ад панскай дапамогі не пацягн..ш ногі. 3. У сабач..ю скуру ўле..ці. 4. З а..кладу няма ладу. 5. Каб выбіць л..ноту, трэба даць работу да сёмага[м] пот.. . 6. У скокі па..сці. 7. Багац..е за грошы не куп..ш.

Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце напісанне арфаграм. Падкрэсліце словы, утвораныя пры дапамозе бяссуфікснага спосабу. Абгрунтуйце свой выбар.

221. Прачытайце тэкст, устаўляючы замест шматкроп'я прапушчаныя словы (карыстайцеся словамі для даведкі). Падбярыце загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай тэксту.

Адкуль узнікла слова *стол*? Хутчэй за ўсё, ад дзеяслова *ставіць*. Бо ў даўнія часы сям'я ўсаджвалася на траве ці долу ў хаце перад

Правообладатель Национальный институт образования

рассцеленым абрусам. Месца, якое было прызначана, каб ставіць розныя стравы, і называлася *стол*.

Пасля, каб было зручней[м], яго прыўзнялі на падпоркі (ножкі), а ўсе члены сям'і ўсаджваліся каля яго на лавы. Так утварылася … — месца для прыёму ежы, для частавання гасцей ці проста для бяседы, каб пасядзець ды пагаманіць. Засцілалі стол кавалкам палатна, які называлі … .

Гаспадар садзіўся на пачэсным месцы адзін, як бы прад (перад) сталом. Адсюль узнікла слова … — так называлі адмыслова зробленае і багата прыбранае сядзенне для старэйшага ў родзе, гаспадара, правадыра, князя. Горад, у якім жыў князь, дзе знаходзіўся яго … (трон), пачаў называцца стольным горадам, або … .

Ішлі гады, а слова *стол* прымала на сябе ўсё новыя значэнні.[сн]

Слова *стол* у слоўніках абрасло цэлым гняздом утвораных ад яго новых слоў. Месца, куды можна зайсці, каб пад'есці, назвалі … . А сам працэс прыёму ежы стаў называцца словам … . Набор мэблі ў тым ці іншым пакоі паклікаў да жыцця слова …, якое неўзабаве набыло шырэйшы сэнс — забеспячэнне прыладамі, мэбляй цэлага прадпрыемства ці ўстановы *(Паводле У. Юрэвіча)*.

Для даведкі: *настольнік, сталоўка, прастол, абсталяванне, застолле, сталіца, сталаванне*.

Вызначце, якія з устаўленых у тэкст слоў з'яўляюцца вытворнымі. Растлумачце, якімі спосабамі яны ўтварыліся.

Якім роднасным словам можна замяніць назоўнік *сталоўка*? Як яно ўтварылася? Ці могуць гэтыя словы ўзаемазамяняцца і выкарыстоўвацца ў адным стылі?

Спішыце апошні абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя словы. Падкрэсліце словы, утвораныя бяссуфіксным спосабам.

Разгледзьце рэпрадукцыю карціны І. Пратасені «Хлеб». Апішыце стол, намаляваны мастаком.

Правообладатель Национальный институт образования

222. Прачытайце тэкст. Да якога стылю ён адносіцца? Падбярыце да тэксту загаловак у адпаведнасці з тэмай.





Па дзюбе птушкі можна вызначыць, чым яна харчуецца. У птушак, якія харчуюцца зернем і ягадамі, цвёрдая і тоўстая дзюба.[сн] У тых, што[м] кормяцца насякомымі, дзюба танейшая і значна слабейшая. У драпежных птушак дзюба кручком. У вадаплаўных — пляскатая, з рагавымі пласцінкамі і зубчыкамі.

«Водная» дзюба ў гусей, качак, леб..дзяў, фламінга, … . «Драпежную» дзюбу маюць арлы, ястр..бы, совы, … . «Нас..комаедная» дзюба ў стрыжоў, ластавак, мухаловак, … . «Зерн..едная» дзюба — сродак харчавання сн..гіроў, крыж..дзюбаў, шчыглоў, … *(Паводле І. Чайкі)*.

Выпішыце з тэксту вытворныя назвы дзюб. Растлумачце праз падбор аднакаранёвых слоў, як яны ўтварыліся. Вызначце спосаб утварэння.

Спішыце другі абзац, устаўляючы прапушчаныя літары і дапаўняючы пералік птушак уласнымі прыкладамі

Складзіце сказы са словам *журавель* у наступных значэннях: а) ‘вялікая балотная пералётная птушка з доўгімі нагамі і шыяй, з доўгай прамой дзюбай’; б) ‘прыстасаванне пры калодзежы для даставання вады’. У якім сказе слова *журавель* з’яўляецца вытворным? Якім спосабам яно ўтварылася?

- Выпішыце з тэксту прыметнікі ў форме вышэйшай ступені параўнання. Пакажыце, як яны ўтварыліся. Формаўтваральныя ці словаўтваральныя суфіксы ўдзельнічалі ва ўтварэнні формы ступені параўнання?

Карыстаючыся інфармацыяй грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны», раскажыце аб праектах і праграмах па захаванні біялагічнай разнастайнасці, якія рэалізуюцца ў нашай краіне.

Складанаскарочаныя словы (абрэвіятуры) могуць утварацца:

а) з частак слоў ці часткі слова і другога поўнага слова: *леспрамгас (лясная прамысловая гаспадарка), медпрэпарат (медыцынскі прэпарат)*;

б) з пачатковых гукаў слоў: *МАЗ (Мінскі аўтамабільны завод), НАН (Нацыянальная акадэмія навук)*;

в) з пачатковых літар слоў: *МДЛУ (Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт), УП (унітарнае прадпрыемства)*;

г) з часткі першага слова і пачатковых гукаў наступных слоў або пачатковых гукаў першых слоў і часткі наступнага слова: *БелАЭС (Беларуская атамная электрычная станцыя), ЭЛіМБел (Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі)*.

Правообладатель Национальный институт образования

Кожная частка складанаскарочанага слова пішацца так, як бы яна пісалася ў поўным слове: *медсястра (медыцынская сястра)*, *гаркам (гарадскі камітэт)*, *заапарк (заалагічны парк)*. У пачатку другой часткі захоўваюцца літары ***і, е, я, ю***, апостраф перад імі не ставіцца: *дзяржінспекцыя, Мінюст*.

Складанаскарочаныя словы, якія абазначаюць назвы ўстаноў, арганізацый, часта пішуцца з вялікай літары: *Нацбанк*, *Саўмін*.

223. «Зашыфруйце» назвы. Як называюцца словы, што вы запісалі? Прачытайце іх услых. Вызначце ўтваральныя асновы.

У з о р: ***сумеснае прадпрыемства → СП***.

Беларуска-рускі слоўнік, Мінскі аўтамабільны завод, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, сродкі масавай інфармацыі, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт, цеплавая электрацэнтраль, Вялікае Княства Літоўскае, лясная гаспадарка, дзяржаўнае страхаванне, Міжнародны алімпійскі камітэт, Кантынентальная хакейная ліга.

Падбярыце з перыядычнага друку і запішыце шэсць сказаў са складанаскарочанымі словамі. Растлумачце ўтварэнне і правапіс гэтых слоў.

224. Прачытайце тэкст. Вызначце яго кампазіцыйную схему і тып. Абгрунтуйце сваю думку.

Бібліятэка «Алмаз»

Напэўна, няма такога беларуса, які не ведаў бы пра існаванне Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, бо гэта адна з самых галоўных[м] славутасцей[ф] нашай краіны. Праз запамінальную форму будынка яго ў народзе называюць «Алмаз». Але мала хто ведае, як сапраўды называецца такая геаметрычная форма. Дык вось, гэта ромбакубаактаэдр — паўправільны шматграннік, грані якога складаюць 18 квадратаў і 8 трохвугольнікаў. І ўсё ж «ромбакубаактаэдр» не такое мілагучнае слова, як «алмаз».

Біблі..тэка мае меды..фасад — шматкал..ровы экран са святлоды..даў па ўсёй паверхні будынк.. . Плошча меды..фасада складае 1985 квадратных метраў. У цёмны час сутак ён паказ..вае розныя малюнкі: ад народных арнаментаў да р..кламы п..пулярных беларускіх брэндаў.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі добра вядома ў свеце. Па версіі амерыканскага выдання *Flavorwire* ў 2013 годзе яна заняла 11-е месца

Правообладатель Национальный институт образования

ў рэйтынгу фантастычных архітэктурных работ, а паводле сайта *Vilage of Joy* — 24-е месца ў спісе самых незвычайных збудаванняў свету. Яшчэ наша бібліятэка ўключана ў расійскую кнігу «100 самых дзіўных дасягненняў сучаснай архітэктуры» і згадваецца ў берлінскім выданні «Лепшыя бібліятэкі свету» *(Паводле Э. Гарошкі)*.

Форму якой фігуры мае Нацыянальная бібліятэка Беларусі? Чым знакамітая яна ў свеце?

Знайдзіце ў тэксце складаныя словы. Вызначце, як яны ўтварыліся.

Запішыце назву Нацыянальнай бібліятэкі ў выглядзе абрэвіятуры.

● Вызначце, якія канчаткі будуць мець назоўнікі *будынак, бібліятэка, алмаз, архітэктура, выданне* ў родным і месным склонах адзіночнага ліку.

Спішыце другі абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце іх напісанне.

Разгледзьце фотаздымак. Якія пачуцці ў вас выклікае выява на будынку Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі?

Карыстаючыся рознымі крыніцамі, падрыхтуйце для сваіх аднакласнікаў завочную экскурсію ў залу рэдкай кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Выканайце інтэрактыўнае заданне «Спосабы словаўтварэння».

225. Прачытайце тэкст. Раскажыце, як утвараюцца новыя словы ў беларускай мове, што лічыцца словаўтваральнай нормай.

Утварэнне новых лексічных адзінак у мове або ўзнаўленне ў працэсе маўлення тых, што ўжо існуюць, адбываецца паводле пэўных правіл словаўтварэння і на ўзор адпаведных мадэлей. Таму калі пад літаратурнай нормай разумець прынятыя[м] ў маўленчай практыцы правілы вымаўлення, словазмянення, словаўжывання і г. д., то **словаўтваральнай нормай** трэба лічыць утварэнне слоў і іх ужыванне ў строгай адпаведнасці з правіламі словаўтварэння, што існуюць[ф] у беларускай літаратурнай мове.

Напрыклад, у перыядычным друку сустракаецца слова *выступоўца* ў значэнні і на ўзор утварэння слова *прамоўца*. Аднак калі *прамоўца* ўтворана ад назоўніка *прамова* з дапамогай прадуктыўнага ў сучаснай беларускай[с] мове суфікса *-ц-(а) (прамова — прамоў-ц-а)*, то *выступоўца* можа быць суаднесена толькі з дзеясловам *выступіць (выступаць)*: *выступіць — выступ-оўц-а*. А суфікс *-оўц-(а)* не ўласцівы словаўтваральнай сістэме беларускай мовы.

Як і ўсе літаратурныя нормы, словаўтваральныя нормы могуць мяняцца. Толькі маўленчая практыка вырашае лёс таго ці іншага

Правообладатель Национальный институт образования

слова або запазычання, якія не адпавядаюць словаўтваральным сувязям і адносінам, што існуюць у сучаснай літаратурнай мове *(Паводле А. Лукашанца)*.

Раскрыйце значэнне тэрмінаў *словаўтваральная сістэма, прадуктыўны суфікс*.

- Складзіце схему першага сказа.

Словаўтваральныя нормы — гэта прынятыя ў грамадстве правілы ўтварэння слоў паводле пэўных словаўтваральных мадэлей.

226. Утварыце ад асноў прапанаваных назоўнікаў і дзеясловаў назвы асоб з дапамогай суфіксаў ***-ак-, -як-, -ок-, -нік-, -ач-, -ыст-, -іст-, -ун-, -ец-***.

Выхваляцца, слухаць, страляць, мора, труба, флейта, лес, ласавацца, піяніна, касіць.

227. Дапоўніце схемы словаўтваральна ўзаемазвязанымі словамі.

I. Д л я д а в е д к і: *добра, дабрата (дабрыня), падабрэць, дабро, дабрэць*.



II. Д л я д а в е д к і: *акружыць, кругленькі (круглаваты), акружэнне, круглы, кругам (кругом)*.



Правообладатель Национальный институт образования

III. Д л я д а в е д к і: *межавы, замежны, размежаваны (адмежаваны), размежаванне (адмежаванне), размежаваць (адмежаваць).*



228. Ад прапанаваных назоўнікаў утварыце прыметнікі з дапамогай розных суфіксаў. Складзіце і запішыце словазлучэнні з утворанымі прыметнікамі. Растлумачце розніцу ў значэнні слоў. Назавіце сэнсаадрознівальныя марфемы.

У з о р: *камень — каменны, камяністы (каменны дом, камяністая дарога).*

Лёд, гліна, гонар, вада, кветка.

229. Падбярыце да рускамоўных словазлучэнняў беларускія аднаслоўныя адпаведнікі.

1) У з о р: *слишком поздно — запозна.*

Слишком близко; слишком высоко; слишком дорого; слишком мало.

2) У з о р: *становиться ярче, яснее, выразительнее — яскравець.*

Становиться более горячим; становиться короче; становиться злым, сердитым; становиться более острым.

3) У з о р: *стать многолюднее — палюднець.*

Стать чище; стать лучше; стать более ласковым; стать более звучным, громким.

4) У з о р: *место, где было гумно, — гумнішча.*

Место, где стоял или стоит за́мок; место, где стоял хлев; место, где стояла мельница; поле, на котором растёт или рос картофель.

5) У з о р: *место за углом дома, за домом — завугопле.*

Место за забором; место за хлевом; то, что расположено за лугом; место за огородами.

Правообладатель Национальный институт образования

230. Вызначце, якія словаўтваральныя нормы парушаны пры ўтварэнні слоў (няправільны выбар прыстаўкі, суфікса, памылкі ў корані слова).

Дажджаваты, подчарк, савёнак, пілотка (у якасці пары *пілот* ‘мужчына’ — *пілотка* ‘жанчына’), адміральша, пескавы (ад *пясок*), культурэнна, падцвердзіць, французка.

231. Прачытайце тэкст, раскрываючы дужкі. Падбярыце загаловак. Раскажыце пра сэнсаадрознівальную ролю словаўтваральных марфем.

Быў на занятках музычнага ўніверсітэта. З нашага класа ходзяць усяго тры чалавекі. Шчыра кажучы, я таксама вагаўся: браць *(абанент, абанемент)* ці не браць? Але Валодзя напусціўся[л]: «Дзівак! Калі ты яшчэ будзеш мець такую магчымасць? Бяры!» Узяў і не каюся.

Дзве-тры гадзіны музыкі і *(цэльны, цэлы)* тыдзень потым (аж да наступных заняткаў) а..чуваеш у сабе нейкую ..часліва-трапяткую радасць як бы дакрануўся да чагос..ці сонечнага кры..тальна-чыстага н..выказна-*(цудоўнага, цудадзейнага)*. Нішто мусіць так не пранікае ў самыя патае..ныя куточкі *(чалавечай, чалавечнай)* душы як музыка!

Музыка музыка... Як абядняем мы сябе а..крадваем калі апраўдва..чыся *(заняткам, занятасцю)* або *(неразуменнем, непаразуменнем)* вялікай музыкі па..бягаем яе. Музыку трэба слухаць як найчасцей! Я *(пераканальны, перакананы)* што нават тады калі ч..лавек яшчэ не ўмеў *(выгаворваць, гаварыць)* ён ужо слухаў музыку. Музыку в..сновага лес.. летняй навальніцы асенняга выра.. *(зімовай, зімовачнай)* завірухі. Музыку ср..бнагалосых ручаёў *(абуджальнай, абуджанай)* з..млі чыстага неба...

Музыка, як і прырода, супакойвае, ачышчае чалавека, абуджае ў ім імкненне да светлага *(высознага, высокага)* *(Паводле З. Прыгодзіча)*.

Чаму аўтар сцвярджае, што мы абядняем сябе, калі не слухаем музыку? Назавіце сучасных беларускіх кампазітараў. Якую музыку яны пішуць?

Спішыце другі і трэці абзацы тэксту, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. Абгрунтуйце напісанне арфаграм.

● Перабудуйце сказ з простай мовай у сказ з ускоснай мовай і запішыце. Падкрэсліце граматычную аснову.

ПЯСЧАНЫ — ПЯСОЧНЫ

Пясча́ны — пакрыты пяском; з аднаго пяску *(пясчаная выспа)*; з вялікай прымессю пяску; той, у якім шмат пяску *(пясчаная глеба)*.

Пясо́чны — які мае адносіны да пяску; з пяску *(пясочны гадзіннік)*; шаравата-жоўты, колеру пяску *(паліто пясочнага колеру)*; прыгатаваны з сухога, рассыпістага цеста *(пясочнае пірожнае)*.

Правообладатель Национальный институт образования

232. Прачытайце. Вызначце, у якіх словах парушаны словаўтваральныя нормы. Выправіце недакладнасці і запішыце сказы.

1. Многа разбурэнняў прыносілі на нашу зямлю шматлікія заваёўшчыкі. 2. За касарамі ішлі жанчыны, падварушваючы скошаную траву. 3. На пероне людзі чакалі рыгскі цягнік. 4. Паабапал вуліцы цягнуліся шматпавярхоўныя дамы́. 5. На пасяджэнні была пастаўлена задача папафарсіраваць падзеі. 6. Нашы канькабежчыкі не пакінулі канкурэнтам ніводнага шансу. 7. У гэтым інтэрнэт-магазіне можна набыць канцылярныя тавары.

233. Прачытайце. Ці зафіксаваны словы з тэксту са значэннем ‘назва маладой істоты’ ў лексікаграфічных крыніцах? Ці можна лічыць утварэнне гэтых слоў парушэннем нормы?

Як толькі ў дзіцяці пачынае фарміравацца свая метамова, бацькі адзначаюць яго здольнасць да словатворчасці. Так з’явіліся словы: *лямпяня, лямпіха, са́дніца, праўдун, малакуля.*

Лямпяня — дзіця лямпы. *Ты будзеш лямпа, а я — тваё лямпяня.*

Лямпіха — у значэнні ‘лямпа як жанчына’. *Ты лямпіха, а я — тваё лямпяня.*

Садніца — тая, хто наведвае дзіцячы сад. — *Ты школьніца? Ты ходзіш у школу? — Не, я садніца. Я хаджу ў сад.*

Праўдун — той, хто гаворыць праўду. *Я праўдун. Я ніколі не падманваю дарослых.*

Малакуля — карова, якая дае многа малака. *Ці прыйшла наша малакуля?* (Паводле інтэрнэт-крыніц).

Па якіх мадэлях утвораны словы? Падбярыце да наватвораў зафіксаваныя ў слоўніках лексічныя адзінкі такой самай будовы. Вызначце словаўтваральныя сродкі.

У шматлікіх тэкстах сустракаюцца **індывідуальна-аўтарскія наватворы**, ці **аказіяналізмы, аказіянальныя словы**, якія ўтвараюцца па вядомых у мове словаўтваральных мадэлях: *слова́падØ* ← ← *слов(а)* + *пада(ць)*, *ад’юбілеіць* ← *юбілей(□)*, *бяздожджыца* ← ← *дождж(□)*.

Індывідуальна-аўтарскія наватворы — гэта словы, якія ствараюцца і ўжываюцца носьбітамі мовы, у тым ліку пісьменнікамі, грамадскімі дзеячамі, вучонымі, з пэўнымі стылістычнымі мэтамі. Аказіяналізмы не зафіксаваны ў слоўніках сучаснай беларускай мовы, але іх нельга разглядаць як прыклад парушэння словаўтваральных норм.

Правообладатель Национальный институт образования

234. Прачытайце. Вызначце, як утварыліся аўтарскія наватворы.

1. Калі здаволіцца[м] лістабой — стаяць ..чарнелыя дрэвы самі сабой *(Р. Барадулін)*. 2. Ты красуй у яркай квец..ні, шумнаспеўны мой родны край! *(В. Максімовіч)*. 3. Лістотна крылаціцца дрэва жыц..я *(Р. Барадулін)*. 4. Ля вязаў басаножыць шматгалос..е *(М. Мятліцкі)*. 5. С..ветла самоціцца сад соннарукі *(Р. Барадулін)*. 6. З асмужаных[сл] пр..сторай Беларусі гл..дзім мы ўсе ў касмічны недасяг *(У. Верамейчык)*. 7. Усміха..ся ранак мне ружовы, г..маніў стазвонна белы свет *(В. Максімовіч)*. 8. Вятрам а..крытае паднеб'е прадз..мута сіверам скразным *(М. Мятліцкі)*.

Спішыце, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары.

235. У нарысах «Людзі і кветкі над Нёманам» вядомая пісьменніца Элаіза Ажэшка адзначае, што ў назвах раслін беларускі народ выявіў сваю «назіральнасць, выказаную вобразна і паэтычна». Падчас падарожжаў па Гродзеншчыне Э. Ажэшка сабрала 228 назваў раслін, большасць з якіх з'яўляецца вытворнымі, напрыклад: *зубнік, коткі, ліпка, малачай, маслянка, маркоўнік, рагуля, скрыпіца, хвашчай, шалястуха* і інш. Вызначце, якія з вышэйназваных раслін згадвае пісьменніца:

1) ніклая фіялетавая кветка, якая, калі сціснеш яе ў пальцах, злёгку паскрыпвае;

2) калі выспявае насенне гэтай травы, торбачкі, у якіх яно знаходзіцца, пры самым маленькім дотыку вельмі мілагучна шалясцяць.

Карыстаючыся тлумачальным слоўнікам, раскрыйце сэнс іншых назваў раслін. Зрабіце словаўтваральны разбор трох такіх назваў.

236. Выканайце тэставую работу «Склад слова і словаўтварэнне».

§ 26–1

КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Якія словы называюцца вытворнымі, а якія — невытворнымі? Прывядзіце прыклады.
2. Што такое ўтваральная аснова? Якія тыпы ўтваральных асноў вы ведаеце? Прывядзіце прыклады.
3. Якія словаўтваральныя сродкі выкарыстоўваюцца пры ўтварэнні новых слоў?
4. Якія змены могуць адбывацца ў асновах пры ўтварэнні слоў? Прывядзіце прыклады.
5. Назавіце асноўныя спосабы ўтварэння слоў. Якія з іх адносяцца да марфалагічных (марфемных), а якія — да немарфалагічных (немарфемных)? Прывядзіце прыклады.

Правообладатель Национальный институт образования

6. Што разумеюць пад словаўтваральнай нормай? Прывядзіце прыклады парушэння словаўтваральнай нормы.
7. З якой мэтай аўтары выкарыстоўваюць у сваіх творах індывідуальна-аўтарскія словы?

Тэставая работа па словаўтварэнні

1. Адзначце вытворныя словы:
1) зарэчны;
2) сталіца;
3) далёка;
4) чытаць;
5) шосты.

2. Утваральныя асновы правільна вызначаны ў наступных прыкладах:
1) сінь ← сін(і);
2) пераход ← хадзі(ць);
3) падлічыць ← падлічва(ць);
4) сур'ёзнасць ← сур'ёзн(ы);
5) па-беларуску ← беларуск(і).

3. Адзначце словы, утвораныя марфалагічным спосабам:
1) цёмна-сіні;
2) АНТ;
3) пераскочыць;
4) паранены;
5) злева.

4. Адзначце словы, утвораныя прыставачным спосабам:
1) праўнук;
2) адрэзак;
3) пераход;
4) узгорак;
5) прынесці.

5. Суфіксальным спосабам утвораны словы:
1) вучаніца;
2) знізу;
3) жалезабетонны;
4) збожжаўборка;
5) бялець.

6. Адзначце словы, утвораныя бяссуфіксным спосабам:
1) сінява;
2) восьмы;
3) завязь;
4) подпіс;
5) шасцёра.

7. Адзначце рады, у якіх усе словы ўтвораны прыставачна-суфіксальным спосабам:
1) прыгарад, адазваць, замежны, уперамешку;
2) адвячорак, прыдарожны, заснежыць, па-новаму;

Правообладатель Национальный институт образования

3) падсініць, абы-які, дажынкі, разносчык;
4) заморскі, перадгор'е, змоладу, бязмоўны;
5) здзіўляць, перадвясновы, вылецець, бязмежны.

8. Адзначце словы, утвораныя пры дапамозе асноваскладання:

1) пяцьсот;
2) чарнашэрсны;
3) руска-беларускі;
4) светаўспрыманне;
5) добраўпарадкаваны.

9. Адзначце словы, утвораныя пры дапамозе словаскладання:

1) двухкватэрны;
2) глыбокапаважаны;
3) даўгавечны;
4) чарнабровы;
5) вышэйзгаданы.

10. Адзначце словы, якія ўтварыліся складана-суфіксальным (асноваскладанне з суфіксацыяй) спосабам утварэння:

1) водаправодны;
2) нашаніўскі;
3) цеплакроўны;
4) паўнапраўнасць;
5) добраахвотнік.

11. Адзначце сказы са складанаскарочанымі словамі:

1) Каля Кацярыны прыпынілася працэдурная медсястра *(А. Якімовіч)*.
2) Дабрабыт свой, культуру ўздымаць абяцаем *(Я. Колас)*.
3) Картачка, зарплата добрыя, але работа нялёгкая *(І. Мележ)*.
4) Не спяшыў камбат пісаць аб стратах *(П. Панчанка)*.
5) Андрэй не спраўдзіў бацькавых надзей — хлебароб з яго не выйшаў *(А. Кудравец)*.

12. Адзначце групы слоў, якія з'яўляюцца словаўтваральнымі ланцужкамі:

1) баба — бабуля — бабулька;
2) дзіва — дзіўны — дзівосны;
3) белы — пабяліць — выбеліць;
4) працаваць — працаўнік — працаўніца;
5) горад — прыгарад — прыгарадны.

13. Адзначце складанаскарочаныя словы, утвораныя з частак слоў:

1) прафсаюз;
2) рыбгас;
3) галоўурач;
4) камбат;
5) лінкар.

Правообладатель Национальный институт образования

14. Адзначце правільна ўтвораныя словы:

1) двухкоссе;
2) спадылба;
3) пяцьсоты;
4) лазеншчык;
5) абветрыць.

15. Адзначце словы, пры ўтварэнні якіх парушаны словаўтваральныя нормы:

1) аляня;
2) абвестка;
3) гліняны;
4) прычапець;
5) балотавы.

16. Падбярыце да словазлучэння *берёзовый сок* аднаслоўны беларускі адпаведнік і запішыце яго.

17. Ад асновы дзеяслова, што ў дужках, бяссуфіксным спосабам утварыце назоўнік і запішыце яго.

Прыляцела вясной *(перамагаць)*. Прыгадалі мы плошчы яе *(П. Броўка)*.

18. Знайдзіце ў сказе маўленчую памылку і запішыце замест ужытага памылкова слова, што падыходзіць па сэнсе (у пачатковай форме):

І вось ён зрабіў ганарлівы круг і апынуўся ў музеі.

19. Устанавіце адпаведнасць паміж словамі і спосабамі іх утварэння:

1) настаўнік	а) прыставачна-суфіксальны
2) цёмна-зялёны	б) суфіксальны
3) беззямельны	в) складана-суфіксальны
4) зазімаваць	г) асноваскладанне
5) аднадумец	д) прыставачны

20. Выпішыце з тэксту слова, якое мае значэнне ‘прадпрыемства, што займаецца апрацоўкай ільну, вытворчасцю льняных тканін і пастаўкай іх іншым прадпрыемствам’. Вызначце, як яно ўтварылася.

Горад Орша — каралеўства беларускага лёну. Тут знаходзіцца Аршанскі льнокамбінат — адзінае ў Беларусі і найбуйнейшае ў краінах СНД і Еўропы прадпрыемства па вытворчасці льняной тканіны *(Паводле І. Зімневай)*.

Правообладатель Национальный институт образования

Марфалагічныя нормы

§ 0–27

§ 1–27

§ 2–27

237. Прачытайце ўрывак з верша. Па чым аўтар прапануе вывучаць мову? Вызначце асноўную думку тэксту.

Калі хочаце авалодаць нашай мовай,
Вывучайце яе не па граматыках...

А вывучайце
Па спрадвечных наш.. пісьмёнах
Крыніц, дарог, плугоў,
Па гоман.. дрэў
У вяснов.. і зімн.. уборы[сл],
Па матчыных калыханк..
На змярканні і ў час зарапад..,
Па цішыні папялішчаў Хатын..
І брацк.. магіл.
Па зязюльчынай варажбе
І жураўлінаму крык..,
Па поціску[сл] рук,
Што зброяй валодаць уме..ць
І сябрам дар..ць,
Дар..ць на ільняных ручніках
Хлеб і соль,
Сваё сэрца і дружбу.

М. Танк.

Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя канчаткі. Растлумачце іх напісанне.

Што сімвалізуюць хлеб і соль у беларускай культуры?

Знайдзіце ў тэксце назоўнікі, якія маюць форму толькі адзіночнага ці толькі множнага ліку. Што яны абазначаюць?

Выпішыце з тэксту прыналежныя прыметнікі. Як яны ўтварыліся?

У якой форме ўжываюцца ў тэксце дзеясловы загаднага ладу?

Марфалагічныя нормы — гэта прынятыя ў маўленчай практыцы правілы словазмянення, формаўтварэння і выкарыстання слоў розных часцін мовы.

Правообладатель Национальный институт образования

§ 27. Ужыванне назоўнікаў, лік, род якіх не супадаюць у беларускай і рускай мовах; назоўнікаў, якія маюць форму толькі адзіночнага ці толькі множнага ліку; назоўнікаў агульнага роду, нескланяльных назоўнікаў і абрэвіятур

238. Прачытайце табліцу і падрыхтуйце вуснае паведамленне пра назоўнік як часціну мовы.

Назоўнік — самастойная часціна мовы		
Агульнае значэнне	называе прадмет, адказвае на пытанні х т о? ш т о?	агульны ці ўласны; адушаўлёны ці неадушаўлёны; асабовы ці неасабовы; канкрэтны ці абстрактны; зборны, рэчыўны
Марфалагічныя прыметы	мае род, адносіцца да аднаго са скланенняў, змяняецца па ліках і склонах	м. р., ж. р., н. р. ці агульны род; 1, 2, 3-е скланенне ці рознаскланяльны або нескланяльны; адз. і мн. лік ці толькі адз. / толькі мн. лік; Н., Р., Д., В., Т., М. склон ці не скланяецца
Сінтаксічная роля	у сказе можа быць	———; ═══; – – – – –; ~~~~~; —·—·—·—

239. Прачытайце табліцу. Дапоўніце яе ўласнымі прыкладамі. Да якіх лексіка-граматычных разрадаў адносяцца назоўнікі ў графах табліцы? Назоўнікі якога ліку пераважаюць у складзе кожнага лексіка-граматычнага разраду?

Назоўнікі, якія маюць форму толькі адзіночнага ліку	
Значэнне	**Прыклады**
1) большасць уласных назваў	*Кавалеўскі Максім, Случчына*
2) большасць назваў абстрактных паняццяў	*сівізна, гарэнне, шчасце*
3) большасць назваў рэчываў	*нафта, мёд, нітрагліцэрына*
4) назвы, якія абазначаюць сукупнасць прадметаў як адно цэлае	*праменне, мэбля, моладзь, калоссе, вучнёўства*
5) назвы грамадска-палітычных вучэнняў, плыняў, працэсаў, навук	*капіталізм, рамантызм, біёніка, тапаніміка*
6) назвы гульняў, відаў спорту	*гандбол, хакей, фітнес, бодзібілдынг*

Правообладатель Национальный институт образования

Назоўнікі, якія маюць форму толькі множнага ліку	
Значэнне	**Прыклады**
1) некаторыя ўласныя назвы	*Пухавічы, Афіны, Курылы*
2) некаторыя назвы абстрактных паняццяў	*паводзіны, дрыжыкі, хітрыкі*
3) некаторыя назвы рэчываў	*дровы, апілкі, бялілы*
4) назвы, якія абазначаюць сукупнасць прадметаў як мноства	*кадры, грошы, мемуары, джунглі*
5) назвы састаўных і парных прадметаў	*абцугі, акуляры, вусны*
6) назвы народных звычаяў, гульняў, грамадскіх падзей	*вячоркі, хованкі, шахматы, выбары, перамовы*
7) назвы адрэзкаў часу і з'яў прыроды	*суткі, канікулы, замаразкі*
8) назвы спецыяльных тэрмінаў	*азімыя, цытрусавыя, сутачныя, асятровыя*

240. Разгледзьце малюнкі і прачытайце подпісы пад імі. Вызначце, якія назоўнікі ўжываюцца ў форме толькі адзіночнага, а якія ў форме толькі множнага ліку. Дапоўніце імі графы табліцы ў практыкаванні 239.

Якое слова мае значэнне ‘мясныя катлеты з начынкай’?

Складзіце па два сказы з назоўнікамі, што маюць форму толькі адзіночнага ці толькі множнага ліку. Вызначце, якімі членамі сказа яны з'яўляюцца.

Ці знаёмы вы з праектам сацыяльнай рэкламы «Смак беларускай мовы»? Чым, на вашу думку, карысныя такія праекты?

Правообладатель Национальный институт образования

241. Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Абгунтуйце сваю думку.

Цымбалы

Без цымбалаў немагчыма
Уявіць зямлю — Айчыну,
Бо і ў радасці[Ф], і ў скрусе
Любяць іх на Беларусі:
Пад цымбалы,
Пад цымбалы
Тут
Лявоніха скакала!
А цяпер пад тыя ж гукі
Скачуць праўнукі і ўнукі.

А. Пісьмянкоў.

Якія вы ведаеце народныя музычныя інструменты? Які з іх узгадваецца ў вершы?

Вызначце ў тэксце назоўнікі, што ўжываюцца ў форме толькі адзіночнага, ці толькі множнага ліку.

Якія назоўнікі з тэксту адносяцца да 1-га скланення? Растлумачце напісанне канчаткаў гэтых назоўнікаў ва ўскосных склонах.

- Растлумачце, як пішуцца словы з арфаграмай «Правапіс вялікай літары».
- Запішыце некалькі назоўнікаў, якія ўтвораны такім жа спосабам, як і слова *праўнук*.

Разгледзьце фотаздымкі. Што на іх адлюстравана? Карыстаючыся звесткамі з розных крыніц, падрыхтуйце «пашпарты» для такіх народных інструментаў, як гуслі і цымбалы. Складзіце спіс выкарыстанай вамі літаратуры.

КОЛАС — КАЛАСЫ — КАЛОССЕ

Зборныя назоўнікі *калоссе, карэнне, галлё, насенне* і іншыя маюць форму толькі адзіночнага ліку.

Іх трэба адрозніваць ад аднакаранёвых назоўнікаў адзіночнага і множнага ліку: *ка́мень* (адз. л.) — *камяні́* (мн. л.) — *каме́нне* (зб.); *бервяно́* (адз. л.) — *бярвёны* (мн. л.) — *бярве́нне* (зб.); *праме́нь, про́мень* (адз. л.) — *праме́ні, прамяні́, про́мні* (мн. л.) — *праме́нне* (зб.).

242. Выпішыце са сказаў назоўнікі, якія ўжываюцца ў форме толькі множнага ліку. Што яны абазначаюць?

1. У векавечнай бацькаўшчыне клёны нячутна пачынаюць аблятаць на рыжую траву, на мох зялёны, на весніцы, на ціхі стаў*, на гаць *(У. Караткевіч)*. 2. Я зноў на станцыі лясной, марозна-звонкай[сл], заінелай, стаю ў Бялынкавічах белых, прапахлых смольнаю сасной *(А. Пісьмянкоў)*. 3. Жыццё не бесклапотнае, не лёгкае, ды не пайду

Правообладатель Национальный институт образования

хавацца ў цень[м], хаця і знаю я: і тых, хто лётае, грымоты б'юць і ў ясны дзень *(М. Маляўка)*. 4. Як чараўніца на нябачных кроснах, ноч тчэ над лесам цёмны полаг свой *(Н. Гілевіч)*. 5. Калі ты ад клапот жыццёвых стараніўся, ні хлебам, ні вадой з сябрамі не дзяліўся, нікога не сагрэў ні словам, ні спагадай і ніву не прыкрыў грудзьмі ад градападу, заўсёды за другіх хаваўся ў ліхалецце, — лічы, што не было цябе на гэтым свеце *(М. Танк)*.

● Выпішыце з практыкавання тры словы, у якіх колькасць літар і гукаў не супадае.

Выканайце інтэрактыўнае заданне «Лік назоўнікаў».

Звярніце ўвагу!

Абстрактныя і рэчыўныя назоўнікі могуць утвараць формы множнага ліку, але пры гэтым часткова змяняецца іх значэнне: *хрыпы ў лёгкіх, беларускія сыры, кітайскія шаўкі.*

Зборныя назоўнікі не могуць мець формы множнага ліку.

Уласныя назоўнікі ўжываюцца ў форме множнага ліку, калі пераходзяць у агульныя ці абазначаюць прадстаўнікоў аднаго роду або людзей з аднолькавымі прозвішчамі: *мужнасць не згарэла ў* ***Хатынях*** (Ю. Свірка); ***Агінскія*** *— старажытны магнацкі род* («Звязда»).

243. Разгледзьце схему. Падрыхтуйце вуснае выказванне пра несупадзенне ліку назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.

Правообладатель Национальный институт образования

244. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову і запішыце.

Вкусная клюква, жирные сливки, садовая ежевика, чёрная смородина, спелая земляника, счастливая двойня, полная пригоршня, нервная дрожь, высокие яровые, крупная брусника, правильное соотношение, небольшое введение, узорчатое кружево.

З двума словазлучэннямі (на выбар) складзіце сказы.

Прывядзіце ўласныя прыклады назоўнікаў, якія адрозніваюцца лікам у рускай і беларускай мовах.

245. Прачытайце тэкст, дапаўняючы яго тэарэтычнымі звесткамі і ўласнымі прыкладамі. На колькі частак можна падзяліць тэкст?

Род назоўніка — яго пастаянная марфалагічная прымета. У форме адзіночнага ліку яна пададзена супрацьпастаўленнем мужчынскага *(брат, дом)*, жаночага *(вярба, зямля)* і … *(акно, сузор'е)* роду. У назоўніках, якія маюць форму толькі множнага ліку, род не вызначаецца.

Асобую групу назоўнікаў складаюць назоўнікі агульнага роду. Да іх адносяцца: назвы асоб паводле адметных якасцей *(соня, …)*; назвы асоб паводле становішча ў грамадстве, прафесіі *(сірата, …)*; побытавыя формы ўласных імёнаў *(Саша, …)*.

Род такіх назоўнікаў змяняецца ў залежнасці ад таго, … якога полу яны абазначаюць. Большасць назоўнікаў агульнага роду — экспрэсіўна афарбаваныя словы, якія характэрны для … стылю і мовы мастацкай літаратуры.

246. Размяркуйце назоўнікі па групах у залежнасці ад родавай прыналежнасці.

Мужчынскі род	Жаночы род	Ніякі род	Агульны род	Род не вызначаецца
1	2	3	4	5

Баль, вермішэль, Кітай, Ягор, вогнішча, нявеста, валяр'ян, радно, гусяціна, грошы, подпіс, задавака, пажарышча, плакса, чаканне, камода, шэрань, шынель, сірата, Івацэвічы, дамішча, асвета, хлапчанё, макарона, Анды, салата, немаўля, какава (напой), лебедзь, педаль, блізняты.

З трыма назоўнікамі складзіце сказы.

Правообладатель Национальный институт образования

247. Прачытайце тэкст. Вызначце сродкі сувязі сказаў.

Верхні слой бярозавай кары называецца бяроста. На ёй нашы продкі пісалі, ёю крылі стрэхі. Сшытыя працавітымі рукамі кавалкі бяросты служылі ёмістасцямі для сыпучых і вадкіх прадуктаў. Бяроста ўтрымлівае кампаненты серабра, таму добра загойвае раны, а ў берасцяных вырабах малако доўга не пракісае.[сн] Для нашых продкаў нарыхтоўка[м] бяросты, якая адбывалася толькі ў маі ці чэрвені, не з'яўлялася вялікай мукай. У гэты час бяроста была эластычная і лёгка аддзялялася ад ствала бярозы *(Паводле А. Коршак)*.

Якія вырабы з бяросты ствараліе нашы продкі?

Вызначце род назоўнікаў, ужытых у тэксце. Якія з іх ужываюцца ў форме толькі адзіночнага ліку?

- Да слова *бяроста* падбярыце аднакаранёвае з тэксту. Як яно ўтварылася?

Запішыце назоўнікі 1-га скланення ў форме меснага склону адзіночнага ліку. Растлумачце напісанне канчаткаў.

248. Запоўніце пропускі ў табліцы беларускімі словамі. Якія словаўтваральныя сродкі паказваюць на род вытворных слоў?

Несупадзенне роду назоўнікаў у беларускай і рускай мовах	
руская мова	беларуская мова
ж. р. *гвоздика, боль, насыпь*	м. р. …
н. р. *яблоко, чудо, стадо*	м. р. …
м. р. *жираф, мазут, цикорий*	ж. р. …
н. р. *творчество, растение, название*	ж. р. …
м. р. *совёнок, шов, свет*	н. р. …
ж. р. *жизнь, среда, ботва*	н. р. …

З трыма назоўнікамі розных родаў складзіце сказы.

249. Перакладзіце на беларускую мову.

Старая мельница, молодой клевер, фарфоровая посуда, белая сирень, неправильная дробь, большая щука, алая гвоздика, личная подпись, неровный шов, высокая валериана, солдатская шинель, маленький цыплёнок, продажа квартиры, кислый щавель, древняя рукопись.

Правообладатель Национальный институт образования

Звярніце ўвагу!

У беларускай і рускай мовах існуюць назоўнікі, якія адрозніваюцца складам слова ці асаблівасцямі словаўтварэння, што прыводзіць да адрозненняў у родзе:

- у беларускай мове да мужчынскага, а ў рускай да жаночага адносяцца: *гваздзік — гвоздика, шчупак — щука* і інш.;
- у беларускай мове мужчынскі, а ў рускай ніякі род маюць назоўнікі: *яблык — яблоко, цуд — чудо* і інш.;
- у беларускай мове да жаночага, а ў рускай да ніякага роду адносяцца назоўнікі *рабрына — ребро, электрычнасць — электричество, назва — название, творчасць — творчество* і інш.;
- у беларускай мове ніякі, а ў рускай мове мужчынскі род маюць назоўнікі *зубраня — зубрёнок, святло — свет, шво — шов* і інш.;
- у беларускай мове да ніякага, а ў рускай да жаночага роду адносяцца назоўнікі *шнураванне — шнуровка, бацвінне — ботва, жыццё — жизнь, асяроддзе — среда, адзенне — одежда* і інш.

У беларускай і рускай мовах ёсць лексічныя адзінкі, якія ў адной з моў маюць два адпаведнікі: беларуск. ж. р. *роднасць* — руск. ж. р. *родственность* і н. р. *родство*.

250. Прачытайце тэкст. Загаловак перадае тэму ці асноўную думку? Да якога стылю і жанру адносіцца тэкст?

Уроки безопасности для подростков

Каждый раз, включая компьютер, телевизор, утюг, помните, что эти бытовые приборы не только ваши помощники. Это электрооборудование, которое может быть опасным, если неправильно его эксплуатировать. Основными причинами возгорания от электричества являются короткое замыкание электрического тока и перегрузка электропроводов. Признаками тления или горения электропроводов являются потемнение изоляции, запах горящей резины или пластмассы, искрение. Обнаружив их, следует немедленно обесточить электроприбор, набросить на него плотную ткань, чтобы прекратить доступ кислорода к очагу возгорания, и позвонить по телефону 101 или 112. Тушить водой электроприборы или находящуюся под током электропроводку опасно для жизни. От вашего поведения зависят ваша жизнь и жизнь ваших близких.

Чтобы избежать пожаров от электричества, запрещается:

- включать одновременно в розетку несколько электроприборов (чайник, утюг, электрообогреватель и т. д.);

Правообладатель Национальный институт образования

- заклеивать электропроводку обоями, подрезать щипцами или ножницами, подвешивать на гвозди, завязывать её в узлы, ставить вплотную к ней различные предметы;
- вешать бумажные абажуры на электролампочки;
- оставлять работающие электроприборы без присмотра;
- пользоваться неисправными электроприборами *(По материалам сайта www.mir.pravo.by)*.

Слоўнік

горящая резина — *гума (рызіна), якая гарыць*
искрение — *іскрэнне*
неисправный — *няспраўны*
обнаружив — *знайшоўшы*
очаг возгорания — *ачаг узгарання*
прекратить доступ — *спыніць доступ*
присмотр — *нагляд*
электрообогреватель — *электраабагравальнік*

Якіх правіл трэба прытрымлівацца, каб засцерагчы сябе ад пажару?

Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Назавіце назоўнікі, якія ўжываюцца ў форме толькі адзіночнага ці ў форме толькі множнага ліку. Якія назоўнікі адрозніваюцца родам у беларускай і рускай мовах?

Выпішыце з кожнага рада назоўнік, які будзе мець канчатак **-у** ў форме роднага склону адзіночнага ліку:

а) кісларод, тэлевізар, электрапрыбор, вузел;
б) тэлефон, ток, памочнік, камп'ютар;
в) асяродак, абажур, пах, прас;
г) чайнік, доступ, цвік, электрапровад.

Якія канчаткі ў форме меснага склону адзіночнага ліку будуць мець назоўнікі *разетка, электраправодка, электралямпачка*?

Падрыхтуйце па ўзоры тэксту памятку-інструкцыю, як трэба сябе паводзіць на вадзе.

ВУЖ — ВУЖАКА

Вуж *(м. р.)* — адна з неядавітых змей сямейства паўзуноў.

Вужа́ка *(ж. р.)* — 1) агульная назва паўзуноў з доўгім гнуткім целам без ног; змяя; 2) ліхі, каварны чалавек.

Да агульнага роду адносяцца назоўнікі з канчаткамі **-а, -я**: *Жэня, Саша, сірата, нераўня*. У залежнасці ад кантэксту яны могуць абазначаць асоб мужчынскага або жаночага полу.

Правообладатель Национальный институт образования

Калі назоўнікі агульнага роду абазначаюць асоб жаночага полу, то змяняюцца як назоўнікі 1-га скланення: *Д. скл. / М. скл. (па) сіраце Марыне, задзіры Сашы, цёзцы Ірынцы.*

Калі назоўнікі агульнага роду абазначаюць асоб мужчынскага полу, то змяняюцца як назоўнікі мужчынскага роду з канчаткамі ***-а, -я***. Іх склонавыя формы залежаць ад тыпу асновы назоўніка і націску.

Назоўнікі з націскнымі канчаткамі ***-а, -я*** скланяюцца як назоўнікі жаночага роду на ***-а, -я*** з адпаведнымі асновамі: *Д. скл. / М. скл. (пры) сіраце Фаме, нераўні Кузьме, суддзі Ілы, ляўшы, старшыні.*

Назоўнікі з ненаціскнымі канчаткамі ***-а, -я*** скланяюцца як рознаскланяльныя, таму што ў назоўным, родным і вінавальным склонах яны маюць канчаткі 1-га скланення *(Н. скл. непасед-а Валер-а, Р. скл. непасед-ы Валер-ы, В. скл. непасед-у Валер-у)*, а ў давальным, творным і месным — 2-га скланення *(Д. скл. непасед-у Валер-у, Т. скл. непасед-ам Валер-ам, М. скл. (пры) непаседз-е Валер-у)*.

Да назоўнікаў агульнага роду адносяцца і словы *хвалько, нямко, гняўко*. Калі яны абазначаюць асобу жаночага полу, то не скланяюцца, а калі мужчынскага, то змяняюцца як назоўнікі мужчынскага роду 2-га скланення: *Н. скл. хвалько, Р. скл. хвалька, Д. скл. хвальку, В. скл. хвалька, Т. скл. хвальком, М. скл. (пры) хвальку.*

251. Прачытайце сказы. Вызначце род выдзеленых назоўнікаў. Абгрунтуйце сваю думку.

1. А сёлетняя восень была **плакса**: яна ахінала зямлю туманамі, засланяла сонца густымі хмарамі, якія сеялі і сеялі, як скрозь сіта, надакучлівую імжу *(Р. Сабаленка)*. 2. Дождж[Ф] — мой даўні **калега**, мой суаўтар элегій, уначы нашаптаных, недасланых каханай *(А. Пісьмянкоў)*. 3. «З крыніцамі звязана шмат паданняў...», — адзначыла **кандыдат** гістарычных навук, **археолаг**, вядомы **этнограф** Людміла Дучыц *(«Звязда»)*. 4. Час — непадкупны і справядлівы **суддзя**! *(М. Танк)*. 5. Ды ён, гэты вецер, — **гарэза** свавольны, што вусны мае цалаваў *(І. Хадарэнка)*. 6. А ў нас лічылі, што апавяданні прадзеда — мана, а ён — **хвалько** *(У. Караткевіч)*.

- Складзіце схему чацвёртага сказа.
  Вызначце, як утворана слова *нашаптаных*.

Правообладатель Национальный институт образования

Звярніце ўвагу!

Назвы асоб паводле прафесіі ці роду заняткаў *(арнітолаг, дэпутат, прафесар)* адносяцца да мужчынскага роду і дапасуюць да сябе прыметнікі і дзеепрыметнікі ў форме мужчынскага роду. Дзеясловы прошлага часу пры такіх назоўніках ужываюцца ў залежнасці ад полу асобы: *У якасці інтэрв'юера кіраўніка дзяржавы* ***выступіла вядомы журналіст*** *Марыя Ганна Матыс («Звязда»).*

252. Спішыце, раскрываючы дужкі. Абгрунтуйце выбар формы назоўнікаў і прыметнікаў.

Дараваць *(гарэза Толя)*, размаўляць з *(вядомы археолаг Вера Пятроўна)*, давяраць *(суддзя Мікіта Іванавіч)*, сядзець пры *(мясцовы лістаноша)*, паведаміць *(таленавіты доктар Дар'я Сяргееўна)*, сумаваць па *(гарэза Каця)*, павітацца са *(старшыня Ілья)*, параіць *(задавака сястра)*, займацца з *(малы Жэня)*, захапляцца *(суддзя Аліна Васільеўна)*, сустрэцца з *(цёзка Даніла)*.

Праз падбор аднакаранёвых слоў растлумачце значэнне слова *лістаноша*. Праскланяйце словазлучэнні *гарэза Толя* і *гарэза Каця*. Ад чаго залежаць канчаткі назоўнікаў?

З двума прыкладамі словазлучэнняў (на выбар) складзіце сказы.

Звярніце ўвагу!

Да **нескланяльных** адносяцца назоўнікі, якія маюць адну і тую ж форму ва ўсіх склонах.

У назоўным і ўсіх ускосных склонах яны маюць аднолькавыя канчаткі. Граматычнае значэнне склону выражаецца сінтаксічна: *прыгожых кенгуру, ролі Адрыяна Чэлентана.*

Да нескланяльных адносяцца:

- запазычаныя агульныя і ўласныя назвы з асновай на галосны: *адажыа, манто, Місісіпі, Гейнэ, Кюры*;
- іншамоўныя агульныя і ўласныя назоўнікі на зычны, якія абазначаюць асоб жаночага полу: *місіс, Элен, Мітчэл*;
- мужчынскія і жаночыя славянскія прозвішчы на ***-о*** і ***-ых***: *Крайко, Ляўко, Бялых, Баранавых*;

Правообладатель Национальный институт образования

- беларускія жаночыя прозвішчы на зычны: *Кавалёнак, Ліс, Арцямёнак*;
- жаночыя прозвішчы, якія ўтварыліся ад назваў прадметаў і суадносяцца з ніякім родам назоўніка: *Дула, Шыла*;
- жаночыя прозвішчы, якія не ўтварыліся ад назваў прадметаў і род якіх вызначыць складана: *Протчанка Настасся, Сувалка Тамара, Шарапа Алеся*;
- гукавыя абрэвіятуры на галосны: *ДАІ*, *НІА*, а таксама літарныя абрэвіятуры: *БДУ*, *СНД*;
- назоўнікі агульнага роду *(хвалько, нямко, гняўко)*, калі абазначаюць асоб жаночага полу: *хвалько Марыля, да хвалько Марылі, хвалько Марылі, пра хвалько Марылю, хвалько Марыляй (-яю), пры хвалько Марылі.*

253. Прачытайце табліцу. Падрыхтуйце паведамленне пра род нескланяльных назоўнікаў.

<table>
<tr><th colspan="2">Род нескланяльных назоўнікаў</th></tr>
<tr><th colspan="2">Адушаўлёныя назоўнікі</th></tr>
<tr><th>Асабовыя назоўнікі</th><th>Неасабовыя назоўнікі</th></tr>
<tr><td>род вызначаецца паводле полу асобы: Кармэн, Маргарэт, лэдзі, місіс — ж. р.; Энтані, Вано, месье, маэстра — м. р.</td><td rowspan="2">адносяцца да мужчынскага роду: фламінга, марабу, гну, грызлі
Выключэнне: івасі, цэцэ — ж. р. (род вызначаецца паводле роду відавога паняцця: рыба, муха — ж. р.)</td></tr>
<tr><td>назвы тыповых мужчынскіх прафесій адносяцца да мужчынскага роду: парцье, аташэ, рэферы, мікада*, кюрэ*</td></tr>
<tr><th colspan="2">Неадушаўлёныя назоўнікі</th></tr>
<tr><th>Агульныя назоўнікі</th><th>Уласныя назоўнікі</th></tr>
<tr><td>адносяцца да ніякага роду: кімано, паліто, безэ, кашпо, фае, шоу</td><td>род вызначаецца паводле роду адпаведнага агульнага назоўніка: Палерма (горад) — м. р., Ай-Петры (гара) — ж. р., Ківу (возера) — н. р., Оку (возера) — н. р.</td></tr>
</table>

Правообладатель Национальный институт образования

254. Падбярыце назоўнікі, што адпавядаюць прыведзеным азначэнням. Дапасуйце да іх прыметнікі, словазлучэнні запішыце.

1. Горад, у якім у 2014 годзе праходзілі Алімпійскія гульні. 2. Назва старажытнага мастацтва складвання фігурак з паперы. 3. Спартыўная водная гульня. 4. Птушка з ружовым апярэннем. 5. Штрафны ўдар у футболе. 6. Слова, што дадаецца да імя ці прозвішча замужняй жанчыны ў Германіі. 7. Сталіца Нарвегіі. 8. Спартыўная камандная гульня з мячом авальнай формы; разнавіднасць футболу.

З двума словазлучэннямі на выбар складзіце сказы. Вызначце род назоўнікаў.

Род **нязменных абрэвіятур** вызначаецца паводле роду асноўнага слова расшыфроўкі: *СНД — Садружнасць Незалежных Дзяржаў* (ж. р.); *РУУС — Раённае ўпраўленне ўнутраных спраў* (н. р.); *РБС — руска-беларускі слоўнік* (м. р.); *ААН — Арганізацыя Аб'яднаных Нацый* (ж. р.); *АБСЕ — Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе* (ж. р.).

Род **зменных абрэвіятур** вызначаецца па канчатку і характары асновы. Зменныя абрэвіятуры на зычны адносяцца да мужчынскага роду: *ЖЭК — у ЖЭКу* (м. р.), *ЛіМ — у ЛіМе* (м. р.), *ЦУМ — каля ЦУМа* (м. р.), *дот — у доце* (м. р.), *рыбгас — у рыбгасе* (м. р.).

Складанаскарочаныя словы змешанага тыпу, у якіх другое слова мае форму ўскоснага склону, адносяцца да таго самага роду, што і першае скарочанае слова: *камроты — камандзір роты, кампалка́ — камандзір палка* (м. р.).

Род **запазычаных абрэвіятур** вызначаецца па знешняй форме: *ЮНЕСКА, НАТА* — н. р., *ФІФА* — ж. р.

255. Размяркуйце словы па групах у залежнасці ад роду. Раскажыце пра асаблівасці вызначэння роду нескланяльных назоўнікаў і абрэвіятур.

Мэры, ДУА, какаду, БРСМ, папуры, Батумі, ВКЛ, лэдзі, жалюзі, Жуліа, грызлі, Конга (рака), куцюр'е, івасі, МНС, Мінэканомікі, самба, бістро, жако, аргработа, вета, Цэнтрвыбаркам, рэзюмэ, тарнада, клішэ, калібры, Кіліманджара (гара), манпансье, Элен, кюрэ, камюніке, пані, леча, Чылі, табу, маэстра, фрау, Антарыа (возера), Каларада (рака), метро.

Растлумачце напісанне слоў з арфаграмай «Правапіс ***о, э, а***».

Правообладатель Национальный институт образования

256. Дапішыце канчаткі прыметнікаў і вызначце род назоўнікаў.

Каштоўн.. жэньшэнь, нов.. выкладчык Ганчарова, сонечн.. Батумі, вечн.. зубрыла сястра, раённ.. леспрамгас, англійск.. Глазга, стапрацэнтн.. алібі, прав.. педаль, дзіўн.. хвалько аднакласнік, шэр.. пыл, горк.. алоэ, прыгож.. бра, незвычайн.. НЛА, японск.. мікада, дзік.. сабака дынга, іспанск.. ранцье, запаведн.. Мачу-Пікчу, глыбок.. Антарыа, аўстралійск.. кенгуру, хутк.. Місуры, шумн.. Мантэвідэа, італьянск.. маэстра, таленавіт.. піяніст Філіпава, цацачн.. поні, алімпійск.. Нагана, тлуст.. макрэль, гультаяват.. беларучка сусед, нов.. АЗС, балюч.. мазоль, малад.. іхтыёлаг Вераб'ёва, смачн.. вермішэль.

257. Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Назавіце сродкі сувязі сказаў у першым абзацы.

Кветкі радзімы

У шасцідзясятыя гады мінулага стагоддзя я пазнаёміўся з французскай мастачкай Надзяй Лежэ. Я суправаджаў яе да вёскі Зембін Барысаўскага раёна. Там малая радзіма мастачкі. Надзя Лежэ была вельмі камунікабельнай, гаваркой, прыязнай і шмат чаго расказала пра сваё жыццё.

Найперш яна ра..павяла якое радаснае пачуц..ё авалодала ёю пры перасяч..нні мяжы. Надзя Лежэ здзіўлялася: «Адкуль гэта пачуццё? Ад усведамлення што ты на сваёй зямлі на зямлі Радзімы? Ёсць у Францыі такая ж з..мля. І нават б..розы ёсць. Кв..тнеюць на ёй і сланечнікі любімыя кветкі Ван Гога але Ван Гог любіў толькі сланечнікі Праванса. Нічога з гэтым не зробіш і не зменіш. Гэта як у маленств.. дотык ма..чынай рукі не зблытаеш ні з адной самай пя..чотнай рукой на свеце. Ні з адной. Людзі паміралі сціснуўшы ў руцэ жменьку роднай зямлі якую яны неслі ў ладанках на грудзях. Ды і я жыла не выпуска..чы гэту зямел..ку з рук. Мама казала "Мілы той куток дзе адр..заны пупок і мой куток пачына..ся з памежнага Брэста..."»

Надзя расказвала, што ёй хацелася, каб у Францыі нешта нагадвала пра яе радзіму, і яна пасадзіла пад акном свайго дома сланечнік. Я запытаў, чаму менавіта гэта расліна, у Ван Гога ж таксама сланечнік, на што яна адказала так:

— У Ван Гога — свой. Вангогаўскі, асабісты сланечнік, французскі. А да свайго сланечніка я ставілася асабліва, не так, як да астатніх

Правообладатель Национальный институт образования

раслін: з ім было звязана нешта сваё, кроўнае, што існавала разам са мной калісьці на беларускай зямлі. І, як у дзяцінстве, я чакала ад яго падарунка. Насенне можна пасадзіць потым у зямлю, і з'явіцца шмат жоўтай весялосці пад маім акном.

Аднойчы муж Надзеі, вядомы мастак Фернан Лежэ, працуючы ў садзе, выпадкова зрэзаў сланечнік. Божа, што было! Надзя кінулася ў слёзы: «Мой сланечнік! Мой сланечнік...» Збянтэжаны, мастак разгубіўся: ён ніколі не бачыў, каб Надзя плакала! «Ну што ж мне рабіць? — схапіўся за галаву маэстра. — Хочаш, я намалюю табе пяцьдзясят такіх сланечнікаў?..» І намаляваў! Праўда, дваццаць. Цудоўных, каляровых... *(Паводле Б. Крэпака).*

Хто такая Надзя Лежэ? З якой мэтай Надзя пасадзіла каля свайго французскага дома сланечнік? Сімвалам чаго з'яўляўся ён для жанчыны?

Які загаловак, акрамя прапанаванага, можна даць тэксту?

Спішыце другі абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы, дзе трэба, знакі прыпынку.

Выпішыце з тэксту нязменныя назоўнікі. Назавіце групы нязменных назоўнікаў у беларускай мове.

Праскланяйце геаграфічныя назвы *Зембін, Барысаў, Брэст*. Паводле якога тыпу скланення яны змяняюцца? Чым адрозніваецца змяненне геаграфічнай назвы *Барысаў* ад прозвішча *Барысаў*?

● З апошняга абзаца выпішыце сказ з прыдаткам. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Ван Гога «Сланечнікі». Ці адпавядае яна зместу тэксту? Чаму, на вашу думку, мастак так любіў маляваць гэтыя кветкі?

Падзяліце тэкст на часткі.

Ці адпавядае прапанаваны план кампазіцыйнай схеме тэксту?

1. Сустрэча з мастачкай.
2. На роднай зямлі.
3. Памяць пра радзіму.
4. Дваццаць сланечнікаў.

Выпішыце ключавыя словы з кожнай часткі. Перакажыце тэкст ад імя трэцяй асобы.

258. Выканайце тэставую работу «Назоўнік».

Правообладатель Национальный институт образования

§ 28. Ужыванне поўных і кароткіх прыметнікаў, форм ступеней параўнання якасных прыметнікаў, прыналежных прыметнікаў. Ужыванне форм ступеней параўнання прыметнікаў і прыслоўяў

§ 0–28

§ 1–28

§ 2–28

259. Падрыхтуйце паведамленне на тэму «Прыметнік як часціна мовы», карыстаючыся планам і схемай.

План

1. Агульнае значэнне прыметніка. Разрады прыметнікаў паводле значэння.
2. Ступені параўнання прыметніка. Марфалагічныя прыметы: род, лік, склон.
3. Сінтаксічная роля.

Разрады прыметнікаў паводле значэння

якасныя

- абазначаюць прыметы прадметаў паводле формы *(круглы)*, памеру *(малы)*, колеру *(белы)*, фізічных і душэўных уласцівасцей ці якасцей *(дужы, шчодры)*;
- адказваюць на пытанні я к і? я к а я? я к о е? я к і я?;
- могуць утвараць ступені параўнання *(цёплы — цяплейшы)*;
- могуць спалучацца са словамі *вельмі, надта (вельмі халодны)*

адносныя

- абазначаюць прыметы прадметаў паводле іх адносін да матэрыялу ці рэчыва *(металічны)*, месца *(вясковы)*, часу *(ліпеньскі)* і інш.;
- адказваюць на пытанні я к і? я к а я? я к о е? я к і я?;
- не могуць утвараць ступеней параўнання;
- не спалучаюцца са словамі *вельмі, надта*

прыналежныя

- абазначаюць прыметы прадметаў паводле іх прыналежнасці чалавеку *(дзядулеў)* або жывёлам *(баброў)*, птушкам *(зязюлін)* і да т. п.;
- адказваюць на пытанні ч ы й? ч ы я? ч ы ё? ч ы е?

260. Прачытайце ўрывак з паэмы Я. Коласа «Новая зямля». Вызначце тып маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

Вось як жывога **дзядзьку** бачу,
Я тут **партрэт** яго зазначу.
Ён невысок, не надта ёмак,
Ды карчавіты і няўломак,
А **волас** мае цёмна-русы,
І зухаўскія[л] яго **вусы**

Правообладатель Национальный институт образования

Умеру доўгі, густаваты,
Угору чуць канцы падняты;
А **вочы** шэры, невялічкі,
Глядзяць прыветна[м], як **сунічкі**,
Але раптоўна і адразу
Не расчытаеш іх выра́зу…

Знайдзіце ў тэксце прыметнікі ў кароткай форме. Вызначце іх лік, род (калі магчыма), сінтаксічную ролю. З якой мэтай аўтар выкарыстоўвае ў тэксце кароткія прыметнікі?

Падбярыце антонім да слова *няўломак*.

Растлумачце напісанне ***не*** з рознымі часцінамі мовы.

Запішыце выдзеленыя назоўнікі ў форме роднага і меснага склонаў адзіночнага ліку. Абгрунтуйце напісанне канчаткаў.

Спішыце другі сказ тэксту, падкрэсліце прыметнікі як члены сказа, вызначце канчаткі.

Разгледзьце ілюстрацыю В. Шаранговіча да паэмы Я. Коласа «Новая зямля». Знайдзіце на ёй выяву дзядзькі Антося. Якія рысы характару героя ўдалося перадаць мастаку?

Карыстаючыся зместам тэксту і ілюстрацыяй, апішыце дзядзьку Антося.

Якасныя прыметнікі ўжываюцца ў поўнай і кароткай форме.

Поўная форма прыметніка ў назоўным склоне адзіночнага ліку мужчынскага роду мае канчаткі ***-ы (-і)***: *рад*[ы], *невысок*[і]; жаночага — ***-ая (-яя)***: *светл*[ая], *сін*[яя]; ніякага — ***-ое, -ае (-яе)***: *густ*[ое], *удзячн*[ае], *сін*[яе]; у множным ліку для ўсіх родаў — ***-ыя (-ія)***: *здаров*[ыя], *дараг*[ія].

Кароткая форма прыметніка ў назоўным склоне адзіночнага ліку мужчынскага роду мае нулявы канчатак: *сябар рад*[ ], *дзед невысок*[ ]; у жаночым і ніякім родзе — канчатак ***-а***: *мара светл*[а], *дзіця ўдзячн*[а]; у множным ліку — канчатак ***-ы (-і)***: *бацькі здаров*[ы], *успаміны дараг*[і].

Поўная форма прыметніка змяняецца па родах, ліках і склонах. Кароткая форма змяняецца па родах (у адзіночным ліку) і ліках, але не скланяецца. У асноўным яна ўжываецца ў паэтычным маўленні і ў вуснай народнай творчасці.

У сказе поўныя прыметнікі выконваюць ролю азначэння ці выказніка, а кароткія — толькі выказніка: ***Добрая*** (поўная форма) *мова — культуры аснова* (М. Пазнякоў). *Месяц люты — вельмі* ***мудры*** (поўная форма) (А. Зэкаў). *Будзь так* ***весел*** (кароткая форма), *як вясна* (З народнага).

Правообладатель Национальный институт образования

261. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Звярніце ўвагу на перадачу кароткіх форм прыметнікаў.

Это надо знать

Не злословьте о других, не повторяйте сплетен. Если вы хотите пошутить, делайте это так, чтобы не задевать самолюбия присутствующих. Совершенно неуместны шутки над внешностью, именами или возрастом других. Человек не виноват в том, что он толст, или тонок, или, например, близорук, или очень молод, как и в том, что родители назвали его каким-нибудь «необыкновенным» именем *(По материалам интернет-ресурсов)*.

Слоўнік

задевать самолюбие — *закранаць самалюбства*
злословить — *зласловіць, абгаворваць*
неуместный — *недарэчны; не да месца, недарэчы*
присутствующие — *прысутныя*

262. Прачытайце табліцу. Запоўніце яе неабходнымі словамі. Раскажыце, як утвараюцца формы вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання прыметнікаў.

Ступені параўнання	Формы	
	Простая	Складаная
Вышэйшая	моцны + *-ейш-* → … дарагі + *-эйш-* → … А л е: добры → … дрэнны → …	больш (болей) + моцны → … менш (меней) + дарагі → … менш (меней) + добры → … больш (болей) + дрэнны → …
Найвышэйшая	*най-* + мацнейшы → … *най-* + даражэйшы → … *най-* + лепшы → … *най-* + горшы → …	самы + моцны → … найбольш + дарагі → … найменш + добры → … самы + дрэнны → …

З двума прыметнікамі ў форме вышэйшай ступені параўнання складзіце сказы. Ужывайце прыметнікі ў канструкцыях «прыметнік + за + В. скл. назоўніка», «прыметнік + чым + Н. скл. назоўніка».

263. Прачытайце тэкст, ужываючы прыметнікі ў дужках у форме вышэйшай ці найвышэйшай ступені параўнання. Падбярыце да тэксту загаловак у адпаведнасці з тэмай.

Дакладна не вядома, якое балота на Зямлі *(глыбокі)*. Але ў гэтай намінацыі маглі б паспаборнічаць за перамогу грэчаскія балоты: іх

Правообладатель Национальный институт образования

глыбіня складае больш за трыццаць метраў! *(Глыбокі)* балоты ў Беларусі — віцебскія, максімальны паказчык якіх — дзевяць метраў.

Лічыцца, што *(старажытны)* балоты, якія захаваліся да нашага часу, — кітайскія. Яны ўтварыліся больш за пяцьдзясят тысяч гадоў таму. Гэта значыць, што яны ў пяць разоў *(стары)* за беларускія.

(Вялікі) верхавое балота ў *(Б/б)*еларус.. — *(Е/е)*льня, што размешчана ў *(М/м)*іёрск.. і *(Ш/ш)*аркаўшчынск.. раёнах *(В/в)*іцебскай вобласці. Яно значна *(вялікі)*, чым многія балот.. *(Е/е)*уропы, і па велічын.. займае пятае месца сярод *(Е/е)*урапейск.. балот. На тэрыторыі *(Е/е)*льні знаходзіцца каля ста дваццаці *(прыгожы)* азёр. Таму, напэўна, жураўлі адчуваюць сябе ў гэтым азёрна-балотн.. комплекс.. лепш, чым у іншых мясцінах. Яны тысячамі спыняюцца тут падчас восеньск.. міграцыі і становяцца сапраўдн.. зоркамі экалагічнага фестывал.. «Журавы і журавіны Міёрскага краю» *(Паводле С. Дзявяткавай)*.

Спішыце апошні абзац тэксту, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя канчаткі прыметнікаў і назоўнікаў. Абгрунтуйце напісанне арфаграм.

Растлумачце, як утварыліся пададзеныя ў тэксце формы ступеней параўнання прыметнікаў і прыслоўяў.

- Знайдзіце колькасна-іменныя словазлучэнні і запішыце іх, паставіўшы ў форму творнага склону.

Карыстаючыся інфармацыяй з розных крыніц, раскажыце пра экафэст «Журавы і журавіны Міёрскага краю». Выкарыстоўвайце розныя формы ступеней параўнання.

Звярніце ўвагу!

Не ўтвараюць форм ступеней параўнання якасныя прыметнікі, якія абазначаюць колькасна нязменную якасць *(голы, мёртвы, рагаты)*, масці жывёл *(буры, вараны́, пярэсты)*.

Таксама не ўтвараюць форм ступеней параўнання прыметнікі, якія з'яўляюцца вытворнымі назвамі колераў *(бронзавы, васількавы, малінавы)*, складанымі прыметнікамі *(цёмна-бардовы, жаўтароты)*.

Не ўтвараюцца простыя формы вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання ад якасных прыметнікаў з суфіксамі ***-ав-, -яв-, -ляв-, -лів-, -аўн-, -авіт-, -ніч-, -ічн-, -іст- (-ыст-), -уч- (-юч-), -н-, -к-, -л-, -еньк-, -утк- (-ютк-), -эзн-***: *перадавы, бялявы, вяртлявы, мітуслівы, сакаўны, працавіты, маляўнічы, гераічны, лясісты, калючы, наліўны, горкі, хрыплы, чорненькі, бялюткі, шырачэзны.*

Правообладатель Национальный институт образования

264. Утварыце ўсе магчымыя формы вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання прыметнікаў.

Чароўны смех, шчаслівы дзень, высокі ўзгорак, гарыстая мясцовасць, жывы сведка, малінавая блузка, вусаты дзядзька, шпаркі аўтамабіль, высачэзны клён, балючы мазоль, сівы конь, беленькі кужаль, гладкашэрсны сабака, рознакаляровая папера, глыбокае возера, крыклівы сусед, прыемны голас, пярэсты кот, светлавалосая дзяўчына.

Складзіце тры сказы з рознымі формамі ступеней параўнання прыметніка (на выбар).

Падрыхтуйце паведамленне «Беларусы ў Кнізе рэкордаў Гінеса».

Выканайце інтэрактыўнае заданне «Ступені параўнання прыметнікаў».

265. Прачытайце. Знайдзіце формы ступеней параўнання якасных прыметнікаў, утвораныя з адступленнем ад граматычнай нормы. Назавіце правільныя формы.

1. Зямля, ты стала для мяне радней і даражэй *(П. Панчанка)*. 2. І гор няма ў нас аніякіх, ды людзі ёсць — вышэй ад гор *(П. Броўка)*. 3. Найлепшая[м] з нашых дарог — дарога дадому *(П. Панчанка)*. 4. Мне доўгае расстанне з Вамі чарней ад Вашых чорных кос *(М. Багдановіч)*. 5. Самы прыгожы горад без добрых людзей — пустэльня[сн] *(С. Грахоўскі)*. 6. Мне неба тваё найясней, радзіма мая малая *(М. Кобец)*. 7. Ніякае багацце людзей не бывае даражэйшым за іх родную мову *(Я. Колас)*. 8. Людское сэрца адчуваць, каб зрухі самыя танчэйшыя сваёй душой расшыфраваць *(Ю. Свірка)*.

Запішыце два сказы з выпраўленымі формамі ступеней параўнання прыметнікаў. Пакажыце, як яны ўтварыліся.

Звярніце ўвагу!

Прыметнікі *малодшы, старшы* ў тэрміналагічных спалучэннях пры абазначэнні афіцыйных пасад і званняў не маюць значэння вышэйшай ступені параўнання *(малодшы лейтэнант, старшая медсястра)*. Прыметнік *малодшы* ўжываецца ў значэнні ‘больш позні паводле часу свайго з’яўлення’ *(малодшая сястра, малодшае пакаленне)*, у процілеглым значэнні — прыметнік *старэйшы (старэйшая сястра, старэйшы брат)*. У такім выпадку гэтыя прыметнікі не маюць значэння вышэйшай ступені параўнання.

Правообладатель Национальный институт образования

266. Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып.

Хто старэйшы?

— У цябе, хлопчык, ёсць брацік? — пытае цёця ў Славіка.
— Не толькі брацік, але і сястрычка! — з гонарам адказвае той.
— Ты, відаць, самы старэйшы?
— Самы старэйшы ў нас дзед! *(М. Сліва).*

Якая форма ступені параўнання прыметніка ўжываецца ў тэксце? Ці правільна яна ўтворана? Абгрунтуйце сваю думку.

Якую форму прыметніка трэба ўжыць, каб сказаць, што сястрычцы менш гадоў, чым Славіку?

- Перабудуйце першы сказ у сказ з ускоснай мовай.

Раскажыце пра сваю навучальную ўстанову, ужываючы прыметнікі ў формах ступеней параўнання. Ці магчымым будзе ўжыванне слова *старшы* ў вашым паведамленні?

267. Прачытайце верш. Вызначце, тэме ці асноўнай думцы адпавядае загаловак. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары.

Зіма і Лета

Сустрэлася з Летам Зіма:
— **Нідзе** ў цябе ладу няма!
Як толькі з'явілася ты,
усё мкнецца ў ц..нёк, пад кусты.
А ходзяць — нага за нагу!
Я нават глядзець **не магу**.
Вось я калі стану ізноў,
не ўседзіць[м] **ніхто** ля кустоў!
Трушком паб..гуць і дз..ды,
не горш, чым які м..лады.
Для моладзі будзе размах[сл]:
на лыжах б..жы, на каньках.
Згадзіся ты, Лета, са мной:
мілей жыць на свеце зімой[сл]!
См..ялася Лета ў а..каз:
— Не знаю, мілейшы хто з нас!
Ніяк зразумець не магу:
чаму ад цябе ўсе б..гуць.

У. Дубоўка.

Знайдзіце ў тэксце прыметнікі і прыслоўі ў формах ступеней параўнання. Растлумачце, як яны ўтварыліся. Чым адрозніваюцца формы ступеней параўнання прыметніка ад форм ступеней параўнання прыслоўя?

Якое слова ў вершы мае значэнне 'павольнай рыссю'?

- Растлумачце напісанне выдзеленых слоў.

Разгледзьце калаж. Раскажыце пра сваю любімую пару года. Ужывайце формы ступеней параўнання прыметнікаў і прыслоўяў.

Правообладатель Национальный институт образования

268. Разгледзьце схему. Якой інфармацыі ў ёй не хапае? У якіх канструкцыях ужываюцца формы вышэйшай ступені параўнання прыслоўяў?

Дапоўніце схему, праілюструйце тэарэтычны матэрыял уласнымі прыкладамі.

269. Прачытайце. Перакладзіце выслоўі на беларускую мову і запішыце.

1. Лучшие слова — это те, которые являются сами собой; они кажутся подсказанными самой правдой *(Квинтилиан)*. 2. Счастье легче найти, чем сохранить *(Публилий Сир)*. 3. Чем мудрее человек, тем проще тот язык, которым он выражает свои мысли *(Л. Маллори)*. 4. Чем честнее человек, тем менее он подозревает других в бесчестности *(Цицерон)*. 5. Часто лучше не замечать обиду, чем мстить за неё *(Публилий Сир)*. 6. Легче переносить терпеливо то, что нам не дано исправить *(Гораций)*.

Якія формы параўнання прыметнікаў і прыслоўяў вы выкарысталі пры перакладзе? Растлумачце, як яны ўтварыліся.

270. Уявіце сябе рэдактарам. Выправіце памылкі ва ўтварэнні і ўжыванні прыметнікаў і прыслоўяў.

1. Сакавітая, мілагучная беларуская мова больш гадзі́ны гучала з вуснаў вядучай. 2. Нацыянальная сістэма адукацыі — важнейшы стратэгічны рэсурс дзяржавы. 3. У апошні час разлік за здадзеную прадукцыю праводзіцца не пазней пятнаццаці дзён. 4. Стаіць задача развіваць інфраструктуру, каб узровень гандлёвага абслугоўвання,

Правообладатель Национальный институт образования

грамадскага харчавання, паслуг пошты быў не ніжэй сярэднеабласнога паказчыка. 5. У ліку самых асноўнейшых была тэма Адзінага дня інфармавання насельніцтва.

271. Разгледзьце схему. З яе дапамогай падрыхтуйце вуснае паведамленне на лінгвістычную тэму «Утварэнне прыналежных прыметнікаў».

Утварыце прыналежныя прыметнікі ад імён *Артур, Лявон, Алесь, Чэсь, Уладзя, Марылька*.

Ад чаго залежыць утварэнне прыналежных прыметнікаў ад імён *Жэня, Валя, Слава, Саша*?

Складзіце з прыкладамі прыметнікаў са схемы словазлучэнні. Два словазлучэнні (на выбар) праскланяйце. Абгрунтуйце напісанне канчаткаў прыметнікаў у розных склонавых формах.

Раскажыце пра асаблівасці ўтварэння прыналежных прыметнікаў, што абазначаюць абагульненую прыналежнасць: *чмяліны гул, чалавечы ўзлёт, салаўіныя трэлі*.

272. Ад назоўнікаў, што ў дужках, утварыце прыналежныя прыметнікі і запішыце іх у патрэбнай граматычнай форме.

1. Усё белае з маленства — свята: печ, беленая да Вялікадня, пагафтаваныя* фіраначкі на вокнах, *(бабуля)* ці *(матуля)* рукамі вытканыя ручнікі, крылы *(дзед)* ветрака *(В. Карамазаў)*. 2. *(Мама)* ручнік — белая дарога ў вечнасць[сн] *(Н. Загорская)*. 3. Мінаюць стагоддзі, як крыгі, сплываюць і лёсы ў нябыт. Ды толькі *(Скарына)* кнігі нам сёння загадваюць — быць! *(Н. Гальпяровіч)*. 4. Не ведаю, што робіцца са мной: ад дабраты я пла́чу *(чалавек)*, заўсёды пла́чу ад спагады[м] нечай — не ведаю, што й робіцца са мной *(Я. Сіпакоў)*. 5. Гаворыць маці. Колькі чысціні ў *(матка)* жывым і простым слове *(З. Марозаў)*. 6. Май — ён маё нараджэнне, — *(зязюлька)* песень зачын *(Ю. Свірка)*. 7. Гучаць мелодыі, і сэрца рвецца туды, дзе ружамі цвітуць даліны, дзе вінаграднік ля дарогі ўецца, а ў небе клёкат чуецца *(арол)* *(Н. Гілевіч)*.

Вызначце, у якой форме ўжыты прыналежныя прыметнікі ў запісаных сказах. Растлумачце напісанне канчаткаў.

Правообладатель Национальный институт образования

273. Запішыце прыказкі, замяняючы словы ў дужках прыналежнымі прыметнікамі са значэннем абагульненай прыналежнасці. Растлумачце сэнс прыказак.

1. Нораў *(бык)*, а розум[м] *(цяля)*. 2. Не выдавай сябе за ваўка, калі маеш хвост *(сабака)*[сн]. 3. Арол з *(муха)* крыламі. 4. Хвост *(ліса)*, а пашча *(воўк)*. 5. Рост *(чалавек)*, а розум *(авечка)*.

Вызначце, як утварыліся прыналежныя прыметнікі.

Праскланяйце адно словазлучэнне з прыналежным прыметнікам. Зрабіце вывад пра напісанне канчаткаў у словах.

274. Выканайце тэставую работу «Прыметнік».

§ 29–1

§ 29–2

§ 29–3

§ 29–4

§ 29. Ужыванне колькасных і парадкавых лічэбнікаў; спалучальнасць зборных лічэбнікаў з назоўнікамі і займеннікамі

275. Разгледзьце схему. Раскажыце пра разрады лічэбнікаў паводле значэння і граматычных прымет. Праілюструйце схему прыкладамі.



На якія разрады падзяляюцца лічэбнікі паводле будовы? Выканайце інтэрактыўнае заданне «Разрады лічэбнікаў».

Лічэбнікі паводле значэння падзяляюцца на колькасныя (тыя, што абазначаюць цэлыя лікі, зборныя, дробавыя) і парадкавыя.

Лічэбнікі, што абазначаюць цэлыя лікі, у назоўным склоне дапасуюцца да назоўнікаў ці кіруюць імі.

Лічэбнік *адзін* дапасуецца да назоўніка ў родзе, ліку і склоне так, як прыметнік: *адзін урок, аднаго ўрока, аднаму ўроку*.

Лічэбнікі *два (дзве), тры, чатыры* і састаўныя лічэбнікі на *два, тры, чатыры* ў назоўным склоне разам з прыметнікам дапасуюцца да назоўніка ў форме множнага ліку назоўнага склону:

Правообладатель Национальный институт образования

дзве зялёныя ялінкі, тры летнія месяцы, дваццаць тры светлыя дні, трыццаць чатыры розныя сшыткі.

Лічэбнікі ад *пяці* і вышэй у назоўным склоне кіруюць родным склонам назоўніка ў множным ліку: *пяць дарог, адзінаццаць вучняў*.

276. Прачытайце. Назавіце лічэбнікі. Да якога разраду яны адносяцца?

1. Шляхі не купляюць за пяць капеек — бяруць іх жыццём сваім *(В. Зуёнак)*. 2. У замку каля шасцідзесяці пакояў, не лічачы калідораў і розных пераходаў з закуткамі *(У. Караткевіч)*. 3. Нам разам трыццаць. Мы стаім на кладцы. Яна свавольна туфелькі зняла, падаўшы мне далонь, каб не сарвацца, сцюдзёнай[ф] хваляй ногі абдала *(Н. Гілевіч)*. 4. Чатырнаццаць гадоў адзвінела, чатырнаццаць садоў адцвіло *(П. Панчанка)*. 5. Гораду майму — дзевяцьсот. Не дужа шмат, але не так ужо і мала *(У. Караткевіч)*. 6. Лягчэй сто гоняў да кахання[сл], чым крок, што з любай дзеліць нас *(П. Броўка)*.

Выпішыце колькасна-іменныя словазлучэнні і праскланяйце іх.

Раскажыце пра скланенне колькасных лічэбнікаў, што абазначаюць цэлыя лікі. У чым адметнасць іх сувязі з назоўнікамі?

277. Прачытайце табліцу. Раскажыце пра асаблівасці змянення простых і складаных колькасных лічэбнікаў, што абазначаюць цэлыя лікі.

Змяненне лічэбнікаў, што абазначаюць цэлыя лікі	
Лічэбнікі	**Асаблівасці змянення лічэбнікаў**
адзін (адна, адно), адны	Скланяюцца як прыметнікі ў адзіночным і множным ліку. Формы *адзін* і *адно* адрозніваюцца паводле роду толькі ў назоўным склоне; ва ўскосных склонах, у тым ліку ў вінавальным, калі ён не супадае з назоўным, родавыя адрозненні лічэбнікаў *адзін* і *адно* сціраюцца: *аднаго абітурыента* і *аднаго дзіцяці, аднаго камп'ютара* і *аднаго вясла*
два (дзве), тры, чатыры	Існуюць два рады склонавых форм: для лічэбніка *два* (мужчынскі і ніякі род) і для лічэбніка *дзве*: *двух сталоў* і *акон, дзвюх спадніц; двум сталам* і *вокнам, дзвюм спадніцам; на двух сталах* і *вокнах, на дзвюх спадніцах*. Канчаткі лічэбнікаў *тры, чатыры* падобны да канчаткаў прыметнікаў: *трох знаёмых, чатырох гасцей; тром знаёмым, чатыром гасцям; пры трох знаёмых, пры чатырох гасцях*.

Правообладатель Национальный институт образования

Лічэбнікі	Асаблівасці змянення лічэбнікаў
	Форма вінавальнага склону лічэбнікаў *два (дзве), тры, чатыры* залежыць ад таго, спалучаюцца яны з адушаўлёнымі ці неадушаўлёнымі назоўнікамі: (бачу) *дзве сурвэткі*, але *дзвюх дзяўчат*; (знайшоў) *тры жалуды*, але *трох адказных*. У творным склоне лічэбнікі *два (дзве), тры, чатыры* маюць канчаткі *-ма* і *-ыма: дву-ма ласямі, дзвю-ма сурвэткамі, чатыр-ма медзведзянятамі, тр-ыма сустрэчнымі*
пяць — дзесяць, адзінаццаць — дваццаць, трыццаць	Скланяюцца як назоўнікі 3-га скланення з мяккай асновай тыпу *радасць*. Лічэбнікі ад *пяці* да *дзесяці*, а таксама лічэбнікі *дваццаць* і *трыццаць* ва ўскосных склонах маюць націск на канчатку: *пяці́ братам, дзевяці́ месяцам, на дваццаці́ старонках, у трыццаці́ скрынках*. У лічэбніках *адзінаццаць — дзевятнаццаць* націск падае на склад *-на-*: *чатырна́ццаці сшыткаў, у адзіна́ццаці падручніках*. У форме творнага склону ў лічэбніках ад *дзевяці* да *дваццаці*, *пяць* і *трыццаць* адбываецца падаўжэнне гука [ц'] у становішчы паміж галоснымі, што перадаецца на пісьме дзвюма літарамі *ц*: *дзевяццю ліпамі, пяццю таварышамі, трыццаццю гадамі*
пяцьдзясят — восемдзесят, дзвесце — дзевяцьсот	Кожная частка складанага лічэбніка скланяецца як просты лічэбнік. Пры скланенні лічэбнікаў ад *пяцідзесяці* да *васьмідзесяці* ва ўскосных склонах кожная частка мае канчаткі, аднолькавыя з канчаткамі лічэбніка *пяць*; націск падае на канчатак першай часткі: *шасці́дзесяці, сямі́дзесяці, васьмю́дзесяццю*. Пры скланенні лічэбнікаў *дзвесце — дзевяцьсот* націск падае на канчатак ці аснову другой часткі: *дв-ум-ст-а́м, тр-ыма-ст-а́мі, шасц-і-со́т-□*. Другая частка лічэбнікаў, якая суадносіцца з лічэбнікам *сто*, ва ўскосных склонах мае чатыры формы: *сямісо́т, сямістам, сямюста́мі, (у) сяміста́х гарадах*. Частка *дзве-* лічэбніка *дзвесце* ў назоўным і вінавальным склонах мае форму жаночага роду, а ва ўскосных склонах змяняецца як лічэбнік *два*: *двумстам, двухсот, у двухстах*

Правообладатель Национальный институт образования

Лічэбнікі	Асаблівасці змянення лічэбнікаў
сорак, сто	Лічэбнікі гэтай групы маюць дзве формы: у назоўным і вінавальным склоне *сто, сорак*, а ва ўскосных (акрамя вінавальнага) — *ста, сарака*: *ста аленяў, сарака вучням*
дзевяноста	Ва ўсіх склонах мае форму *дзевяноста*: *дзевяноста песень, дзевяноста песням, дзевяноста песнямі*
тысяча	Скланяецца як назоўнік 1-га скланення з асновай на зацвярдзелы зычны: *няма тысячы экзэмпляраў, у тысячы экзэмпляраў*; у творным склоне мае варыянтныя формы: *тысячай экзэмпляраў*
мільён, мільярд	Скланяюцца як неадушаўлёныя назоўнікі 2-га скланення з цвёрдай асновай: *двух мільёнаў, чатырох мільярдаў*

278. Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып. Падбярыце загаловак.

Мін..чына — край з багатай гістарычнай і культурнай спа..чынай, р..знастайнасцю нацы..нальных традыцый, звычаяў, абрадаў, яркай палітрай фестываляў, свят, конкурсаў. Увогуле культурная спа..чына Мінскай вобласці матэры..лізавана ў 664 нерухомых аб'ектах: у 301 помніку архе..логіі, 201 — архіт..ктуры, 155 — гісторыі, 1 — г..радабудаўніцтва, 4 — мастацтва, а таксама ў 2 запаве..ных месцах. Ажыццяўляецца мэтанакіраваная праца па правядзенні рамонтна-р..стаўрацыйных работ на аб'ектах спа..чыны. Так, за кошт сродкаў м..сцовага бюджэту ў 2017 годзе на р..канструкцыю з р..стаўрацыяй касцёла Божага Цела ў Н..свіжы накіравана 500 тысяч рублёў, на капітальны р..монт будынка былога Дома дваранскага сходу ў Слуцку — каля 900 тысяч рублёў.

Статус гісторыка-культурнай каштоўнасці нададзены 12 аб'ектам нематэрыяльнай культурнай спадчыны.[сн] Паказчыкам прэстыжу і гонару для Мінскай вобласці з'яўляецца ўключэнне 2 аб'ектаў (каляднага абраду «Цары» вёскі Семежава Капыльскага раёна і ўрачыстасці ў гонар ушанавання абраза Маці Божай Будслаўскай «Будслаўскі фэст» аграгарадка Будслаў Мядзельскага раёна) у Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА[м] *(Паводле Т. Лазоўскай)*.

Спішыце першы абзац, устаўляючы літары і замяняючы лікі словамі. Растлумачце напісанне арфаграм і форм лічэбнікаў.

Ахарактарызуйце лічэбнікі паводле значэння і структуры.

- Якія канчаткі будуць мець назоўнікі *фестываль, Нясвіж, рубель, фэст, спіс* у форме роднага склону адзіночнага ліку?

Правообладатель Национальный институт образования

Дапоўніце табліцу патрэбнымі формамі лічэбнікаў. Раскажыце пра асаблівасці змянення састаўных лічэбнікаў, якія абазначаюць цэлыя лікі.

Н.	*два месцы*	*дванаццаць аб'ектаў*	*пяцьсот тысяч рублёў*
Р.	*двух месцаў*	…	*пяцісот тысяч рублёў*
Д.	…	*дванаццаці аб'ектам*	…
В.	*два месцы*	*дванаццаць аб'ектаў*	*пяцьсот тысяч рублёў*
Т.	…	…	…
М.	*на двух месцах*	*на дванаццаці аб'ектах*	…

279. Прачытайце. Запішыце колькасна-іменныя словазлучэнні словамі. Раскажыце пра асаблівасці змянення лічэбнікаў і іх сувязь з назоўнікамі.

Смачныя навіны

Што падаць да святочнага стала? Зразумела, што торт! Яго можна прыгатаваць самім.

Разатрыце 2 яйкі з 200 г (1 шклянкай) цукру, змяшайце з 250 г (1 шклянкай) кефіру, 1 шклянкай варэння і 350 г (2 шклянкамі) мукі. Дабаўце чайную лыжку соды, абсыпце форму маннымі крупамі і выпякайце корж.

Для крэму да 250 г смятаны дабаўце 80 г цукру і ўзбіце або 150 г масла змяшайце са 150 г згушчанага малака. Зразумела, прадукты гэтыя цяпер не вельмі танныя, але, пакаштаваўшы торт, вы не пашкадуеце пра 250 г кефіру і 350 г мукі! *(Паводле А. Служэўскай).*

Разгледзьце малюнак. Складзіце паводле яго рэцэпт кактэйлю. Запішыце рэцэпт, замяняючы лікі словамі.

- Выпішыце з тэксту дзеясловы загаднага ладу. Графічна пакажыце, як яны ўтварыліся. Якія марфемы ўдзельнічалі ў іх утварэнні?
- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў апошнім сказе тэксту.

Правообладатель Национальный институт образования

280. Разгледзьце схему. На аснове дадзеных у ёй прыкладаў падрыхтуйце паведамленне на тэму «Асаблівасці спалучэння зборных лічэбнікаў з назоўнікамі і займеннікамі».

281. Назавіце рады слоў, якія могуць спалучацца са зборнымі лічэбнікамі тыпу *двое, трое*.

а) Сяброўка, матуля, ваўчаня;
б) вучань, жураўляня, рабочы;
в) смартфон, сланяня, арнітолаг;
г) вучоны, яны, аптыміст;
д) дзяжурны, сані, дырэктар;
е) канюшына, сарока, нажніцы.

Раскажыце пра асаблівасці ўтварэння зборных лічэбнікаў.

З адным радам слоў складзіце словазлучэнні «зборны лічэбнік + назоўнік». Адно колькасна-іменнае словазлучэнне праскаляйце. Растлумачце напісанне лічэбнікаў.

Звярніце ўвагу!

Зборныя лічэбнікі *абодва, абедзве* змяняюцца па родах і склонах як лічэбнікі *два* і *дзве*, спалучаюцца з рознымі назоўнікамі і асабовымі займеннікамі. У назоўным склоне яны дапасуюцца да назоўнікаў і прыметнікаў у назоўным склоне множным ліку: *абодва новыя сшыткі, абедзве шчаслівыя сястры*.

Лічэбнік *абое* ўжываецца толькі тады, калі гаворка ідзе пра асоб рознага полу, і змяняецца як займеннік *свае*: *Р. скл. / В. скл. абаіх, Д. скл. абаім, Т. скл. абаімі, М. скл. (у) абаіх*.

Зборныя лічэбнікі *двое — дзясяцера* ў назоўным склоне кіруюць назоўнікамі ў родным склоне множнага ліку: *двое важатых, сямёра ваўчанят*. Ва ўскосных склонах зборныя лічэбнікі звязваюцца з назоўнікамі сувяззю дапасавання: *Д. скл. дваім важатым, семярым ваўчанятам, Т. скл. дваімі важатымі, семярымі ваўчанятамі*.

Правообладатель Национальный институт образования

282. Спішыце. Падкрэсліце зборныя лічэбнікі. Ахарактарызуйце іх паводле значэння, марфалагічных прымет і спалучальнасці з назоўнікамі.

1. Кожны ведаў, што прыдбаў *(двое)* сяброў. Верных. Сапраўдных. На ўсё жыццё *(У. Караткевіч)*. 2. Быў ён бацька *(чацвёра)* дзяцей *(К. Чорны)*. 3. Маці... апякала адзінага свайго сына за *(пяцёра)* бацькаў *(В. Быкаў)*. 4. Сэнс гэтага пытання быў ясны для іх *(абое)* *(Я. Колас)*. 5. Чарнаморац з вайны едзе, ён *(сямёра)* коней вядзе[сн] *(К. Крапіва)*. 6. Мірон ухапіўся *(абедзве)* рукамі за зайца, але зараз жа адну руку адхапіў *(Я. Маўр)*. 7. Я ім тады ўжо зайздросціў, *(трое)* маім пуцейцам: іхнюю памяць шанавалі людзі, імі ганарыліся дзеці *(В. Быкаў)*.

Праскланяйце колькасна-іменныя словазлучэнні са зборнымі лічэбнікамі.

● Запішыце ўласныя назоўнікі ў форме творнага склону адзіночнага ліку. Абгрунтуйце напісанне канчаткаў.

283. Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль.

Цели устойчивого развития

25 сентября 2015 года государства — члены ООН приняли Повестку дня в области устойчивого развития до 2030 года. Она содержит 17 Целей устойчивого развития, направленных на ликвидацию нищеты, сохранение ресурсов планеты и обеспечение благополучия для всех. Республика Беларусь принимала активное участие в разработке Повестки-2030 на всех её этапах и взяла на себя обязательства по достижению Целей устойчивого развития.

Цель 12. *Обеспечение перехода к рациональным моделям потребления и производства*

Каждый год около трети всего производимого продовольствия, что составляет 1,3 млрд тонн стоимостью около 1 трлн долларов США, в конечном счёте оказывается в мусорных контейнерах потребителей и магазинов или портится из-за плохо организованного сбора урожая и транспортировки. Домашние хозяйства потребляют 29 % мировой энергии и выбрасывают до 21 % общего объёма CO_2. Если к 2050 году население мира вырастет до 9,6 млрд человек, то для поддержания нынешнего образа жизни ему потребуется эквивалент почти трёх планет.

Правообладатель Национальный институт образования

Снизить объём производства отходов можно различными способами: например, не выбрасывать еду или уменьшить потребление пластика — одного из основных загрязнителей Мирового океана *(По материалам сайта www.mir.pravo.by)*.

Слоўнік

в конечном счёте — *у выніку*
загрязнитель — *забруджвальнік*
мировой — *сусветны*
мусорный — *смеццевы*
обеспечение — *забеспячэнне*
образ жизни — *лад жыцця*
обязательство — *абавязак*
повестка — *парадак*
поддержание — *падтрымка*
потребление — *спажыванне*
производство — *вытворчасць*
устойчивый — *устойлівы*

Карыстаючыся дадатковымі крыніцамі інфармацыі, назавіце 17 Мэт устойлівага развіцця. Што трэба зрабіць, каб дасягнуць 12-й Мэты?

Вусна перакладзіце тэкст. Запішыце па-беларуску лічэбнікі разам з назоўнікамі ў той форме, у якой яны ўжываюцца ў тэксце. Растлумачце асаблівасці правапісу лічэбнікаў і іх спалучэння з назоўнікамі.

Звярніце ўвагу!

У дробавых лічэбніках лічнік скланяецца як колькасны лічэбнік, а назоўнік — як парадкавы лічэбнік: *тры дзясятыя кіламетра, трох дзясятых кіламетра, тром дзясятым кіламетра.*

Пры скланенні лічэбнікаў, якія абазначаюць цэлы лік і яго частку, змяняюцца ўсе часткі. Дробавыя лічэбнікі, якія абазначаюць частку цэлага ці цэлы лік і яго частку, кіруюць родным склонам назоўніка: *тры восьмыя гектара, чатыры цэлыя сем сотых пяску.* Рэчыўныя назоўнікі, а таксама назвы адзінак вымярэння ва ўсіх склонах ужываюцца ў форме адзіночнага ліку роднага склону: *тры пятыя цукру, дзве цэлыя пяць дзясятых метра.*

Дробавыя лічэбнікі *паўтара* і *паўтары* захоўваюць родавыя адрозненні пры скланенні і ва ўсіх склонах маюць аднолькавую форму: *паўтара* — пры спалучэнні з назоўнікамі мужчынскага і ніякага роду, *паўтары* — з назоўнікамі жаночага роду.

У назоўным склоне лічэбнік кіруе родным склонам назоўніка адзіночнага ліку: *паўтара рублі, паўтары гадзіны.*

Ва ўскосных склонах, акрамя роднага і вінавальнага, пры лічэбніках *паўтара* і *паўтары* назоўнік ужываецца ў множным ліку: *паўтара рублямі, у паўтара рублях.*

Правообладатель Национальный институт образования

284. Прачытайце прыказкі з назвамі грашовых адзінак. Растлумачце іх сэнс.

1. Не хапае дзевяць грыўняў да рубля. 2. Няма ні палушкі за душой. 3. Грош маленькі, а вялікую справу робіць. 4. У вераб'я багатая сям'я: у кожнага верабейкі па тры капейкі. 5. За морам цялушка палушка, ды рубель перавозу. 6. Дарагая залатовачка: каля рубля ляжала. 7. Усякая капейка алтынным гваздом прыбіта.

Карыстаючыся даведкай, утварыце і запішыце сказы з колькасна-іменнымі словазлучэннямі паводле прапанаванага ўзору.

У з о р. *1 пуд роўны шаснаццаці цэлым трыццаці васьмі сотым кілаграма.*

Д л я д а в е д к і: *1 грыўня = 3 $^1/_3$ (алтын); 1 палушка = 0,0025 (рубель); 1 грош = $^1/_2$ (капейка); 1 рубель = 400 (палушка); 1 капейка = 0,1 (грыўня); 1 палушка = $^1/_4$ (капейка); 1 рубель = 200 (грош); 1 залатоўка = 1,5 (грыўня); 1 алтын = 0, 03 (рубель); 1 талер = 92,62 (капейка).*

285. Утварыце колькасна-іменныя спалучэнні і запішыце іх у патрэбнай склонавай форме.

а) 736 + паштоўка *(М. скл.)*;
б) 425 + вучоныя *(Т. скл.)*;
в) 100 + зубр *(Т. скл.)*;
г) 734 + старонка *(Р. скл.)*;
д) 6 $^1/_8$ + тэрыторыя *(М. скл.)*;
е) 4 $^2/_5$ + метр *(Т. скл.)*

Раскажыце пра асаблівасці спалучэння лічэбнікаў з назоўнікамі і ўтварэнне склонавых форм.

286. Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак.

Нацы..нальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы найстар..йшы прафесійны тэатр у Беларусі галоўная драматычная пл..цоўка краіны.

Ён быў створаны як Беларускі дз..ржаўны тэатр (БДТ) на базе Першага беларускага таварыства драмы і камед..і. Урачыстае а..крыццё тэатра а..былося 14 верасня 1920 года. Гэта дата лічыцца датай заснавання Купалаўскага тэатра. З 1926 года БДТ стаў называцца БДТ-1, таму што беларускія дз..ржаўныя тэатры таксама былі адкрыты ў іншых гарадах Беларусі: Віц..бску (БДТ-2) і Гом..лі (БДТ-3).

20—30-я гады XX стаго..дзя сталі важным этапам у станаўленні і развіцці тэатр... У 1940 годзе за значныя дасягнен..і ў галіне культуры

Правообладатель Национальный институт образования

тэатр быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Жыццё БДТ-1 не спынялася і ў г..ды В..лікай Айчыннай вайны. Тэатр працаваў у Томск.. . Тут у 1944 годзе р..жысёр Леў Літвінаў паставіў славутую «Паўлінку» Янкі Купалы якая стала візітнай карткай тэатр.. . Гэты сп..ктакль захоўваецца ў рэпертуар.. тэатр.. і сёння. У снежн.. 1944 года тэатру прысво..на імя Янкі Купалы а ў 1955 годзе зван..е «Акадэмічны».

У 1993 годзе за высокія дас..гненні ў галіне разві..я беларускай тэатральнай культуры пастановай Савета Міністраў Р..спублікі Беларусь тэатру імя Янкі Купалы быў прысво..ны статус «Нацы..нальны».

Купалаўскі тэатр на прац..гу многіх гадоў п..спяхова захоўвае найлепшыя дас..гненні айчыннага тэатральнага мастацтва а таксама спалучае традыцыйныя каштоўнасці з устаноўкай на н..спынны мастацкі пошук і творчы эксп..рымент. Рэпертуар тэатр.. прадстаўлены п..станоўкамі розных жанраў і форм паводле п'ес айчынных класікаў а таксама сучасных а..тараў дзеля чаго тэатр актыўна супрацоўнічае з найлепшымі драматургамі мастакамі і р..жысёрамі *(Паводле матэрыялаў сайта www. kupalauski.by)*.

Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. Лікі запішыце словамі. Растлумачце напісанне арфаграм.

Запішыце назоўнікі *Янка Купала, драматург, спектакль, «Паўлінка», пастаноўка* ў форме меснага склону адзіночнага ліку.

Падзяліце тэкст на часткі, выпішыце з іх ключавыя словы. Перакажыце тэкст па ключавых словах.

Які тэкст вы склалі б для сайта сваёй школы, класа?

Прагледзьце рэпертуар тэатра на сайце. Прапануйце сваім сябрам ці аднакласнікам пайсці на адзін са спектакляў. Спытайцеся пра час наведвання спектакля, пра месца продажу білетаў, адрас і тэлефон тэатра.

Парадкавыя лічэбнікі змяняюцца як прыметнікі ў залежнасці ад характару асновы, націску і роду.

Парадкавыя лічэбнікі (за выключэннем лічэбніка *другі*) ва ўсіх склонавых формах маюць націск на аснове: *адзіна́ццаты,*

Правообладатель Национальный институт образования

мільённы, трыста трыццаты. Парадкавыя лічэбнікі дапасуюцца да назоўнікаў у родзе, ліку і склоне: *трыста трыццаты абітурыент, трыста трыццатая старонка.* Пры скланенні састаўных парадкавых лічэбнікаў змяняецца толькі апошняе слова: *трыста трыццатай старонкі, трыста трыццатай старонкай.*

У лічэбніках, якія заканчваюцца на ***-тысячны, -мільённы, -мільярдны***, таксама змяняецца толькі апошняе слова: *дваццацітысячны, дваццацітысячнаму, дваццацітысячным.*

287. Прачытайце. Пад якой назвай можна аб'яднаць гэтыя тэксты?

1. Полацк самы старажытны горад Беларусі. *(У)*першыню ён у..гадваецца ў «Апов..сці мінулых гадоў» у 862 годзе. У Полацк.. знаходзіцца самая старажытная камен..ая пабудова Беларусі *(С/с)*афійскі сабор узведзены ў 1044—1066 гадах.

2. Самы малады горад Беларусі — Крупкі (Мінская вобласць). Ён атрымаў статус горада ў 1991 годзе.

3. Нацыянальны парк «Белавежская пушча» ўвайшоў у Спіс Сусветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА ў 1992 годзе і праз год атрымаў статус біясфернага запаведніка.

4. Самая старая беларуская школа, якая дзейнічае дагэтуль, знаходзіцца ў Ашмянскім раёне Гродзенскай вобласці. Сёння яна называецца ДУА «Барунскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад — сярэдняя школа». У 2017 годзе гэта ўстанова адукацыі адзначыла 400-гадовы юбілей *(Паводле І. Зімневай).*

Знайдзіце ў тэксце парадкавыя лічэбнікі.

Спішыце першы тэкст, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. Лічэбнікі запішыце словамі.

У апошнім сказе чацвёртага тэксту знайдзіце парадкавы лічэбнік. Запішыце яго словамі і праскланяйце разам з назоўнікам, да якога ён дапасуецца.

● Знайдзіце ў тэкстах прыметнікі ў форме найвышэйшай ступені параўнання. Пакажыце, як яны ўтварыліся. Параўнайце па часе ўзнікнення горад Полацк з іншымі беларускімі гарадамі.

Разгледзьце выяву паштовай маркі. Што на ёй адлюстравана? Да якой падзеі быў прымеркаваны яе выпуск?

Як выглядае сучасны герб Полацка? Апішыце яго. Якія лічэбнікі вы выкарыстаеце пры апісанні?

Правообладатель Национальный институт образования

288. Устаўце ў фразеалагізмы прапушчаныя лічэбнікі ў патрэбнай склонавай форме. Вызначце разрады лічэбнікаў.

1) да … не гавары	а) ‘амаль (стаў кім-небудзь па прафесіі, становішчы)’
2) без … мінут	б) ‘вельмі славуты ў пэўнай галіне чалавек’
3) зорка … велічыні	в) ‘бязмерна шчаслівы, вельмі задаволены’
4) на … небе	г) ‘хто-небудзь рашучы, гарачы’

Складзіце і запішыце сказы з двума фразеалагізмамі (на выбар).

289. Выканайце тэставую работу «Лічэбнік».

§ 30. Ужыванне асабовых займеннікаў, зваротнага займенніка *сябе*, ужыванне прыназоўніка пры адмоўным займенніку; акцэнталагічныя нормы пры скланенні займеннікаў *сам, сама, самы, ніхто, нішто*

§ 0–30

§ 1–30

290. Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку. Які загаловак вы да яго падабралі б?

Я тое а..даю, што сам люблю,
І а..даю без выгады *(н..)*якай,
І ў с..рцы а..гукаецца падзякай
Дабро, якое *(н..)*каму раблю.
А ўдзячнасць[м], мусіць, вартая таго,
Каб і яе ў жыц..і адзначыў хтосьці…
А..дам агонь, каб ён сагрэў кагос..ці,
І ..одбліскам любуюся яго.

Я. Міклашэўскі.

Што вы ведаеце пра беларускія дабрачынныя фонды?

Выпішыце з тэксту займеннікі ў пачатковай форме. Вызначце іх разрад па значэнні (карыстайцеся табліцай на с. 179). Займеннікаў якіх разрадаў няма ў вершы?

Падрыхтуйце лінгвістычнае паведамленне пра займеннік як часціну мовы.

Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце напісанне арфаграм.

- Складзіце схему апошняга сказа.

Правообладатель Национальный институт образования

Разрады займеннікаў	
Асабовыя	*я, мы, ты, вы, ён, яна, яно, яны*
Зваротны	*сябе*
Прыналежныя	*мой, твой, наш, ваш, свой, яго, яе, іх*
Указальныя	*гэты, той, такі, гэтакі, столькі, гэтулькі*
Азначальныя	*увесь, усякі, кожны, сам, самы, іншы*
Пытальныя	*хто? што? які? чый? каторы? колькі?*
Адносныя	*хто, што, які, чый, каторы, колькі*
Адмоўныя	*ніхто, нішто, ніякі, нічый, ніколькі*
Няпэўныя	*нехта, нешта, нейкі, нечы, хтосьці, штосьці, хто-небудзь, што-небудзь, які-небудзь, чый-небудзь, абы-хто, абы-што, абы-які, абы-чый, сёй-той, сякі-такі* і інш.

291. Разгледзьце схему. З якімі часцінамі мовы могуць суадносіцца займеннікі? Дапоўніце групы ўласнымі прыкладамі.

292. Прачытайце. Размяркуйце па асобных групах займеннікі, якія суадносяцца з назоўнікамі, прыметнікамі і лічэбнікамі.

1. Кожны чалавек носіць у сабе **ненапісаную** кнігу — кнігу цікавую, непаўторную *(М. Танк)*. 2. О маці мова! Тваё слова — паветра для душы жывой *(В. Жуковіч)*. 3. Якую ж песню выткаць мне, знайсці якія гамы?[сн] *(Я. Янішчыц)*. 4. Праз столькі год я кожным маем Дрывяты, Браслаў зноўку сню... *(М. Пазнякоў)*. 5. Хто не хвалюецца, тым можна ўсёй душой паспагадаць[сл] *(Я. Сіпакоў)*.

- Растлумачце напісанне выдзеленага слова.

Правообладатель Национальный институт образования

293. Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып. Падбярыце да тэксту загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай.

Напэўна, няма чалавека ў нашым літаратурным асяродку, які б не ведаў пра Анхелу Эспіносу Руіс. Гэта беларускамоўная іспанка з Андалусіі. У 2013 годзе яна пачала вучыць беларускую мову, і ўжо праз год яе вершы надрукаваў часопіс «Маладосць». Сёння Анхела мае паэтычны зборнік, прыхільнікаў і, зразумела, крытыкаў.[сн] І, дарэчы, пачала вучыць ірландскую мову. Пра Анхелу не хочацца казаць банальнае. Таму лепей пра сябе распавядзе яна сама. За кубкам зялёнай гарбаты са смачным печывам...

— Ёсць такі стэрэатып, што андалусы вельмі пацешныя, экспрэсіўныя. «О, ты з Андалусіі, ну давай, жартуй!» Я інтраверт. Бацькі актыўна займаліся маёй сацыялізацыяй, каб я не была замкнёнай у сабе, каб умела размаўляць з людзьмі. У нас у Іспаніі, калі ты, напрыклад, стаіш у чарзе па хлеб і не падтрымліваеш гутарку бабулек, якія тут жа, у чарзе, то ты як мінімум некультурны. Як гэта, бабулькі стараюцца, а ты ў навушніках і іх не слухаеш. З намі жыла бабуля, таму ў мяне была пастаянная практыка.

Напэўна, ёсць акрамя *(я)* такія хто сто..чы ў чарзе ў краме пра сябе прагаворваюць: «Адзін батончык хлеб.. калі ласка адзін батончык хлеб.. калі ласка». А потым не могуць гэта вымавіць. Вось я такая. І *(я)* а..праўлялі ў краму прымушалі казаць што трэба пыталіся: «Скажы *(я)* як ты папросіш?» Мая мама педагог і псіхолаг таму ведала што рабіць як займацца са *(я)*. Яна гаварыла *(я)*: «Слухай трэба быць ветлівай да ўсіх. *(Ты)* не трэба с..браваць з усімі але варта камунікаваць бо гэта спатрэбіцца ў жыцці». Камунікацыі можна навучыцца калі займацца сам..му. І калі а..ставіны прымушаюць *(ты)* вучыцца *(Паводле часопіса «Бярозка»)*.

Чаму можна павучыцца ў Анхелы?

Падбярыце антонім да назоўніка *інтраверт*, раскрыйце значэнне слова.

Вызначце, у якой форме і ў якім значэнні ўжываюцца ў тэксце займеннікі *сябе* і *сам*.

Спішыце апошні абзац тэксту, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы, дзе трэба, знакі прыпынку.

- Выпішыце з тэксту назоўнікі, якія маюць форму толькі адзіночнага ліку.

Уявіце, што вам трэба ўзяць інтэрв'ю ў Анхелы Эспіносы Руіс. Карыстаючыся рознымі крыніцамі інфармацыі, пазнаёмцеся з яе творчасцю. Падрыхтуйце пытанні, якія вы задалі б Анхеле.

Правообладатель Национальный институт образования

294. Прачытайце ўрывак са звароту Я. Коласа да моладзі. Вызначце, у якім стылі павінен быць напісаны тэкст.

Мой запавет вам: ідзіце ў нагу з жыццём, не адставайце, апераджайце яго. Развівайце і памнажайце вашы дары, аддайце іх народу...

Якія формы слоў і сінтаксічныя канструкцыі дапамаглі пісьменніку дакладна і выразна перадаць думку?

Падрыхтуйце віншавальнае прывітанне з нагоды адкрыцця ўрачыстага мерапрыемства, прысвечанага святкаванню Дня жанчын.

295. Прачытайце. Запішыце па-беларуску.

1. Приносим извинения за некоторую задержку с ответом на Ваше письмо... 2. Вынуждены сообщить Вам о том, что... 3. Считаем целесообразным отметить... 4. Обращаем Ваше внимание на... 5. Надеемся на плодотворное сотрудничество с Вами...

Раскажыце пра асаблівасці выкарыстання ў маўленні займеннікаў *ты* і *вы (Вы)*. У якім выпадку пры звароце да асобы займеннік можа не ўжывацца?

Уявіце сябе спецыялістам па дзелавой камунікацыі. Выкарыстоўваючы матэрыял практыкавання, напішыце афіцыйнае пісьмо ад імя арганізацыі, у якой вы працуеце.

Пры вымаўленні займеннікаў *ён, яна, яно, яны* і іх форм да пачатковых галосных гукаў далучаецца [й]: [йон], [йана́], [йано́], [йаны́], [йаму́], [йіх].

296. Прачытайце верш. Каму яго адрасуе аўтар?

Паклон т..бе, мой беларускі[сл] краю!
Ты — мой, я — твой: ад роду і навек.
Я зноў і зноў да с..рца прыкладаю
Твой ліст дубовы[м] — як чароўны лек.
За хле.., што ем, за песні, што сп..ваю,
За шчасце звацца ім..нем тваім —
Паклон т..бе, мой беларускі краю!
Ты — мой, я — твой: усюды і ва ўсім!

Н. Гілевіч.

Устанавіце адпаведнасць паміж асабовымі і прыналежнымі займеннікамі. Раскажыце пра іх ролю ў тэксце.

Запішыце верш, устаўляючы прапушчаныя літары. Падкрэсліце асабовыя і прыналежныя займеннікі, вызначце іх склон, лік, род (калі ёсць).

- Назавіце зваротак у першым сказе. Складзіце схему гэтага сказа.

Правообладатель Национальный институт образования

297. Разгледзьце схему. Раскажыце пра асаблівасці змянення займеннікаў *ты* і *сябе*.



Складзіце словазлучэнні з займеннікамі *ты, сябе* ва ўскосных склонах.

298. Устаўце ў фразеалагізмы займеннік *сябе* ў патрэбным склоне. Вызначце, у якіх формах ён ужываецца.

1) матаць … на вус
2) выдаць …
3) сам з …
4) сам па …

а) ‘адзін, на адзіноце’
б) ‘адвольна, незалежна ні ад кога’
в) ‘выкрыць, выявіць уласныя тайныя пачуцці, намеры’
г) ‘запамінаць што-небудзь з якой-небудзь мэтай’

● З двума фразеалагізмамі складзіце сказы. Вызначце, якім членам сказа з’яўляюцца ўстойлівыя выразы.

САМАГА — САМОГА, САМАМУ — САМОМУ

Азначальны займеннік ***са́мы (са́мая, са́мае, са́мыя)*** ужываецца для ўтварэння найвышэйшай ступені параўнання прыметнікаў: *самы цікавы фільм, самая прыгожая карціна, самыя прыемныя людзі*. Займеннік ***самы*** ўказвае таксама на крайнюю мяжу распаўсюджання дзеяння, з’явы або праяўлення якасці: *З самай раніцы ішоў снег* (В. Быкаў).

Пры скланенні займеннік ***самы*** мае націск на аснове ва ўсіх формах: *Р. скл. са́мага, са́май, са́мых*; *Д. скл. са́маму, са́май, са́мым*; *Т. скл. са́мым, са́май, са́мымі*; *М. скл. (у) са́мым, са́май, са́мых*.

Займеннік ***сам (сама́, само́, са́мі)*** паказвае на асобу або прадмет, які самастойна ўтварае дзеянне: *Мы самі ствараем свой лёс* (А. Звонак). Займеннік ***сам*** служыць таксама для ўзмацнення значэння назоўніка: *Сам камандзір батальёна сядзеў за сталом, займаў цэнтральнае месца* (Я. Колас). Пры скланенні займеннік ***сам*** мае націск на канчатках ва ўсіх ускосных склонах: *Р. скл. само́га, само́й, само́х*; *Д. скл. само́му, само́й, само́м*; *Т. скл. само́м, само́й (-о́ю), само́мі*; *М. скл. (у) само́м, само́й, само́х*.

Правообладатель Национальный институт образования

299. Прачытайце тэкст. Да якога стылю і жанру ён адносіцца? Як вы разумееце яго алегарычны змест?

Мох і Дуб

Спачатку пасяліўся ля камля,
Пасля на дрэва ўзабраўся,
Як да вяршыні **самае** дабраўся,
Сказаў:
— Цяпер я[м] —
Вышыня.
Магу я дарасці аж да нябёс:
Да **самае** далёкай зоркі.
Ды Дуб зазначыў горка:
— Шаноўны Мох,
Я для цябе зрабіў усё, што мог,
Але да зорак і нябёс
Пакуль што **сам** я не дарос.

Я. Крупенька.

Як вы разумееце выраз *Але да зорак і нябёс пакуль што сам я не дарос*? Якое слова мае значэнне ‘ніжняя патоўшчаная частка дрэва, якая прылягае да кораня’?

Вызначце, да якога разраду паводле значэння адносяцца выдзеленыя займеннікі. Раскажыце пра асаблівасці іх значэння.

Запішыце гэтыя займеннікі ў форме жаночага і ніякага роду разам з назоўнікамі ў форме адзіночнага ліку і праскланяйце іх. Абгрунтуйце напісанне канчаткаў.

Які займеннік выкарыстоўваецца для ўтварэння складанай формы найвышэйшай ступені параўнання прыметніка?

Складзіце два сказы з займеннікам *сама* ва ўскосных склонах.

Выканайце інтэрактыўнае заданне «Разрады займеннікаў».

300. Прачытайце табліцу. З якімі часцінамі мовы суадносяцца адмоўныя і няпэўныя займеннікі? Назавіце іх граматычныя прыметы. Карыстаючыся табліцай, падрыхтуйце паведамленне пра адмоўныя і няпэўныя займеннікі.

Разрад паводле значэння	Суадносіцца з часцінай мовы	Марфалагічныя прыметы		Словаўтваральныя асаблівасці
Адмоўныя *ніхто, нішто*	назоўнік	склон, роду і ліку не маюць	скланяюцца як займ. *хто, што (нічо́му, ні ад чо́га)*	вытворныя: *ні + хто / што*
нія́кі, нічы́й	прыметнік	склон, род, лік	скланяюцца як прыметнікі	вытворныя: *ні + які / чый*
нікалькі	лічэбнік	склон	скланяецца як прыметнік у множным ліку	вытворны: *ні + колькі*

Правообладатель Национальный институт образования

Разрад паводле значэння	Суадносіцца з часцінай мовы	Марфалагічныя прыметы		Словаўтваральныя асаблівасці
Няпэўныя *нехта, хтосьці, хто-небудзь, абы-хто, нешта, штосьці, што-небудзь, абы-што*	назоўнік	склон, роду і ліку не маюць	скланяюцца як *хто* або *што*	вытворныя: *не- / абы- + аснова пытальнага займенніка*; *аснова пытальнага займенніка + -сьці / -небудзь*
нейкі, нечы, некаторы, які-небудзь, чый-небудзь, якісьці, чыйсьці, абы-які, абы-чый	прыметнік	склон, род, лік	скланяюцца як пытальныя займеннікі	
некалькі	лічэбнік	склон	скланяецца як прыметнік у множным ліку	вытворны: *не- + колькі*

Праскланяйце займеннікі *ніхто, нішто, нехта, нешта*.

301. Прачытайце верш. Вызначце яго асноўную думку. Які загаловак можна падабраць да яго?

Жило-было Ничего,
Не умело ничего,
Не хотело ничего.
Взад-вперёд оно ходило
И ни с кем не говорило,
Никого не замечало,
Лучше всех себя считало.
А про это Ничего
И сказать-то нечего!

И. Михайлова.

Перакажыце тэкст па-беларуску. Раскажыце пра асаблівасці вымаўлення і ўжывання адмоўных займеннікаў у рускай і беларускай мовах.
Як перакладаецца на беларускую мову выраз *Лучше всех себя считало*?

Правообладатель Национальный институт образования

302. Складзіце і запішыце словазлучэнні з адмоўнымі займеннікамі.

а) Не заўважыць …;
б) не пераканацца …;
в) не спрачацца …;
г) не загадваць …;
д) не марыць …;
е) не зачытвацца …;
ж) не крыўдзіцца …;
з) не дараваць …;
і) не звяртаць увагі …;
к) не думаць … .

Якія правілы напісання адмоўных займеннікаў трэба ведаць пры ўтварэнні словазлучэнняў? У якіх сітуацыях можна выкарыстаць такія словазлучэнні?

Выберыце словазлучэнні, на аснове якіх можна скласці тэкст «Урокі сяброўства».

Адмоўныя займеннікі ўтвараюцца ад пытальных пры дапамозе прыстаўкі ***ні-***, якая з займеннікам пішацца разам: *ніхто, нічый, нікольк і.*

Калі ***ні*** аддзяляецца прыназоўнікам, то займеннік пішацца ў тры словы: *ні да чо́га, ні да ко́га, ні з кім, ні пры я́кіх, ні ў чы́іх.*

Рускім формам займеннікаў *не́кого, не́чего, не́ с кем, не́ в чем* у беларускай мове адпавядаюць канструкцыі са словам *няма*: *няма каго́, няма чаго́, няма з кі́м, няма з чы́м.*

303. Прачытайце тэкст, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы патрэбныя формы займеннікаў. Вызначце яго стыль. Абгрунтуйце сваё меркаванне.

Верны рыцар

Клара і Слава сябруюць. Сёння, 28 лютага, у Клары дзень нараджэння.

На яго святкаванне Клара *(ніхто)* з вучняў не запрашала. І *(ён)*, Славу, не запрашала. А ён ідзе, бо ведае, што на дзень нараджэння сябры павінны прыходзіць *(сам)*.

Прыйшоўшы са школы, Слава адразу сеў за чарцяжы. Трэба зрабіць два — *(сябе)* і Клары. Дзяўчыне няма калі займацца *(нейкі)* там чарцяжамі. У яе сёння трэніроўка. Слава як сапраўдны рыцар заўсёды дапамагаў дзяўчыне ва *(увесь)*.

Падарунак для Клары стаяў на стале. Гэта быў невялікі букецік жывых ландышаў. Каб падарыць ландышы сёння, Слава яшчэ ўвосень выкапаў *(яны)* на лецішчы разам з дзірванам. Хлопец даглядаў іх, і ландышы зацвілі, запахлі вясной. Яе, вясну, і падорыць Слава сваёй сяброўцы.

Правообладатель Национальный институт образования

У сем гадзін вечара хлопец стаяў каля дзвярэй Кларынай кватэры. Калі за дзвярыма сціхла музыка, ён пазваніў. Як заўсёды, дзверы адчыніла хатняя работніца. Слава зайшоў і сумеўся ад незнаёмых позіркаў.

— Ну што, зрабіў чарцёж? — спытала Клара.

— Зрабіў, — адказаў Слава і працягнуў ёй скрутак. — Гэта табе. З днём нараджэння.

Клара ўзяла скрутак, здзівілася яго лёгкасці, узважыла на руцэ і разгарнула.

— Кветкі, — усміхнулася яна. — Дзякуй. Глянь, колькі мне сёння *(усялякі)* кветак нанеслі.

— То ж хатнія, зімовыя. А *(гэты)* пахнуць *(сама)* вясной.

Клара пакруціла ў руцэ букецік і аддала яго *(нехта)* з гасцей. Той панюхаў букецік, а потым, не падымаючыся з канапы, уторкнуў яго ў вузенькую, як горла гусака, вазу, што стаяла на падаконніку.

— Ландышы. Яны вясной пяць капеек пучок, — сказаў госць.

Хатняя работніца пачала накрываць на стол, і ўсе ажывіліся: пачалі смяяцца, жартаваць.

На Славу ніхто[м] не звяртаў увагі, ён *(ніхто)* не быў цікавы. Хлопец спачатку чытаў старую газету, а потым выйшаў у калідор. Апрануў паліто, азірнуўся і сустрэўся вачыма з Кларай. Яна ўсміхнулася і памахала *(ён)* на развітанне рукой.

(Ніхто) не развітаўшыся, Слава выйшаў з кватэры. З двара ён зірнуў на акно, белае ад яркага святла, і на падаконніку заўважыў тую вазу, у *(які)* бялелі дробныя званочкі яго ландышаў.

Славу зрабілася шкада *(гэты)* кветак. Хай бы яны раслі на лецішчы і цвілі ў маі. Навошта было прыносіць *(яны)* людзям, якія не шануюць сяброўства і за вясну плацяць толькі пяць капеек *(Паводле В. Хомчанкі)*.

Чаму тэкст мае такую назву?

Ці з'яўляюцца Слава і Клара сапраўднымі сябрамі? Што для вас сяброўства?

● Запішыце назоўнікі *Слава, Клара, работніца, рыцар, гусак, хлопец* у форме давальнага і меснага склону адзіночнага ліку.

Разгледзьце малюнак ландышаў. Апішыце іх у навуковым стылі.

Выпішыце з тэксту ключавыя словы. Падзяліце тэкст на часткі і перакажыце яго.

Правообладатель Национальный институт образования

304. Прачытайце табліцу. Выпраўце памылкі ва ўжыванні займеннікаў. Абгрунтуйце свой выбар.

Памылкі пры ўжыванні займеннікаў		
Тып памылкі	**Памылка**	**Правільны варыянт**
Двухсэнсоўнае ўжыванне займенніка, які ўказвае на 3-ю асобу	*Я дастаў ручку з сумкі і даў* ***яе*** *сябру.*	
Двухсэнсоўнае ўжыванне займенніка ***сябе***	*Сястра папрасіла прынесці ноўтбук к* ***сабе.***	
Двухсэнсоўнае ўжыванне займенніка ***свой***	*Класны кіраўнік папрасіў Алесю даслаць* ***сваё*** *эсэ.*	
Замена назоўніка адзіночнага ліку са значэннем сукупнасці займеннікам ***яны***	***Клас*** *прасіў забраць* ***іх*** *раней за ўсіх.*	
Збыткоўнае ўжыванне прыналежнага займенніка	*Якуб Колас у* ***сваёй*** *паэме «Сымон-музыка» раскрыў вобраз таленавітага хлопца.*	
Няправільнае ўтварэнне формы займенніка	***Некага*** *запрасіць на турнір.*	

305. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя займеннікі. Растлумачце сэнс прыказак.

1. З *(свой)* языка спусціш — на чужым не зловіш. 2. Вышэй *(свой)* пят не падскочыш. 3. Адзін *(увесь)* не ўласціш[м]. 4. Вока *(ніхто)* не запарушыць. 5. Добры[м] запеў — *(увесь)* парадак. 6. Жарты *(нішто)* не варты, але часам праўдзяцца. 7. Кінь за *(сябе)*, знойдзеш перад *(сябе)*.

- Вызначце ўтваральныя асновы для слоў *запеў, запарушыць*.
- Растлумачце пастаноўку працяжнікаў у сказах.

306. Выканайце тэставую работу «Займеннік».

Правообладатель Национальный институт образования

§ 31–1

§ 31–2

§ 31. Ужыванне асабовых канчаткаў дзеясловаў, адрозненне канчаткаў дзеясловаў абвеснага і загаднага ладу; акцэнталагічныя нормы пры ўтварэнні спрагальных форм дзеясловаў

307. Прачытайце тэкст, устаўляючы прапушчаныя словы.

Дзеяслоў — … часціна мовы, якая абазначае … або … прадмета.

Вылучаюць тры лады дзеяслова: … , … і … .

Дзеясловы … ладу абазначаюць дзеянне ў цяперашнім, прошлым ці будучым часе.

Дзеясловы бываюць … і … трывання.

Спражэнне — гэта змяненне дзеясловаў па … і … у цяперашнім (… простым) часе … ладу.

Адрозніваюцца два тыпы спражэння дзеясловаў у залежнасці ад характару … … .

308. Прачытайце табліцу. Раскажыце, якія дзеясловы адносяцца да I спражэння, якія — да II спражэння.

Канчаткі дзеясловаў I і II спражэння			
I спражэнне		**II спражэнне**	
Адзіночны лік			
1-я асоба	*-у (-ю)*	1-я асоба	*-у (-ю)*
2-я асоба	*-еш (-эш, -аш)*	2-я асоба	*-іш (-ыш)*
3-я асоба	*-е (-э, -а)*	3-я асоба	*-іць (-ыць)*
Множны лік			
1-я асоба	*-ём (-ем, -ом, -ам)*	1-я асоба	*-ім (-ым)*
2-я асоба	*-еце (-яце, -аце)*	2-я асоба	*-іце (-ыце)*
3-я асоба	*-уць (-юць)*	3-я асоба	*-аць (-яць)*

Ад чаго залежыць правапіс канчаткаў розных дзеясловаў аднаго спражэння (напрыклад, дзеясловаў I спражэння 1-й асобы множнага ліку)?

Правообладатель Национальный институт образования

У формах 1-й асобы множнага ліку дзеясловаў I спражэння пад націскам ужываюцца канчаткі ***-ом, -ём***, не пад націскам — канчаткі ***-ам, -ем***: *бяро́м, вядзём, пі́шам, адка́зваем.*

У формах 2-й асобы множнага ліку дзеясловаў I спражэння пад націскам ужываюцца канчаткі ***-аце́, -яце́***, не пад націскам — канчаткі ***-аце, -еце***: *бераце́, ведзяце́, пі́шаце, адка́зваеце.*

309. Пісьмова праспрагайце дзеясловы. Вызначце іх тып спражэння.

Чытаць, падлічваць, вучыць, рабіць.

Якія цяжкасці ў вас узніклі пры напісанні канчаткаў?

310. Разгледзьце схему. Назавіце спосабы вызначэння спражэння дзеясловаў.



311. Спішыце прыказкі, раскрываючы дужкі і замяняючы формы дзеясловаў 2-й асобы адзіночнага ліку формамі 2-й асобы множнага ліку.

1. Ад зайздрасці *(не)*паразумнееш, *(не)*падужэеш, *(не)*пабагацееш. 2. Бачаннем жорава *(не)*зловіш. 3. Глыбей узарэш — болей збярэш. 4. Днём раней пасееш — тыднем раней збярэш. 5. Зямля —

Правообладатель Национальный институт образования

талерка: што пакладзеш, тое возьмеш. 6. Калі здолееш узяцца за справу — і снег загарыцца. 7. Калі хочаш хлеб мець, то трэба зямліцы глядзець.

Падбярыце сінонім да слова *жораў*.

Вызначце ў прыказках кантэкстуальныя антонімы.

Звярніце ўвагу!

Націск у дзеясловах 2-й асобы множнага ліку падае або на аснову, або на апошні склад канчатка: *паведамля́еце, знахо́дзіце, тчаце́, жывяце́*.

Каб правільна ўжыць канчатак дзеяслова ў форме 2-й асобы множнага ліку, трэба паставіць дзеяслоў у форму 2-й асобы адзіночнага ліку. У форме 2-й асобы множнага ліку націск захоўваецца адпаведна або на аснове, або на канчатку: *скле́іш — скле́іце, ве́рнеш — ве́рнеце, глядзі́ш — гледзіце́, ідзе́ш — ідзяце́*.

312. Пісьмова праспрагайце дзеясловы.

Бегчы, есці, даць.

Чаму гэтыя дзеясловы называюцца рознаспрагальнымі?

313. Прачытайце тэкст. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку тэксту? Запішыце, устаўляючы прапушчаныя літары, растлумачце іх напісанне.

Трэнды бульбяной моды

Як на ўсё ў свеце, на бульбу ёсць свая мода. Дакладней, на колер лупіны, крухмалістасць, разварыстасць. Напрыклад, жыхары каўка..кіх рэспублік, расіяне, малдаване, італьянцы адда..ць перавагу бульбе з чырвонай лупінай. Немцам больш падаба..цца бульба з жо..тай лупінай і такой жа мякаццю. Англічане выбіра..ць белую бульбу з белай мякаццю. А ў Амерыцы самым вялікім попытам карыста..цца ф..летавая бульба. Паводле звестак **РУП** «Навукова-практычны цэнтр **НАН** Беларусі па бульбаводстве і плодаагародніцтве» каля 90 % беларусаў сёння адда..ць перавагу бульбе з жо..тай і крэмавай мякаццю. Але нашы селекцыянеры люб..ць экспер..менты і пер..дычна здзіўля..ць[м] «кулінарных» моднікаў. Напрыклад, нядаўна навукоўцы вывелі бульбу з двухколернай мякаццю і з зорачкай на разрэзе *(Паводле З. Ганчар)*.

Раскрыйце значэнні слоў *трэнд, селекцыянер*.

- Назавіце складаныя словы, растлумачце іх напісанне.
- Як называюцца выдзеленыя словы? Вызначце іх род.

Правообладатель Национальный институт образования

314. Прачытайце тэкст. Падбярыце загаловак у адпаведнасці з тэмай тэксту. Запішыце, устаўляючы прапушчаныя літары ў канчатках дзеясловаў. Растлумачце напісанне канчаткаў дзеясловаў.

Лес немалады. У ім і бярозы, і сосны, і асіны, і дубы. Па ўскрайку лесу падыма..цца бярэзнік, алешнік, лазняк, асіннік.

Дроб люб..ць гэты лес. У ім спява..ць птушкі, стука.. па дрэве дзяцел, свар..цца вароны, стракоч..ць сарокі. Дроб прысядз.. на сухі пень ці на паваленае бурай дрэва, супакойва..цца, слуха.., забыва..цца на хвіліну пра ўсё тое, што ляж..ць на душы цяжкім каменем і хвалю.. з дня ў дзень. Ён нават чу.., як дзесьці недалёка булькоч.. на перакатах лясны ручай.[сн]

Дроб услухоўва..цца ў лёгкі пошум дрэў і згадва.. той час, калі і гэты лес, і ён сам былі маладзейшыя[м] *(Паводле І. Капыловіча)*.

Ці ёсць у вас любімыя мясціны? Чым яны адметныя?
Як вызначыць тып спражэння зваротных дзеясловаў?
Раскрыйце значэнне слова *пошум*.
Назавіце зборныя назоўнікі, ужытыя ў тэксце.
Падрыхтуйце паведамленне «Дарагія мясціны роднага краю».

315. Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай.

Не памятаю ўжо, дзе і калі меў я сустрэчу з хуткачытальнікамі. За нейкую хвіліну яны прачытвалі цэлыя старонкі тэксту, іх падахвочвалі воплескамі, а мяне гэта ўсё злавала. Навука чытаць таксама не простая навука.[сн] Чытаць, як і піса́ць (тварыць), трэба вучыцца ўсё жыццё. У дзіцячыя і юначыя гады я чытаў шмат і без разбору, але чытаў неяк дзіўна, прапускаючы дыялогі, апісанні прыроды, аўтарскія адступленні, шукаючы толькі дзеянні, той самай дынамікі, не разумеючы, што галоўным якраз было тое, прапушчанае. Сапраўднае чытанне патрабуе не толькі засяроджанасці, але і моцы ўяўлення. Беднае ўяўленне не дарадчык чытанню. Здараецца і так, што чытач бачыць зусім не тое, што бачыць пісьменнік. Але такое здараецца рэдка. Часцей за ўсё, калі ў аднаго не хапае дэталей, а ў другога — цярплівасці.

Чытанню часта шкодз..ць уласныя асац..тыўныя малюнкі: чыта.. нешта чужое, а ўяўленнем ці ўспамінам пераскоква.. на сваё ўласнае, асабістае. Тады твор атрымліва..цца латана-няпоўным, як парваны ручаямі развод..я снег.

Правообладатель Национальный институт образования

Найлепшае чытанне — гэта чытанне маруднае, з перапынкамі, роздумам над кожным абзацам. Не, не тое прыдзірлівае чытанне з ало..кам, уласцівае р..дактарам ды р..ц..нзентам, а тое, што бывае ў людзей, шчыра захопленых творам. Такое чытанне не стамля.. вочы, а толькі замаруджва.. ды забіра.. час, але і ўзвыша.. душу *(Паводле К. Камейшы)*.

Як трэба чытаць? На што неабходна звяртаць увагу пры чытанні?

Запішыце другі і трэці абзацы тэксту, устаўце прапушчаныя літары і растлумачце іх напісанне.

Назавіце дзеясловы, ужытыя ў форме прошлага часу. Запішыце іх у форме 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку цяперашняга часу. Растлумачце напісанне канчаткаў.

- Выпішыце з тэксту словы з прыстаўнымі (устаўнымі) зычнымі, растлумачце іх напісанне.

316. Прачытайце тэкст. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку тэксту?

Бессмяротны слізявік

Парыжскі заапарк прадставіў свету свой новы экспанат — загадкавую аднаклетачную істоту, якая падобна да грыбоў, паводзіць сябе так, як жывёла, здольная рэгенерыраваць*.

Навукоўцы яшчэ будуць адказваць на многія звязаныя з ім пытанні, аднак цяпер кожны ахвотны можа назіраць містычную жоўтую плёнку, якая ўжо атрымала імя ў гонар фільма 1958 года *The Blob* (кропля, клякса, згустак). Па сюжэце фільма іншапланетная слізь паглынае ўсё на сваім шляху.

Згаданы клас істот да гэтага часу не атрымлівалася ўпісаць у **якое-небудзь** канкрэтнае царства[л] жывёльнага свету. Іх называюць слізевікамі, і ў прыродзе налічваецца каля тысячы відаў такіх арганізмаў, кожны з іх здольны паставіць у тупік нават **дасведчанага** біёлага. Напрыклад, *Blob* з'яўляецца аднаклетачным, хоць яго памер дасягае некалькіх сантыметраў. Ён расце практычна **бясконца**, перамяшчаецца з хуткасцю да чатырох сантыметраў у гадзіну, шукае ежу і ператраўляе* яе. Пры гэтым «кропля» можа перадаваць свой вопыт іншым асобінам. У адным з эксперыментаў слізявік павінен быў знайсці выхад з лабірынта. Пасля паспяховага выканання *Blob* выбіраўся з пасткі хутчэй, а калі яго змясцілі побач з іншай асобінай, то тая таксама справілася з задачай хутка. Слізявік практычна **бессмяротны**: сваю цэласнасць ён аднаўляе за лічаныя хвіліны. Небяспеку

Правообладатель Национальный институт образования

для яго ўяўляюць толькі засуха і крытычныя тэмпературы, прычым нават у гэтым **выпадку** ён, хутчэй за ўсё, проста ўпадзе ў стан, блізкі да анабіёзу*. Знішчаюць слізевіка толькі магутнае ультрафіялетавае выпраменьванне і агонь. У прыродзе «кропля» камфортна жыве пры вільготнасці каля 85—100 % і тэмпературы паветра 19—25 °С, а харчуецца рознай арганікай (напрыклад, драўнінай). Упершыню гэты від трапіў у фокус увагі навукоўцаў у 1973 годзе, калі жыхарка Тэхаса знайшла на сваім двары **загадкавую** жоўтую субстанцыю *(Паводле І. Купарваса)*.

Як выглядае слізявік? Чаму ён атрымаў назву ў гонар фільма?

Выпішыце з тэксту ўсе дзеясловы, паставіўшы іх у пачатковую форму і ў форму 2-й асобы множнага ліку цяперашняга або будучага простага часу.

У з о р: *прадставіць — прадставіце.*

Растлумачце напісанне асабовых канчаткаў дзеясловаў.

- Сфармулюйце правілы, якім падпарадкоўваецца напісанне выдзеленых слоў.

317. Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму і асноўную думку.

Парады стаматолага

Усмешка і здаровыя зубы нас упрыгожва.., але мы хапа..ся за шчотку часта толькі за хвіліну да выхаду з дому. Мы хуценька праходз..ся шчоткай па зубах, палошч.. рот і бяж.. . Знаёмая сітуацыя?

Як правільна чысціць зубы, параіў урач-стаматолаг.

1. Зубы трэба **чысціць** 2-3 хвіліны пасля ежы. Так **выдаляюць** рэшткі сняданку, абеду ці вячэры.

2. Неабходна не менш за шэсць разоў старанна **праходзіць** зубной шчоткай ад аднаго ўчастка да другога і вертыкальнымі рухамі ўсё **вымятаць**.

3. Трэба **выкарыстоўваць** зубную шчотку сярэдняй жорсткасці, **мяняць** яе раз у 2-3 месяцы, а **захоўваць** у адкрытым выглядзе ў шклянцы або ў спецыяльнай падстаўцы *(Паводле Г. Курак)*.

Калі і як трэба чысціць зубы? Як павінна захоўвацца зубная шчотка?

Спішыце першы абзац тэксту, устаўляючы канчаткі дзеясловаў, растлумачце іх правапіс.

Уявіце, што вы даяце падобныя парады сябрам. Запішыце свае парады, выкарыстоўваючы інфармацыю з тэксту і ўжываючы выдзеленыя дзеясловы ў форме 2-й асобы множнага ліку цяперашняга часу абвеснага ладу. Растлумачце напісанне канчаткаў дзеясловаў.

Правообладатель Национальный институт образования

318. Прачытайце тэкст. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку?

Рарытэты* з чыгункі

Музеі, як вядома, бываюць розныя. Некаторыя з іх вельмі арыгінальныя. У Баранавічах, напрыклад, ёсць музей… чыгункі. «Музей чыгункі ў г. Баранавічы УП “Баранавіцкае аддзяленне Беларускай чыгункі”» — такую афіцыйную назву ён мае. Найбольш цікавая частка экспазіцыі музея размешчана пад адкрытым небам. Тут **можна пабачыць** самыя розныя ўзоры чыгуначнай тэхнікі. Прычым не толькі **пастаяць** побач, але дзесьці нават **залезці** на падножку вагона, **зазірнуць** унутр.

Тут размяшчаецца калекцыя паравозаў як айчыннай, так і замежнай вытворчасці. Ёсць цеплавозы, пасажырскія і грузавыя вагоны розных пакаленняў.

Асабліва цікавы для многіх экскурсантаў дзейны макет Баранавіцкага чыгуначнага вузла, усталяваны ў адным з пасажырскіх вагонаў.

У іншых вагонах таксама ёсць экспазіцыйныя залы, дзе прадстаўлены некаторыя інструменты, прыборы і механізмы (напрыклад, ручныя рэйкарэзныя і рэйкасвідравальныя станкі), якімі ў мінулым карысталіся чыгуначнікі.

У экспазіцыі **можна пабачыць** і грузавую дрызіну, якую многія ведаюць калі не з асабістага досведу, то па старых кінафільмах. Ёсць там і дзейны семафор, і гідраўлічная калонка для запраўкі паравозаў вадой.

Гэтыя экспанаты, без сумнення, цікавыя як прафесіяналам-чыгуначнікам, гісторыкам, так і іншым. Дзе яшчэ **атрымаецца трапіць** у такі цэласны, напоўнены рознымі цікавасцямі тэхнічны свет? У 2002 годзе ў музеі стварылі экспазіцыю тэхнікі чыгуначных войскаў. Гэта пуцеўкладчык, выправачна-падбівачная машына, зенітна-кулямётныя ўстаноўкі, якія ставілі калісьці на спецыяльных чыгуначных платформах з браніраванымі адсекамі для размяшчэння кулямётных стужак, машыны для будавання мастоў на палях.

Наведваючы экспазіцыю пад адкрытым небам, усведамляеш прыгажосць і значнасць многіх ідэй, рэалізаваных пры стварэнні чыгунак. Тут **можна дакрануцца** да мінулага і **ўбачыць** гісторыю развіцця і ўдасканалення чыгуначнай тэхнікі ў розныя часы. Музей перыядычна папаўняецца новымі экспанатамі.

Непадалёк ад экспазіцыі пад адкрытым небам размяшчаецца і музейны будынак. Ён датуецца пачаткам XX стагоддзя і з’яўляецца

Правообладатель Национальный институт образования

гісторыка-культурнай каштоўнасцю. А сам музей быў створаны ў ім у 1984 годзе. У музейным дамку **можна сустрэць** шмат цікавых экспанатаў, звязаных з працай чыгуначнікаў *(Паводле Н. Шчарбачэвіч)*.

Пра які музей расказваецца ў тэксце? Чым ён адметны?

Перабудуйце сказы з выдзеленымі словамі, замяняючы гэтыя словы дзеясловамі ў форме 2-й асобы множнага ліку будучага простага часу (можна ўстаўляць займеннік ***вы***).

У з о р. *Там **можна пабачыць** самыя розныя ўзоры чыгуначнай тэхнікі. — Там вы пабачыце самыя розныя ўзоры чыгуначнай тэхнікі.*

Растлумачце напісанне канчаткаў дзеясловаў.

Назавіце запазычаныя словы. Чаму іх многа ў тэксце? Растлумачце іх напісанне.

Правядзіце завочную экскурсію па адным з музеяў вашага рэгіёна. Выкарыстайце дзеясловы ў форме 2-й асобы множнага ліку цяперашняга або будучага простага часу.

Пры ўтварэнні форм дзеяслова неабходна адрозніваць канчаткі абвеснага і загаднага ладу.

Формы дзеясловаў 1-й асобы множнага ліку загаднага ладу ўжываюцца з канчаткамі ***-ем (-эм, -ам), -ім (-ым)***. Адны з іх супадаюць з формамі будучага простага часу абвеснага ладу (***возьмем, напішам, успомнім*** і інш.), другія з'яўляюцца спецыфічнымі для загаднага ладу (***хадзем, бярэм, нясем*** і інш.).

319. Прачытайце тэкст. Вызначце яго тып. Сфармулюйце тэму і асноўную думку. Падбярыце загаловак.

У нядзелю да Сіваковых прыехалі старэйшы сын Толік і ўнук Максім бо перастаў працаваць дзядул.. камп'ют..р. Трэба выручаць старога таму што сёння ён без камп'ют..ра *(н..)*уяўляе жыцця. Калі раней бавіў час на двары дзе збіраліся мужчыны каб пра жыццё пагаманіць то цяпер дзеда зусім *(н..)*выгнаць з кватэры прыкіпеў ён да камп'ют..ра. А бабуля і раду..цца. Бабуля ёсць бабуля. Яна і цяпер круціцца каля сына і ўнука стара..цца тым нават *(н..)*шта па..казаць.

— Паспрабуй, Максім, вось гэты шнур пакратаць: можа, перацёрся, — раіць старая.

Максім моршчыцца:

— Ну, бабуля, не перашкаджай...

— Паглядзі, паглядзі! — не адступае старая. — Працэсар быццам жа новы. Не павінна быць, каб ён закапрызіў. А?

Правообладатель Национальный институт образования

Хлопцы моўчкі робяць сваю справу. Дзед, як заўсёды, маўчыць, бо ён сваю старую добра веда.., і спакойна-сканцэнтравана назіра.. за сынам і ўнукам: можа, калі і самому спатрэбіцца гэтая навука? І дзівяцца суседзі, што ён у такім паважаным узросце — гляньце на яго! — карыстаецца камп'ют..рам: нешта піша, нешта чытае там... Малайчына!

Не вытрымлівае бабуля, заглядвае туды, дзе працуюць майстры:

— Ну што, зрухі ёсць?

Сын Толік таксама моршчыцца, як Максім:

— Мам, гатуй абед.

Старая глядзіць на дзеда, з непрыхаваным папрокам у голасе заўважа..:

— Бачылі? Я ім ужо і не патрэбна!

І, пакрыўджаная, пакідае майстроў *(Паводле В. Ткачова)*.

На што пакрыўдзілася бабуля? Як пазбегнуць падобных сітуацый?

Як вы думаеце, што адбудзецца далей?

Назавіце дзеясловы, ужытыя ў тэксце ў форме загаднага ладу. Запішыце іх у форме 1-й асобы множнага ліку загаднага ладу.

Запішыце першы абзац тэксту, раскрываючы дужкі, устаўляючы патрэбныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку.

Падрыхтуйце паведамленне «Стаўцеся з павагай да людзей сталага ўзросту».

320. Прачытайце тэкст. Растлумачце правапіс канчаткаў дзеясловаў.

Кава з дзьмухаўцоў

Карані выкопва..ць і збіра..ць ранняй вясной ці ўвосень, калі перакопва..ць агарод. Іх добра мы..ць, злёгку аскраба..ць і суш..ць, пакуль яны не стан..ць крохкімі. Іх таўкуць у ступцы або змолва..ць у кавамолцы. Пасля парашок абавязкова праж..ць (апрацоўва..ць моцным жарам) на патэльні, увесь час перамешваючы лыжкай. Астуджа..ць і ссыпа..ць у слоік.

Для прыгатавання кавы 1 чайную лыжку парашку заліва..ць 200 г вады, даводз..ць да кіпення і 5 хвілін вар..ць на маленькім агні, даюць пастаяць 15—20 хвілін, працэджва..ць, дадаюць малако, цукар і кіпяцяць яшчэ раз.

Паспытайце, гэта смачна! *(Паводле Л. Мятлеўскай)*.

Запішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары. Пры запісе першага і другога абзацаў пастаўце ўсе дзеясловы, якія абазначаюць дзеянні чалавека, у форму 2-й асобы множнага ліку цяперашняга часу абвеснага ладу (І варыянт) і ў форму 2-й асобы множнага ліку загаднага ладу (ІІ варыянт). Растлумачце напісанне канчаткаў дзеясловаў абвеснага ладу.

Правообладатель Национальный институт образования

321. Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму і асноўную думку. Пісьмова перакладзіце на беларускую мову правілы паводзін пры галалёдзіцы.

Лёд — причина травм

Гололедица является причиной чрезвычайных ситуаций. При гололедице значительно увеличивается количество уличных травм: ушибов, вывихов и переломов. Чтобы не попасть в число пострадавших, к неблагоприятным условиям нужно подготовиться — повторить простые правила.

1. Обратите внимание на свою обувь: подберите нескользящую.

2. Смотрите себе под ноги, старайтесь обходить опасные места. Если ледяную «лужу» обойти невозможно, то перемещайтесь по ней небольшими шажками, как лыжник.

3. Обходите места с наклонной поверхностью.

4. При ходьбе наступайте на всю подошву, ноги слегка расслабьте в коленях.

5. Руки по возможности должны быть свободны. Не держите их в карманах.

6. Если вы поскользнулись, присядьте, чтобы снизить высоту падения.

7. В момент падения постарайтесь сгруппироваться и перекатиться, чтобы смягчить удар о землю.

8. Не пытайтесь при падении спасти вещи, которые несёте в руках.

9. Упав, не торопитесь подняться, осмотрите себя, попросите прохожих помочь.

10. В случае травмирования обязательно обращайтесь к врачу за медицинской помощью.

11. Будьте внимательны при переходе дороги: не торопитесь и тем более не бегите *(По А. Беганскому)*.

Слоўнік

наклонный — *схілісты, спусцісты*
нескользящий — *някоўзкі*
перемещаться — *перамяшчацца*
поскользнуться — *паслізнуцца, пакаўзнуцца*
прохожий — *прахожы*
пытаться — *спрабаваць*

Дзеясловы якога ладу пераважаюць у запісаным тэксце? Чаму? Растлумачце іх напісанне.

Дзеясловы, ужытыя ў форме загаднага ладу, пастаўце ў форму 2-й асобы множнага ліку цяперашняга або будучага простага часу абвеснага ладу. Запішыце. Пракаменціруйце іх напісанне.

322. Выканайце тэставую работу «Дзеяслоў».

Правообладатель Национальный институт образования

§ 0–32

§ 1–32

§ 32. Ужыванне дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў, дзеепрыметнікавых і дзеепрыслоўных зваротаў

323. Уважліва прачытайце матэрыял табліцы. Раскажыце пра ўтварэнне і ўжыванне дзеепрыметнікаў у сучаснай беларускай мове.

Утварэнне і ўжыванне дзеепрыметнікаў			
Час	**Спосаб утварэння**	**Прыклады**	**Ужыванне**
Незалежны стан			
цяперашні час	аснова дзеяслова цяперашняга часу + суфіксы ***-уч-, -юч-, -ач-, -яч-***	*кіруючая роля, гаворачая асоба, вісячы замок*	ужываюцца абмежавана; выкарыстоўваюцца ва ўстойлівых зваротах тыпу *рухаючая сіла, кіруючая роля* і інш.
прошлы час	аснова дзеяслова неазначальнай формы + суфікс ***-л-***, суфіксы ***-ш-, -ўш-***	*пераспелыя ягады,* *знікшы чалавек, парыжэўшыя стагі*	пашыраны ў беларускай мове; ужываюцца абмежавана; часта замяняюцца дзеепрыметнікамі з суфіксам ***-л-***: *парыжэлыя стагі*
Залежны стан			
цяперашні час	аснова дзеяслова цяперашняга часу + суфіксы ***-ем-, -ім-***	*чытаемы твор, вывучаемыя з'явы, прыводзімыя факты*	не характэрны для беларускай мовы
прошлы час	аснова дзеяслова неазначальнай формы + суфіксы ***-н-, -ен-, -ан-, -т-***	*пабудаваны дом, прывезеныя рэчы, вывучаны верш, вымыты посуд*	шырока выкарыстоўваюцца ў маўленні

Раскажыце на аснове табліцы аб правапісе суфіксаў ***-н-, -ан-, -ен-, -т-*** у дзеепрыметніках. Падбярыце і запішыце адпаведныя прыклады.

Звярніце ўвагу!

У суфіксах дзеепрыметнікаў залежнага стану прошлага часу пішацца адна літара **н**: *напісаны, зроблены, прынесены*.

Дзеепрыметнікі мужчынскага роду маюць толькі поўную форму з канчаткам ***-ы***: *дом* ***пабудаваны***, *раман* ***напісаны***.

У сістэме беларускіх дзеепрыметнікаў адсутнічаюць зваротныя формы.

Правообладатель Национальный институт образования

324. Выпішыце формы дзеепрыметнікаў, уласцівыя беларускай мове.

Адшліфаваны *(камень)* — адшліфованы *(камень)*; заросшы *(сад)* — зарослы *(сад)*; куплёны *(падарунак)* — куплены *(падарунак)*; *(сшытак)* падпісан — *(сшытак)* падпісаны; *(атрад)* расфармірован — *(атрад)* расфарміраваны.

325. Прачытайце тэкст, утвараючы ад дзеясловаў у дужках уласцівыя беларускай мове формы дзеепрыметнікаў.

Сфармулюйце праблему, якая абмяркоўваецца ў тэксце.

Вітушка супраць слімака

Існуе шэраг прыкладаў рознага напісання і перакладу англамоўнага камп'ютарнага слэнгу. Напрыклад, вядомы сімвал @ у рускай мове называюць «сабака», у міждзяржаўных стандартах ён *(замацаваць)* як «камерцыйнае "эт"». Па-беларуску ж прапаноўваецца назваць гэты сімвал слімаком або вітушкай, згодна са знешнім падабенствам. У такіх выпадках кожны робіць выбар у адпаведнасці з густам. Але вучоныя адзначаюць, што павінна быць *(выкарыстаць)* агульна *(прыняць)* форма, а для гэтага павінен быць *(сфарміраваць)* асобны тэматычны слоўнік. Сэрвісы ад *Google* тут не дапамогуць, таму што машына не ўлічвае і не перадае ўсю адметнасць і спецыфіку беларускай мовы, дапускаецца шмат недарэчнасцей і ка́лек* з рускай мовы *(Паводле С. Дубовіка)*.

Запішыце ўтвораныя дзеепрыметнікі, вызначце іх форму і граматычнае значэнне (лік, род ці склон), сінтаксічную ролю ў сказе.

Прывядзіце прыклады недарэчнасцей і ка́лек з рускай мовы, якія ўзнікаюць пры перакладзе на беларускую мову камп'ютарнай тэрміналогіі.

Які варыянт назвы сімвала па-беларуску маглі б прапанаваць вы?

Звярніце ўвагу!

Часцей за ўсё ва ўжыванні дзеепрыметнікавых зваротаў сустракаюцца наступныя памылкі:

1. Выкарыстоўваюцца не ўласцівыя беларускай мове формы дзеепрыметнікаў цяперашняга часу або зваротныя дзеепрыметнікі: *зацвітаючыя кветкі, разглядаемыя малюнкі; крадучыся воўк*.

Правообладатель Национальный институт образования

2. Назоўнік, які паясняецца дзеепрыметнікавым зваротам, аказваецца ўнутры яго: *Абсаджаная алея ліпамі вяла да ракі* (Правільна: *Алея, абсаджаная ліпамі, вяла да ракі*).

326. Прачытайце сказы. Знайдзіце недакладнасці ва ўжыванні дзеепрыметнікавых зваротаў. Выправіце памылкі і запішыце правільныя сказы.

1. Над зарослай лесасекай густым арэшнікам плыло павуцінне бабінага лета. 2. Круглая, зарослая паляна кустамі ўся была ўсыпана густым верасам. 3. Рассмяяўшаяся дзяўчынка не звяртала ніякай увагі на просьбы бацькоў супакоіцца. 4. Прымаемы на трэці квартал план мерапрыемстваў не вы́клікаў пярэчанняў у прысутных.

327. Прачытайце верш.

Беларусь мая, бярозка белая,
Ад марозу ўся заінелая,
Зімы лютыя ўспамінаючы,
Рада сонейку ты вяснянаму,
Косы доўгія расплятаючы,
Рада ветрыку закаханаму,
Рада выраю ты птушынаму,
Спеву дзіўнаму салаўінаму, —
Беларусь мая, бярозка майская,
Абагрэтая сонца ласкаю.

Н. Тарас.

Назавіце прыметнікі і дзеепрыметнікі з тэксту. Растлумачце ўтварэнне і ўжыванне дзеепрыметнікаў.

Выпішыце дзеепрыслоўі, зрабіце іх разбор па саставе.

328. Разгледзьце схемы пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах з дзеепрыметнікавымі і дзеепрыслоўнымі зваротамі. Якія правілы пастаноўкі знакаў прыпынку пры дзеепрыметнікавых і дзеепрыслоўных зваротах не перададзены на схемах? Падрыхтуйце вуснае паведамленне аб правілах выдзялення зваротаў на пісьме, дапоўніўшы яго неабходнай інфармацыяй.

Дзеепрыметнікавы зварот

наз., /~~~~~~~~~~/.

наз., /~~~~~~~~~~/, ...

/~~~~~~~~~~/ наз..

Дзеепрыслоўны зварот

/ —·—·—·—·— /, _____ .

..., / —·—·—·—·— /, ...

_____, / —·—·—·—·— / .

Правообладатель Национальный институт образования

329. Прааналізуйце сказы з дзеепрыметнікамі і дзеепрыслоўямі. Сфармулюйце на іх аснове правіла выдзялення або невыдзялення коскамі дзеепрыметнікаў і дзеепрыметнікавых зваротаў, дзеепрыслоўяў і дзеепрыслоўных зваротаў.

1. Працяты марозам, снег хрустка скрыпеў пад нагамі дзеда Талаша *(Я. Колас)*. 2. Абуджаныя косамі, праносіліся над паплавамі чародкі шпакоў *(А. Асіпенка)*. 3. Ахутаныя полагам туману, навакольныя прадметы здаюцца незнаёмымі, хісткімі *(І. Навуменка)*. 4. Над Жукаўкай грымела не сціхаючы. Там ліў дождж *(І. Пташнікаў)*. 5. Іван пастаяў яшчэ, аглядваючыся і згадваючы, што рабіць *(В. Быкаў)*. 6. Ён склаўшы рукі сядзець не будзе *(П. Кавалёў)*. 7. Лёгка паранены ў абедзве нагі, ён аказаўся бойкім на язык чалавекам *(В. Быкаў)*.

Звярніце ўвагу!

Асноўнае дзеянне, выражанае дзеясловам-выказнікам, і дадатковае, выражанае дзеепрыслоўем, абавязкова павінна выконваць адна і тая асоба (ці прадмет): *Стары ішоў, не зважаючы на тое, што рабілася вакол* (стары ішоў і не зважаў). Нельга сказаць: *Ідучы дадому, у мяне забалела галава* (у сказе два ўтваральнікі дзеяння: ***я** ішоў, **галава** забалела*). Правільна: *Калі я ішоў дадому, у мяне забалела галава* або *Ідучы дадому, я адчуў, што ў мяне забалела галава.*

Дадатковае дзеянне, выражанае дзеепрыслоўем, сэнсава і граматычна звязваецца з асноўным дзеяннем, выражаным дзеясловам-выказнікам: *Паліўшы кветкі, дзяўчынкі пайшлі дадому* (Няправільна: *Паліваючы кветкі, дзяўчынкі пайшлі дадому*).

330. Вызначце, у якіх сказах дапушчаны памылкі пры ўтварэнні або ўжыванні дзеепрыслоўяў. Выправіце памылкі, карыстаючыся адным са спосабаў: 1) перабудова асновы сказа такім чынам, каб быў адзін утваральнік дзеяння; 2) замена дзеепрыслоўнага звароту даданай часткай складаназалежнага сказа са злучнікам ***калі***. Спішыце, выправіўшы памылкі (там, дзе яны ёсць).

1. Лежачы на траве, я з асалодай удыхаў водар простых летніх кветак. 2. Пад'язджаючы да станцыі, у мяне знік партфель. 3. Знаходзячыся ў няволі, паэт напісаў цэлую кнігу вершаў. 4. Вярнуўшыся дадому, пайшоў снег. 5. Прыйшоўшы на сход, я па дарозе сустрэў свайго сябра. 6. Пісьменнік паказаў нам сапраўднае жыццё, не прыхарошваючы яго. 7. Яшчэ больш сур'ёзным стаў Сцёпка, скончыўшы пачатковую школу. 8. Даведаўшыся пра апошнія навіны, гаворка сяброў часта перарывалася дружным смехам.

Правообладатель Национальный институт образования

Звярніце ўвагу!

Заўсёды да месца дзеепрыслоўі ў безасабовых сказах з выказнікамі, выражанымі словамі *трэба, варта, неабходна, добра, лёгка, проста* з інфінітывам: *Думаючы пра будучыню, варта паклапаціцца пра рацыянальныя адносіны да прыроды і яе багацяў.*

Нельга ўжываць дзеепрыслоўі пры выказніках *відаць, чуваць* або безасабовых дзеясловах тыпу *вечарэе, днее, падмарожвае* і інш.

331. Вызначце, да якога з двух прапанаваных у кожным пункце сказаў можна далучыць дзеепрыслоўны зварот. Сказы з дзеепрыслоўнымі зваротамі запішыце. Аргументуйце, чаму нельга далучыць зварот да іншага сказа.

1. Набіраючы хуткасць, …	а) цягнік набліжаўся да горнага тунэля. б) у акне быў відаць горны перавал.
2. Збіраючыся ў падарожжа, …	а) сустрэчу прызначылі на самым світанні ў хаце Мірона. б) хлопцы дэталёва прадумалі маршрут.
3. Зайшоўшы ў хату, …	а) стомленасць авалодала Сяргейкам. б) Сяргей хуценька скінуў з плячэй ранец і пайшоў да стала.
4. Сабраўшыся невялікімі групкамі, …	а) на вуліцы пахла нечым няўлоўна прыемным. б) на рагу вуліцы стаялі прыгожа апранутыя хлопцы і дзяўчаты.
5. Пад'язджаючы да станцыі, …	а) пасажыры затурбаваліся і сталі збіраць свае рэчы. б) хвілін на пятнаццаць нас затрымаў чыгуначны пераезд.

332. Прачытайце тэкст, ужываючы назоўнікі ў дужках у патрэбнай склонавай форме.

Знайдзіце ў тэксце дзеепрыметнікі і дзеепрыслоўі, дзеепрыметнікавыя і дзеепрыслоўныя звароты. У якіх выпадках аўтар выкарыстоўвае дзеепрыметнікі, а ў якіх — дзеепрыслоўі? Чым гэта абумоўлена?

Скончыўшы сваё снеданне сабраўся дзед крыху адпачыць. Але глухі шорах у *(лес)* прымусіў яго прыслухацца і разгледзецца[с]. І бачыць дзед Талаш: вялізны дзікі кабан павольна выходзіць з ляснога *(гушчар)* і брыдзе па чэрава* ў *(снег)* не зважаючы на дзеда. Кабан

Правообладатель Национальный институт образования

падыходзіць да прыгожага *(стажок-мурашнік)* акуратна і роўна прысыпанага снегам і запыняецца. А потым пачынае разрываць яго сваім страшным ікластым лычом. Кожны рух магутнага лыча высока ўскідае ўгору камякі *(снег)* разам са смеццем нанесеным мурашкамі за цэлыя гады ўпартай працы. І хутка дзве цёмныя баразны вырысоўваюцца на чыстым некранутым *(снег)* *(Я. Колас)*.

Запішыце сказы з дзеепрыметнікамі і дзеепрыслоўямі, раскрываючы дужкі і расстаўляючы знакі прыпынку. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

Зрабіце марфалагічны разбор дзеяслова, дзеепрыметніка і дзеепрыслоўя з тэксту.

Разгледзьце малюнак. Ці з'яўляецца ён ілюстрацыяй да ўсяго тэксту? Ці можна праілюстраваць адным малюнкам тэкст-апавяданне, тэкст-апісанне? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

Звярніце ўвагу!

Ад дзеясловаў незакончанага трывання ўтвараюцца дзеепрыслоўі незакончанага трывання, а ад дзеясловаў закончанага трывання — дзеепрыслоўі закончанага трывання: *чытаць — чытаючы, убачыць — убачыўшы*.

333. Утварыце ад дзеясловаў дзеепрыслоўі адпаведнага трывання, запішыце іх, растлумачце правапіс суфіксаў.

Махаць, думаць, разважаць, нахіліцца, запісаць, разгледзець, несці, разглядаць, паглыбіць, уставіць, прапускаць, утвараць, утварыць, перакладаць, выкарыстаць, пісаць, выцягнуцца, выцягнуць, адсмяяцца, смяяцца, з'явіцца, пачынаць, кідаць, раскідáць, выразіць, вяртацца, прыдумаць, ісці, паказаць, паказацца.

334. Выканайце тэставую работу «Дзеепрыметнік».

335. Выканайце тэставую работу «Дзеепрыслоўе».

§ 32–1

§ 32–2

§ 32–3

Правообладатель Национальный институт образования

§ 33–1

§ 33–2

§ 33. Ужыванне прыназоўнікаў у словазлучэннях, якія перадаюць асаблівасці кіравання ў беларускай мове

336. Прачытайце тэкст, устаўляючы прапушчаныя словы.

Прыназоўнік — … часціна мовы, якая ўдакладняе значэнні … склонаў і выражае адносіны паміж назоўнікам (…, …) і іншымі словамі ў сказе.

Паводле … прыназоўнікі падзяляюцца на невытворныя (іх паходжанне растлумачыць немагчыма: *аб, да, пры*) і … (паходзяць ад … часцін мовы: *збоку, згодна, наперадзе*).

Паводле будовы прыназоўнікі падзяляюцца на … *(без, да, сярод)*, … *(з-за, з-пад, па-над)* і … *(нягледзячы на, у сувязі з, у імя)*.

Кожны прыназоўнік ужываецца з якім-небудзь склонам, некаторыя прыназоўнікі могуць ужывацца з двума ці трыма склонамі. Напрыклад, прыназоўнік ***на*** ўжываецца з вінавальным і месным склонамі *(на бераг, на беразе)*, ***па*** — з давальным, вінавальным і месным *(фільм па Мележу, вада па пояс, хадзіць па лесе)*.

337. Прачытайце тэкст. Падбярыце загаловак у адпаведнасці з яго тэмай.

О, як любіла матуля пячы хлеб! Да хлеба ставілася як да жывой істоты: пя..чотна, з павагай.

Звечара яна прасейвала муку, рабіла закваску ў дзежцы, якую вельмі шанавала: *(абы)*куды *(н..)*ставіла, *(н..)*стукала па ёй. А раніцай матуля з першымі пеўнямі ўставала, запальвала ў печы і шчыравала каля дзежкі. У закваску яна ўлівала свянцонай вады і з малітвай замешвала цеста, *(н..)*кому *(н..)*дазваляла грукаць, голасна размаўляць. У печ без *(н..)*абходнасці *(н..)*зазірала, каб хлеб *(н..)*асеў.

Гатовы хлеб матуля вымала з бляшанак, ц..лавала і выстаўляла на засцеле..ай чыстым ручніком лаве ўздоўж сцяны. Верх боханаў змочвала вадой і накрывала ручніком.

Канешне, мы прачыналіся ад сма..нага паху. О, які гэта быў хлеб, хлеб нашага дзяцінства! *(Паводле Н. Літвінюк)*.

Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце напісанне слоў.

Правообладатель Национальный институт образования

Падкрэсліце прыназоўнікі. Вызначце іх разрад паводле паходжання, склоны, з якімі яны ўжываюцца. Назавіце прыназоўнікі, якія ў тэксце ўжываюцца з некалькімі склонамі. Знайдзіце варыянт аднаго і таго ж прыназоўніка. Ад чаго залежыць ужыванне варыянтаў прыназоўнікаў?

Звярніце ўвагу!

Некаторыя невытворныя прыназоўнікі ўжываюцца ў двух ці больш варыянтах: *у — ў — ва; з — са; аб — аба; над — нада; пад — пада; перад — перада*.

Ужыванне варыянтаў прыназоўнікаў у асноўным залежыць ад фанетычных асаблівасцей пачатку слова, якое ідзе непасрэдна за прыназоўнікам. Ужыванне варыянтаў *у — ў* залежыць ад папярэдняга слова, а ў пісьмовым маўленні — і ад знакаў прыпынку.

Перад словам са збегам зычных у пачатку слова ці слова з пачатковым *у* ўжываецца варыянт *ва*: *ва мне, ва ўсіх*. Пасля слова, якое заканчваецца на галосны і не аддзелена знакам прыпынку ад прыназоўніка, ужываецца варыянт *ў*: *запісала ў блакноце* (параўн.: *запіс у блакноце*).

Перад словам, якое пачынаецца збегам зычных, першы з якіх *з, с, ш, ж, м*, ужываецца варыянт *са*: *са мной, са школы*.

Перад займеннікам *мне (мной)* ужываюцца варыянты *аба, нада, пада, перада*: *аба мне, перада мной*.

338. Параўнайце склоны, з якімі ўжываюцца прыназоўнікі ў некаторых словазлучэннях у беларускай і рускай мовах. Зрабіце вывад пра ўжыванне прыназоўнікаў у словазлучэннях, якія перадаюць асаблівасці кіравання ў беларускай мове.

Беларуская мова	**Руская мова**
Дзеясловы руху (*ехаць, ісці, бегчы, плыць* і інш.), волевыяўлення (*выправіць, паслаць* і інш.) пры абазначэнні мэты дзеяння ўжываюцца з назоўнікам	
• у форме вінавальнага склону з прыназоўнікам ***па***: *пайсці па хлеб, паслаць па доктара*	• у форме творнага склону з прыназоўнікам ***за***: *пойти за хлебом, послать за доктором*
Назвы грыбоў, ягад і да т. п. пры дзеясловах руху (у значэнні ‘збіраць’) ужываюцца	
• у форме вінавальнага склону з прыназоўнікам ***у***: *пайсці ў грыбы, у чарніцы, у арэхі*	• у форме творнага склону з прыназоўнікам ***за***: *пойти за грибами, за черникой, за орехами*

Правообладатель Национальный институт образования

Беларуская мова	Руская мова
Слова, якое абазначае прадмет думкі, маўлення, ужываецца	
• у форме вінавальнага склону з прыназоўнікам ***пра***: *думаць пра маці, гаварыць пра іх.* З а ў в а г а. У афіцыйным стылі ўжываецца прыназоўнік ***аб*** з месным склонам: *дамова аб супрацоўніцтве*	• у форме меснага склону з прыназоўнікам ***о (об)***: *думать о матери, говорить о них*
Дзеясловы *жартаваць, смяяцца, насміхацца, кпіць, дзівіцца* (руск. *шутить, смеяться, насмехаться, подтрунивать*) ужываюцца з залежным словам	
• у форме роднага склону з прыназоўнікам ***з***: *смяяцца з сябе, кпіць з няўмекі*	• у форме творнага склону з прыназоўнікам ***над***: *смеяться над собой, подтрунивать над неумехой*
Дзеясловы *ажаніць, ажаніцца* (руск. *женить, жениться*) ужываюцца з залежным словам	
• у форме творнага склону з прыназоўнікам ***з***: *ажаніцца з Таццянай*	• у форме меснага склону з прыназоўнікам ***на***: *жениться на Татьяне*
Пры дзеясловах *ехаць, хадзіць, сустракацца* (руск. *ехать, ходить, встречаться*) і да т. п. і назоўніках, утвораных ад іх, залежнае слова ўжываецца	
• у форме меснага склону з прыназоўнікам ***па***: *ехаць па дарогах, сустрэчы па вечарах*	• у форме давальнага склону з прыназоўнікам ***по***: *ехать по дорогам, встречи по вечерам*
Пры дзеясловах і назоўніках, што абазначаюць жаль, смутак, тугу, залежнае слова ўжываецца	
• у форме меснага склону з прыназоўнікам ***па***: *сумаваць па сястры*	• у форме меснага склону з прыназоўнікам ***о (об)***: *тосковать о сестре*
Дзеясловы *хварэць, захварэць* і прыметнік *хворы* (руск. *болеть, заболеть, больной*) ужываюцца з залежным словам	
• у форме вінавальнага склону з прыназоўнікам ***на***: *хварэць на грып, хворы на ангіну*	• у форме творнага склону без прыназоўніка: *болеть гриппом, больной ангиной*
У словазлучэннях з галоўным словам — прыметнікам ці прыслоўем у форме вышэйшай ступені параўнання — залежнае слова ўжываецца	
• у форме вінавальнага склону з прыназоўнікам ***за***: *старэйшы за брата*	• у форме роднага склону без прыназоўніка: *старше брата*

Правообладатель Национальный институт образования

Беларуская мова	Руская мова
Пры абазначэнні адлегласці ўжываецца	
• прыназоўнік ***за***: *за два кіламетры*	• прыназоўнік ***в***: *в двух километрах*
Пры абазначэнні прычыны залежнае слова ўжываецца	
• у форме вінавальнага склону з прыназоўнікам ***праз***: *спазніліся праз мяне*	• у форме роднага склону з прыназоўнікам ***из-за***: *опоздали из-за меня*
Пры абазначэнні месца і часу залежнае слова ўжываецца	
• у форме вінавальнага склону з прыназоўнікам ***праз***: *ісці праз лес, прыехаць праз месяц*	• у форме вінавальнага склону з прыназоўнікам ***через***: *идти через лес, приехать через месяц*
Прыназоўнік ***праз*** ужываецца ў спалучэннях *праз сон, праз смех*	Прыназоўнік ***сквозь*** ужываецца ў спалучэннях: *сквозь сон, сквозь смех*

339. Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Падбярыце загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай тэксту.

Узімку, калі дні становяцца карацейшымі, а **сонца** паказваецца не так часта, без штучнага асвятлення ні дома, ні ў школе, ні на працы абысціся немагчыма. Аднак нават у такі час можна крыху **сэканоміць** на **электраэнергіі** і знізіць нагрузку на прыроду. Трэба ўсяго толькі выбраць правільныя лямпачкі.

Сёння існуюць чатыры віды лямпаў: **напальвання**, люмінесцэнтная, святлодыёдная і галагенная. Апошняя ў быце амаль не выкарыстоўваецца.

Цікава, што лямпачка напальвання з'явілася яшчэ ў XIX **стагоддзі**, але да гэтага часу не страчвае папулярнасці сярод спажыўцоў. Прычына даволі простая: такая лямпачка вельмі танная. І ў некаторым сэнсе яе можна назваць нават экалагічнай, таму што робяць яе са шкла і металу — кампанентаў, бяспечных для **навакольнага асяроддзя**. Яна не патрабуе ніякай спецыяльнай утылізацыі*. Тым не менш назваць такую лямпачку цалкам «зялёнай» нельга, бо яе эфектыўнасць пры магутнасці ў 100 Вт складае не больш за 10 %. Астатняя спажытая энергія расходуецца ў выглядзе цяпла і выпраменьвання ў **нябачным** для чалавека ІЧ-дыяпазоне. Сярэдні тэрмін службы сучаснай

Правообладатель Национальный институт образования

лямпачкі напальвання складае 1 тысячу гадзі́н. Для параўнання: у святлодыёднай ён у 35 разоў большы.

Дарэчы, над святлодыёднымі лямпамі навукоўцы пачалі працаваць яшчэ ў пачатку XX стагоддзя. Але ў масавую вытворчасць яны ўвайшлі толькі ў 2000-я гады. Цяпер такія лямпы лічацца найбольш энергаэфектыўнымі і **даўгавечнымі**, бо могуць выкарыстоўвацца да 50 тысяч гадзі́н. Яны нетаксічныя і не патрабуюць спецыяльнай утылізацыі. Нягледзячы на ўсе перавагі святлодыёдных лямпаў у параўнанні з іншымі відамі штучнага асвятлення, іх распаўсюджанне стрымлівае адзін немалаважны фактар — высокі кошт. Аднак спецыялісты сцвярджаюць[ф], што такія лямпачкі вельмі хутка акупляюцца.

І святлодыёдныя, і галагенныя, і лямпы напальвання не ўтрымліваюць у сабе ніякіх шкодных рэчываў, у адрозненне ад люмінесцэнтных, якія доўгі час лічыліся вельмі экалагічнымі.

Сапраўды, яны дазваляюць эканоміць электраэнергію, яны больш танныя за святлодыёдныя. Аднак у адной такой стандартнай лямпе змяшчаецца ад 3 да 5 мг ртуці, якая пры разбурэнні або пашкоджанні колбы можа выклікаць цяжкае **атручэнне**. Менавіта таму іх нельга выкідаць разам з агульным смеццем. Такія лямпы неабходна змяшчаць у спецыяльныя кантэйнеры, адкуль іх потым забіраюць на **абясшкоджванне.**

Такім чынам, трэба ведаць не толькі тэхнічныя характарыстыкі лямпачак, але і тое, як правільна іх утылізаваць *(З часопіса «Родная прырода»)*.

Якія віды лямпачак існуюць? Якія лямпачкі вы параіце выкарыстоўваць аднакласнікам (бацькам, знаёмым)? Пракаменціруйце свой выбар.

Выпішыце з тэксту прыназоўнікі разам са словамі, да якіх яны адносяцца. Вызначце разрад прыназоўнікаў паводле будовы.

Назавіце спецыфічныя для беларускай мовы прыназоўнікавыя словазлучэнні.

- Растлумачце напісанне выдзеленых слоў.

Карыстаючыся спецыяльнай літаратурай ці інтэрнэт-рэсурсамі, падрыхтуйце паведамленне пра галагенныя лямпачкі.

340. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову. Вызначце склон, з якім ужываюцца прыназоўнікі ў рускай і беларускай мовах.

Шёл по полям, увидеть сквозь мглу, поехать за дровами, послать за доктором, рассказать о фильме, шутить над ним, приехать через неделю, опоздать из-за дождя, говорить сквозь смех, болеть корью, тоска о Родине, жениться на соседке, пойти за сахаром.

Правообладатель Национальный институт образования

341. Прачытайце прыказкі. Назавіце словазлучэнні, якія перадаюць асаблівасці кіравання ў беларускай мове. Выпішыце іх, перакладзіце на рускую мову. Вызначце, з якім склонам ужываюцца прыназоўнікі ў словазлучэннях беларускай і рускай моў.

1. З бабулінага слова толькі неразумны ўнучак засмяецца. 2. Бацька з маткаю на рабоце не томяцца, калі з дзетак сваіх цешацца. 3. З другой смяецца, а самой і блін не ўдаецца. 4. Як пайшла па масла, то і ў печы пагасла. 5. Працавітаму лёгка перайсці праз гару, гультаю цяжка паварушыць пальцам.

Зрабіце марфалагічны разбор прыназоўнікаў з 4-га сказа.
Паразважайце над сэнсам адной з прыказак (на выбар). Свае думкі выкладзіце ў міні-сачыненні «Трапнасць народнай мудрасці».

342. Прачытайце словазлучэнні. Запішыце, выправіўшы памылкі.

Ажаніцца на Галіне, спазніліся з-за снегападу, смяяцца над ім, пайсці за хлебам, вандраваць па краінам, прыехаць цераз год, гаварыць скрозь сон, знаходзіўся ў пяці метрах.

343. Прачытайце тэкст. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку? Перакладзіце тэкст на беларускую мову і запішыце. У тэксце перакладу падкрэсліце прыназоўнікі. Вызначце іх разрад паводле паходжання. Назавіце характэрныя для беларускай мовы словазлучэнні з прыназоўнікамі.

Как видят кошки

Лучи света фокусируются на сетчатке благодаря хрусталику, играющему роль своеобразной линзы. Если сравнивать хрусталик человека и кошки, то у животного он менее эластичен. Кошки близоруки. Если у обычного человека острота зрения — 1,0, то у кошки — 0,1—0,2. Наши любимицы могут чётко видеть лишь на расстоянии не более 6 м, в то время как для нас привычны 30—50 м. Но и слишком близко расположенные предметы они не способны хорошо рассмотреть. Для оценки того, что находится ближе полуметра, природа наделила кошек замечательными органами. Эти животные «видят» глазами, носом и вибри́ссами — осязательными волосками *(По И. Костюченко)*.

Слоўнік

близорукий — *блізарукі*
вибрисса — *вібрыса*
осязательный — *датыкальны*
привычный — *звычны, прывычны*
хрусталик — *хрусталік*

Правообладатель Национальный институт образования

344. Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль, тэму і асноўную думку.

Вялікі каньён

Зусім не абавязкова ляцець праз паўсвету, каб убачыць Вялікі каньён. Ён ёсць у Мікашэвічах, што за дваццаць кіламетраў ад Лунінца. Гэта кар'ер найбуйнейшага ў Еўропе прадпрыемства па здабычы каменю — «Граніт». Глыбіня — каля ста сарака метраў, перыметр большы за тры кіламетры. Пейзаж касмічны — нагрувашчванне камянёў усіх памераў і адценняў: ад пяшчотна-ружовага да чорнага. Вострыя скалы і горныя вадаспады. А па дарогах перасоўваюцца гіганцкія самазвалы, якія з вышыні аглядная пляцоўкі нагадваюць дзіцячыя цацкі *(Паводле Г. Курак)*.

Выпішыце словазлучэнні, якія перадаюць асаблівасці кіравання ў беларускай мове. Падкрэсліце прыназоўнікі, вызначце склон, з якім яны ўжываюцца.

- Растлумачце напісанне слоў з вялікай літары.

Карыстаючыся спецыяльнай літаратурай ці інтэрнэт-рэсурсамі, падрыхтуйце паведамленне пра Вялікі каньён — адзін з самых глыбокіх каньёнаў у свеце.

345. Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку тэксту?

Звоняць званы Хатыні

Расходзіцца белая заслона бяроз — і перад наведвальнікам паўстае высокая чорная фігура «Няскоранага чалавека». Стары, прататыпам якога стаў Іосіф Камінскі, што выжыў цудам, у вобразе забітага сына выносіць насустрач[м] нам гора і трагедыю ўсёй краіны. Справа — сімвалічная страха гумна, у якім зажыва згарэлі жыхары вёскі. Злева — брацкая магіла загінуўшых з вянком памяці. Без папярэджванняў мы адразу ж трапляем на месца трагедыі. Па агульнапрынятым стандарце любы мастацкі твор кульмінацыяй не пачынаецца, а заканчваецца. У Хатыні гэты стандарт парушаны. І парушылі яго не столькі аўтары праекта — архітэктары Юрый Градаў, Валянцін Занковіч, Леанід Левін і скульптар Сяргей Селіханаў, колькі сама гісторыя. Хіба папярэдзіў хто жыхароў вёскі пра тое, што іх чакала 22 сакавіка 1943 года? Усё адбылося знянацку...

Словы тут не патрэбны. Замест экскурсавода пра трагедыю Хатыні расказваюць званы на абелісках-комінах, адкрытыя брамкі, вянцы зрубаў, пералічаныя імёны вяскоўцаў. Усяго 149 чалавек, з іх 75 дзяцей.

Правообладатель Национальный институт образования

Помнік-дакумент — так называюць мемарыяльны ансамбль «Хатынь». І гэты дакумент сведчыць пра трагедыю не толькі Хатыні. Ідучы па галоўнай алеі мемарыяла, наведвальнік трапляе на сімвалічныя «Могілкі вёсак». 185 беларускіх вёсак раздзялілі лёс Хатыні — згарэлі і не адрадзіліся пасля вайны. Хатынь — 186-я *(Паводле Л. Мінаковай)*.

Калі адбылася трагедыя ў Хатыні? Хто аўтары мемарыяльнага ансамбля «Хатынь»? Як яшчэ называюць гэты мемарыяльны комплекс? Чаму?

Выпішыце з тэксту прыназоўнікі разам са словамі, да якіх яны адносяцца. Вызначце склон, з якім яны ўжыты. Назавіце спецыфічныя беларускія прыназоўнікавыя словазлучэнні.

346. Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль, тэму і асноўную думку. Падбярыце загаловак.

У на..больш архаічных міфалагічных сюж..тах Жыж жыў пад зямлёй. Згодна з падан..ямі беларуса.., ён павольна блука.. па падземны.. абшара.., вывярга.. з сябе агонь і грэў зямлю. Але ў гневе не было н..кога больш страшнага за яго. Вырва..шыся на паверхню, Жыж спальва.. усё: л..сы, траву на лугах, збож..а ў полі, вёскі. Нярэ..ка яго ахвярамі станавіліся і люд..і.

У нашы дні памяць пра пакланенне агню захавалася ў падан..ях і ў мове. Ад асновы імя бога агню ўтварыўся цэлы лексічны куст слоў, значэнне якіх непасрэдна або **асацыятыўна** пераклікаецца з уласцівасцямі агню: «жыжа» **(дзіцячае)** — агонь, «жыгала» — **жукрывасмок** і шворан для **прапальвання** дзірак у **дрэве**, «жужаль» — шлак і паразіт-крывасмок, «жыгучка» — куслівая **восеньская** муха, крапіва, «жыгунец» — павойная расліна. Ад Жыжа паходзяць і словы «джала», «джаліць». Нават назвы рэчак і балот з халоднай да **пякучасці** вадой маюць **сувязь** са старадаўнім богам агню: Жыгянка, Жыгулянка, Жыжма. Як бачым, нічога ў гісторыі народа **бясследна** не знікае. Пры ўдумлівым **падыходзе** да культурнай **спадчыны** заўсёды выяўляецца сувязь сучаснага з мінулым *(Паводле С. Цярохіна)*.

Спішыце першы абзац тэксту, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары.

Падкрэсліце словазлучэнні, якія перадаюць асаблівасці кіравання ў беларускай мове. Вызначце, з якім склонам у іх ужыты прыназоўнікі.

- Растлумачце напісанне выдзеленых у другім абзацы слоў.

З кантэксту раскрыйце значэнне слова *шворан*.

347. Выканайце тэставую работу «Марфалагічныя нормы».

§ 33–3

§ 33–4

§ 33–5

§ 33–6

Правообладатель Национальный институт образования

КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Якія нормы называюцца марфалагічнымі?
2. Якія групы назоўнікаў маюць форму толькі адзіночнага, а якія — толькі множнага ліку? Прывядзіце прыклады.
3. Раскажыце пра несупадзенне роду і ліку назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.
4. Як вызначаецца род нязменных назоўнікаў і абрэвіятур? Прывядзіце прыклады.
5. Раскажыце пра асаблівасці змянення назоўнікаў агульнага роду. Праскланяйце словазлучэнні *сведка Паліна* і *сведка Ціма*. Абгрунтуйце напісанне канчаткаў.
6. Як утвараюцца формы ступеней параўнання прыметнікаў і прыслоўяў? Прывядзіце прыклады.
7. Раскажыце пра асаблівасці ўтварэння і змянення прыналежных прыметнікаў. Перакладзіце на беларускую мову словазлучэнні *Ванино пальто, отцов планшет, лебяжий пух, лисья шуба, Алинина салфетка, дедушкина энциклопедия*.
8. Як змяняюцца колькасныя лічэбнікі, што абазначаюць цэлыя лікі? У чым асаблівасць спалучэння такіх лічэбнікаў з назоўнікамі? Запішыце па-беларуску: *две весёлые соседки, три новеньких автомобиля, четыре древних дуба*.
9. З якімі назоўнікамі спалучаюцца і як змяняюцца зборныя лічэбнікі *двое — дзясяцера*? Праскланяйце спалучэнне *пяцёра прысутных*.
10. На прыкладзе колькасна-іменных словазлучэнняў *2 $^{4}/_{9}$ гектара* і $^{5}/_{8}$ *кіламетра* раскажыце пра асаблівасці спалучэння дробавых лічэбнікаў з назоўнікамі. Праскланяйце лічэбнікі разам з назоўнікамі. Абгрунтуйце выбар форм.
11. Дакажыце на прыкладах, што парадкавыя лічэбнікі змяняюцца як прыметнікі.
12. Назавіце лічэбнікі, якія з'яўляюцца нязменнымі ў беларускай мове.
13. Раскажыце пра асаблівасці змянення азначальных займеннікаў *сам* і *самы*, неазначальных і адмоўных займеннікаў.
14. Якія марфалагічныя нормы могуць быць парушаны пры ўтварэнні форм назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў і займеннікаў? Прывядзіце прыклады.
15. Як вызначаецца спражэнне дзеясловаў? Ад чаго залежыць напісанне асабовых канчаткаў дзеясловаў?

Правообладатель Национальный институт образования

16. Раскажыце пра асаблівасці напісання канчаткаў дзеясловаў абвеснага і загаднага ладу ў 1-й асобе множнага ліку.
17. Выканайце інтэрактыўнае заданне па тэме «Марфалагічны разбор дзеяслова».
18. Раскажыце пра нормы ўжывання дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў.
19. Раскажыце пра ўжыванне прыназоўнікаў у словазлучэннях, якія перадаюць асаблівасці кіравання ў беларускай мове.

Тэставая работа па марфалогіі

1. Адзначце назоўнікі мужчынскага роду:

1) даследчык;
2) педаль;
3) тарнада;
4) карункі;
5) Манрэаль.

2. Адзначце назоўнікі, якія могуць мець формы адзіночнага і множнага ліку:

1) нажніцы;
2) парада;
3) крылы;
4) дзёгаць;
5) правады.

3. Адзначце словазлучэнні з назоўнікамі, якія маюць канчатак ***-у***:

1) не разабраў рукапіс..;
2) абмяркоўваць пры дырэктар..;
3) не з'еў бутэрброд..;
4) кіраўнік камбінат..;
5) шкатулка з малахіт.. .

4. Укажыце словазлучэнні з памылкамі:

1) цяжкія каменні;
2) дарожны насып;
3) глыбокае Нарач;
4) прыгожы какаду;
5) белая гваздзіка.

5. Адзначце сказы, у якіх формы ступеней параўнання прыметніка ўтвораны і ўжыты няправільна:

1) З кожным крокам пясок пад нагамі здаваўся ўсё больш гарачым.
2) Неба сёння ясней, чым учора.
3) Мікола Гусоўскі — буйнейшы паэт-лацініст эпохі Адраджэння.
4) Задачу можна было рашыць прасцейшым спосабам.
5) Наталля Пятроўна маладзейшая свайго мужа.

6. Адзначце словазлучэнні з правільна ўжытымі займеннікамі:

1) паважаць сябе;
2) з самой раніцы;
3) нічому не здзіўляўся;
4) з'еў нішто салёнае;
5) дзякую цябе.

Правообладатель Национальный институт образования

7. Укажыце лічэбнікі, правільна запісаныя ў форме творнага склону:

1) пяцярымі;
2) сям'юдзесяццю;
3) двумастамі;
4) абедзвюмя;
5) шасцідзесяццю пяццю.

8. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 1-й асобы множнага ліку цяперашняга ці будучага простага часу маюць канчатак ***-ем***:

1) адштурхнуць;
2) сесці;
3) наступаць;
4) плысці;
5) вымавіць.

9. Адзначце дзеясловы з суфіксам ***-ыва-***:

1) даказ..ваць;
2) падыгр..ваць;
3) запіс..ваць;
4) праветр..ваць;
5) каманд..ваць.

10. Укажыце словазлучэнні з формамі дзеепрыметнікаў, якія не ўжываюцца ў сучаснай беларускай мове:

1) расколаты лёд;
2) стомленная гаспадыня;
3) збялелы твар;
4) расхваляваўшаяся вучаніца;
5) чырванеючыя шчокі.

11. Адзначце сказы з памылкамі ва ўтварэнні і ўжыванні дзеепрыслоўяў:

1) Разглядаўшы фатаграфіі, Алена марыла пра новыя падарожжы.
2) Рыхтуючыся да экзаменаў, нельга забываць пра паўнацэнны сон.
3) Выступая перад вялікай аўдыторыяй, дакладчык вельмі хваляваўся.
4) Слухаючы мелодыю вальса, успамінаецца выпускны баль.
5) Трэнер аб'явіў перапынак, дазволіўшы спартсменам адпачыць.

12. Адзначце словы, якія пішуцца разам:

1) гаварыць *(на)*распеў;
2) вывучыць *(на)*памяць;
3) памераць *(у)*абхват;
4) выказаць *(у)*голас;
5) ударыць *(з)*размаху.

13. Укажыце спалучэнні слоў з вытворнымі прыназоўнікамі:

1) напісаць праз злучок;
2) перамагчы дзякуючы партнёру;
3) сустрэцца пасля расстання;
4) адпачываць на працягу тыдня;
5) ляцець над аблокамі.

Правообладатель Национальный институт образования

14. Адзначце сказы, у якіх ужыты падпарадкавальныя злучнікі:

1) Конь спыніўся, бо пасярод сцежкі ляжаў вялізны камень.

2) Урач адзначыў, што хвораму неабходна ўжываць вітаміны.

3) Мы схаваліся пад дрэвамі, што стаялі паабапал дарогі.

4) Каб адказаць на тваё пытанне, мне трэба зазірнуць у энцыклапедыю.

5) Над полем не то пыл курэў, не то імгла ўзнялася.

15. Адзначце сказы са словамі, якія з ***не*** пішуцца асобна:

1) *(Н..)*трэба шкадаваць пра мінулае.

2) Гаспадыня *(н..)*дагледзела куранят.

3) Стол быў прыкрыты *(н..)*выбеленым абрусам.

4) Рухавік працаваў *(н..)*спыняючыся.

5) Гэта кніга *(не)*надрукавана.

16. Выпішыце адносны займеннік:

1) столькі;

2) свой;

3) чый;

4) чыйсьці;

5) нічый.

17. Вызначце словазлучэнне з парадкавым лічэбнікам і запішыце яго ў родным склоне адзіночнага ліку:

1) дзевяноста чатыры абітурыенты;

2) з семярымі аднакласнікамі;

3) тры чацвёртыя часткі;

4) сорак другая старонка;

5) пяцідзесяцігадовы юбілей.

18. Ад дзеяслова ў дужках утварыце дзеепрыметнік, запішыце яго ў пачатковай форме.

Міхась трымаўся за парэнчы *(пасінець)* ад холаду пальцамі.

19. Ад прыслоўя *добра* ўтварыце простую форму вышэйшай ступені параўнання.

20. Выпішыце з тэксту:

а) назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў адзіночным ліку (укажыце пачатковую форму);

б) якасныя прыметнікі (у пачатковай форме);

в) дзеепрыслоўе незакончанага трывання.

Зацірка — мучная страва. Елі яе гарачай, звычайна раніцаю, на сняданак. Бо, пастаяўшы і астыўшы, гэта рэдкая страва густэла і траціла свой смак. Варылі яе хутка. Гаспадыня брала муку, жытнюю ці пшанічную. Сыпала яе ў гаршчок з кіпенем, памешваючы лыжкаю, і варыла. Іншы раз муку спачатку замочвалі або густа, з камячкамі, замешвалі ў місцы, а потым ужо варылі ў кіпені *(М. Маляўка)*.

Правообладатель Национальный институт образования

Паўтарэнне і сістэматызацыя вывучанага

§ 34. Моўныя нормы і культура маўлення

348. Адкажыце на пытанні. Выканайце заданні.

1. Раскажыце пра ролю беларускай мовы ў жыцці чалавека і грамадства. Як часта вы гаворыце па-беларуску? Якую адзнаку вы паставілі б сабе за веданне беларускай мовы? Матывуйце сваё рашэнне.

2. Назавіце лінгвістычныя тэрміны з вывучаных раздзелаў. Дайце ім азначэнні.

3. Пералічыце асноўныя прыметы тэксту. Ахарактарызуйце іх.

4. Зрабіце словаўтваральны разбор і разбор па саставе слоў *грамадства, руплівы, шчыраваць, па-святочнаму*. Якая мэта гэтых разбораў? Чым яны адрозніваюцца?

5. Раскажыце (з абавязковым выкарыстаннем прыкладаў) пра адну з часцін мовы па наступным плане: а) агульнае значэнне; б) марфалагічныя прыметы; в) словаўтваральныя асаблівасці; г) сінтаксічная роля.

Правообладатель Национальный институт образования

349. Дапоўніце табліцу. Раскажыце падрабязна пра адну з норм літаратурнай мовы.

Нормы беларускай літаратурнай мовы				
№ п/п	Назва літаратурнай нормы	Сутнасць нормы	Прыклады	Даведнік, які дапамагае праверыць адпаведнасць норме
1.		Правільнае вымаўленне гукаў і іх спалучэнняў		
2.		Правільная пастаноўка націску ў словах		
3.		Правільная перадача вуснага маўлення на пісьме сродкамі беларускай графікі		
4.		Правільнае ўжыванне слоў у адпаведнасці з іх значэннем і стылістычнай афарбоўкай		
5.		Правільнае ўжыванне фразеалагізмаў з характэрнымі для іх семантычнымі і спалучальнымі асаблівасцямі		
6.		Правільнае ўтварэнне слоў паводле словаўтваральных мадэляў		
7.		Правільнае ўтварэнне і ўжыванне граматычных форм слова		

350. Па памяці (або з дапамогай зборнікаў беларускіх прыказак) запішыце прыклады на захаванне арфаэпічных норм пры вымаўленні часціцы ***не*** і прыназоўніка ***без***. Сфармулюйце адпаведныя правілы.

351. Прачытайце ў адпаведнасці з нормамі літаратурнай мовы. Разважайце, у чым заключаецца мудрасць, філасофія, жыццёвая праўда народнай думкі. Якія маральна-этычныя ідэалы заключаны ў выразах?

1. Бацькоў не цурайся, ад Радзімы не адракайся. 2. Па нітачцы і клубок знойдзеш. 3. Усё, што сабе не міла, другому не зыч. 4. За вочы і мышаня кату хвост адкусіць пагражае. 5. Хітрасцю свет пройдзеш, ды назад не вернешся. 6. Хто пытае — той не блудзіць. 7. Не рыба, што ў рацэ, а рыба, што ў руцэ. 8. Не прыгожая прыгожа, а каханая

Правообладатель Национальный институт образования

прыгожа. 9. Су́джанага і канём не аб'едзеш. 10. Кніга — маленькае акенца, ды праз яго ўвесь свет відаць.

Выпішыце прыклады, якія адпавядаюць правілам «Правапіс прыстаўак», «Правапіс канчаткаў дзеясловаў». Падбярыце з дапамогай падручнікаў, слоўнікаў па 10-15 слоў для слоўнікавага дыктанта на гэтыя правілы.

352. Адзначце словы з правільным націскам.

I. а) Абе́руч;
б) ву́дзіць;
в) бліскавіца;
г) выпа́дак;
д) іна́чай.

II. 1) Пацве́рдзіць;
2) шкада́;
3) шко́да;
4) Украіна;
5) хаба́р.

III. 1) Ці́хенькі;
2) сівы;
3) іменны́ (выказнік);
4) і́мянны (спіс);
5) гліняны.

IV. 1) Алфа́віт;
2) аднасастаўны́;
3) грамадзяні́н;
4) нера́звіты (сказ);
5) жыха́р.

353. Знайдзіце і растлумачце памылкі. Запішыце выпраўленыя варыянты сказаў.

1. На ваенным была апранута шынель старога ўзору. 2. Спартсменаў за першае месца ўзнагародзілі залатой медаллю. 3. Валасы былі чыста вымыты пахучай дарагой шампунню. 4. Новым абуткам можна нацерці балючую мазоль. 5. Мастаку, відаць, не хапіла блакітнага гуашу. 6. Жывапіс Беларусі разнастайная паводле прызначэння, тэматыкі, тэхнікі пісьма. 7. Ідучы па мокрым і цёмным лесе, дождж усё не пераставаў. 8. Чытаючы гэты раман, ствараецца ўражанне, што Шамякін сам быў архітэктарам. 9. Прачытаўшы пра падарожжа, мне адразу ж уявіліся гэтыя падзеі *(З запісаў С. Язерскай)*.

354. Назавіце асновы складаных слоў, растлумачце правапіс злучальных галосных.

*-**а**-*	*дабр**а**якасны, крас**а**моўны, светл**а**валосы, шкл**а**вырабы*
*-**о**-*	*час**о**піс, святл**о**ўстойлівы, шкл**о**пакет*
*-**я**-*	*жыццяздольны, сярэдняве́чча, земляпрус*
*-**е**-*	*жыццесцвярджальны, сярэдневяко́вы, землеўласні́к*

Запішыце ўласныя прыклады на правапіс злучальных галосных. Растлумачце адпаведныя арфаграмы.

Правообладатель Национальный институт образования

355. Растлумачце правапіс літар ***о*** і ***а*** ў першай частцы складаных слоў.

О	*А*
высокаадукаваны, шырокадаступны, поўнагалоссе	*высакародны, шыракатвары, паўнагучны*
мовазнаўства, вокамгненна, фондасховішча, поўнаўладны	*чырванашчокі, ідалапаклонства*
фотавыстаўка (а л е: *фатаграфія*), ***штораніцы***, ***мотакрос*** (а л е: *матацыкл*), ***своеасаблівы***, ***словаўтварэнне***	***веласпорт***, ***відэаматэрыялы***, ***кінафестываль***, ***аднагалосна***, ***адзінаўладдзе***
поўдзень, поўнач	*паўаркуша, паў-Мінска*

Падбярыце ўласныя прыклады на правапіс галосных у першай частцы складаных слоў. Растлумачце адпаведныя арфаграмы.

356. Устаўце прапушчаныя літары, растлумачце правапіс.

Дал..гляд, выс..каідэйны, вогн..ўстойлівы, зл..памятны, д..брабыт, выс..каякасны, д..брасумленны, ч..рнабровы, ч..рнавалосы, ф..рмаўтваральны, малак..завод, аўды..касета, мн..жналікавы, раб..тадаўца, р..бататэхніка, пр..цілеглы, ф..тагалерэя, кін..афіша, метэ..зводка, дз..с..цібальны, дз..с..цітомны, з..мл..робства, св..тапогляд, с..нанарыхтоўка.

357. Раскажыце пра спосабы словаўтварэння самастойных часцін мовы. Запішыце адпаведныя прыклады. Карыстайцеся словаўтваральным слоўнікам. У якія групы вы ўключыце словы *ветлівасць, бяздоказны, выпускнік, дзесяцікласнік, суразмоўца, цішыня, глуш*?

Прыставачны	Суфіксальны	Бяссуфіксны	Прыставачна-суфіксальны	Складанне	Пераход слоў з адной часціны мовы ў іншую

358. Прачытайце азначэнні марфалогіі, прапанаваныя вучнямі. У якім з азначэнняў правільна акрэслены прадмет вывучэння марфалогіі і месца раздзела ў лінгвістыцы? У якіх азначэннях дапушчаны памылкі? Выправіце іх і абгрунтуйце свае праўкі.

1. Марфалогія — гэта раздзел, у якім вывучаецца слова як часціна мовы.

Правообладатель Национальный институт образования

2. Марфалогія — навука пра мову, якая вывучае слова як часціну мовы.

3. Марфалогія вывучае часціны мовы, іх правапіс і знакі прыпынку.

4. Марфалогія — гэта раздзел граматыкі, у якім слова вывучаецца як часціна мовы.

5. Марфалогія вывучае часціны мовы, формы слова, значэнні слоў, словазлучэнняў і сказаў.

6. Марфалогія — раздзел мовазнаўства, у якім слова вывучаецца як адзінка, што выконвае ролю пэўнага члена сказа.

359. З дапамогай табліцы ўзнавіце правіла «Утварэнне і правапіс прыметнікаў з суфіксам ***-ск-***».

1) *к* + ***ск*** = *ЦК* *т* + ***ск*** = *ЦК* *ц* + ***ск*** = *ЦК* *ч* + ***ск*** = *ЦК*	*мастак* + ***ск*** = *мастацкі* *дэпутат* + ***ск*** = *дэпутацкі* *выдавец* + ***ск*** = *выдавецкі* *Асіповічы* + ***ск*** + *асіповіцкі*
2) *д* + ***ск*** = *ДСК*	*сусед* + ***ск*** = *суседскі*
3) геаграфічныя назвы: *з* + ***ск*** = *ЗСК* *ж* + ***ск*** = *ЖСК* *ш* + ***ск*** = *ШСК* *х* + ***ск*** = *ХСК*	*Каўказ* + ***ск*** = *каўказскі* *Белая вежа* + ***ск*** = *белавежскі* *Добруш* + ***ск*** = *добрушскі* *Цюрых* + ***ск*** = *цюрыхскі* а л е: *Рыга* + ***ск*** = *рыжскі* *Волга* + ***ск*** = волжскі
4) *с* + ***ск*** = *СК* *ш* + ***ск*** = *СК*	*Беларусь* + ***ск*** = *беларускі* *таварыш* + ***ск*** = *таварыскі*
5) *з* + ***ск*** = *ЗСК* *к* + ***ск*** = *КСК* *х* + ***ск*** = *ХСК* *ш* + ***ск*** + *ШСК*	*француз* + ***ск*** = *французскі* *узбек* + ***ск*** = *узбекскі* *казах* + ***ск*** = *казахскі* *латыш* + ***ск*** = *латышскі* а л е: *славацкі, калмыцкі, турэцкі, чэшскі*

360. Утварыце і запішыце прыметнікі ад прапанаваных слоў. Растлумачце іх правапіс.

Нясвіж, Ушачы, Глыбокае, Бешанковічы, Старыя Дарогі, Канада, Парыж, узбек, Чыкага, Магдэбург, Прага, Нарвегія, Турцыя, латыш.

Правообладатель Национальный институт образования

361. Утварыце ад дзеясловаў форму 2-й асобы множнага ліку цяперашняга часу. Пазначце націск. Абазначце канчаткі, растлумачце іх напісанне.

Чытаць, смяяцца, браць, тлумачыць, пісаць, гаварыць, рэзаць, шаптацца, плыць, ехаць, адчыняць, знаходзіцца, глядзець, баяцца.

362. Прачытайце прадмову да энцыклапедыі «Брэст», прысвечанай 1000-годдзю горада. Чаму, на вашу думку, у якасці эпіграфа да выдання складальнікі ўзялі словы Канстанціна Сіманава: «Калі кажуць пра мужнасць, успамінаюць Брэст, калі кажуць пра выпрабаванні, успамінаюць Брэст, калі кажуць пра жыццё, аддадзенае за нашу зямлю, успамінаюць Брэст»? Што вы ведаеце пра Брэст, яго гісторыю і сучаснасць?

Запішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары, растлумачце іх правапіс.

Гэта адзін з самых старажытных белару..кіх гарадоў, які пра..шоў слаўны шлях ад гарадзішча ў **сутоках** *(З/з)*аходн..га Буга і Мухаўца да сучаснага горада, які **дынамічна** разв..ваецца, адм..ністрацыйнага, эканамічнага і культурнага цэнтра Брэс..кай воблас..і, найбуйнейшага м..жнароднага транспартнага вузла. Брэст **вылучаецца** багатай і **самабытнай** гістарычнай і культурнай спа..чынай. Многія **лёсавызначальныя** падзеі ..ўрапейскага і сусветнага значэн..я звязаны з гэтым горадам, Брэс..кай крэпасцю-геро..м. *(Не)*аднаразова кр..вапралітныя і разбуральныя войны, пажары і іншыя бе..ствы б..злітасна зні..чалі гара..скі **набытак**. *І кожны раз дзякуючы самаад..анай працы і намаган..ям жыхароў горад адрад..аўся.* **Берасцейцы** г..раічна і тал..навіта складалі гісторыю малой радзімы, стваралі асаблівы дух і н..паўторн..ю атмасферу свайго горада, **дэманстравалі** яго свету велічным і мужным, гасцін..ым і зручным для жыцця.

Брэст сё..я — гэта духоўна багаты і эканамічна развіты ..ўрапейскі горад, які ўвабраў у с..бе ўсе добрыя якасці сучаснай Беларусі і шчыра накіраваны ў мірнае будучае *(А. Вабішчэвіч)*.

Вызначце стыль і тып тэксту, абгрунтуйце свой адказ.

Назавіце арфаэпічныя і арфаграфічныя нормы на прыкладзе слоў з тэксту.

Падбярыце сінонімы да выдзеленых слоў.

Вызначце, якой часцінай мовы з'яўляецца кожнае слова ў сказе, набраным курсівам.

Вызначце разрад займеннікаў, ужытых у тэксце.

Выберыце з тэксту назоўнік, прыметнік і дзеяслоў. Зрабіце іх марфалагічны разбор.

Правообладатель Национальный институт образования

363. Знайдзіце памылкі ва ўжыванні лічэбнікаў. Запішыце выпраўленыя варыянты.

1. Паміж дзвюмястамі трыццаццю двума вучаніцамі. 2. З трымастамі пяццюдзесяццю чатырма рублямі. 3. З трымястамі дваццацю двума кнігамі. 4. Адна цэлая і дзве тысячных тоны. 5. Адзін цэлы і чатыры дзясятых літра. 6. Два новых сшыткі. 7. Чатыры вялікіх шары.

364. Прачытайце тэкст і выканайце заданні да яго.

Імідж сёння разумеецца як мэтанакіраванае стварэнне вобраза (чалавека, краіны).

Імідж краіны фарміруецца на аснове розных аспектаў: людзі, падзеі, гісторыя, традыцыі, звычкі. Ён не можа зводзіцца да адной характарыстыкі, паколькі краіна — складанае паняцце, якое налічвае мноства характарыстык. Адпаведна вобраз дзяржавы фарміруецца з некалькіх складнікаў: гістарычная спадчына, асаблівасці ўнутранай і знешняй палітыкі, спартыўныя дасягненні, ментальнасць нацыі.

Якім павінен быць імідж Рэспублікі Беларусь? Як яго ствараць? Якія фактары іграюць першасную ролю ў пазіцыянаванні краіны? Каб адказаць на гэтыя пытанні, было праведзена сацыялагічнае апытанне. Яго вынікі адлюстраваны ў наступнай дыяграме.



Так, большасць грамадзян (65 %) лічыць, што імідж дзяржавы на міжнароднай арэне ў першую чаргу фарміруецца за кошт гасціннасці, ветлівасці беларускага народа. На думку паловы апытаных, важным

Правообладатель Национальный институт образования

фактарам з'яўляецца высокая якасць прадуктаў харчавання, якія вырабляюцца ў нашай краіне. Крыху менш рэспандэнтаў (48 %) адзначылі міралюбівую і дружалюбную палітыку. Больш за трэць апытаных (35 %) лічыць, што свет ведае Беларусь праз высокія дасягненні ў спорце, перамогі на міжнародных спаборніцтвах.

Некаторыя лічаць, што фарміраванне іміджу краіны варта пачынаць з пазітыўных вобразаў малой радзімы — малых гарадоў і мястэчак. Паказальна, што ў 2016 годзе беларуская вёска Пагост трапіла ў сусветны рэйтынг, складзены кампаніяй *CNN*, як лепшае месца для сустрэчы Каляд і Новага года. Прычым Пагост заняў пяты радок у рэйтынгу, пакінуўшы за сабой Нью-Ёрк, Лондан, Зальцбург і Бостан.

У сённяшніх умовах недастаткова мець пэўныя перавагі (геаграфічнае становішча, інвестыцыі, турызм, інфраструктуру). Важна расказваць пра гэтыя перавагі мэтавай аўдыторыі *(Паводле Т. Рудакоўскай)*.

1. На аснове тэксту запішыце значэнні слоў *імідж, рэспандэнт, сацыялагічнае (апытанне)*.

2. Назавіце сцвярджэнне, якое не пярэчыць зместу тэксту:

а) імідж краіны вызначаецца на аснове аднаго крытэрыю;

б) праведзенае сацыялагічнае апытанне не прынесла плённых вынікаў;

в) высакаякасныя прадукты, што вырабляюцца ў краіне, не могуць выступаць паказчыкам іміджу;

г) фарміраванне іміджу краіны варта пачынаць са стварэння пазітыўнага вобраза малой радзімы.

3. Вызначце стыль тэксту і тып маўлення:

а) гутарковы стыль, разважанне;

б) мастацкі стыль, апісанне;

в) публіцыстычны стыль, разважанне;

г) афіцыйны стыль, апавяданне.

4. Сфармулюйце пытанні да кожнай сэнсавай часткі тэксту.

5. Прапануйце загаловак, які перадае асноўную думку тэксту.

6. Перадайце змест чацвёртага абзаца з дапамогай простага ўскладненага сказа.

7. На аснове калажу стварыце сціслы тэкст на тэму «Прывабны імідж Беларусі». Дапоўніце выказванне ўласнымі разважаннямі і прапановамі адносна стварэння пазітыўнага іміджу нашай краіны.

8. Выкажыце свае адносіны да сцвярджэння, сфармуляванага ў апошнім абзацы.

9. Адкажыце на пытанні, змешчаныя ў тэксце. Для гэтага сфармулюйце тэзісы, што перадаюць вашу абгрунтаваную пазіцыю.

Правообладатель Национальный институт образования

10. Самастойна прапануйце пытанні (заданні) да тэксту, скіраваныя на паўтарэнне лексікі, словаўтварэння, марфалогіі.

11. Якія арфаэпічныя і арфаграфічныя правілы можна праілюстраваць прыкладамі з тэксту?

365. Прачытайце аналіз тыповых памылак, дапушчаных абітурыентамі на цэнтралізаваным тэсціраванні ў заданнях па марфалогіі і правапісе. Падрыхтуйце (з дапамогай падручнікаў, слоўнікаў, інтэрнэт-рэсурсаў) практыкаванні для аднакласнікаў па тых правілах, што адпавядаюць прааналізаваным заданням.

У мінулыя гады абітурыенты дапускалі найбольшую колькасць памылак пры вызначэнні канчатка асабовых назоўнікаў 2-га скланення з зацвярдзелай асновай: *аб прафесару, аб доктару, аб дыктару*. Каля 40 % выпускнікоў пры выкананні задання не змаглі правільна вызначыць канчаткі назоўнікаў 1-га скланення з асновай на ***к***, які ў месным склоне адзіночнага ліку чаргуецца з ***ц***: *заяўка — (у) заяўцы, закваска — (у) заквасцы, пралеска — (на) пралесцы*. 30 % няправільна запісалі канчатак назоўніка *дачка́* ў форме меснага склону адзіночнага ліку.

Веданне пачатковай формы любой часціны мовы неабходна для ўмення ўтвараць граматычныя формы слова. Практычна 65 % удзельнікаў тэсціравання не ведалі, што прыметнікі *малы, вялікі, добры, дрэнны* ўтвараюць простую форму вышэйшай ступені параўнання ад іншых асноў пры дапамозе суфікса ***-ш-***, і таму няправільна адзначылі як пададзеныя ў пачатковай форме прыметнікі *меншы, большы, лепшы, горшы*. 35 % абітурыентаў не ведалі пачатковай формы іншых прыметнікаў, прапанаваных у заданні ў простай форме вышэйшай ступені параўнання, напрыклад *мякчэйшы*.

Ад 30 да 60 % абітурыентаў не ведалі правіла асобнага напісання назоўнікаў з прыназоўнікамі пры наяўнасці залежных слоў: *у глыбіню марскую, ад веку мінулага, у дзень сонечны* і да т. п. Толькі 50 % абітурыентаў правільна напісалі прыслоўі, утвораныя шляхам спалучэння прыназоўнікаў і склонавых форм поўных прыметнікаў і займеннікаў: *укрутую, ухаластую, унічыю* і інш.

Абітурыенты часцей за ўсё памыляліся ў напісанні ***не*** з прыметнікамі, якія можна замяніць сінонімамі без ***не***: *недалёкі, неспакойны*. Больш за 30 % з іх памылкова напісалі разам ***не*** з дзеепрыслоўямі: *не знайшоўшы, не дайшоўшы, не заўважыўшы* (Паводле З. Бадзевіч).

Дакладна сфармулюйце правілы, пра якія гаворыцца ў тэксце.

Правообладатель Национальный институт образования

366. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання верша. Паразважайце, чаму мы давяраем паэту ў яго шчырым прызнанні любові да Радзімы. Ці могуць кранаць чытача вершы, у якіх няма ўзнёслых эпітэтаў, арыгінальных параўнанняў?

Бачыў шмат —
І Эйфелеву вежу,
Спёку[м] Рыма, і Эльбруса **лёд.**
Тысячы зямных **дарог** і **сцежак**
Праз мяне прабеглі навылёт.
Думаў[м] я, малы, калісь з **трывогай,**
Як да рэк славутых мне **дайсці.**
Праплылі **праз сэрца** Дон і Волга,
Сена і Дняпро, Дунай і Цібр.
Я стаміўся **ездзіць** і **здзіўляцца**
(Хоць, прызнацца,
Ёсць[ф] на што глядзець[м]).
Беларусу і ў Парыжы **сняцца**
Белізна бяроз і сосен **медзь.**

П. Панчанка.

Зрабіце вусны арфаэпічны разбор выдзеленых слоў.

Растлумачце розныя варыянты пастаноўкі націску ў словах *белізна* і *бялізна*. Зрабіце словаўтваральны разбор і разбор па саставе слова *здзіўляцца*.

Запішыце па памяці крылатыя радкі з верша, што выражаюць асноўную думку твора.

Знайдзіце з дапамогай інтэрнэт-рэсурсаў 4-5 выказванняў беларускіх пісьменнікаў, грамадскіх дзеячаў пра беларускую мову. На якія ўласцівасці беларускай мовы звяртаецца ўвага? Якія прыметнікі, дзеясловы выкарыстоўваюцца пры характарыстыцы мовы? Ці згодныя вы з аўтарамі выказванняў? Афармеце свой адказ як разважанне.

Практ. 366–1–366–3

Правообладатель Национальный институт образования

Тлумачальны слоўнік

Агні́шча, -а, *н.* Месца, дзе быў касцёр.

Адзёр, адру, *м.* Заразная, пераважна дзіцячая, хвароба, якая суправаджаецца высыпкай, запаленнем дыхальных шляхоў і гарачкай.

Аксю́маран, -а, *м.* Стылістычны прыём наўмыснага спалучэння слоў процілеглага сэнсу, у выніку чаго ўзнікае новы сэнсавы змест *(белая варона, гаючы боль).*

Анабіёз, -у, *м.* Рэзкае зніжэнне жыццёвых працэсаў у арганізме з наступным аднаўленнем іх пры спрыяльных умовах.

Апеля́цыя, -і, *ж.* 1. Скарга ў вышэйшую інстанцыю на рашэнне ніжэйшай. 2. Зварот да каго-, чаго-небудзь дзеля падтрымкі, спачування і да т. п.

Ашча́дна, *прысл.* Беражліва, эканомна.

Бо́нна, -ы, *мн.* -ы, -аў, *ж. (уст.).* Выхавальніца малых дзяцей (звычайна іншаземка).

Бра́згаць, -аю, -аеш, -ае, *незак.* Утвараць кароткія звонкія гукі, ударяючы чым-небудзь па металічных, шкляных і іншых прадметах.

Бра́ма, -ы, *ж.* Шчыльныя, на дзве палавіны, крытыя зверху вароты, якія закрываюць галоўны ўваход на тэрыторыю горада, завода, двара і інш.

Бро́кер, -а, *м.* Агент-пасрэднік пры заключэнні здзелак на біржах, пры куплі-продажы каштоўных папер, твораў.

Бры́фінг, -у, *м.* Кароткая нарада прадстаўнікоў друку, на якой спецыяльна ўпаўнаважанымі асобамі паведамляецца пазіцыя ўрада па пэўным пытанні.

Ву́сцішна, *прысл.* Страшна, жудасна.

Ву́сцішны, -ая, -ае *(разм.).* 1. Ціхі, спакойны. 2. Страшны, жудасны.

Вы́спа, -ы, *мн.* -ы, -аў, *ж.* Невялікі востраў, часцей пясчаны.

Га́ніць, -ю, -ніш, -ніць; *незак., каго-што.* Прызнаваць непрыгодным, дрэнным; даваць нізкую ацэнку.

Гарсэ́т, -а, *м.* 1. Шырокі пругкі пояс, які носяць пад сукенкай для сцягвання таліі і надання стройнасці фігуры. 2. Састаўная частка беларускага народнага жаночага касцюма ў выглядзе безрукаўкі. 3. Бандаж, які носяць на верхняй частцы тулава пры захворванні або скрыўленні пазваночніка.

Го́нта, -ы, *ж. (зб.).* Дахавы матэрыял у форме невялікіх дошчачак, востра саструганых з аднаго боку і з пазам — з другога.

Даскана́лы, -ая, -ае. Які характарызуецца найвышэйшай ступенню і паўнатой дадатных якасцей; узорны, беззаганны, бездакорны.

Ды́лер, -а, *м.* Асоба, фірма, банк, што займаюцца перапродажам тавараў, купляй-продажам каштоўных папер, валюты і да т. п. і дзейнічаюць за свой кошт і ад свайго імя.

Дылета́нт, -а, *м.* Той, хто займаецца навукай або мастацтвам без спецыяльнай падрыхтоўкі; чалавек, які мае павярхоўнае знаёмства з якой-небудзь галіной ведаў.

Правообладатель Национальный институт образования

Дыспле́й, -я, *м.* Прыстасаванне для візуальнага адлюстравання інфармацыі (у выглядзе тэксту, табліц, чарцяжа і інш.) на экране электронна-прамянёвага прыбора (тэлевізійнага або асцылаграфічнага тыпу).

Ёдафо́рм, -у, *м.* Прэпарат ёду — крышталічны жоўты парашок, які выкарыстоўваецца ў медыцыне як антысептычны сродак.

Заку́ты, -ая, ае. Закаваны.

Зва́біць, -блю, -біш, -біць; *зак., каго-што (разм.).* Прывабіць, спакусіць.

Ка́лька, -і, *ДМ* кальцы; *ж.* 1. Спецыяльна апрацаваная празрыстая папера або тканіна, пры дапамозе якой знімаюцца дакладныя копіі з чарцяжоў і малюнкаў. 2. Копія чарцяжа або малюнка на такім матэрыяле. 3. Слова або выраз, утвораны па ўзоры слова або выразу іншай мовы *(слова «аднаасобнік» — калька рускага слова «единоличник»)*.

Капэ́ла, -ы, *ж.* Вялікая музычная група выканаўцаў — хор у спалучэнні з аркестрам.

Карце́ць, -ціць; *незак.* 1. *безасабовая форма з інфінітывам, са злучнікам каб і без дапаўнення.* Пра неадольнае жаданне што-небудзь зрабіць; хацецца. 2. Турбаваць, хваляваць, не даваць спакою.

Карэ́йка, і, *ДМ* -рэйцы, *ж.* Свіная або цялячая грудзінка спецыяльнага прыгатавання.

КлінО́к, -нка́, *мн.* -нкі́, -нко́ў, *м.* 1. Памянш. форма да *клін*. 2. Вострая частка халоднай зброі; лязо. 3. Трохвугольная торбачка для прыгатавання сыру.

Крана́ць, -аю, -аеш, -ае; *незак., каго-што.* Датыкацца, дакранацца да каго-, чаго-небудзь; чапаць.

Кудзе́ркі, -рак, *мн.* Кучаравыя або накручаныя валасы.

Куле́ш, -ляшу́, *м.* Густая мучная або крупяная каша з салам.

Кюрэ́, *нескл., м.* Каталіцкі прыходскі свяшчэннік у Францыі, Бельгіі і некаторых іншых краінах.

Ліхі́, -ая, ое. Дрэнны, паганы.

Мардва́, -ы́, *ж., зб., адз.* мардві́н, -а, *м.* Народ, які складае насельніцтва Мардоўскай Рэспублікі, што ўваходзіць у склад Расійскай Федэрацыі.

Ме́лас, -у, *м. (спец.).* Абагульненне паняцця меладычнага, песеннага пачатку ў музыцы.

Ме́неджар, -а, *м.* Асоба, якая арганізоўвае публічныя выступленні артыстаў, спартсменаў.

МетэаралО́гія, -і, *ж.* Навука аб фізічным стане зямной атмасферы і аб працэсах, што адбываюцца ў ёй.

Ме́цца-сапра́на, *нескл., н.* 1. Жаночы голас, сярэдні паміж сапрана і кантральта. 2. Спявачка з такім голасам.

МікА́да, *неск., м.* 1. Тытул японскага імператара. 2. Асоба, якая носіць гэты тытул.

Мультыпле́кс, -а, *м.* Вялікі кінатэатр, які складаецца з некалькіх кіназалаў.

Няге́глы, -ая, -ае *(разм.).* 1. Кволы, слабы; няўдалы. 2. Непрыгожы з выгляду, нязграбны; няўклюдны. 3. Няўмелы, ні да чаго не здатны.

Правообладатель Национальный институт образования

Пагафтава́ны, -ая, -ае, *дзеепрым. залежнага стану пр. часу ад «пагафтаваць»*. Упрыгожаны гафтам (ажурнай вышыўкай); вышываны, вышыты.

Ператравіць, -траўлю, -травіш, -травіць. Засвоіць у працэсе стрававання.

Плеана́зм, -у, *м*. Моўная з'ява, пры якой адбываецца паўтор слоў, аднолькавых ці блізкіх па значэнні *(бясплатны падарунак)*.

Працадзе́нь, -дня́, *мн.* -дні́, -дзён, *м*. Адзінка ўліку працы калгаснікаў і размеркавання даходаў па працы ў калгасах.

Пэ́йджар, -а, *м*. Партатыўны радыёпрыёмнік, прызначаны для прыёму маўленчай інфармацыі з адлюстраваннем яе ў выглядзе літарна-лічбавага тэксту на ўбудаваным экране (табло).

Рарыте́т, -а, *М* -тэце, *м*. Рэдкая рэч, якая ўяўляе сабой музейную каштоўнасць; рэдкасць.

Рэгенеры́раваць, -ую, -уеш, -уем *(біял.)*. Адраджацца, аднаўляць сваю цэласнасць (аб жывёлах і раслінах), аднаўляць страчаныя або пашкоджаныя органы, тканкі.

Са́льта-марта́ле, *нескл., н*. Скачок з пераваротам цела ў паветры.

Сло́та, -ы, *ДМ* сло́це і **слата́**, -ы, *ДМ* слацэ́, *ж. (разм.)*. Вадкая гразь на зямлі, на дарогах.

Стаў, става, *м*. 1. *(разм., абл.)*. Сажалка, запруда. 2. *(спец.)*. Назва спецыяльнага тэхнічнага прыстасавання для ўмацавання, замацоўвання чаго-небудзь.

Стэ́ла, -ы, *ж*. Прамавугольная ці звужаная ўверсе каменная пліта, пастаўленая вертыкальна ў якасці мемарыяльнага знака.

Сумёт, -а, *м*. Намеценая ветрам гурба снегу.

Таўтало́гія, -і, *ж*. Паўтарэнне ў межах сказа аднолькавых або аднакаранёвых слоў *(вырабіць выраб)*.

Транслітара́цыя, -і, *ж. (спец.)*. Перадача літар адной пісьменнасці літарамі другой пісьменнасці незалежна ад іх вымаўлення.

Трэд-юніён, -а, *м*. Назва канфесіянальных саюзаў у Вялікабрытаніі і іншых англамоўных краінах.

Туш[1], -а, *мн.* -ы, -аў, *м*. Кароткае музычнае прывітанне ў гонар каго-небудзь.

Туш[2], -ы, *ж*. Чорная ці каляровая фарба для чарчэння, малявання або пісьма.

Туш[3], -у, *м*. Выпадковы дотык да шара пры гульні на більярдзе, што лічыцца за ўдар.

Утыліза́цыя, -і, *ж*. 1. Выкарыстанне, ужыванне з карысцю. 2. Выкарыстанне якіх-небудзь адходаў у якасці сыравіны, паліва, угнаення і да т. п.

Факсі́міле, *нескл., н*. 1. Дакладнае ўзнаўленне рукапісу, дакумента, подпісу і да т. п. пры дапамозе фотамеханічнай рэпрадукцыі. 2. Клішэ, пячатка з чыім-небудзь подпісам.

Фено́мен, -а, *м*. Рэдкая, незвычайная, выключная з'ява.

Чэ́рава, -а, *н*. Жывот, бруха.

Ша́ры, -ая, -ае *(абл.)*. Шэры.

Шрот, -у, *М* шро́це, *м. (зб.)*. Дробныя свінцовыя шарыкі для стральбы з паляўнічай стрэльбы.

Правообладатель Национальный институт образования

Змест

РОЛЯ МОВЫ Ў ЖЫЦЦІ ЧАЛАВЕКА І ГРАМАДСТВА

§ 1. Мова як грамадская з'ява. Функцыі мовы 3

МАЎЛЕННЕ

§ 2. Маўленне як працэс маўленчых зносін. Віды маўленчай дзейнасці. Формы маўленчай камунікацыі 10

ТЭКСТ

§ 3. Тэкст як адзінка мовы і маўлення. Прыметы тэксту 17

§ 4. Апісанне, апавяданне, разважанне як функцыянальныя тыпы маўлення 21

КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ

§ 5. Асноўныя якасці культуры маўлення. Правілы маўленчых паводзін. Маўленчы этыкет 27

АРФАЭПІЧНЫЯ НОРМЫ

§ 6. Вымаўленне галосных і зычных гукаў, некаторых спалучэнняў зычных 35

АКЦЭНТАЛАГІЧНЫЯ НОРМЫ

§ 7. Націск і яго функцыі 43

Тэставая работа па фанетыцы і арфаэпіі 48

АРФАГРАФІЧНЫЯ НОРМЫ

§ 8. Правапіс галосных ***о, э, а*** 50

§ 9. Правапіс галосных ***е, ё, я*** 53

§ 10. Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах 56

§ 11. Правапіс прыстаўных галосных 60

§ 12. Правапіс звонкіх і глухіх, свісцячых і шыпячых зычных 62

§ 13. Правапіс прыстаўных і ўстаўных зычных 65

§ 14. Правапіс літар ***у*** і ***ў*** 68

§ 15. Правапіс ***д*** і ***дз***, ***т*** і ***ц*** 71

§ 16. Правапіс падоўжаных зычных 74

§ 17. Правапіс некаторых спалучэнняў зычных 77

§ 18. Правапіс мяккага знака і апострафа 79

§ 19. Правапіс вялікай і малой літар 84

§ 20. Правапіс слоў разам, праз злучок і асобна 89

§ 21. Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны 96

§ 22. Правапіс ***і, ы, й*** пасля прыставак 99

Кантрольныя пытанні і заданні 102

Тэставая работа па арфаграфіі 104

Правообладатель Национальный институт образования

ЛЕКСІЧНЫЯ НОРМЫ

§ 23. Ужыванне слова ў адпаведнасці з яго лексічным значэннем, адрозненне мнагазначных слоў і амонімаў 107
§ 24. Правілы выкарыстання сінонімаў, антонімаў, паронімаў 113

ФРАЗЕАЛАГІЧНЫЯ НОРМЫ

§ 25. Правілы ўжывання фразеалагізмаў у маўленні 118
Кантрольныя пытанні і заданні 122
Тэставая работа па лексіцы і фразеалогіі 122

СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫЯ НОРМЫ

§ 26. Утварэнне слоў і іх ужыванне ў адпаведнасці з правіламі словаўтварэння 126
Кантрольныя пытанні і заданні 140
Тэставая работа па словаўтварэнні 141

МАРФАЛАГІЧНЫЯ НОРМЫ

§ 27. Ужыванне назоўнікаў, лік, род якіх не супадае ў беларускай і рускай мовах; назоўнікаў, якія маюць форму толькі адзіночнага ці толькі множнага ліку; назоўнікаў агульнага роду, нескланяльных назоўнікаў і абрэвіятур 145
§ 28. Ужыванне поўных і кароткіх прыметнікаў, форм ступеней параўнання якасных прыметнікаў, прыналежных прыметнікаў. Ужыванне форм ступеней параўнання прыметнікаў і прыслоўяў 159
§ 29. Ужыванне колькасных і парадкавых лічэбнікаў; спалучальнасць зборных лічэбнікаў з назоўнікамі і займеннікамі 167
§ 30. Ужыванне асабовых займеннікаў, зваротнага займенніка *сябе*, ужыванне прыназоўніка пры адмоўным займеннiку; акцэнталагічныя нормы пры скланенні займеннікаў *сам, сама, самы, ніхто, нішто* 178
§ 31. Ужыванне асабовых канчаткаў дзеясловаў, адрозненне канчаткаў дзеясловаў абвеснага і загаднага ладу; акцэнталагічныя нормы пры ўтварэнні спрагальных форм дзеясловаў... 188
§ 32. Ужыванне дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў, дзеепрыметнікавых і дзеепрыслоўных зваротаў 198
§ 33. Ужыванне прыназоўнікаў у словазлучэннях, якія перадаюць асаблівасці кіравання ў беларускай мове 204
Кантрольныя пытанні і заданні 212
Тэставая работа па марфалогіі 213

ПАЎТАРЭННЕ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВЫВУЧАНАГА

§ 34. Моўныя нормы і культура маўлення 216

Тлумачальны слоўнік 226
Спіс выкарыстаных крыніц

Правообладатель Национальный институт образования

Вучэбнае выданне

Валочка Ганна Міхайлаўна
Васюковіч Людміла Сяргееўна
Зелянко Вольга Уладзіміраўна і інш.

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

Вучэбны дапаможнік для 10 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання
(з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню)

На вокладцы змешчаны фотаздымак
скульптуры Ефрасінні Полацкай (скульптар І. Голубеў)

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *І. С. Балабановіч*
Вокладка мастака *З. П. Болцікавай*
Мастакі *А. Ю. Ляшчынская, З. П. Болцікава, А. М. Брыкет*
Мастацкі рэдактар *Н. А. Хромава*
Камп'ютарная вёрстка *А. М. Брыкет*
Карэктар *І. С. Балабановіч*

Падпісана да друку 24.07.2020. Фармат 70×90 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 16,97. Ул.-выд. арк. 12,92 + 25,72 эл. дадат. Тыраж 131 230 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/263 ад 02.04.2014.
Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных
выданняў № 2/3 ад 04.10.2013. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск

Правообладатель Национальный институт образования

(Назва ўстановы адукацыі)

Навучальны год	Імя і прозвішча вучня	Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні	Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			

Правообладатель Национальный институт образования

УЗОР ФАНЕТЫЧНАГА РАЗБОРУ

Здзіўляюць — *здзіў-ля́-юць*.

Гукі:		Літары:
[з’]	— зычны мяккі, звонкі, свісцячы	з
[д͡з’]	— зычны мяккі, звонкі, свісцячы	д, з
[і]	— галосны ненаціскны	і
[ў]	— зычны цвёрды, санорны	ў
[л’]	— зычны мяккі, санорны	л
[а]	— галосны націскны	я
[й]	— зычны мяккі, санорны	ю
[у]	— галосны ненаціскны	
[ц’]	— зычны мяккі, глухі, свісцячы	ц, ь

Правообладатель Национальный институт образования

УЗОРЫ РАЗБОРУ СЛОЎ ПА САСТАВЕ



УЗОРЫ СЛОВАЎТВАРАЛЬНАГА РАЗБОРУ

Прыбегчы ← *бегчы*.

Смелася́ць ← *смел*(*ы*).

Уверсе́ ← *верх*(□).

Дабра́вольны ← *добр*(*ы*) + *вол*(*я*).

УЗОР ЛЕКСІЧНАГА РАЗБОРУ

***Волат** да брата на замчышча крочыць* (А. Вялюгін).

Волат — казачны герой незвычайнай сілы. Слова многазначнае. Ужыта ў прамым значэнні. Сінонімы — *асілак, сілач, велікан*. Слова агульнаўжывальнае, спрадвечна беларускае.

Правообладатель Национальный институт образования

УЗОРЫ ПІСЬМОВЫХ МАРФАЛАГІЧНЫХ РАЗБОРАЎ

Адзінаццаць стагоддзяў горда стаіць наш Полацк на стыку магутнай Дзвіны і ціхай Палаты (В. Хомчанка).

Назоўнік

Полацк — назоўнік; п. ф. — *Полацк*; уласны, неадушаўлёны, неасабовы, канкрэтны; м. р., 2-га скл.; Н. скл., адз. л.; дзейнік.

Прыметнік

Магутнай (Дзвіны) — прыметнік; п. ф. — *магутны*; якасны; поўн. ф.; ж. р., адз. л., Р. скл.; азначэнне.

Лічэбнік

Адзінаццаць – лічэбнік; п. ф. — *адзінаццаць*; колькасны (цэлы лік), просты; В. скл.; у складзе акалічнасці.

Займеннік

Наш (Полацк) — займеннік; п. ф. — *наш*; прыналежны; Н. скл., м. р., адз. л.; азначэнне.

Дзеяслоў

Стаіць — дзеяслоў; п. ф. — *стаяць*; неперах., незвар., незак. тр., II спр.; абв. л., цяп. ч., 3-й ас., адз. л.; выказнік.

Правообладатель Национальный институт образования

Прыслоўе

Горда — прыслоўе; якаснае; нязмен.; акалічнасць.

Прыназоўнік

На (стыку) — прыназоўнік; невытв.; просты; ужыты з М. скл. наз. *(стыку)*; у складзе акалічнасці.

Злучнік

І – злучнік; зл. (спалуч.); просты; адз.; звязвае аднарод. дап. *Дзвіны*, *Палаты*.

У такія дні ў лесе аж за вярсту было чуваць, як недзе падае, рассыпаючыся на ляту, белы камяк з патрывожанай галіны (І. Мележ).

Дзеепрыметнік

Патрывожанай (галіны) — форма дзеяслова — дзеепрыметнік; п. ф. — *патрывожаны*; поўн. ф.; зал. ст., зак. тр.; пр. ч., адз. л., ж. р., Р. скл.; азначэнне.

Дзеепрыслоўе

Рассыпаючыся — форма дзеяслова *рассыпáцца* — дзеепрыслоўе; незак. тр., звар.; акалічнасць.

Часціца

Аж — часціца; узмацн.; не член сказа.

Правообладатель Национальный институт образования